# Янка Сіпакоў

# 1



# Янка Сіпакоў

*Выбраныя творы ў двух тамах*

# Янка Сіпакоў

*Выбраныя творы ў двух тамах*

# Янка Сіпакоў

# 1

## Паэзія

Мінск
«Мастацкая
літаратура
1995

ББК 84(4Беи)6
С 39
УДК 882.6-1

*Прадмова Любові Ламекі*

С 8820600000—006 / М 302(03)—95 93—94

ISBN 5-340-01334-8(Т.1)
5-340-01345-6

© І. Д. Сіпакоў, 1995
© Прадмова. Л. А. Ламека, 1995

# НЕСПАТОЛЬНАЯ ПРАГА КРЫЛА

Калі б хтосьці спытаў, чым абумоўлена мая даўняя і шчырая прыхільнасць да творчасці Янкі Сіпакова, відаць, я не адказала б пэўна — такое шматмернае і невычарпальнае гэтае пачуццё. А мо яно і не пачуццё зусім, а нешта большае — нейкая часцінка душы, твайго «я», надзейная, балючая і самая дарагая...

Якое вялікае шчасце — мець у суразмоўцах паэта, здольнага вярнуць цябе да тваёй сутнасці, дадзенай Богам, абнадзеіць, што ў цябе ўсё яшчэ ёсць крылы і, значыць, ты можаш здзейсніць свой палёт, няспраўджаны пакуль што лёсам. Можаш!.. Інакш не гарнулася б так душа да кожнай краскі ля ўтравелай сцежкі, мелодыі абуджанага сонцам зерня, вечаровай мудрасці дрэў.

Сапраўдны паэт, а менавіта такі Янка Сіпакоў, не носьбіт нейкіх тэм, ідэй, вобразаў, не шчыры паслухмяны выканаўца сацыяльнага заказу, найперш ён — выратавальнік чалавечай душы і яе мудры творца.

...Ты стаміўся, мой дарагі чытач, здзіўляцца і захапляцца светам? — як бы пытаецца ён. Паспяшайся тады са мною да чыстай крыніцы і падумай, чаму так хвалююць цябе гэтыя тры прыгаршчы вады і адусюль ты вяртаешся пакланіцца ёй? А мо цябе ўратуе лыжны след, які праз завею і холад зімы пралёг незваротнай чысцінёй юнацкай вернасці? Ці маленькі падарожнік сонца сланечнік, нязменна верны адзінай — сонечнай арбіце?

Як бы там ні было, не слухай тых, якія сцвярджаюць, што самая вялікая раскоша і насалода — нічога не адчуваць. Яны моцна памыляюцца! Не вызваляй сваё сэрца ад буры — куды страшней і небяспечней для яго напятая вакол ціша...

А мо ты засаромеўся сваёй чуллівасці, плачаш ад чалавечай дабраты і спагады, хаваючы твар? Не трэба, мой любы! Баліць там, дзе цепліцца душа. І яна не дасць шчырай слязе сагнуць плечы перад крыўдаю і подласцю.

А мо ты, мой маўклівы субяседнік, зняверыўся ў будучыні свайго народа, задыхаешся ў атмасферы нацыянальнага нігілізму, манкурцтва, здрады бацькоўскім караням? Не адчайвайся так моцна. Чуеш, як з далечы сівых вякоў ідуць табе на падмогу нашы дзяды, збіраюцца на сваё веча? Яны не могуць быць непачутымі — у праўды стагоддзяў асаблівы голас...

У нашым непаўторна-непрадказальным жыцці, дзе бессэнсоўнасць стала незатухаючым перажываннем, свінцовым псіхалагічным фонам, у ат-

масферы духоўнага ўбоства, адчаю і разгубленасці кнігі Янкі Сіпакова — як глыток чыстага паветра, які выратавальна вяртае да простых і вечных ісцін.

Калі любоў да Радзімы не дэкларуецца высокай патэтыкай, а прамаўляецца «ціхім, сціплым і нават крыху сарамлівым голасам — такім, якім прызнаюцца ў сваіх самых цнатлівых і непапраўных пачуццях»; калі клопат пра лёс народа не выражаецца катэгарычна-прымітыўным «народ нас не поймет», а вырываецца глыбокім уздыхам-мальбою: «Божа!.. Вярні майму народу гістарычную памяць, абудзі ў ім самапавагу. Памажы зразумець яму, што ён не цёмны, забіты і прыніжаны, а такі ж вольны і паважаны на зямлі, як і ўсе іншыя народы ў свеце!»; калі выратаванне бачыцца не ў нейкім «ізме» з чалавечым тварам (быццам ёсць яшчэ і з жывёльным!), а ў самім Чалавеку.

Думка... Вось яна, самая каштоўная якасць кніг Янкі Сіпакова! Думка, падсвечаная пранізліва-шчымлівай журбою — такім рэдкім і такім надзейным пачуццём. Бо ў ім няма разбуральнай злосці, нянавісці, цынізму і пагарды, а ёсць толькі вялікасны боль і ачышчальны смутак, якія здольныя прасвятліць чалавека, вярнуць яго да спакойнага, а значыць, мудрага стану, у якім толькі і можна разважаць пра высокае, тварыць яго.

Такая думка не пагодзіцца з тым, што беларусы — прыцярпелая «нацыя рабоў», якая сама сабе плюе ў твар, не падзеліць пацяшання і глумлення з усяго беларускага, а спадзявальна паспрабуе яшчэ раз закрануць глыбінную, каранёвую струнку беларускай душы, каб ажывіць яе.

Яна прыгадае беларусу лёс яго спакутаванай, абрабаванай на скрыжаваннях гісторыі, але «спагадлівай ад веку зямлі». Яна ўзвысіць яго духоўным подзвігам Францішка Скарыны і Кастуся Каліноўскага, Кірылы Тураўскага і Ефрасінні Полацкай, Францішка Багушэвіча і Максіма Багдановіча, Якуба Коласа і Янкі Купалы. І яна, гэтая думка, патрабавальна распачне яшчэ адну мужную праўдзівую размову аб тым, што сталася з намі — ласкавым, шчырым, спагадлівым, працавітым народам.

Хто адабраў у нас памяць, чаму мы выракліся сваёй роднай мовы, сталі абыякавымі да сваёй гісторыі, з лёгкасцю едзем у свет шукаць шчасця, не разумеючы, што знайсці яго без роднай зямлі немагчыма. Чаму дазволілі ператварыць у палігон для эксперыментаў прыгажэйшую ў свеце зямлю, разбурылі яе старажытныя храмы, атруцілі рэкі, вынішчылі лясы, асушылі балоты, забрудзілі паветра, бяздумна выконваем «любыя, нават дурныя пастановы» — калі ласка! Зрабілі амаральнай самую нашу сумленнасць.

Чаму, урэшце, мы — не гаспадары ў сваім доме, і гэткае людскае пачуццё, як сціпласць, ператварылі ў гіпертрафіраваную ўгодлівасць. Інакш ці пайшоў бы ў свет такі, балюча-справядлівы, жарт, які напрыканцы свайго жыцця нагадаў пісьменніку (як бы прасіў запомніць) цяжкахворы Сцяпан Александровіч: «Дазвольце беднаму беларусу ў сваёй хаце, на голай лаве, дзе-небудзь у куточку хоць адну ночачку пераначаваць...»

Але разам з тым адкуль у нас, беларусаў, столькі нецярпімасці, самаедства? Пад'юшчыць, падкусіць, падставіць падножку, а не дык увогуле спляжыць. І асабліва таго, хто хоча дапамагчы нам стаць нацыяй, народам. Чаму не беражэм адзін аднаго, не ідзём насустрач? І, як тыя беларусы ў абразлівым, але і справядлівым анекдоце, які нагадвае пісьменнік, гатовы

ўцягнуць назад у кацёл смельчака-суродзіча, які паспрабаваў быў вылезці з пекла?..

У кожнай думкі Янкі Сіпакова — сваё адметнае жыццё, знешняя абалонка, пластыка, сваё дыханне і ўзмах крыла. Калі ў паэтычным радку яна, як імгненне ў лёце, выхапленае вечнасцю, то ў мініяцюры, прытчы набывае зусім іншае выражэнне і характар. Сцішанасць, засяроджанасць, мудры спакой дазваляюць сказаць тое, што немагчыма было б выразіць у паэтычным вобразе. Іншы жанр — іншыя сродкі. Празаік Сіпакоў шчасліва дапаўняе паэта Сіпакова, а тонкі праніклівы лірык дапамагае глыбей выявіцца аналітыку, псіхолагу, знаўцу чалавечай душы.

Творы Янкі Сіпакова, у якіх ён вядзе неапасродкаваную літаратурным сюжэтам размову з чытачом,— гэта больш, чымсьці лірычная філасофская проза, за якой — асоба мастака, надзеленага чуйным грамадзянскім талентам, афарыстычным мысленнем, тонкай назіральнасцю. Гэта праз вякі выспелены менавіта беларускай зямлёй голас яе журбы. І калі ён світальна гучыць у душы — нараджаецца надзея. Што ўсвядомяць яшчэ беларусы сябе народам на гэтай зямлі, ачысцяць крыніцы, бо «той, хто хоча піць чыстую ваду,— мусіць гэта зрабіць», падымуцца да разумення паэзіі Міколы Гусоўскага, мудрага слова Францішка Скарыны, лірычных маленняў Кірылы Тураўскага, бунтарнага духу Кастуся Каліноўскага. І ўсцешыцца нарэшце беларуская зямля, пачуўшы з вуснаў сваіх анямелых дзяцей роднае слова...

Эсэ Янкі Сіпакова, ягоныя мініяцюры-нататкі, прытчы — гэта паэтычны россып думак пра лёс народа, яго гісторыю, мову, пра чалавека і яго месца ў свеце, экалогію душы і экалогію прыроды, пра пісьменніцкую працу і таямніцы слова, духоўныя і маральныя традыцыі. Гэта асабістыя роздумы, ураджанні, меркаванні, адкрыцці якіхсьці з'яў, падзей, асоб... Але было б недастатковым убачыць у іх толькі абвостраную грамадзянскую пазіцыю мастака. Ён і ў прозе — найперш паэт, і яго ўзнёслае паэтычнае эмацыянальнае слова, якое вырастае да метафары, афарызма, алегорыі, глыбокага сімвала, мае шырокую амплітуду выражэння. Тут і абурэнне, і захопленасць, і нязгода, і скруха, і павучанне, і маленне, і ўсмешка. Бывае, мастака літаральна захлынаюць пачуцці любові, замілаванасці, захаплення, скажам, родным словам, і тады ён жывапісуе кожную літару, выяўляючы яе характар і настрой. Пісьменнік адчувае сапраўдную асалоду, унікаючы ў словаўтваральную стыхію, спасцігаючы таямніцы слова. Прыглядзьцеся, як бы запрашае ён чытачоў, якое яно шматграннае, шматфарбнае, шматмернае!

Асобная размова — высокае майстэрства Янкі Сіпакова, культура яго слова, радка, багацце жанраў, формаў, прыёмаў, вытанчанасць мастацкага густу, філасофская глыбіня ў спасціжэнні жыцця...— шлях пісьменніка пазначаны мноствам адкрыццяў! Мы гаворым пра верш, баладу Янкі Сіпакова, яго апавяданне, эсэ, прытчу, мініяцюру, крытычны артыкул, нарыс, пераклад. Усё гэта, безумоўна, з'явы ў нашай літаратуры. І аб іх яшчэ столькі будзе сказана даследчыкамі яго творчасці, упэўнена ў гэтым! Бо ці можна, скажам, прайсці міма прытчы Янкі Сіпакова, у якой такі высокі ўзровень думання, бачання, перажывання, такая магутная інтэлектуальная эмоцыя, такі пранікліва — праз вякі — позірк на чалавека. Позірк збоку і як бы з самай глыбіні. «Ён быў якраз з тых, на каго часцей за ўсё звяр-

таюць увагу Багі і каго звычайна не заўважаюць людзі... Ён жыў небам, хоць і хадзіў па зямлі...»

Можна шмат было б гаварыць пра арыгінальнасць і змястоўнасць прытчаў Янкі Сіпакова «Адзін з нас», «Яма», «Клетка», «Двое для дваіх...» — яны даюць такі прастор думцы, фантазіі, пачуццю! Але мне... хочацца ізноў вярнуцца да вершаў, напісаных у далёкія шасцідзесятыя летуценным юнаком, душа якога прагнула палёту і яшчэ толькі спрабавала сваё крыло.

Звонкі радок праліўся тады сонечным дажджом, адгукнуўся салаўінай песняй і шэптам бярозкі, напоўніўся водарам мяты. Здавалася, амаль усе праявы жыцця шукалі свайго выйсця ў слове. Прасіліся ў радок зыркі промень і ўпаўшая зорка, бялявы туман і колкі ржэўнік, кропелька расы і крамяная антонаўка... Усё пачыналася як быццам традыцыйна, як у многіх іншых: молада, весне, упэўнена,— калі б... не адзін вобраз-сімвал, які і сёння пераварочвае ўсю душу — вобраз ліста, неадасланага маці (разам з бацькам яе закатавалі фашысты за сувязь з партызанамі)...

Я адчуваю яго прысутнасць амаль у кожным творы Янкі Сіпакова. Ён усё яшчэ пішацца, гэты ліст,— праз доўгія гады, дзесяцігоддзі як адказ на ласкавы пяшчотны дотык мацярынскай рукі, запаліўшай калісьці паэтычны агеньчык у сынавым сэрцы. Яго хопіць на ўсё астатняе жыццё. І на мноства іншых жыццяў, здольных адгукацца на святло чалавечай душы. Я думаю, што сіпакоўская мудрая, трывожна-шчымлівая журба, якая забрала ў палон і маё сэрца, з таго неадасланага маці, ліста таксама.

Гляджу разам з паэтам на Міс Вёску, у яе штодзённай апратцы — гумовых ботах і звычайнай плюшаўцы, з ім іранізую-чакаю, калі накінуць ёй мадэльеры Высокай Моды кухвайку ад Ларана ці плюшаўку ад Кардэна, абуюць гумовыя боты ад Шанэль. І раптам лаўлю сябе на думцы: гэта ж паэт, мусіць, ізноў успамінае сваю маці — самую Міс Дабрыню з найпрыгажэйшай у свеце каронай з самых каштоўных камянёў — зіхоткіх кропелек расы, нячайна ўпаўшых з жытнёвых каласоў пад яе сярпом...

Я нізка кланяюся Вам, незнаёмая і такая знаёмая Матуля Паэта, бо ведаю, пэўна ведаю, што ў той дзівосны вянок санетаў, які напісаў Ваш сын у гонар Жанчыны, першую кветку ўплялі Вы. І як бы ні стараліся непаэты-паэты зганьбіць, прынізіць і абліць брудам жанчыну, зернетка чысціні, пасеянае Вамі, станецца ёй паратункам: «а ты — святая, як сама любоў».

О, паэзія! Выток самых прыгожых і высокіх пачуццяў! Чаму ж чалавек усё часцей адмаўляецца ад цябе, абыходзіць, уцякае нават? Невыносна, злачынна лянівы стаў ён душою! А мо проста баіцца, што не вытрымае выпрабаванне любоўю, чысцінёй, годнасцю — так ачарсцвела і выпетрала душа?..

І толькі паэт з Божае ласкі можа вярнуць ёй адчуванне неабходнасці палёту, здольнасць радавацца як найвялікшаму святу — магчымасці ПРОСТА ЖЫЦЬ НА ЗЯМЛІ.

Толькі ён можа абудзіць прагу неспатольнай любові да кожнай травінкі і краскі, кузюркі і рачулкі, дрэва і птушкі, жаданне спасцігнуць іх мудрую тайну агульнажыцця.

І толькі дзякуючы яму адкрываецца ў цябе другое дыханне і нараджа-

ецца той асаблівы стан душы, калі ты можаш расчуліцца да слёз ад аднаго толькі ласкавага дотыку мятлушкі-шматкалёрніцы...

Я вельмі спачуваю тым, хто не сустрэўся яшчэ з творамі Янкі Сіпакова, іх гаючаю, выратавальнаю чысцінёй, і зайздрошчу сабе — столькі яшчэ наперадзе хвілін чыстай і высокай радасці. І столькі адкрыццяў!

Бывае так, што возьмеш у рукі збор твораў якога-небудзь пісьменніка, зноўку перагорнеш старонкі яго кніг і з прыкрасцю адзначыш, як бяздумна растрэсены па пульхных тамах Божы дар, загублена некалі так ярка ўспыхнуўшая іскра таленту. Не зразумеў чалавек, што на яго долю прыйшлася мо самая цяжкая праца — духоўная. А яна, як вядома, не церпіць ленасці і несумленных да сябе адносін.

Не ўратавалі некаторых ні званні, ні пасады, ні тытулы. Наадварот, церневым стаўся ім лаўровы вянок эфемернай славы.

Ад ганебнага ўдзелу быць непаэтам, шэрай пасрэднасцю ў літаратуры Янку Сіпакова ўратавала ягоная самасць, асабовасць, сумленная праца, глыбокае адчуванне адказнасці за Слова.

І яшчэ — неспатольная прага дарогі. Той, якая не мае канца і пачатку і яднае ў сабе мудрасць усіх шляхоў і сцежак у Сусвеце — дарогі да людскіх душ і сэрцаў. У гэтым ён роўня яшчэ аднаму вялікаму паэту, які «жыў у заўсёдным здзіўленні перад зямлёй, скаламі, майскімі кветкамі, зоркамі, дажджом, снегам» — Уолту Уітмену.

Чытаю паэмы ў прозе Я. Сіпакова «Варзоб», «Ахвярны двор», «Хата», «Одзіум», «Экстаз» і іншыя, народжаныя ў далёкіх вандроўках па зямлі армян, украінцаў, таджыкаў, рускіх, па нашай, беларускай, зраненай Чарнобылем зямлі, і ўспамінаю Уолта Уітмена, яго паэмы «Песня пра вялікую дарогу», «Калі цвіў гэтай вясною бэз у маім двары», «Песня радасцяў», «З калыскі, якая заўсёды гайдаецца»...

Здавалася б, такія розныя жыццёвыя з'явы, сітуацыі, лёсы, час, а тэмпература сэрца — адна, і захопленасць — тая ж, і такая ж засяроджанасць роздуму аб таямніцах Прасторы і Часу, і дыханне — ва ўнісон, і такая ж чароўная ўсмешка, і песня — вольная і нязмушаная, і прарочая радасць надзеі, і тая ж годнасць духу!

У такіх творах не трэба шукаць сюжэтаў. Іх проста няма ў традыцыйным іх разуменні. Усё яднае асоба мастака, ягоныя думка, пачуццё, настрой, інтэлектуальная эмоцыя.

Чаму, скажы, паклікаў цябе паэт у Варзобскую ўпадзіну, дзе цвітуць снежныя кветкі гульбарфы і «вечным холадам дыхае ў твар першароднасць снегу і неспазнанасць жыцця»? Чаму запрасіў на старажытную зямлю векапомных камянёў і мудрых кніг Арменію, на пранізаны наскрозь ветрам экзатычны востраў Саарэмаа — гонар і любоў эстонцаў? Чаму прывёў на вялікую Чарнечую гару Украіны, дзе знайшоў свой апошні прытулак Вялікі Пакутнік Тарас Шаўчэнка, які «больш за ўсё цаніў і паважаў у чалавеку годнасць, спавядаўся маральнай чысціні, разумеў смутак і журбу, ведаў боль»?

Я думаю, паэт проста даў табе яшчэ адну шчаслівую магчымасць — сярод прыгожых краявідаў, у акіяне людскога болю, радасці і надзеі спасцігнуць сябе, зразумець, хто ты такі, чаго варты, адчуць і ўбачыць, што носіш у сваім сэрцы. Праз людскія лёсы дапамог табе глянуць на лёс уласны, засвоіць няпростыя ўрокі жыцця.

Мо найбольш такіх мудрых урокаў спасцігаеш праз лірычную, аналітычна-філасофскую прозу Янкі Сіпакова. І не таму, што мастак раскрывае ў ёй нейкія незвычайныя характары, лёсы, жыццёвыя сітуацыі. Лірычны герой большасці апавяданняў і аповесцей — просты, звычайны вясковы працаўнік. Але — ІНТЭЛІГЕНТ ад зямлі! АРЫСТАКРАТ ДУХУ, як пісаў калісьці аб ім Максім Гарэцкі. І талент ён мае надзвычай рэдкі сёння — уменне працаваць на зямлі, пяшчотна любіць і берагчы яе красу, адчуваць кожнаю клетачкаю і жылкаю яе дыханне.

Разумеючы, якую незваротную страту панясем, калі пакінуць нас сумленныя і сціплыя працаўнікі — усе гэтыя Сцяпаны, Ганначкі, Наташкі, Іваны, Раіскі,— пісьменнік беражліва занатоўвае кожную драбніцу іх жыцця, рух душы, кожнае імгненне, настрой, пачуццё — столькі ў іх сапраўднай духоўнасці, маральнасці, паэзіі!

І журыцца, абураецца, шчыра перажывае, што, зведаўшы столькі гора, пакут, болю, перанёсшы такія велізарныя выпрабаванні, ахвяраваўшы дзеля чыйгосьці дабрабыту ўсім — красою, маладосцю, здароўем,— застаўся гэты працаўнік сам-насам са сваёй нішчымнаю старасцю-бядою. І з нашай жорсткаю, злачыннаю абыякавасцю.

...Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю адзінокага калекі-пастуха з апавядання «Клопат». Ні светлага дзяцінства, ні акрыленага марай юнацтва, ні сям'і і хаты ў сталым узросце. Так і прахадзіў усё жыццё за чужымі каровамі, па чужых хатах, церпячы папрокі і насмешкі, кпіны і абразы: «Хілюта-пастух, Хілюта-сухарукі, Хілюта не чалавек».

І ўсё ж вярнуўся ў вёску-мачаху пасля Чарнобыля, дзе давялося ў самай зоне пасвіць кароў. Вярнуўся цяжка хворы. Зрабіла сваю нядобрую справу хворая трава, хворая раса, хворая зямля...

Але растапталі Вабішчы апошні давер Хілюты. Не знайшлося ніводнай добрай душы, каб прытуліць хворага старога чалавека, раздзяліць яго гора-бяду. Запозненая жаласлівасць Паўлюка, якая прыйшла праз злосць, раздражненне і абурэнне,— не апраўданне вёсцы.

Горкі сімвал — адзінокі азяблы нямоглы чалавек на лаўцы пад вокнамі раскошнай і цёплай людской хаты... Ці не прыгавор гэта нашай жорсткасці, бяздушнасці, маральнаму садызму?..

Не сустрэўшы ні разу ў сваім жыцці ТАКОГА гаротніка-Хілюту, я памятаю яго. Той памяццю, якая выспельваецца болем, спагадай, дабрынёй. І сорамам...

*Любоў Ламека*

*З кнігі*

## «СОНЕЧНЫ ДОЖДЖ»,

1960 г.

* * *

Адгукніся
На стук у акно асцярожны;
Дай вады,
Калі просіць яе падарожны;
Абагрэй,
Калі той скарчанеў на марозе;
Накармі,
Калі доўга не еў у дарозе.
Ды не вер,
Калі вораг прыкінецца братам;
Не маўчы,
Калі смерць напаўняе гарматы;
Не чакай,
Каб цябе закавалі ў кайданы;
Не даруй
Ні за здзек,
ні за гвалт,
ні за раны!

## Ваўчыца ў звярынцы

Нялёгка з пушчай вольнай разлучыцца
І апынуцца ў цеснакутай клетцы...
Кідаецца ва ўсе бакі ваўчыца
І на свабоду вырвацца імкнецца.

Ды сталь крышыць — замала ў яе сілы.
Яна прылегла ціхенька ў знямозе.
Прылегла... І, тужлівая, завыла
Па ваўчанятах родных, па бярлозе.

Кранаў за сэрца голас яе слабы,
Хоць ён і з пашчы воўчае выходзіў.
Яна ж праз краты высунула лапы —
Хай хоць яны пабудуць на свабодзе.

## Неадасланы ліст да маці

Пішуць хлопцы лісты дадому —
У студэнтаў ёсць радасць такая...
Я таксама пішу табе сёння.
А нашто? —
Сам сябе пытаю.
Успаміны ж прыйшлі нязвана,
Прыгадаўся мне зноўку час той —
Сустракаў я цябе пасля працы,
Бег на выган хлапчук віхрасты.
І прасіўся к табе на рукі,
Хіба ж ведаць я мог, бесклапотны,
Што гудзелі яны і нылі
Пасля цяжкай
Мужчынскай работы.
Шмат чаго я тады не ведаў,
У пакутныя тыя вёсны:
І каму ты вячэру насіла,
І чаму пакідала кросны;
Хто хаваецца ў нашым склепе,

І чаму ён не прыйдзе ў хату,
І чаго недзе вельмі далёка,
А не з намі жыве наш тата;
І чаго па грыбы ты хадзіла,
Хоць я рэдка еў бульбу з грыбамі;
І што́ ты ў гумно вазіла
На калёсах цяжкіх пад снапамі...
Як вялі цябе ў горад пад вартай,
Зразумець я не мог анічога:
Слёзы... Слёзы...
Сястрычкі галосяць...
А мяне суцяшаюць, малога.
Мне ж і цётка-суседка сказала,
Што дамоў цябе пусцяць уранні...
І хоць слёзы ёй засцілі вочы,
Я не мог не паверыць Ганне...
А калі ўжо слязой перад смерцю
Ты сіроцтва маё абмывала,
Я дзівіўся, чаму гэта цётка
Не сваіх,
А мяне забаўляла.
Пішуць хлопцы лісты дадому —
Радасць светла ля іх карагодзіць!
Я таксама пішу,
Хоць і знаю:
Пісьмы, мама, мае не даходзяць,
Пісьмы, мама, дарог не знаходзяць
Туды, да цябе...

## Сонечны дождж

Ён паліўся... Спорны, шчодры.
Церабнуў па промнях коса,
Зазваніў са стрэх у вёдры,
На двары абмыў калёсы.

Падстаўляюць чашкі кветкі —
Хочуць піць пасля спякоты,
А ільнам, бы нам, няўседкі —
Ліўнем мыюцца з ахвотай.

Веццем-прыгаршчамі клёны
Дажджавыя кроплі ловяць;
Як жаніх, стаіць зялёны,
Чыста вымыты ядловец.

А пасля дажджовай працы
Прыгажосць зямля прыдбала,
Нават сонца прыбірацца
У вясёлку спешна стала.

## Хітрая восень

Невясёлае птаства гамоніць наўкола,
Абмяркоўвае выраю сумныя планы:
Час, напэўна, ляцець — лапкі ржэўем скалолі,
Па лістах ды па пнях дождж бубніць несціхана.

Толькі хітрая восень не хоча застацца
У палях апусцелых без шчэбету птушак.
І яна для падману бярэцца за працу —
Лісце з дрэў абтрасае і полымя тушыць.

Павуцінай іржэўнік замотвае колкі,
І слатою мякчыць пачынае дарогу,—
Можа, птушкі пабудуць з ёю хоць колькі,
Можа, ёй заручыцца з дажджом дапамогуць.

Пачакаць ці ляцець? Каб рашыць гэту справу,
Заспрачаліся птушкі на ўзлётным парозе.
Птушкі, любыя! Тут пасварыцеся нават,
Толькі дружна жывіце ў далёкай дарозе.

## Сонца села

Пасвяці яшчэ крышку, сонца,
Не спяшайся зніжацца да лесу,
Не вядзі за сабою ты вечар
З пераклічкаю жаб на балоце,

З кіслым пахам вады застаялай,
З уздыханнем кароў над травою,
З смачным сном пастуховым на сене,
З мяккім крокам дзядоў каля свірнаў.
А яно ўсё ніжай і ніжай...
Паглядзі навакола, сонца,
Бач, камбайнер нервуецца вельмі,
Клін яму засталося дакончыць,—
А тады б і магло ты садзіцца.
Па дарозе спяшаюць калёсы,
Пад снапамі пакрэктваюць цяжка;
А падлеткі ўсё нокаюць гучна,
Бо ім рупіць да захаду сонца
Звезці бабкі ўсе, што ў калоссе
Загарнулі сухія зярняты.
А яно ўжо нізка звісла...
І нашто адбіраць табе промні
Ад антонавак недаспелых,
Што ўбіраюць цяпло тваё прагна,
Каб сваёй жаўцізною крамянай
Да цябе стаць падобнымі ўвосень.
А яно ўжо вісіць над лесам...
Глянь, дзяўчаты вяртаюцца з поля.
Пра вяселлі ў песнях спяваюць,
Пра спатканні з каханымі мараць,
Яны просяць, каб вечар спусціўся
З салаўінай неўтаймаванасцю,
З сарамліваю поўняй над вуліцай,
З несціханым шэптам бярозак,
З сумнаватым уздыхам гармоніка.
І сонца застыла ў роздуме.
Чуеш, там, за далёкім лесам,
Просяць ранак хутчэй прынесці
І сабраць з каласоў усе росы,
Даць па кроплі жыццю травінкам.
Ды і ў нас на ўсходзе чакаюць
Твайго першага цёплага промня...

Усміхнулася ласкава сонца
І схавалася ціха за лесам.

* * *

Вецер блукаў па садзе,
П'яны вясною роснай,
Вецер пупышку пагладзіў —
Стала пупышцы млосна.

Лопнула ўраз пупышка
Ад маладое сілы.
Светла ды боязна крышку —
Сонца не асляпіла б.

Травы пачулі шорах,
Іх узяла цікавасць:
Ціха паднялі ўгору
Покрыў старой атавы.

Убачыць травінкам трэба,
Чаму гэтак сёння ярка...
Дзівіцца ў чыстым небе
З дожджыкам цёплым хмарка.

Што там з зямлёю стала,
Што гэта там за гукі?
Хмара ў разведку паслала
Дожджык,
На ногі хуткі.

Дожджык паволі агледзеў
Кожны лісток, травінку,
Нават убачыў недзе
Сіняй пралескі хусцінку.

Бліснуў расой на голлі
Калакалушным, язмінным;
Дождж выпіў цяпла даволі,
Потым зямлю пакінуў.

І заспяшаўся на неба,
Каб папярэдзіць хмару:
Снегу страсаць не трэба —
Вясна на зямлі гаспадарыць!

## Лебядзіная вернасць

Яны ляцелі з выраю тады,
Як стрэл дагнаў яго на паўдарозе.
І ён упаў, не ўцёкшы ад бяды,
Сяброўку папярэдзіў у трывозе.

Яна ж над чорнай прорваю сама
Кружыла доўга, змучаная горам:
Нашто жыццё, калі таго няма,
Спакойна з кім пералятала моры.

І горкі сум па сябруку сваім
Яна ў апошнім выдыхнула стогне,
А потым склала крылы —
                                        і за ім,
Як камень,
                  паляцела
                              у прадонне.

## Начны дыялог

— Вунь маладзік прысеў на горку
Каля стагоў...
— Глядзі, глядзі — упала зорка!
— Ну й што з таго...

— Кажу, што менш на небе сведак —
Сама ж мяркуй!..
— Не камячы касынку гэтак,
Пусці руку!

— А бачыш — з саду выйшаў хтосьці,
Сюды глядзіць.
— Ой, не цалуй... Ну, сціхні, Косцік,
Дамоў ідзі.

— Ды то пайшоў ужо каханы
Сястры тваёй.
— А ты не йдзеш, які паганы...
Ты ўсё сваё...

— А вечар! Гэтакі прыгожы
Па-над сялом...
— Ты што, зусім не бачыш, можа,—
Днець пачало!

— І праўда, светла ўжо, Марынка,
Ну, што ж, пайду.
— Ідзеш? А як жа я сцяжынку
Адна знайду?..

## Колішняя сварка

Доўга я заснуць не мог...
Мулка мне было на сене,
Гэтак свежа пах мурог,
Бы ў парні кляновы венік.

Пад страхой, бы ў лазні дух,
Венік млява лісце звесіў...
Адчыняць акно іду
На някратанай завесе.

Прарыпела і сюды
Поўню з вуліцы пусціла.
Нарабіў сабе бяды,—
Не прымусіш спаць і сілай.

Недзе ж грае гарманіст,
Не ўгамоніцца да ранку.
А хлапцы пяюць пад свіст
Пра няверную каханку.

Чэрці... Хоць устань і кроч
На іх песні-весялункі...
Захмялела нават ноч
Там ад шчырых пацалункаў.

Так я і не звёў вачэй,
П'яны быў тады без чаркі.
. . . . . . . . . . . . . . . . . .

Шмат было такіх начэй
Пасля кожнай нашай сваркі.

Што ж рабіла ты ў той час?
Можа, дужа моцна спала?
Жонка кажа мне ў адказ:
— Дурань, я цябе чакала...

## Салаўіная бяссонніца

Месяц у поўныя росы глядзіцца,
Вецер ледзь чутна у лісці шапоча.
Сённяшняй ноччу нікому не спіцца,—
Каму ж пажадаеш добрае ночы?

Чутна, на возеры плёскаюць вёслы —
Дзяўчаты з хлапцамі наслухацца хочуць,
Аб чым салаўі спяваюць за вёскай;
Навошта яно тут — «добрае ночы!».

З кветкі упала расіна са звонам,
Кветка пялёсткамі выцерла вочы...
Ніхто ж салаўю,
яго песні бяссоннай,
Сказаць не асмеліцца: «Добрае ночы!»

## На бацькавых руках

Я сам зайздросціў гэтакім рукам
З мазольнымі, цяжкімі кулакамі:
Іх сталь пякла, студзіла іх рака,
Яны ў пясок крышылі цвёрды камень.

А трэба — дрэва з крэктам упадзе,
Яны гару ў далонях утрымаюць,
І гэтыя вось рукі да грудзей,
Глядзі, дзіцё малое прыціскаюць.

Шкада малога? Выручаць бяжы,
А то яно ў абдымках задыхнецца...
Дзіцё ж у бацькі на руках ляжыць,
Сваім ратком маленечкім смяецца.

## Слёзы маці

Сын прыехаў, хусціну прывёз —
Пасвятлела адразу ў хаце.
Дык чаму ж не ўтрымала слёз,
Дык чаго ж гэта плача маці?

Выглядала з відна да відна
І чакала, нібыта свята...
А цяпер?.. Ці ж не рада яна —
Сын жа ў госці прыехаў салдатам.

Не...
І радасна ёй, а калі б
Усё ішло сваім ладам ды следам,
Трое хлопцаў старэйшых маглі б
За сталом за бацькоўскім абедаць.

Не прыйшлі яе дзеці з вайны,
Не грымець тром чаканым вяселлям...
То ж па вас, дарагія сыны,
Ручнікі ўсё слязьмі яна беліць.

## Далёкія сенажаці

Калі туманы узбоч
Зноў папаўзуць з нізіны
І, прапацеўшы за ноч,
Росы вакол пакінуць,—
Спорна косіць каса.
Калі адап'е прамень
Квасу з касцовай кварты

І ветрык за цэлы дзень
З неба прагоніць хмаркі,—
Добра сохне трава.
Калі і мянташкі ўсе
Ахрыпнуць зусім пад вечар,
Трава надакучыць касе,
А ў хлопцаў заныюць плечы,—
Копы ў лузе растуць.
Калі нават месяца рог
Прапахне мядункам, мятай,
Нанач тады мурог
Сцелюць падвялы, прымяты,—
Спіцца добра касцам...

## Год

Здаецца, ўсё па-летняму было:
Па-летняму і сонца шчыра грэла,
І луг у промнях зыркіх за сялом
Свяціў сваёй чупрынай парыжэлай.

Ды раптам ліст сарваўся —
ўніз,
уніз,
Бы ў сне, скружыў на ссохлае націнне.
Яшчэ...
Яшчэ...
Трапечацца, павіс
Наступны на танюткай павуціне.

Зірнеш назаўтра — вецер-прайдзісвет
Пажоўклыя лісты іржышчам коле,
Куды ні ступіш,
за табою ўслед
Шуміць,
шарсціць,
шаргоча наваколле.

Праходзяць дні...
І вось лісток адзін
Вісіць на ветры, мокры і гаротны...

Зляцеў і ён...
І тут спаміж галін
Прасыпаўся пушок-сняжок халодны.

Ён сыпаў дзень,
другі,
пакуль не змог
Паназмятаць сумётаў ля парканаў.
Укрыў зямлю,
капец
і сена стог
І нават у падстрэшнікі заглянуў.

Ён шчодра сыпаў цэлую зіму
На палазню,
на след зубчатай шыны.
Аднойчы ўсе здзівіліся яму,—
Бы ўлетку, пахлі росамі пушыны.

Падзеўся дзе калючы холад іх,
Яны ў садах п'янілі закаханых
І маладзілі ўдумлівых старых,—
Пялёсткі ўсіх вялі у сіні ранак.

Прайшло і гэта.
Толькі па начах
У жыта часта звальваліся зоры,
Трымаліся у яблынь на плячах
Антоны,
каб не шпокнуцца ў разору.

Ды падалі ў бульбоўнік, білі ў дах,
І з коласа цякло,
як слёзы, зерне,
Камбайнерам не спалася —
шкада,
Што дарагіх зярнят ужо не вернеш.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Спяшаемся з вясны у лета мы,
Зімою веснія ўспаміны грэем.
Не бачым і на сходзінах зімы,
Што год мінуў...
Што мы, сябры, старэем...

## Размова

Слепіць дождж паравозу вочы,
Нават вецер не хоча збочыць.
Паравоз не сціпае разгону
І пытаецца ў цяжкіх вагонаў:
  «Колькі там панасядала,
  Колькі там панасядала?..»

Прарыпелі вагоны: «Пройдзеш,
А свабоднага месца не знойдзеш».
Уздыхнуў паравоз на ўсе грудзі
І пытае: «А што там за людзі?
  І куды яны спяшаюць,
  І куды яны спяшаюць?»

«Гэта хлопцы са службы вайсковай
Будаваць едуць горад новы...»
Кроку ён прыбаўляе — рады,
Што вязе на будоўлю брыгады:
  То да нас у Салігорск,
  То да нас у Салігорск...

І да месца падмеўся давезці
Юнакоў, іх салдацкую песню.
Так і быць, няхай сядзяць,
Так і быць, няхай сядзяць,
  Так і быць,
  Так і быць,
  Так і быць...

## Перад світаннем на будоўлі

Шась!..
  Шууу!..
    Шыы!..—
Гэта ранак ідзе асцярожна,
Па краях катлаванаў шуршыць,
Не грыміць — спатыкнуцца тут можна.

Бух!..
        Шух!..
                Шах!..—
Ноч ад ранку ўцякае віхурай,
То зачэпіць за сценку каўша,
То наткнецца на новы падмурак.

* * *

Не баюся я цяжкай, далёкай хады,—
Рупіць пешшу прайсціся па роднаму краю.
Ах як пахне чабор, колькі сонца тады,
Калі восень сады абтрасае!

Хай і ногі гудуць, хай абколе асцё,
Я пайду, каб да скону запомніць дарогу...
Да крыніцы ж дайду — буду рад, як дзіцё,
Што дайшло ўпершыню да парога.

*З кнігі*

## «ЛІРЫЧНЫ ВЫРАЙ»,

1965 г.

## ЗА НЕБАКРАЙ

### Пачатак палёту

Зямля мая! Маліцца трэба
На твой вянок у ззянні рос...
А недзе там, за сёмым небам,
Рыпіць сузор'яў зорны воз.

Я распраўляю крылы шырай,
Як сын, кажу табе: «Бывай!»
Мяне сабрала ты у вырай
За свой напяты небакрай.

Руку, зазор'е, мне падай!

* * *

Ляжаць на далоні зерні...
Не верне зямля іх?.. Ці верне?..
Чысценькія такія,

Дагледжаныя і сухія;
Іх аддаваць страшліва
Нават зямлі ўрадлівай.

А што, калі сонца не знойдзе
І промень воддаль іх пройдзе?..
А што, як у цёмных нетрах
Не хопіць для іх паветра?..
І яны, нібы рыба на беразе,
Задыхнуцца ў раллі?..
Не верыце?
І не верце, бо нават у жменях,
Як жывыя, варушацца зерні
І ў пальцы дзяўбуць расткамі —
У руках прарастаюць самі...

Расшчапіце хутчэй далоні —
Не трымайце жыццё ў палоне!

## Пра стол

Марозікам пахне капуста,
Жаўруковаю песняй — яблык,
Вераснем — сопкая бульба,
Расой — агурок крамяны,
Селядзец — глыбінёй акіяна.
Сонцам — акраец хлеба,
Ветрам і небам — піва...
А стол пахне добрай вячэрай.

Прыходзь да мяне, свет, вячэраць!

## Начная змена

Я грукаць не буду на працы —
Спіце спакойна, людзі...
Я раблю ўсё так асцярожна:

Спачатку збіраю воблакі,
З якіх дажджы выціскаю,—
Хай чыстымі, свежымі будуць
Дрэвы, дамы, тратуары...
Потым рассоўваю хмары
І неба да бляску глянцую.
А потым усцягваю сонца,
Цягну на свой бок яго волакам,
Як некалі лодкі цягалі...
Крок...
А лямка гэтак жа рэжа!
Крок...
Няма мне ў што ўперціся!
Крок...
Нага... Зноў нага саслізнула!
Крок...
Нялёгкі ён, хлеб бурлацкі!
Крок...
Яшчэ крок...
І вось яно, сонца!
Дзень добры! Уставайце, людзі!..
Толькі цішай крыху захапляйцеся —
Дайце ж хоць задрамаць
Стомленаму чалавеку,
Якому і заўтра волакам
Усцягваць на ваш бок сонца
У начную змену.

## Танец соснаў

Каб сустрэць хутчэй аўтобус,
Сосны выбеглі на ўзлесак
І, як людзі з караваем,
З аблачынкамі на лапках
Запрасілі ў сваю хату
На агледзіны іх казкі.
Гэта казка — танец соснаў:
Мітусяцца яны злева,
Справа — робяць круг шырокі
І, як бы дзяўчаткі тыя,
Так і млеюць, так і хочуць

За спіну другіх схавацца.
А калі карэнне раптам
Пад аўтобус наш трапляе,—
Сосны ўпрысядкі ірвуцца,
Як вясковыя танцоры,
А пасля ў ручай спяшаюць,
Каб абдаць вадою станы,
Разамлелыя у танцы.
Гляньце, гляньце, як галінкі
Засрабрыліся ад пырскаў!..
Толькі позна... Вунь з ускрайку
Нам апошняя сасонка
Памахала сваёй лапкай.
Едзе полем наш аўтобус,
Не ўзнімае ні пылінкі:
Мусіць, хоча азірнуцца,
Каб яшчэ хоць раз убачыць
Танец казачны сасонак.

## Спёка

Духата... Цішыня захрасла.
Як мёд, яе рэж, цягучую...
Глыбока ў званочку краскі пчала ўздыхае сасмаглая,
Жаўранак песню ўпусціў, і тая аб поле разбілася,
Стомлены бусел падскоквае
на патэльні сухога балота,
Камбайны па жыце сноўдаюць —
шукаюць свайго вадапою,
А калі іх з вядра пояць людзі,
без страху сюды збіраюцца
Птушкі, звяры паручнелыя, і кожны глыток яны
лічаць.
А зямля, як гаршчок гліняны, патрэскалася на
кавалкі,
Сама берагамі, як вуснамі,
прыпала да рэк перасохлых
І з прагнасцю з дна высмоктвае
апошнія цёплыя кроплі...
А громаадводаў антэны
ў небакрай углядаюцца пільна —

Кожную хмарку гатовы затрымаць на сваіх
іголках.
І толькі чуваць, як стукае
чалавечае сэрца ўзрушана —
Бы кроплі
буйнога
дажджу.

* * *

І цяпер яшчэ веру я —
ў казак ёсць дом...
Хто не верыць —
за мной, калі ласка!
Паказаць я магу,
як пад кожным кустом,
Нібы коўдрай,
накрыўшыся цёпла
лістом,
Спяць у лесе
упокат
казкі.

## Песні

*Слухаючы Забэйду-Суміцкага*

Зямля,
хоць такая вялікая,
А ўсяго пясчынка сусвету;
А ў песні,
самай кароткай,
Змяшчаецца цэлы сусвет;
У сэрцы ж —
маленечкім жаўранку —
Жыве столькі матчыных песень...

О, ты маеш столькі сусветаў —
Які ты багаты чалавек на зямлі!

## Мова

Бывае,
        спатрэбіцца ўзімку
Промень, не злоўлены летам,
Бывае,
        што мала пахаў
У моры травінак і красак,
Бывае,
        не хопіць колераў
У вясновым квяцістым разліве,
Бывае,
        так мала гукаў
Чуецца ў моры лесу,
Бывае,
        не радуюць песні
Мора крылатага птушак —
Тады я іду да цябе,
Мой акіян вялікі,
У які ўсе моры ўпадаюць,—
Мая адзіная
                мова!

* * *

Пакліч
        да зімы ў адведзіны,
Мая маўклівая дзедзіна,
Пачастуй мяне свежынаю,
Пасядзі ля грубкі са мною —
Раскажы
        свае даўнія былі ўсе,
Пра якія нашчадкі забыліся;
Каб акно,
        ва ўзорах якое ўсё,
Мне здалося тваім слуцкім поясам,
А промні,
        ва ўзоры праніклыя,—
Залатымі затканымі ніткамі...
А затым
        давай, мая дзедзіна,

Ў талаку з табою паедзем мы —
Ты ж за век свой набралася вопыту
Талакой вырашаць свае клопаты.
Я з табой,
мая ціхая дзедзіна,
Раскрычуся на снежных агледзінах,
На тваіх зімовых гулянках,
Дзе запрэжаны вецер у санкі,
Дзе ляціш —
не па ўзгорку крутому,
А па Шару зямному!
Гэта радасць снегу —
адвечная,
Першабытная,
чалавечая;
Пэўна, так весяліліся прашчуры,
І зіму, як зямлю сваю, лашчылі...

Хоць на дзень зімовых агледзінаў
Пакліч
да сябе мяне,
дзедзіна.

## Пехатою ў вырай

Хмаркі лета блытаюцца ў просіні —
Чысцяць пер'е ў вырай і яны...
Колькі розных выраяў па восені
Пачынаюць пошукі вясны.

Нашы думкі ў вырай з імі просяцца...
Захініце, птушкі, іх крылом!
Чалавек — не птушка. Ёсць жа розніца —
Я спяшаю ў вырай пешаком.

Я спяшаю. Лезу па гушчарніку,
Атрасаю кроплі за каўнер,
Да мяне ідуць дубкі ў напарнікі,
Лес грыбамі корміць напавер.

Раптам — сінь тваіх вачэй бясхмарная,
Ласка ўсмешкі — рэху не дагнаць,

Ты ўжо тут? Баяўся, значыць, марна я,
Што ў самоце буду сумавацы!..

Абагрэцца трэба. Трошкі выспацца.
Ты збіраеш будучы агонь:
Па галінцы, промніку, па іскарцы
Ловіш у спагадную далонь.

І касцёр, нібыта з сонца высеян,
Асвятліў аголены прастор,
Ірвануўся ў неба, зліўся з высямі
І змяшаўся з сейвам зыркіх зор.

Над кастрамі полымнымі, шчырымі
Птушкі нават восенню пяюць...
А вясной яны дарогу з выраю
Па кастрах тваіх распазнаюць.

## Лінія гарызонта

Яе адкрываюць дзеці,
Гэтую вабную, як бабуліна казка, нітку,
  Якая злучае зоркі з расою
  І не злучыць зоркі з расою;
  Якая мяшае паветра з вадою
  І не змяшае паветра з вадою;
  Якая звівае аблокі з раллёю
  І не саўе аблокі з раллёю;
  Якая сшывае неба з зямлёю
  І не сшые неба з зямлёю.
У дзяцей пераймаюць дарослыя
Гэтую зманлівую, як матчына песня, нітку,
  Каб адкрываць невядомае
  Тое, што ёсць за домам;
  Каб за ніткай ісці без стомы,
  Некалі выйшаўшы з дому;
  Каб не заседжвацца дома —
  З падарожжаў вяртацца дадому.
  І каб прыносіць дадому
  Сабраныя зоркі за домам.
Ах, гэтая зменлівая нітка!
Вечна яна дражніцца новымі небасхіламі!

* * *

Зноў я сцежку шукаю ў тую краіну,
Дзе жыве непасрэднасці вечны закон,
Дзе звычайная бочка вуркоча машынай,
А лазовы дубец — твой няўрымслівы конь...

Сын, я сцежку шукаю ў тваю краіну.

## Сінягорыя

Ёсць летуценні сінія —
Сіней ад аснежаных ранкаў,
Краіна ёсць — Сінягорыя,
Прывезеная на санках.

Над ёй галаруч завіхаюцца
Па вушы мокрыя дойліды,
Рукі ў кішэнях грэюць,
Калі пальцы ад снегу зойдуцца...

Мараць у снежных сценах,
Мараць у белых палацах,
Якія жывуць толькі ў казках,
Сівым архітэктарам сняцца.

Калі спаць прымушаюць дойлідаў —
У парках, нібы ў музеях,
Сумаваць без іх застаюцца
Напаўразбураныя калізеі.

Імі ўсю ноч любуюцца
Паклонніцы і паклоннікі —
Іх снежныя бабы вартуюць,
Як белага дойлідства помнікі.

Як летуценні светлыя —
Святлей ад аснежаных ранкаў —
Берагуць яе,
                    Сінягорыю,
Прывезеную на санках.

## Маналог мядзведзя, які пасля першай спячкі выйшаў з бярлогі

О, як гэта ноч надакучыла,
Доўгая, быццам бы пушча,
Цёмная, нібы бярлога...
Колькі я сноў перасніў,
А ў снах пераеў маліны
І пераласаваў мёду —
Аж цяпер яшчэ горка ў роце.
Нарэшце прачнуўся!..
Толькі
Што гэта вочы так рэжа
І ніяк не даецца панюхаць?..
Ага!
Гэта ж сонца, якое
Пахне чамусьці знаёма —
Нагрэтаю поўсцю. Штосьці,
Нібыта прамень, няўлоўнае
(Ніяк не магу здагадацца!)
Мой нос прыемна казыча...
А каб ты жыў быў! То ж вецер,
Што пахне ільдзінкамі крохкімі,
Снежнай вадой і зямлёю
Адталай.
Мусіць, ён з хмелем,
Бо як нюхнеш яго толькі —
Адразу ў бакі так і водзіць...
Ціха!
Нейкія дзіўныя гукі?..
Уцякаць?
Але ж не! Здаецца,
Небяспекай навокалле не пахне.
Дык хто ж тады там балбоча?
Зірну!..
То вада размаўляе!
Мне ж якраз усю ноч і хацелася
Піць!..
Каб прагнаць гаркату тую,
Што засталася ад мёду,
Якога гэтулькі пераеў я
У сне...

* * *

З разамлелых пупышак
Выпырхнулі неяк раніцою
Мільярды зялёных птушанятак.
Абселі яны галінкі
І залопалі кволенькімі крыльцамі —
Мусіць, хацелі зляцець на зямлю.
Ды збаяліся...
Так і засталіся яны на дрэвах сядзець да восені
І спяваць сваю зялёную песню...

## Карэнне расы

І ў расы ёсць карэнне.
Я гэта сцвярджаю,
Бо глядзеў, як збірае яе салавей —
Па расіне,
Бы ягады, ён адрывае
І, упаўшы на хвост па-гусінаму,
П'е.

І ў расы ёсць карэнне...
Дзе ж тая сцябліна,
На якой даспяваюць ягады рос?
Павучынка, травінка?
А мо нават промень,
Што, як дзіда, ўдзябнуўся ў зямлю
І прарос.

## Блакітная геаграфія

Такія знаёмыя
Чыстыя воблакі —
Дзяцінству майму, маім верасням помнікі.
Дзяцінства...

Старэйшых званкі ў школу клікалі,
А я вывучаў тады кнігу блакітную.
Яблыкі рвеш,
А зірнеш толькі ўгору ты —
Неба ўбачыш кнігай разгорнутай;
Едзеш на конях —
Аблокі гартаюцца.
Чытаеш:
Вунь моры,
Вунь горы ўзнімаюцца...
Дзяцінства...
І зноў я застыў і не дыхаю
Перад вялікай блакітнаю кнігаю.
І сярод дзіўнай такой несусвеціцы,
Між воблак,
Указка географа свеціцца.
Боцікам,
Бачу,
Ніяк не нахваліцца
Модніца свету —
Паўвостраў з Італіяй;
За ёю спяшае
Такая галантная —
Белай ільдзінкай іскрыцца Грэнландыя;
А вунь ужо іншыя воблакі сцелюцца:
Пяскі узняліся,
Над Афрыкай сеюцца;
Шукаючы берагу,
Коцяцца ціха так
Валы
З акіяна ўтрапёнага —
Ціхага...
Два воблакі — тыя ж паўвостравы шэрыя,
Бы іклы, тырчаць з цэлай хмары —
Амерыкі.
А воблакі рояцца,
Воблакі рояцца —
Новыя контуры мрояцца,
Мрояцца...
Раптам зрабілася ўказка пытальнікам.
Географ заблытаўся...
Гэта ж батаніка!
Паказвае грыб мне,
Што ўзняўся над горамі,

Грыб,
Пра які з адчаем гаворым мы...
Уцякайце хутчэй,
Мае мілыя воблакі —
Дзяцінству майму, маёй радасці помнікі!
Гэта ж забойства,—
Крычу вам са страхам я,—
Гэта ж замах на усю геаграфію!
Няўжо можа стацца,
Што будзе сасватана
Смерцю зямля наша з бомбаю атамнай?
Няўжо прарыпіць сваёй воссю надломленай
Глобус Зямля
І спыніцца стомлена,
Быццам гадзіннік,
                    людзі?
Людзі!

. . . . . . . . . . . . . .

Не, такога не будзе!
Не будзе!

## Брацкая магіла

Здаецца, што дрэвы няўмела
Над ёй абдымаюцца ўпотай;
Здаецца, цалуюцца кветкі
Засмяглымі, прагнымі вуснамі;
Шэпчуцца, шэпчуцца травы,
Быццам вясною каханыя,
Бо травы,
          і кветкі,
                    і дрэвы
З каханняў няздзейсненых выраслі,
З маладых салдацкіх жаданняў,
Якімі праз дрэвы,
                    і кветкі,
                              і травы
Мёртвыя ў вечнасці трызняць.

* * *

Спяць у снарадах,
Спавітыя белаю, як сама смерць,
Сталлю,
Пакручастыя віхры,
Аглушальныя грамы,
Пажары, вулканы і землетрасенні...

Спяць чалавечыя крыкі,
Спяць адкрытыя вочы,
Спяць бяссонныя месяцы,
Спяць сусветныя жахі
Ва ўпакоўцы сталёвай...

Не будзіце іх, людзі!

* * *

Сэрца —
то спрасаваны стагоддзямі порах,
Міна незразумелай дакладнасці:
Бывае, не разрываецца ад вялікага гора,
А ўзрываецца ад маленькай радасці.

## Пейзаж з чалавекам

Гэткае дрэва!
Яно зямны шар захапіла карэннямі
І, нібы мяч у сетцы, здаўна яго трымае...

Макавіна якая!
Жылплошчы ў ёй хапае для ўсіх абяздоленых птушак,
І песням іхнім, і песням птушыных унукаў і праўнукаў.

Пад страху ягоную
Спяшаюць, ідуць адусюль суніцы, лісіцы, баравічкі,
Людзі, ночы, ваўкі, русалкі і нават сонцы.

Пад ім знаходзяць:
Сумныя — песню, галодныя — харч,
скалелыя — зацішак...
Шчодрае,
вельмі шчодрае гэта зялёнае дрэва-гасцініца.

Хто толькі яго пасадзіў: суніцы, грыбы, ваўкі?
Ці птушкі?..
Ці сонца?..
Ці чалавек?..

* * *

Заходзіць яблык —
Чырвоны і вялікі, быццам сонца ў садзе заходзіць.

Усё ніжэй і ніжэй
Згінае ён галіну, якая трымала яго ў самым зеніце.

Усё хутчэй і хутчэй
Коціцца ён па зялёным небасхіле дрэва.

Заходзіць яблык...
І трава — гарызонт ягоны — становіцца гэткаю
блізкай...
Падстаўце рукі!
І ў іх скоціцца, апёкшы далоні, гэтае спелае сонца.

Глядзіце не апячыцеся,
Калі пыркі, як промні ля сонца, навокал яблыка
ўспыхнуць.
Засмяглымі вуснамі
Прагна лавіце промні — гэты дарунак зямлі і неба.

А калі падужэеце,
Выпіўшы ўвесь круглабокі кубак, да краёў
напоўнены промнямі,
Закасвайце рукавы
І рабіце гняздо ўтульнае пад наступныя,
большыя сонцы.

Няхай узыходзяць новыя яблыкі!

## ВЯРТАННЕ

* * *

Каб неба
цябе не загушкала,
Каб зямля
не калола
бyльнікам,—
Верш! Ляці
раскальцованай птушкаю:
У цябе —
ўвесь сусвет пад крылямі.

* * *

Думкі чалавека —
вы працяг
Нейчых недаходжаных дарог,
Нейчага кароткага жыцця,
Што сусвет
прадбачліва збярог.
Думкі чалавека —
вы святло
Зор,
што змоўклі рана ў вышыні.
А святло стагоддзямі ішло
І дайшло —
зноў зоры запаліць.

* * *

Пасля расставанняў з ёю,
абжытай,
Мы гэткай
нашу планету запомнім:
Зямля —
зялёнае сонца
З травою —
зялёнымі промнямі.

## Коні на праспекце

Па коўзкім праспекце коні непадкаваныя цокалі:
У вітрыны глядзеліся,
Вывучалі шэрыя цокалі,
Абнюхвалі зводдаль
Сталоўкі
І крамы парфумныя,
Дзівіліся — ведама, коні! — на тратуары тлумныя.
А каб яны не парушылі
Руху агульныя правілы —
Імі, нібыта машынамі,
Рэгуліроўшчыкі правілі.
Толькі ж буланых цягнула
Да зяляніны скверыка кожнага,
Дзе гэтак звыкла пахла
Лугам,
Расою
І пожняю.
І тады, канюхам насуперак, іржалі яны прарэзліва,
Паставы злаваўся і лаяў:
— Но, ідзі, ваўкарэзіна!
Коні тут — дзіва.
І дзеці спяшаюць гурбою звонкаю,
Як некалі ў вёсцы бегалі мы за старымі трохтонкамі.
Сам бы, здаецца, пабег пад музыку конскага цокату,
Але...
На галаве капялюш, жонка таксама пры боку тут.
А ў хату пад вечар зайшоў —

Якою здалася цеснаю
Яна,
На шпакоўню падобная, калыска мая трохмесная:
Лягла на ўсю хату тахта,
Крэслы расселіся грэбліва,
І нельга па хаце прайсці,
Нібы ў магазіне мэблевым...
А вось ужо мроіцца луг
Шырокай пахучаю краскаю.
Па сена я еду.
Вішчаць
Колы, што трызняць падмазкаю...
А вось тыя самыя коні,
Што па праспекце цокалі,
Бягуць па дарозе лясной —
Вязуць мяне ў вёску далёкую...
Мама...
Яна наліла крупніку місу вялікую,
І загарэлы
З-пад ручніка на мяне ўжо бохан
Зіркае,
Які мною зернеткам кінуты,
Рукою маёй дагледжаны,
Мною ў млыне змелены,
Маці маёю спечаны...

* * *

Вось яна, піраміда
Падарункаў на наваселле:
Самазадаволеныя, як індыкі, самавары,
Насцярожаныя, як жырафы, таршэры,
Запыленыя пыласосы...

Мы ж, радасныя,
Не можам адвесці вачэй
Ад адной сарамлівай кветкі,
Якую нехта прынёс,
Не атросшы нават расіны,
Не спудзіўшы нават пчалы,
Што заюшылася на працы...

## Хвіліна сустрэчы

Жанчына дзяліла сонца —
Пароўну кожнаму коласу;
Яна стаяла сівая
У сваім у бабіным леце...
Я падышоў...
— Дзень добры!—
Яна мне ласкава сказала.

*Яе рукі*

Яны — нібыта мужчынскія:
Гэтак умеюць ціснуць,
Але ўмеюць і лашчыць,
Агрубелыя гэтыя рукі,
Высліжаныя аб цапільны,
Аб касільны ды тапарышчы,
Што ў іх, як у тое люстэрка,
Можна усім глядзецца!

*Яе вочы*

Гэтулькі, гэтулькі промняў
Плёскае ў іхнім блакіце.
Іх многа. Іх, можа, столькі,
Колькі ўсходаў і захадаў
Вочы страчалі ў полі...
Яны многае ведаюць,
Яны многае бачылі,
Гэтыя сведкі блакітныя,
Якія запамінаюць гісторыю
Зямлі, чалавека.

*Яе валасы*

З-пад паркалёвай хусткі
Выбіваюцца белыя промні —
Іх сонца бяліла з палотнамі,
Яно працавала над гэтым
Сотню чэрвеняў, ліпеняў, жніўняў —
Аж пакуль назаўжды не змяшаліся
Промні сонца з белымі промнямі...

*Уся постаць*

Свеціцца... Ласку праменіць...
Дык гэта ж сапраўднае сонца,
Што сабрала гэтулькі промняў
На руках,
у вачах,
пад хусткай!

— Ну, дзень добры, сівое сонца —
Бабка Алеся!

## Вітаюцца кавалі

Ці бачылі вы,
сябры,
калі,
Як вітаюцца кавалі,
Як за рукі
здароўкаюцца кавалі?
Падаюць яны ў руках грамы,
Ад якіх жахаемся мы:
Варочаюцца паміж далоняў яны,
Нібы
вялізныя валуны.
Імклівых маланак
сцішэлы рой
Нясуць тыя рукі з сабой.
Бярыце маланкі ў сваю далонь —
Ён ручны ўжо,
хаця і агонь!
Рукавіцы скідайце хутчэй,
Каб руку каваля ўзяць лаўчэй,
Якой прыручае каваль
І грамы,
і маланкі,
і сталь.
Кавалі вашы рукі ў свае бяруць,
Як кувалды
цяжкія
бяруць.

А калі вы малую руку падалі,—
Ушчэнт бянтэжацца кавалі...
Ці бачылі вы,
сябры,
калі,
Як вітаюцца кавалі,
Як за рукі
здароўкаюцца кавалі?

## Споведзь

Пасівелы мой лес,
Я твой вечны палоннік,
Я твой вечны даўжнік,
Прад табой на каленях стаю.
Я спяшаў да цябе,
Як спяшае стамлёны паломнік,
Каб паспець, каб данесці
Няхітрую споведзь сваю.

1

Я люблю цябе, лес,
За тваю чалавечую шчодрасць,
Калі ты накрываеш
Абрусам паляны-сталы,
А на іх высыпаеш
Зялёныя поўныя вёдры
І суніц, і чарніц,
І грыбкоў — карапузаў малых.

А калі на рабіну
Наніжаш пляцёнкі караляў,
Журавінныя лямпачкі
У імхах пазапальваеш ты —
Аглядае вавёрка арэхі.
Што ў цябе панакрала,
А барсук для пасцелі
Тралюе сухія лісты.

2

Не люблю цябе, лес,
Калі многа няшчасцяў прарочыць
Усім тваім жыхарам
Твая сонцам напятая ціш.
Ты ж зялёную шапку
Насунуў на самыя вочы,
Каб нічога не бачыць,
І гэтак зацята маўчыш.
Ты схаваў у галлі
Дзюбу ястраба злога,
Што цікуе за зайцам —
Нявіннай лясною душой.
Сук падставіў пад стрэльбу,
Каб зноў ад ласінага рога
Не бярозкаю пахла,
А порахам пахла ужо.

3

Мне шкада цябе, лес,
Пашчапаны вайною,
Тваіх ран, што на непагадзь
Шчэ і сёння гудуць...
Мне шкада тых бярозак,
Якіх раняць кожнай вясною,
А людзі іх слёзы
Збіраюць у жбан, бы ваду.

Мне шкада, калі сосны
Паміраюць заўчасна,
Расстраляныя вострай
Падсочнай стралой;
За цябе мне, мой лесе,
Неяк робіцца страшна,
Калі кожны твой пень
Выглядае магільнай плітой...

4

Я люблю цябе, лес,
Як зямлю перад кветам,
І злую на цябе,

Бы на восеньскі сум,
І шкада мне цябе,
Быццам зжатага лета,
Ты патрэбен мне, лес,
Як спачынак касцу.

* * *

Горад мой
У чарзе адной —
П'е, спацелы, ваду...
Адрывае падэшвы асфальт —
Растапіўся ад сонца гэтак.
Я іду,
Ледзь цягнуся —
Маю хаду
Закавала ў спякоту лета.

Стой, аўтобус! Спыніся, брат!
Я з табою...
Я буду рад,—
Завязі мяне
Пад вадаспад,
Вадаспад цішыні,
зеляніны
і кветак...

## Зялёнае воблака на рынку

Бярыце, людзі,— я вам прывёз
Вятры, травінкамі закалыханыя.
Вось перад вамі паўнюткі воз
Салаўіных песень, што з лугу сабраныя.

Бярыце веснюю радасць маю —
Май, што водарам красак успоены.
Бярыце. Я з краскамі мёд аддаю —
Ён на гудзе пчаліным настоены.

Я прывёз у горад, дзівак,
Росных захадаў ціхія водбліскі.
Спрачацца не будзем — бярыце за так
Усё зялёнае летняе воблака —
Воз духмянага сена!

## Лірычны ўспамін

Пачужэлы прыехаў у госці,
А малым сюды бег — дадому,
І хукала старая хата
На мае азалелыя пальцы,
Расцірала збялелыя вушы
І, за стол мяне пасадзіўшы,
Усміхалася добрымі вокнамі.

Не, яшчэ не забыўся я, хата,
Як любіла ты лашчыцца печкай,
Дзе грэліся бабчыны казкі,
Дзе за комінам сны хаваліся
У валёнках калматых бацькавых,—
Яны пахлі апілкамі, лесам...
Тут жа грэлася маці з марозу
Перад тым, як мяне ўзяць на рукі.

Я вясёлыя дні твае помню,
Калі цяжка было загнету
Ад каструль, чыгункоў пузатых,
Калі радасна печка смяялася
Сваім шчырым старэчым ротам;
А калі яна хлеб ружавіла —
На пах адусюль зляталіся
Сарокі да нашага коміна.

А было ў цябе і такое,
Калі пахла ты бульбай гнілою,
Калі стравы былі з крапівы ўсе —
Не стрыкае пякучка ў голад!
Калі печ вінавата глядзела,
Халоднай закрыўшыся засланкай,
Калі міскі і лыжкі маўчалі,
Хоць чакалі мы іхняга звону.

Я цябе і заплаканай помню,
Калі бацька з табою на ростань
Падаваў нам звязаныя рукі,
Што, як крылы, ў вяроўках біліся...
Паніжэла вянцоў ты на пару,
Пастарэла гадоў на дзесятак
І, вуглы ў кулакі сашчапіўшы,
Пагражала вінтоўкам чужацкім.

Я цябе не сустрэў, мая хата,
А мяне прывітала тут новая,
Са страхою, заломленай горда,
Са сцяною — наўсцяж у вокнах,
Нават з люстрай замест газоўкі
І са столлю — свежым жаўточкам,
На якой не лічыў я дошак
І не знаю сучка ніводнага.

Тут схаваны пляменнікаў казкі,
Тут дурэюць іхнія гульні...
Не крыўдуй, мая родная хата,
Якая была маёй нянькаю,
Якая была мне калыскай,
Што сюды я прыйшоў, як дадому,
Хоць прыехаў толькі у госці...

Гэй, пасуньцеся, успаміны,—
Дай жа месца ў сваім застоллі,
Новая хата!

## Уваходзіны ў паэму

Эпіталама

*Верасню прысвячаецца*

Хвала яму, жоўтаму свату,—
Сягоння ў нас уваходзіны:
У новую, незвычайную хату
З табою нясмела ўваходзім мы.

Тут сцены — закрытыя вочы.
Страха ўся з лістоты сатканая.

І ложак — пінжак мой святочны
На кветкі пасланы, каханая.

Дык пойдзем хутчэй жа, мой голад,
Куды ты захочаш, харошая...
Рыпіць і пяро і голас:
«Са шлюбам законным! І грошы з вас...»

Ах, рэгістратар! Усмешкі хоць трошкі
Адпусціце без плана для радасці...
Але ён, нібы скнара грошы,
Усмешкі схаваў: ці не ўкрадуць іх?

І сябры з такой жа гаворкай:
«Ад імя, з даручэннямі вуснымі...»
Што ж, я сам сабе крыкну: «Горка!»,
Каб напіцца тваімі вуснамі!

Дык пойдзем хутчэй. Нас чакаюць
Невядомыя уваходзіны...
Я паэмай яго называю,
Гэты храм, куды ўваходзім мы.

У паэме будуць, няйначай,
Свае адступленні лірычныя:
Першы сын неўзабаве заплача,
Першы ўнук падасць голас зычны нам.

Цяпер жа глядзіць з-пад далоні
І чакае даўно нас Верасень...
Жоўты ліст,
жоўты лес,
жоўты промень
І радасць, як сонца, уперадзе.

Жоўта... Не любіш?.. А я дык рады,
Што промняў столькі намолата...
Кажуць: жоўтае — колер здрады.
Не вер! Гэта колер золата!

Па жоўтай дарозе ідзём мы
У залатое вяселле звонкае...
Смялей жа ступай у паэму
Маёю
вечнаю
жонкаю.

* * *

Мы стаім у зялёным маі —
Недалёка ад нашых студзеняў,
Так далёка ад жоўтых верасняў,
Шчэ далей ад сваіх лістападаў,
Адкуль ужо стануць нам бачны
Нашы сівыя
ціхія снежні.

Мы стаім па калені ў красках,
На якія вёсны так шчодрацца.
Мы глядзім,
як цвітуць нашы яблыні
І красуюцца першаю завяззю,
Якую спяліць нам да восені,
Покуль завязь
не выспее
яблыкам.

Мы смяёмся,
зялёныя дрэвы,
У сваіх макавінах не бачачы,
Аніводнага ліста пажоўклага,
Які б нам пра восень напомніў;
Мы смяёмся
і краскі раскідваем,
На якія не шчодрыцца восень.

Мы смяёмся.
За смехам не бачым,
Як махаюць дні крыллем над намі,
Над зялёнымі нашымі кронамі,
Над бурнымі нашымі маямі,
Покуль часу крыло не збівае
Першы ліст —
неспадзёўкаю першаю.

Вось тады мы і заўважаем,
Што не мы ўжо стаім у маі,
Што смяюцца пад нашымі кронамі
Маладыя
зялёныя дрэвы —
Нашы дзеці.

## Успомненая дарога

Дарогу забівае чыхаўка
Ад пылу,
Што ўзнімаюць босыя ногі бежанцаў:
Старэчыя — у пухлінах,
Жаночыя — у ранах,
Дзіцячыя — у крыві...
Яна з першых дзён аглухла
Ад гэткага ляскату колаў
І адчайнага ляманту
І чуе цяпер толькі адзін дзіцячы крык,
Адзін крык:
— Хачу есці!
— Хачу піць!
— Хачу пасядзець!

Дарозе цяжка.
Яна выгінаецца, выкручваецца, уецца:
То так дапаўзе да рэчкі,
Што з берага можна ўхапіць кроплю вады
жаданай,
То ўбачыць на небасхіле маленькую
дажджавую хмарку —
і да яе
да яе,
да яе...
То зверне ў лес,
У цянёк,
Пад вялікі зялёны парасон,
То здалёк убачыць крамяны баравічок —
і да яго,
да яго,
да яго...
То ўпрэцца раптам у чырвоны куст малінніку...

Ешце, дзеці... Ешце...
Дарога гэтак стараецца.
Для вашых шчаслівых сноў,
Перарваных вайною
На самым цікавым месцы...

* * *

Ужо аб вайне не могуць
расказаць маладзенькія таты —
Бянтэжацца перад сынамі...
А ў свеце з часоў яшчэ тых
Накрываюць пустое месца
на ложках спрасонку салдаткі,
Як інвалід па звычцы
сціскае рукаў пусты.

## Заканчэнне палёту

О, светлы боль сустрэчы шчырай!
Як сын, кажу я:
«Сустракай!»
Я зноў вяртаюся.
І вырай
Табе вяртаю, матчын край.

А недзе там, дзе неба мгліцца,
Рыпець застаўся зорны воз...
Зямля!
Вярнуўся я дзівіцца
На твой вянок у ззянні рос.

Дзе гэты вырай спеў і рос.

*З кнігі*

«ДЗЕНЬ»,

---

1968 г.

## МЕЛОДЫЯ ПЕРШАГА ПРОМНЯ

### Запрашэнне ў раніцу

Там
Да хрусту ў галінах
Пацягваюцца спрасоння бярозкі
І атрасаюцца ад імху і лісця
Баравікі.

Там,
Паколаты яловымі лапкамі,
Выходзіць з лесу густы туман,
Якім накрываліся зайчаняты
Ноччу.

Там
Спрабуюць галасы птушкі
І настройваюць на вясёлую песню
Свае адсырэлыя за ноч
Жалейкі.

Там,
Нібы тварык твайго смяшлівага сына —
Ружовага ад палётаў у сне,—
Выглядвае, як з-пад коўдры,
з-за лініі гарызонта
Сонца.

Спяшайце
У ціхую раніцу гэткую
Усе, хто хоча пачуць,
Як, слізгануўшы па расіне, звініць
Першы промень.

## Світальнае

Зямля!
Напаўняй свае соты —
Лугі і палі —
Гулам работы,
Пахам раллі
І потам.

Час медазбору
Трывожыць дзень.
У ячэях палёў тваіх
Скора
Чалавек загудзе.

## Пачатак

Як страшна ўсё-ткі, мусіць, нараджацца
Нам з цемрыва ды ў акіян святла,
Дзе непазнаныя шчэ рукі мітусяцца
Па шырыні
бяскрайняга стала.

Над намі нагінаюцца, як поўні,
Усмешкі незнаёмых нам людзей.

І хаты —
неабжытыя шпакоўні —
Мы позіркам ніяк не абвядзем.

І штосьці невядомае
у горле
Качаецца,
як кропля,
як туга,
Пакуль яго мы ў слова не аформім:
— Куга!
— Куга!

## Малітва над калыскаю

Слухай, сыне мой,—
Здарыўся цуд:
Ты з'явіўся на гэты свет
Па волі сапраўднага Бога.
Не крыўдзі ж яго ніколі,
Любі яго,
Веруй у яго,
Маліся яму заўсёды —
Ласкавым яго рукам,
Шчырым яго вачам,
Поўным яго грудзям,
Бо гэты Бог —
Твая маці.

## Патоп

Скавышамі прапахлы,
Бацька прыехаў на полудзень.
І ў хаце — адразу патоп...
Першай адчула гэта кошка.
Яна замітусілася, замяўкала
І пачала да чагосьці падазрона прынюхвацца.
Потым,
Затопленыя па самыя макаўкі,

Зарадаваліся дзеці
І забегалі па хаце.
Затым, услухаўшыся,
Захвалявалася малое ў калысцы —
Да яго дайшло толькі цяпер.
Дабраўся патоп і да самога бацькі,
І той з асалодаю зафыркаў,
Нібы купаючыся...
А хату ўсё затапляла і затапляла.
Хутка патоп прасачыўся і затапіў сенцы.
І вось ужо праз шчыліны з хаты,
Як з дзіравай лодкі,
Цэдзіцца ён на вуліцу...
Затапляе дрэвы,
Сінічак на іх,
Падымаецца пад самыя воблакі
Гэты прыемны патоп —
Пах капусты, шкваркі, куляшу, каўбасы.
Аж свярбяць насы ад такога патопу,
На які раздобрылася сялянская печ...
А ў хаце —
Як збавенне,
Як выратавальны круг,
Бацькаў загад:
— Дзеці, за стол!

* * *

Пушчу турбуе клопат адзіны:
У пушчы радзіны.
На гэтай зялёнай птушынай планеце
У кожным гняздзе нараджаюцца дзеці.
Цесна ў шкарлупках —
Сціснуты плечы,
Быццам у цэлях, закутых навечна.
Чуеце,
Кволыя стукаюць дзюбы?..
Гэта упарта,
Бы камнярубы,
Працуюць нядаўнія эмбрыёны,
Акно прабіваючы ў свет зялёны.

І ўсё ж паддаецца бетон шкарлупіны —
У пушчы радзіны!
Малечы выходзяць на свет.
І са стомай
Падаюць на абломкі нядаўняга дома...
Вятры!
Іх калыскі пагушкаць варта —
Хай адпачне стамлёная ўпартасць.
А вунь зверанё сваю маці шукае —
Цёплаю пыскаю свет аглядае,
Пакуль яшчэ не адкрыліся вочы:
Малое знайсці сабе ежу хоча
І палохаецца,
Наткнуўшыся на травіну,—
У пушчы радзіны.
І аляняты,
І зубраняты
Пакуль на траве ляжаць вінавата,
У зямлю, што выслізгвае, кволыя ногі
Натужна ўпіраюць —
Да самай знямогі:
Зямлю адпіхнуць настойліва хочуць,
Каб самім на ногі ускочыць...

І стрэльбы долу
Апускаюць рулі нявінна —
У пушчы радзіны!

* * *

Калі
Заблытаецца ў тваіх валасах вясна,
Нібы промень у гранях самацвета,—
Табе робіцца вельмі лёгка.
І ты бяжыш па зямлі,
Быццам па лёгенькаму барабану дзіцячай качалкі.
А зямля пачынае хутчэй круціцца
Насустрач табе,
Слухаючыся
Нават самага лёгкага дотыку
Тваіх шурпатых ног...

## Імпрэсія

Аж сівее —
                    так пеніцца за кармою вада,
Рыбацкая лодка ляціць пад ветрам.
Няма на ёй ветразяў —
                                        не бяда, не бяда:
У мора нясе рыбака барада —
Сівы ветразь.

* * *

Мы цяжка ходзім па зямлі,
Нагружаныя, бы саставы...
— Табе, зямліца, не баліць,
Як мы твае дратуем травы,
Як вязнуць колы у раллі,
Як плуг цябе скрылюе ржавы
І як машыны, бы чмялі,
Гудуць у восеньскіх канавах?

І ўсюды ногі, ногі, ногі...
Нібы цапы пры малацьбе,
Без жалю топчам мы цябе —
Аж прагінаюцца дарогі,
Як тыя кладкі пры хадзьбе.
А мы ідзём, ідзём сабе...

Балюча, мусіць, вам, дарогі?
— Ды не, смялей ступайце, ногі!

* * *

Трава — мядзведзь мядзведзем.
У яе,
Як у мядзведжую поўсць калючыя дзяды,
Паўпіваліся пчолы...

Маленькія мсціўцы!
Вы памыліліся —
Гэты мядзведзь
Не разбурае вашых вулляў,
Хоць і прапах увесь мёдам;
Бачыце, ён нават не ўмее раўці
І махаць лапамі...

## Птушаня

Як чаканне,
                    доўгае дрэва —
Ніяк да гнязда не дайсці,
Хочаш не хочаш —
                              заблудзішся
У яго несхадзімым лісці.

А побач — пранізліва сочаць
За табою кацінья вочы.

І трэба ж было адысціся так —
Далёка цяпер уцякаць...
А крылы
                адно замінаюць,
Калі ты не ўмееш лятаць.

І хочацца, хочацца плакаць —
Побач каціныя лапы.

Цяпер трэба, мусіць, трымацца
І бацькоў клікаць,
                              каб памаглі...
Спатыкнулася
                    і паляцела
Спалохана
               ўніз
                    між галін.

Праляцела — так удалося —
Пад самым каціным носам.

Хутка зямля...
Ды нешта не падае
Яно на тую зямлю.
І крылы ўжо не чапляюцца —
Усё далей ад дрэва нясуць,
Дзе кот з раскапцюранай лапай
Ад злосці гатовы заплакаць.

* * *

Нібы бліскавіцы белыя,
Сок застукаўся ў голле з сілаю,
І, калісьці такія нясмелыя,
Чырванеюць дзявочыя сны...
Лопаецца
недзе за небасхіламі
Сонца—
пупышка вясны.

## Паядынак

Неба — блакітны звон.
А ў ім, як падвешаны, жаўранак
Б'е ўтрапёна маленькімі крыльцамі
Па крыштальных сценках.

І неба — вялікі звон —
Не вытрымлівае гэтага паядынку з жаўранкам,
Раскалыхваецца і тонка звініць,
Як сама раніца...

Тады з неба — глыбокага звона —
Горда падае стомлены жаўранак.
А за ім доўга яшчэ
Асыпаецца, як лісце з дрэў,
Яго песня...

## Настраёвы эцюд

Быццам светлыя трубы аргана,
Ледзяшы звісаюць са стрэх.
І ліецца матыў вясняны
З аргана
Адразу ў снег.

Кап...
    кап...
        кап...

Капяжу застылыя гукі
У марознай аціхнуць цішы —
Можна браць тады ў цёплыя рукі
Гукі,
Злоўленыя ў ледзяшы...

* * *

Мая хата ўзімку расянай палянай зрабілася —
Да мяне, нібы ў лес, столькі птушак пагрэцца
Набілася;
І забілася ў цесным пакоі
Птушыная песня, бы ўвесну,
І садзілася песня на шторы, на крэслы,
                                        падвескі;
Затрымцела, заціנькала, засвістала, зачэкала,
Забулькацела, запінькала, засакатала,
Быццам хацела аглушыць яна некага...
Цесна ўжо стала
Адагрэтай
Песні гэтай
У голым,
Прыдуманым мною лесе,
У кволым куточку лета.

Дзяўбе іголка пласцінку
Панура, але ста        ранна,—
Пласцінку, нібы лісцінку, маю дарагую
                                        паляну.

Шукае старанна, дзюбай шукае
Згубленыя на пласцінцы дзесьці
Песні
Даўняга
Мая...

## Цнатлівы жарт

У лесе мы з табой.
І блізка хоць,
аднак
Якая ўсё ж недасягальнасць — твае вусны!
Цнатлівасць лесу,
памажы ты нам...
А за кустом сучок, як промень, хруснуў...

Зачырванелася ты сарамліва ўся.
Пытаюся — чаму?
Сумелася і шэпчаш ціха:
— Ты ведаеш...
Ты ведаеш...
Ну, як табе сказаць?..
Там заяц па...
пацалаваў зайчыху...

## Полюс цішыні

Свіціцца цішыня няўлежанага снегу,
Нібыта страказінае крыло.
І разбіваецца раптоўным нашым смехам,
Як возера спакойнае
вяслом.

Спяшаемся у казку мы з табою,
Праз снежны вір acцішаны ідзём,
Дзе вецер завірухі супакоіў —
Утаймаваліся,
заснулі нават днём.

А мы нясём сагрэтыя усмешкі
І ў снягах не тонем — ані-ні,
Бо лыжы —
нашы вузенькія сцежкі
І кладкі цераз снежнае бязмежжа —
Імчаць далей,
на полюс цішыні.

## Санет кахання

Чаго саромецца,— ты ж у маім санеце,
Як у аазісе закінутым, адна,
Надзейна ахаваная штодня
Ад цынікаў, якіх нямала ў свеце.

Ты мне здалёк, каханая, відна
На беразе нясходжанага лета.
Адзенне ўсё тваё — вяночак з кветак
На галаве, нібыта цішыня.

О ява маіх вечных летуценняў,
Не трэба лепшага табе адзення!

І я заўсёды буду берагчы
Тваю цнатлівасць светлую аддана.
Ты не саромейся мяне. Бо ты адна, лічы,
Тут, у санеце, беражна схавана.

## Пасля сваркі

Няўжо ты не можаш,
Каханая,
У ціхай начы пачуць,
Як я ў тэлефонную трубку
Маўчу,
Бы крычу?..

* * *

Еўропа грэецца Гальфстрымам,
Ім адагрэтыя тады
Так распускаюцца нястрымна,
Нібы вясною, ўсе сады.

І я, бывае, замярзаю,
Як разбягаюцца сябры...
Як трэба мне тады бывае
Тваё дыханне — мой Гальфстрым.

## Падарожжа вакол цябе

Дзень добры, невядомая краіна!
Яшчэ ў вачах тваіх начуе ноч,
І толькі недзе там,
за небасхіламі,
Праменні ўсё спрачаюцца з зарніцамі —
Будзіць цябе ці не...
Ты ж спіш,
І ўсмешка, быццам кропелька на яблыку,
Дрыжыць,
качаецца на вуснах разамлелых —
Не дай Бог адарвецца, упадзе
І шпокнецца аб коўдру...
Гэты выбух
Цябе разбудзіць...
А цяпер ты мякка
Пад сны падклала цёплыя далоні
І слухаеш, як ціхенька ў падушцы
Дурэюць, нібы тыя кацяняты,
Запозненыя, ранішнія сны.
А бровы — матылі твае пужлівыя —
Прачнуліся і ўжо трапечуць крыльцамі —
На першым промні рады паіграць.
А хвалі валасоў —
схвалёванае мора —
Струменяцца па далікатнай шыі,
Як вадаспады,
коцяцца на плечы,

Ласкава затапляюць нават грудзі,
Пакінуўшы два ціхіх астраўкі.
Ды і сама ты ў акіяне белым,
У акіяне светлым, нібы востраў
Жадомай, пракавечнай прыгажосці,
Якую гэтак доўга я шукаў...
Вітанне,
мной адкрытая краіна!
Я, стомлены самотай падарожнік,
Тут затрымаюся урэшце назаўсёды,
Каб бачыць, як штораніцы праменні
Спрачаюцца,
будзіць цябе ці не?..

## Двое

— Бачыш, дожджык па лузе здалёку ідзе,
Дажджанятак за рукі з сабою вядзе.

— Дзе?
Дажджаняткі? То ж буйныя кроплі.
Уцякайма, пакуль не прамоклі!

— Глянь, вунь жыта паклоны б'е дожджыку
ў пояс,
Што ён колас яго абмывае і поіць...

— Во як?
Ты паблытала ўсё на свеце:
Жыта проста гне вецер.

— Канапаціць шпакоўню спяшаецца шпак,
Памагаюць і дзеткі ў працы сяк-так...

— Як?
Ты не бачыш нічога, галуба,
Шпак жа чысціць — дый толькі! — дзюбу.

— Чуеш, нехта па дрогкім драўляным мосце
Так грукоча — спяшае ўцячы ад кагосьці...

— Штосьці
Я не бачу, не чую нічога,
Апроч грому — мокрага, злога.

— Ну й гарэза ж ён, дождж, цалавацца так хоча!
Вусны нашыя лашчыць, заглядвае ў вочы...

— Скончы!
Стой адна, на дажджы я стаяць не згодны,
Бо тут кожная кропля — як цвік халодны!

## Хрыстова нявеста

> О, як мяне стаміла ты, каханне!
> *Дантэ*

Яна даўно, даўно Хрысту
Сябе захоўвае старанна...
Каб на яе ніхто не глянуў —
Мужчын абходзіць за вярсту.

Сівенькая
у сівых мурах,
Ад жаніха чакае вестак —
Хрыстова тупае нявеста
Па пустаце манастыра.

Не бачаць вочы.
Кій прыціх
У пальцах скручаных.
Штовечар
Хрыста чакае ўсё старэча...
О дзе ты, прывідны жаніх?

Цябе ж усё яшчэ няма.
І ведае:
ужо не будзе...
Таму і нудзіцца па людзях
Яе халодная зіма.

* * *

Паміж ручаямі і ліўнямі,
Паміж маразамі і спёкаю
Праходзіць граніца дзіўная —
Наіўная, блакітнавокая.

Граніца з пралесак сплецена:
Пралескі пускаць не павінны
Зімовых завей да квецені,
Снегу — да зеляніны.

Ды — хочаш не хочаш — сыходзяцца:
Не лічацца вёсны з граніцаю!
І пахнуць пралескам даводзіцца
Марозам і навальніцамі
Адразу.

## Яечня

Калі ты ўбачыш, што пад вечар
Затлее ў печы весялосць,
То ведай:
смажыцца яечня,
А ў хаце гэтай, пэўна ж, госць.

Трашчаць сучкі ў славянскай печы
І скачуць, скачуць у парог.
Каб госць зайсці у хату мог —
У хаце смажыцца яечня.

А вось і на стале яна,
Як сонца, асвятляе вечар...
Ну дзе там крышачку пітва —
На стол пададзена яечня!

На стол пакласці ўсё,
што ёсць,—
Такі ўжо звычай наш спрадвечны.
Як толькі ў хату ступіць госць —
Адразу смажыцца яечня.

* * *

Хоць продкі здаўна мае хрышчоныя,
Ва мне язычнік не памірае,
Калі ўсе графікі я ламаю
І цягніком ці нават трамваем
Спяшаю ў храмы свае зялёныя.

Там станаўлюся я мнагабожцам —
Мне трэба многа чаму пакланіцца:
Лясной крыніцы —
                              з яе напіцца,
Лісту, суніцы,
                         грыбку, травінцы
І сонцу.

Як продак, я спавядаюся дрэвам,
Прашу ў сонца я ўраджаю,
Хоць сам не сею і не збіраю,
Апроч лірычнай,
                           нідзе не маю
Дзялянкі выкарчаванай пасеву.

Стаю, укленчаны.
                            Чую, мамант,
Той, што ў паганскае яшчэ ранне
На продка рынуў, скубе старанна
Траву.
          Я чую яго дыханне —
Аж вецер ходзіць між валасамі...

## Гукі дарог

Дарогі,
          па вас спрадвеку
Час безупынна праходзіў.
Дарогі,
          на вас запісаны
Гулкія крокі стагоддзяў.

Дарогі —
мaўклівыя паскі,
Вы — зямлі фанатэка,
Што складзена
з тысяч
крокаў
Вечнага Чалавека.

## Вечны пацалунак

Яны і самі, пэўна, ўжо не помняць,
Як усё гэта адбылося.
Неяк
Выпадкам вусны вуснаў дакрануліся
Ў напружанай напятай цішыні.

Калі гэта было?
Ў якім стагоддзі?
Які мастак у мамантавай шкуры
Злучыў на камні
Ў вечным пацалунку
Іх пажадлівасць, прагнасць пачуцця?

А мы знайшлі той камень.
І застылі —
Уразіла нас чысціня кахання,
Якую зберaглі праз годы
Двое
Далёкіх, невядомых нам людзей.

Яны ж, ахопленыя вечнай страсцю,
На нас ніякай не звярталі ўвагі,—
Бо не маглі
Ад вуснаў адарвацца,
Што і вякі ніяк не разнялі...

## Галерэя вокнаў

У горадзе, у вечаровых прыцемках
Ёсць доўгія, як вечар, галерэі —
То галерэі вуліц.

Штодзень тут абнаўляюцца карціны,
Падсвечаныя хатнім асвятленнем
У рамках вокнаў.

Вунь, бачыце, эцюд «Каханне»:
Заціхлі ў шчырым пацалунку вусны —
Не спудзьце іх, ханжы!

А вось на ложку маці з немаўляткам:
Яна сябе даўно закалыхала ўжо;
Дзіцё ж яшчэ не спіць...

О, ўсплеск натхнення! Бачны толькі рукі,
Як хлеба чорнага два ўпечаныя боханы,
То праца на стале.

І раптам профіль мудрасці і думак...
Пра што задумаўся ты, неспакойны Фауст,
Забыўшыся на чай?

Тут — сын даўно чакае бацьку з працы:
Ён прынясе малому многа казак,
А з імі — сон.

Вось гэтую карціну я дапоўню
І ў яе, нібы ў гняздо птушынае,
Сам увайду:

Бо ў тым акне — мой сын.

## Мір

Злавацца на дождж,
Які доўжыцца з самае раніцы,
затапляючы нашу надзею пазагараць;
Наракаць на цеснату

У перапоўненым, душным тралейбусе,
дзе вы можаце стаяць
толькі на адной назе,—
як бусел;
Сварыцца з жонкаю
З-за нейкіх мілых, ласкавых дробязей
і чакаць, нібы свята, прымірэння;
Ушчуваць сына,
Які ў суседавым садзе
налаташыў поўную пазуху яблык;
Лаяць камара,
Які не дае вам заснуць —
звініць, малеча, над вухам, нібы цэлы
аркестр...

Якая ўсё гэта радасць —
Мы, разгубленыя, пазнаём
толькі ў першы дзень вайны.

* * *

Які чалавек вуглаваты!
За ўсё на зямлі чапляецца —
За лясы,
за хаты,
за святы,
На цішыні і то спатыкаецца.

Чапляецца
за моды, за густы,
За сынавы ручаняты,
Аб пах сусветны капусты
Спатыкаецца
чалавек вуглаваты.

Спатыкаецца аб прасторы,
Аб гнёзды,
дзе спяць птушаняты.
І нават за неба,
за зоры
Чапляецца чалавек вуглаваты.

## ВЫШЫНЯ
## ПОЎНАГА
## СОНЦА

* * *

Хаця ў аснежаных залужжах
Агонь начлежніцкі ачах,
Ледзь толькі вочы прыімружыш —
Нясуцца коні ў лета дружна,
Імчацца на начлег праз сцюжы
На капытах, на капытах, на капытах...

* * *

Ці бачылі вы, як камень
Пастунова пачынае разумець сваю годнасць,
Пачынае разумець сябе...
Ён, нібы распранаючыся,
Скідае з сябе лішні груз,
Што абмяжоўваў яго ў стагоддзях;
Ён скідае з сябе,
Як сарочку уціхамірвання,
Спакой застылай бясформеннасці.
І вось —
У невыразных пакуль контурах
Натужліва ажывае роздум.
Яшчэ год, яшчэ два —
І, асветлены чалавечаю думкаю,
Ён натхнёна і горда
Закідвае галаву над планетамі і стагоддзямі...

Вы бачылі, якімі маленькімі ля яго
Выглядаюць стомленыя скульптары?..

* * *

Рыбы хочуць лятаць, як птушкі,
І крылатымі хочуць стаць,
Перанесці ўсе перагрузкі
І, як некалі, лёгка лятаць.

Аб паветры мараць да свербу
І куртатыя плаўнікі іх.
Рыбы прагнуць узняцца за вербы
На падрэзаных крылах сваіх.

І выстрэльваюць рыбы з глыбіняў,
Навастрыўшы у неба слых,
І натужна махаюць усімі
Куксамі крылаў сваіх.

## На выстаўцы дзіцячых малюнкаў

Неўтаймаванасць гулкая фантазіі,
Я па тваім хаджу сягоння свеце,
Як госць далёкі.
                    І баюся спудзіць
Сваёй разважнасцю і мудрасцю халоднай
Вось гэта свята неслухмяных ліній,
Яшчэ не зведзеных ні ў якія параграфы
Вучоных кніжак.
                    І плывуць па сценах,
Нібы пасля вялікіх крыгаломаў,
Трохкутнікі і паралелаграмы —
З фантазіі сабраныя дамы.
З усіх бакоў іх асвятляюць сонцы —
Калючыя, праменістыя кактусы:
Як транспарант,
                    бяры яго за промень,
Нясі па свяце вымраеных вуліц
І асвятляй расчыненыя вокны,
Тут з іх адных усе дамы сабраны —
Хляўчук і хорам,
                    дача і турма...

## Знойдзенае завяшчанне багацея

«Мой сын,
я табе завяшчаю
Усё, чаго сам не маю:
Голад —
каб добра ведаў
Радасць ад сціплых абедаў;
Холад —
каб ведаў, што ў вецер
Шчасце ў хаце сагрэцца;
Слёзы —
адчуць з імі можна
Каштоўнасць усмешкі кожнай;
Атопкі —
каб помніў і потым,
Што значыць мець свае боты;
І гора —
пасля якога
Шчасця становіцца многа:
Сонечны дзень,
знойдзены грыб,
Людскі «добры дзень!»
і танец рыб...
Вярні ты мне радасць такую —
Па ўсім я па гэтым сумую.
І таго
не ўспомню я словам харошым,
Хто мне завяшчаў толькі грошы —
Багацце...»

Ці зразумее сын свайго бацьку?

## Крыўда

Паводле народнага

Як збіраўся да дзеўчыны хлапец,
Яго маці папярэджвала,
Яго маці папярэджвала,
Выпраўляючы з сянец:

— Ты ж глядзі, мой сыночак, глядзі,
Не пакрыўдзі нічым каханую,
Не пакрыўдзі нічым каханую —
Ва ўсім дагадзі.

— Ты не бойся, матулька мая,
Ад яе буду вельмі далёка,
Ад яе буду вельмі далёка
Я ўвесь вечар стаяць.

Не крануся яе і рукой,
Каб не ўкрыўдзіць каханай,
Каб не ўкрыўдзіць каханай
Абразай такой...

А каханая выйшла з сяла,
Яго гэтак ветла сустрэла,
Яго гэтак ветла сустрэла
І сама абняла.

І прасіла ля самых сянец:
— Пакрыўдзі мяне хутчэй ты,
Пакрыўдзі мяне хутчэй ты —
Пацалуй мяне!

* * *

Маўчанне ціхае маланак,
Дзе ваш разлеглы гулкі гром?
Сплывае моўчкі з шэрых стром
Маўчанне ціхае маланак.

Маўчанне ціхае маланак
І ўзбуджаны не патрывожыць слых:
Нібы размова двух нямых,
Маўчанне ціхае маланак.

## Вязень

Неспакойны за кратамі сон,
Бо і тут сніцца вязню няволя.
А трывожны,
трывожны звон
Не сціхае і ў клетцы ніколі —
Неспакойны за кратамі сон.

Гэты звон аддзяліў яго
Ад далёкага,
лёгкага неба,
Ад паветра, ад ветру таго,
Які яму вельмі трэба.
Гэты звон аддзяліў яго.

Адмыкае наглядчык турму:
Навакола стаіць такі скрогат.
Спрабаваў перапець.
Але ўбачыў:
яму
Не асіліць шуму такога.
Адмыкае наглядчык турму.

Прыадчынены дзверы крыху —
Абы толькі пралезла міска.
Вязень бачыць чужую руку —
Валасатую, пульхную —
зблізку:
Прыадчынены дзверы крыху.

Зненавідная гэта рука
Потым ставіць з вадою шклянку...
О, ён лепей напіўся б з лістка
На сваёй
абжытай палянцы.
Зненавідная ты, рука!

І вязень,
нібы сапраўдны герой,
На руку кідаецца ў клетцы,
Сабраўшы ўвесь смутак па волі свой,
Не сцярпеўшы абразы даўняй такой...

— Гляньце, гляньце,—
наш дроздзік дзяўбецца!

Зноў зачынена моцна турма —
Хіба краты дзюбай зламаеш!
А ў яго,
апроч песні, нічога няма,
Апроч крыл,
ён нічога не мае,

І зачынена моцна турма.

## Праліў сноў

Як калісьці ў дзяцінстве,
зноў
Я плыву па праліве сноў...
А за мной па абодва бакі
Узыходзяць мацерыкі.
І, прарэзаўшыся праз гады,
Атрасаюцца гарады
І спыніцца просяць мяне —
Пакланіцца сваёй даўніне.
Я ж мінаю іх маякі
І плыву глыбей у вякі.
Я прыбіўся да гону рыб
І крычу, як дэльфін,— аж ахрып;
Так прашу — зразумейце мяне,
Птушкі, стоеныя ў траве,
І фантаны марскія — кіты,
І ты,
мой далёкі, далёкі дзед!
Да цябе твой нашчадак ідзе
Праз бухенвальды вайны,
Праз інквізіцый агні,
Праз бронзавы век
За каменны век
Ідзе чалавек.
Мінаючы патры- і матрыярхаты,
Нарэшце знаходжу я свой пачатак —

Ты на чацвярэньках ідзеш, як мядзведзь,
На свайго прапраўнука паглядзець.
Прывітанне! Здалёк я прыйшоў —
Аж з тваіх неакрэсленых сноў!..
Пасля доўгіх і цяжкіх мук
Навучыўся хадзіць ты на двух
І на ловы цяжкія пабег
Аж за каменны век,
Прама ў атамны век...
Я ж сяджу і дрыжу за агонь —
Ты глядзець даручыў мне яго...
А як вернешся зноў,
                    я дамоў
Паплыву па праліве сноў...

## Перасяленцы

Яны даўно тайгу сваёю лічаць
І маразы, як хату, абжылі,
Мядзведзя, што чамусьці любіць
Пасвіцца з каровамі ціхмяна,
Без боязі ад статка адлучаюць...
                              А дзеці —
Белагаловыя, як лён, сібіраняты —
У кедравай распараныя лазні,
Нібы глушцы, куляюцца ў сумёты —
Аж снежныя ўзрываюцца фантаны!
А іх бацькі і ціхія дзяды
Босыя пракладваюць сцяжынкі
Па цаліку — ад лазні да двара.
Сапраўдныя сібіракі!
                    І толькі ў хаце
Іх выдаюць старэнькія цымбалы,
Дзе струны,
          быццам правады
Над доўгаю дарогаю ў край той,
Адкуль сюды
Прыйшлі яны
Даўно...

# Пажар у старажытным Полацку

> В Полотске позвониша заутренюю у Светыя Софеи въ колоколы: а он въ Кыеве звонъ слыша.
>
> *«Слова аб палку Ігаравым»*

Полымем раскалыханыя званы,
У Полацку
Кідаюцца ў агні яны,
Нібы жывыя,—
Ім цесна ў цеснаце званіц
Званіць.
«Дапамажыце, людзі дарагія!
Хоць нечым...
Мы клічам вас на веча!»
А ў адказ, аглушаныя звонам
(Не адарвацца птушкам ад званіц!),
Крычаць, лятаючы ля іх, шалёна
І падаюць, як факелы, уніз...
У горадзе — адны званы.
А вораг тут, ля гарадской сцяны,
І чуцен звон ягоны:
Звіняць страмёны,
Мячы і дзіды звоняць...
Звіняць званы.
І плавяцца званы, бы воск.
І кропелькі — маленькія званочкі — у жар
Звіняць і падаюць,
І падаюць...
Бы скідвае на мёртвыя стагоддзі
Свой рэквіем пажар.
«Народзе, дзе ты, мой народзе!..»
Маўчаць, дымяцца ваяры.
Званы кідаюцца ўгары
І клічуць мёртвых зноў на веча...

Трымайцеся, званы! Пачуў вас...
Коней асядлаў...
Спяшае з Кіева дадому Усяслаў,—
Будзе сеча, будзе сеча...

Але пакуль
Ад агню паўсюль
Абараняюцца званы адны...

## Вечаровая песня лесаўчыка[1]

Абсыхае мой конь уночы —
Нялёгка было і каню...
А вочы, забітых вочы,
Да майго спяшаюць агню.
І, ціхія, сочаць самі
За буднем маіх клапот.
А сала тады, нібы камень,
Не лезе ў засмяглы мой рот.
Яшчэ не астыла руля,
Загады грымяць увушшу...
        Маці, мая ты кукуля,
        Прысніся свайму Тамашу!

Даўно ўжо блукае слава
Па пятах нашых пакут,
І просяць чужыя дзяржавы
Лесаўчыкоў хоць капу.
І мы распраўляем плечы,
Імчымся на злом галавы
І смела кідаемся ў сечу,
Нібы раззлаваныя львы...
Павісні над сумам, поўня,
І асвятлі мне душу...
        Вазоўня, наша вазоўня,
        Прысніся свайму Тамашу!

І вось, як паранены, гасне
Стомлены стогнамі дзень...
Хто, нібы толькі што пасвіў,
Гусака на вяроўцы вядзе;
Хто сала полаці выняў —
Наесціся толькі й ахвоч;

---

[1] Лесаўчыкі — беларуская вайсковая вольніца канца XVI — пачатку XVII стагоддзяў. Славіліся сваёй смеласцю. Абаранялі не толькі свае землі, але іх прасілі на дапамогу і іншыя краіны тагачаснай Еўропы. Прымалі ўдзел у Трыццацігадовай вайне, у барацьбе супраць туркаў, у войнах Запарожскай Сечы.

А хто ў падранай пярыне
Вязе паланянку на ноч.
Абіраецца тая ад пуху...
    Каханая, штодзень прашу.
    Рагнеда! Дзе ты? Паслухай —
    Прысніся свайму Тамашу!

Прынясі хоць у сон мне дзетак,
Якіх яшчэ ў нас няма.
Усю ноч, хоць і стомлены гэтак,
Ім аддасць твой далёкі Тамаш.
Я ў сне б на радзіму паехаў,
Каб управіцца к самай касьбе,—
Так бы ляскалі рэхвы, што рэха
Даляцела б і ў сон да цябе.
Зноў вочы... Зноў вочы... Над імі
Рук, быццам крылаў, шум...
    Валошка... Валошка з радзімы,
    Прысніся хоць ты Тамашу...

## Пятля Кастуся Каліноўскага

Нялёгка быць вераўчанай пятлёю
І чакаць тваёй шыі, хлопча...
Лепей з табою я звозіла б сноп'е,—
Калёсы аж квокчуць, а мы на возе;
Снапы я, вяроўка, уціснула моцна,
Казыча калоссе — аж хочацца чыхнуць;
Я — лейцы таксама ў руках тваіх цёплых...
Нялёгка чакаць тваёй шыі, хлопча!

А магла б я радзіцца й абрусам,
Якія ткаў добра калісьці твой бацька.
Мяне б заслалі на стол святочны,
Пітвом і ядою мяне б пазаставілі,
І ўсе гулялі б да самае раніцы
Твае заручыны з чарнабровай Марысяй...
Страшна чакаць тваю шыю, хлопча!

Ці мала на што вам трэба вяроўка,—
Спачатку трымала б я вашу калыску,

А потым магла б зрабіцца і гушкалкай
Для вашых дзяцей. І яны б любілі
На мне гутатацца да самае столі,
А вы, іх калышучы, шчыра б смяяліся...
Жудасна абвіваць тваю шыю, хлопча...

А магла б я стаць і аборамі
Да лапцей тваіх. І з табой тады
Мы пайшлі б таптаць небасхілы
Гэтым вечным мужыцкім абуткам,
Гэтай вечнай мужыцкай праўдаю,—
І святло б мы выкралі ў ночы...

Скінь мяне з шыі, хлопча!
Памажыце хутчэй яму, выракі...
Памажыце хутчэй...
Памажыце...

Кляніце мяне, стагоддзі!
Кляніце,
Мяне кляніце!
Моц маю, людзі, кляніце!

## Тураўская элегія

> Сёння вясна красуецца, ажыўляючы зімовую прыроду. Буйныя ветры, ціха павяваючы, песцяць і гадуюць плады. І зямля, жывячы насенне, родзіць зялёную траву...
>
> *З малення Кірылы Тураўскага*

Прыгінае і самых высокіх
Да зямлі вечны цяжар гадоў.
І цішэюць,
цішэюць крокі
І людзей і старых гарадоў.

Як прысеў ты, драўляны горад!
З крэктам з замкавай споўз гары.
І стагоддзі з табой не гавораць,
Як калісьці маглі гаварыць.

І за сценамі замка не радзяць,
Як прынясць з Егіпта гасцей.
А на колішнім княскім пасадзе
Бульба расце.

Покуль сала княгіня смажыць
(Пах яго заваёўвае дзень),
З камунальных харомаў княжыч
Па каня з аброццю ідзе.

Бы праз сон,
праз гады сваю веліч
Слухае горад стары,
Як над ім,
над стольным,
звінелі,
Нібы песня, званы ўгары.

А таму,
калі сонца прагляне
І ўдзяўбнецца промнямі ў снег,
Як продкі, спавядаюцца тураўляне
Вясне.

Хоць і вёснаў мінула багата,
Толькі ў Тураве,
як і тады,
Зямля атуляе і корміць зярняты,
Каб радзіць,
як даўней,
плады.

## Вяртанне ў лес

Кажуць, было гэта даўным-даўно —
Адсюль не відно,
Было недалёка недзе:
Хадзіў мядзведнік з мядзведзем.
Па гарадах і вёсках яны хадзілі,
Абняўшыся, быццам бы роўныя,
Дарослых смяшылі, дзяцей весялілі

Гэтыя артысты вандроўныя.
А мядзведзь быў артыст не просты —
Прыгожы, высокі ростам.

Да таго ж ён, кажуць, перанёс, нібы эпідэмію,
Навуку ў Смаргонскай мядзведжай акадэміі.
Яшчэ і сёння кожнае па́ назубок
Ён ведаў, нібы той школьнік урок.

Бо танцаваць вучыўся, няйначай,
На патэльні гарачай,
Якую падсоўвалі яму пад ногі
Дужа строгія педагогі.

Колькі смеху ў вёсках было!
Смех збягаўся ў тое сяло,
Дзе танцавала нявінна
Гэтая касматая балерына.

А яна хусцінкай над галавою махала,
Упрысядкі да самой зямлі прысядала,
А затым у паэзію дабаўляла прозы —
Паказвала, як дадому вяртаецца гаспадар нецвярозы.

Асабліва любіў мядзведзь
Нумар, дзе трэба было барукацца,—
Колькі яму даводзілася пасапці, папацець,
Каб гаспадара паваліць, а самому наверх узабрацца!

І раптам не стала пацешнага артыста —
Збег у лес вячысты.
Там на паляне лясной
Сабраў ён род увесь свой

І пачаў перад усімі хваліцца,
Чаму ён змог у людзей навучыцца.
Пачне паказваць, як п'яныя ходзяць,—
Усе маўчаць у здзіўленні:

Не разумеюць, выходзіць,
Сэнсу яго прадстаўлення.
А калі ён упрысядкі пойдзе
Пры ўсім пры лясным народзе,

Пачне махаць над галавою лісцінай,
Нібы хусцінай,
Усе рагочуць,
Аж слёзы ім засцілаюць вочы:
— Што з ім такое?! Чаго ён хоча?!
А калі блудны родзіч з натхненнем паказваў,
Як ён некалі чалавека вобземлю бразнуў,—

Астатнім было не да смеху:
— Цяпер мы верым — ты сапраўды, мусіць, з глузду з'ехаў.
Не зразумелі мядзведзя родзічы —
Рашыў ён назад варочацца.
Доўга блукаў па пушчы з гэтай пары —
Шукаў чалавека і на палянах, і ў гушчары,
Але, як назло,
Яго нідзе не было.
І раптам... Ад радасці ён ажно крэкнуў —
Убачыў мядзведзь чалавека.
Раскінуўшы лапы шырока,
Мядзведзь кінуўся да яго ў абдымкі з радасным ровам...
Але чалавек гэты пасвіў каровы,
І ў яго, як на грэх, была дубальтоўка.
Куля, стаіўшыся перад вылетам, ціха ў рулі ляжала —
Яго, мядзведзя, чакала,
А спалоханая рука
Хапатліва шукала курка...

Чалавек гэты быў не мядзведнік, а пастух...

* * *

Лягчэй вы паміралі, нашы прашчуры,
Бо верылі, што будзеце прыходзіць
Сюды, дамоў, на кожныя Дзяды —
Вясной і ўвосень. На сваім падворку,
Перш чым зайсці у сцішаную хату,
Усё агледзіце руплівым вокам,
За кожны зна́дабень зачэпіцеся вы:
Вясной — у баране паправіце кляцы,
Падмажаце рыпучыя калёсы,
Павесіце на месца скінутыя лейцы
І ў думках свайго сына паўшчуваеце,
Што гаспадарыць ён не так, як вы.
А восенню ў вас іншы клопат —
Прыкінуць намалочанае збожжа,

Зірнуць, ці добра выкапана бульба,
Аўса насыпаць коням поўны жолаб
І ўзважыць добра ўлежанае сена —
Ці хопіць на зіму? А потым
Вы прыйдзеце ў цяплынь начную хаты
І сядзеце у покуце на лаву,
Драўляную намацаеце лыжку
І саганок, закураны у печы;
І есці будзеце са смакам груцу,
Пакінутую на стале для вас,—
Так некалі вячэралі вы ў поцемках,
Вярнуўшыся запозна з дамалотак...
З якою ж прагай вы пасля вячэры
Нагбом з вядра вады крынічнай вып'еце,
Вусы спярша развёўшы даланёю!
А потым, зноў збіраючыся з хаты,
Вы пакалышаце ліповую калыску,
Дзе ваш унук, прачнуўшыся, заплача;
І доўга клямку будзеце шукаць,
Якую вашы рукі гэтак зналі,
Якую рукі сталі забываць.
Ад бразгату прахопіцца нявестка
І сонным голасам спытае: «Хто там?»
А сын спакойна гэтак ёй адкажа:
«Спі, гэта, мусіць, бацька...»
Адкажа так, нібыта, як калісьці,
На досвітку вы ўсталі малаціць...

Лягчэй вы паміралі, нашы прашчуры.

* * *

Я люблю вельмі край свой зялёны...
Ды ўсё роўна
мне сняцца поначы
Піраміды —
як крык фараонаў,
І ільдзіны —
вакзалы Поўначы.

## Нарвежская балада

Па гарадах,
                з якіх снягі абтрэсены,
Як з крылаў цяжкіх матылька,
Чужыя словы ходзяць весела,
Трымаюць кветкі у руках.

Па гарадах усёй Нарвегіі
Чужыя словы толькі й чуць,
Яны ідуць, як прывілегіі
І як захопнікі ідуць.

За горы хочацца так дужа ім,
Дзе ў цеплыні,
                сярод завей,
Сагрэтая рукамі дужымі
І адгароджаная сцюжамі,
Другая мова шчэ жыве.

Яна пра вікінгаў расказвае
У песнях, як снягоў разгон:
Фіёрды з даўнішнімі назвамі
Прыводзіць у дзіцячы сон.

І б’ецца між гарамі цеснымі
Жывога слова мужны дух,
А прыхадні
                з сваімі песнямі
На горы прыступам ідуць.

І вязнуць, дзе снягі глыбокія,
У гурбах тонуць з галавой...
Чужыя словы,
                смелавокія,
Што трэба вам за той гарой?

Вы дома радуеце слоўнікі,
А тут —
                ды што вам гаварыць! —
Тут тролі — казачныя гномікі —
Назад вас спіхваюць з гары.
А горы ўсталі, як шаломнікі,
Дзе лезлі словы, як вужы...

Скажыце, горы,
ёсць вам помнікі,
Што не пусцілі слоў чужых?

Што ў гарадах,
дзе снег абтрэсены,
Як з крылаў лёгкіх матылька,
Свае ўжо словы ходзяць весела,
Сабраныя сваімі песнямі,
Трымаюць кветкі у руках.

## Чорны храм

Быў у неграў маленькі і цесны свой храм —
Не павярнуцца ніяк у ім.
І сказалі белыя чорным: «Мы лепшы збудуем вам
І Бога свайго дадзім».

Быў у неграў маленькі і цесны свой храм —
Ад яго засталася спазма тугі,
А белыя чорным, узнятым да Бога, рукам
Падсунулі храм другі.

І ўсё ззяла, усё аж іскрылася там
Белізной невядомых трывог,
Але чорным патрэбен быў чорны храм
І чорны таксама Бог.

І стаяў, і маўчаў — халодны, як сплін,
Гэты склад невядомых кадзіл,
Але негр не ў яго, а ў цёплы ўспамін
На маленне сваё хадзіў.

І дзівіліся белыя: храм, нібыта букет,
Толькі негры — ні на парог...
І ўзагналі сілай на белы і слізкі паркет
Статак чорных пужлівых ног.

Не паверылі негры ўсё роўна вачам,
Спавядаць белы Бог іх не змог,

Бо чорным патрэбен быў чорны храм
І чорны таксама Бог.

І яны знайшлі свайму Богу жытло —
Збудавалі храм пад зямлёй,
А маліцца хадзілі ў яго праз дупло,
Каб не выдаць тайны сваёй.

Адкрываліся пастарам там, як сябрам,—
І знікаў з іх вачэй спалох,
Бо там звыкла атульваў іх чорны храм
І чорны ўсміхаўся Бог.

## Пакаранне мёртвай

У старажытным Рыме нельга было караць смяротнай караю цнатлівых нявінніц: кат іх спачатку павінен быў зганьбаваць.

Цяпер ужо не страшна ёй памерці —
Яна чакае, як збавення, смерці.
І жудаснай апошняй цішыні
Не заўважае...
Сонца, час гані!
Хутчэй, хутчэй...
Апошні ранак, можа,
Забыць усё навечна ёй паможа:
І пальцы ката,
Што са спрытам спрута
Яе грудзей сціскаюць некранутасць,
Па чысціні бязгрэшнай смела шнараць,
Нібыта хочуць задушыць ахвяру,
А ад грудзей да шыі —
Гэтак блізка...
Адкуль у ката столькі пальцаў слізкіх?!
Забыць паможа той апошні ранак,
Як пахнуць губы катавы пагана —
Халодныя,
Нібыта жаба тая,
Што скача каля вуснаў.

Не збягае
Яна з тых вуснаў светлых, беззаганных,
Якіх і не рашыўся так каханы
Хоць дакрануцца...
А крывавы пах,
Якім збрыдзелы кат гэты прапах,—
Пах ліпкі, жудасны, пах бойні...
Хто можа удыхаць яго спакойна!
А кат сваю напружвае ахвоту,
А кат сваю выконвае работу,
Якая перад караю належыць...
І для яго няма ніякіх межаў:
Пасля таемнасці вялікай зачынання
Галовы ён сячэ без шкадавання...
Яна ж ляжыць —
Аціхлая такая.
Яна ўжо мёртвая,
Хаця яшчэ й жывая...
Калі ж караць яе кат павядзе,
Збярэцца, як заўсёды, шмат людзей,
Спалохана плебеі загудуць:
— Глядзіце,
Мёртвую на эшафот вядуць!

Хаця ісці яна будзе й сама...

* * *

Маці!
Белыя, жоўтыя, чорныя маці!
Калі вашых сыноў
Вырвуць з вашых абдымкаў
І са звязанымі крыламі
Укінуць,
Як у калодзеж,
У чорнае прадонне турэмных дзвярэй
Нейкія новыя, ашалелыя фашысты;
І калі вы прынясеце вязням перадачу —
Букет ціхіх, нявінных кветак,—

Ведайце,
Вас могуць расстраляць
За падбухторванне да ўцёкаў.
Кветкі за кратамі пахнуць свабодаю!
Іх забараняецца прыносіць у турмы:
Там гэта ўжо зброя —
Белыя, жоўтыя, чорныя кветкі.

## Правады

Яны аж прагнуліся ад навін
Ледзь не да снегу — халоднага пуху.
Шэпчуць ціхенька штосьці слупам,
А тыя, развесіўшы вушы, слухаюць:
— Што, на вяселле?
— Не, на наваселле
Просім!

Яны гэтак беражна перадаюць,
Нібы само немаўлятка,
Весткі, што нехта ўжо дзедкам стаў,
А нехта зрабіўся бабкаю:
— Што, унучка?
— З унукам за ручку —
Двойня!

І раптам вестка — буйная сляза
Пакацілася ціха па провадзе...
Замоўклі, задумаліся правады.
— Што? Не чуем! Што вы гаворыце?!
— Глядзі ты — смерць...
— Няўжо смерць?
Не можа быць...

Маўчаць правады. А з другога канца
Даўно ўжо голас хвалюецца,
Прыспешвае радасцю правады:
— Алё! Няўжо вы там пазаснулі ўсе?
— Што, наваселле?
— Ды не — на вяселле
Клічам.

* * *

Калі ўпершыню
Ад самалётаў,
Якія да гэтага часу былі мірныя
І толькі што прывозілі
Пісьмы,
Гасцей,
Татаў з камандзіровак,
Пачынаюць аддзяляцца бомбы —
Маленькія, як камары, крапінкі,—
Дзеці яшчэ паспяваюць нарадавацца..
Яны бягуць туды,
Дзе бомбы павінны ўпасці,
І яшчэ паспяваюць крыкнуць дарослым:
— Глядзеце!
Глядзеце, як цікава!..
— Гля...

Дз-е-е-ц-і-і!

## Гарады, якіх няма

*Мінску — зруйнаванаму вайною і адбудаванаму нанава*

Яшчэ і сёння
Рыпяць масніцы
У даваенных вашых дамах.
Яшчэ і сёння пад'ездам сніцца
Спакойных кветак спакойны пах.

Яшчэ і сёння —
Насцеж балконы:
Не зачыняліся з таго дня.
І грамафоны, і патэфоны
З даваеннага лета звіняць.

Там яшчэ й сёння
Гуляюць дзеці
У даваенную, тую вайну.
Набіты паркі. У мірным леце
Не заўважаюць шчэ цішыню.

Заходзіць сонца —
Чуеце, шорах?
Салдаты мірна кладуцца спаць.
Засынаюць за горадам горад,
Раніцою якім не ўстаць.

Мы нават чуем,
Як госці звоняць
У даваенных гэтых дамах;
І прачынаемся нават сёння
У гарадах, каторых няма.

## Зялёны ліст

Глядзіце, смяротнікі,
Як у бучныя, зялёныя травы
Падае сонца збалелаю ранай;
Глядзіце і помніце:
Недзе ўзыходзіць вось зараз іскрысты,
Няпуджаны ранак.
Бяжыце!
Туды вы ў трызненні бяжыце,
Дзе перапёлкі купаюцца ў жыце.
Расою свой твар асвяжыце
І зноў, хоць у думках, бяжыце,
На волю ўсе вы бяжыце,—
Ангел, Бранка, Курт, Жуль, Іван,
Іржы, Костусь, Алекса, Хаім, Юліуш,
Шандар і іншыя сотні тысяч...
А тут,
Бы ў калодзежы, дротам калючым аплеценым
(Ён лагерам смерці завецца),
Падзелена ўсё па-братэрску,
Што магло толькі ў роце халодным сагрэцца:
Карэнне, лісцё і галіны,
Кара і нават крыло матылінае...
А болей, як вокам звесці,
Няма на што птушцы прысесці —
Няма зеляніны...

І толькі зялёным верадам
Так і лезе ў галоднае вока
Дрэва,
Якое ў канцлагеры на галінах высока
Зялёную ежу трымае ў аблоках,
На якое ў лісцё садзяцца,
Бы птушкі, галодныя думкі ўсіх,
І якое
Як сімвал пакінулі людзі-пакутнікі,
Пакінулі ў вечным спакоі,
Нібыта святое,—
На ім ні лістка не з'едзена...
Казалі,
Што тлумнага веку самоту
Рассейвала дрэва гэтае
немцу вялікаму — Гётэ.
І дрэва стаяла някранутым
Сярод памутнення фашысцкага,
быццам бы крэпасць стаяла.
І пад сцягам зялёным жыцця,
Нямецкае,
Супраць немцаў яно ваявала...
На ноч прызначалі смяротнікі
Да дрэва галодную варту —
Калі усе спаць палягуць,
Каб ніхто ў забыцці не з'еў
Нават лісточка з зялёнага гэтага сцяга.
Трымалі той сцяг упарта
І самі за сцяг трымаліся, каб небасхіл не хістаўся...
А побач дзяўчынка малая
Ляжала на мяккай, рукамі ўскапанай пасцелі.
Прывезлі дзяўчынку адтуль,
Дзе з краіны зялёнай зрабілі канцлагер суцэльны,
Дзе птушкі даўней гняздзіліся
у ціхім ласкавым лесе,
Прывезлі дзяўчынку Алесю.
Трызніла ежай дзяўчынка:
— Мама, налі мне клёцак...
Поўную місу трэба...
Мама, дай куляшу...
Сарві мне з дрэва хоць ліст —
яблык я ўжо не прашу...
Я есці хачу... А наша дзяжа насыцістая
Чамусьці не мае хлеба...

Мам, хадзем у наш агарод,
дзе морквы, я знаю, багата...
Мама, гарыць наша хата!
І маму дзяўбе, кусае зяўло аўтамата...
Тата!..
Адгані аваднёў,
якія дзуняць і дзуняць над маёй галавою...
Дзе вы ўсе?..
Мо пазаснулі?..
Лісток... Смачны лісток... І авадні...
— Ціха, дзяўчынка, то кулі.
Над трызненнем галоднай дзяўчынкі
Нагнуліся тысячы татаў свету.
Што ж вы так стаіцё?
Збірайце ціхую братчыну — пачастунак у складчыну.
У вас выйдзе няблага гэта:
Ты, лесаруб, даставай тую хлебную крошку,
што засталася ад зайцава хлеба (яго ты
вёз сыну!) і згубілася недзе ў кішэні;
Ты, араты, страсай попел з печанай некалі
бульбы ў полі, якім яшчэ і сёння абсыпаны
твае акучнікі-жмені;
Ты, цесля, асцярожна дабаў першага паху
улазінаў, які яшчэ і сёння не выветрыўся
з тваіх валасоў-праменняў;
Ты, пекар, сюды дакладзі пах свежага
даваеннага хлеба, якім яшчэ і сёння
пахнуць увесь ты павінны;
А калі ў вас нічога не захавалася,
Тады ў братчыну смела кладзіце
Вы свае даваенныя успаміны,
Ангел, Бранка, Курт, Жуль, Іван,
Іржы, Костусь, Алекса, Хаім, Юліуш,
Шандар і іншыя сотні тысяч...
Праўда, і гэтай складчыне
Не стае ўсё роўна чагосьці.
Чаго ж гэта ёй не хапае?..
Пэўна, ліста зялёнага...
Вунь яго вецер за дротам паціху гайдае, гайдае...
Курт, куды ты?!
Хіба ты не бачыш, як з вышкі драпежна
На яго аўтамат пазірае?..
— Не яблык прашу... Дайце... мне... ліст...
І за Куртам ланцуг худых рук спяшае.

Гайдаецца ліст.
Рука ўжо за дротам калючым.
Яна зрывае зялёны,
Сабраўшы сілы астатак,
І перадае другой,
А другая — трэцяй,
Трэцяя — пятай, дзесятай...
За лістом спяшаюцца стрэлы —
Колькі рук прайшоў ліст, лічыць варта
Сваім аўтаматам.
Ліст зялёны!
Ты страшнай мяжою зрабіўся —
Між жыцця і смерці асновай,
Перадавалі цябе, як апошні ўздых,
Як апошні пагляд,
Як апошняе слова.
І падалі, да зямлі прыбітыя кулямі.
А ліст ішоў далей і далей...
Ён ужо ў Алесі ў руках:
— Які смачны ліст гэты, дзядзі!
Стрэл...
І ў гэтую радасць фашысты папалі...
Мёртвыя свету! Пацясніцеся крышку —
Дайце месца маленькай дзяўчынцы.
Ёй месца многа не трэба...
Нават з лістом — яе зялёным гасцінцам...
Я вас прашу пацясніцца,
        Ангел, Бранка, Курт, Жуль, Іван,
        Іржы, Костусь, Алекса, Хаім, Юліуш,
        Шандар і іншыя сотні тысяч...
Хай з вамі яна страчае
Ранкі пад цёплым вясновым сугрэвам —
Гэты лісток,
Галінка,
Якая ніколі-ніколі не будзе зялёным дрэвам.

## Нюрнберг. Пасля прысуду

Галовы ў плечы ўгнуўшы быстра так
І баючыся на людзей зірнуць,
Пад позіркі, нібы пад выстралы,
Віноўнікі ідуць.

* * *

У садзе,
Нібы ўкапаны,
Садоўнік стаіць на нагах драўляных.
Здаецца,
Дрэўцы,
Што чалавека трымаюць,
Зноў прыжыліся — карэнне пускаюць.
Ля іх зямля —
Аж варушыцца:
То карэнне шукае сок —
Так малое шукае матчын сасок...
І здаецца,
Што зараз распусцяцца,
Разбуджаныя невядомай трывогаю,
Чалавечыя ногі,
Драўляныя ногі...

## Па вайне

Быў цяжкі год,
Жаночы год.

Удовы ўпрагаліся ў параконныя плугі,
А мы, дзеці,
Ледзь паспявалі бегчы за гэтымі плугамі,
Якія валілі нас,
І мы, як галчаняты, губляліся ў баразне —
Мы, мужчыны...

Яны паднімалі нас,
Атрасалі ад зямлі
І цалавалі неяк вельмі ўжо нязвыкла —
У самыя губы...

Быў цяжкі год,
Жаночы пот —
Салёны, як удовін сум...

* * *

Успаміны не ўсе заараны —
Напамінкаў,
зірніце,
колькі!
І з зямлі,
бы з глыбокай раны,
Яшчэ й сёння выходзяць асколкі...

* * *

Я дні рассуну,
нібы шторы,
Каб зноў вярнуцца у красу,
І пасля доўгіх угавораў
Цябе з сабою панясу.

Праз пераплеценае лісце,
Што атрасаецца ў траву,
Цябе нясу я ў свет дзяцінства —
Нагні шчэ ніжай галаву!

А вунь —
жаданая паляна...
Яна не ведае тугі:
На ёй пякуць усе старанна
З пяску і гліны пірагі.

Вяселле ладзіцца маё там.
Нявеста, бачыш, пад цябе:
Хоць да сяброў мне ўцеч ахвота —
Не адпускае ад сябе.

Яна ўчапілася за рукі...
Адкуль, макулінцы, ёй знаць,
Што ёй каханне дорыць мукі —
Ля дому мужа так трымаць.

Ты што?..
Няўжо прыраўнавала?..
А ёй зайздросціць нават грэх!
Глядзі — дзяўчынка не ўтрымала,—
І я спяшаюся ў твой смех.

Глядзі — прыціхлі дзіцяняты...
Давай паслухаем і мы,
Як у худыя ручаняты
Цярушыцца, табою ўзняты,
Удовін халадок зімы.

## «Самадзержац»

Сядзіць ён на зялёным троне,
А побач птушкі гнёзды ўюць,
Прад ім схіляюцца ў паклоне,
Яму паклоны кветкі б'юць.

І усыпаюць птушкі звонам
Яго манаршую гару,
Каб весялей было на троне
Гуляць капрызнаму цару.

А ён сядзіць і ўсім кіруе:
Пчала — за ўзяткам хай ляціць,
А ветру — ветракі круціць,
А сонцу — яблыкі спяліць,
Зямлі — час жыта ўжо карміць,—
Усім занятак ён дарує.

Уся зялёная прырода
Ў яго слабых яшчэ руках;
Жыве ён з ёю ў добрай згодзе —
Манарх у мокрых паўзунках.

Плыве ў калысцы, нібы ў лодцы,
Пад ім — увесь зямны абшар.
Свой скіпетр — лёгкую бразготку
Трымае моцна гэты цар —
Дзіця малое...

* * *

Я згодзен зерню вечна пакланяцца —
Малое зерне месціць цэлы свет.
Там спеюць нашы мускулы і праца
І прарастаюць
гарады планет.

* * *

У такое надвор'е
Матылі сушаць крылы,
Увесь скарб свой мурашкі
На прасушку выносяць...
У такое надвор'е
Сонца раскрыла,
Каб праверыць на спеласць,
Цяжкое калоссе.

...Блізка восень.

* * *

Там, недзе за гарой сваіх гадоў,
Стаміўшыся спяшацца і любіць,
Ты засумуеш,
што не прыйдуць зноў
Дні,
калі ўсім яшчэ ты
можаш быць,
Кім захочаш...

## ВЕЧАРОВАЯ МУДРАСЦЬ ДРЭЎ

### Ціхая мелодыя

Блукаю, ўсхвалёваны нечым,
І чую прыглушаны шорах —
Штосьці рыхтуе вечар,
Збіраючы шэры морак.

Пераймаю вячэрнія цені,
Бы ягнят,
што вяртаюцца з поля.
Лаўлю цішыні трымценне,
Хвалююся, як ніколі.

Не кідаю зялёнай вахты
І бачу:
як продкі на веча,
Дрэвы — зялёныя яхты —
Сплываюцца ў ціхі вечар.

* * *

Ламаюцца ў снежных сумётах вятры,
Сонца прымерзла да небакраю —
Раніцою ледзь адрываецца,
А пад наша акно,
У якім агеньчык гарыць,
Дуйкі з усіх палюсоў збіраюцца.

Што ім сцены!
Бачыш, сядзяць за сталом халады,

І агеньчык хліпае, хліпае —
На яго ж дзьме уся планета...
Апранайся цяплей, мая памяць,—
Праз сумёты мы пойдзем туды,
Дзе далёкія птушкі дзяўбуць
Вечназялёнае лета.

* * *

Я выплываю з адзіноты,
Нібы з халоднай глыбіні,
І бачу сонца ў вышыні —
Я выплываю з адзіноты!
Святлеюць сонечныя дні,
І рукі просяць зноў работы:
Я выплываю з адзіноты,
Нібы з халоднай глыбіні...

## Гекзаметры рыбака

Ведаць павінны мяне вы, мае беларускія рэкі,
Ціхія, сціплыя, нібы і край, па якім цечаце вы.
Вы ж гадавалі мяне ў лодцы — шырокай калысцы,
Усланай луской акунёвай,
хвастамі самоў паўсліжанай;
Як салодка я засынаў пад рып асцярожны уключын,
Нібыта ў хаце сасновай пад спеў цвыркуна
ў запеччы...
Лодка была, для мяне ўсім маім цяжкім набыткам:
Возам, калі я вазіў сена з зарэчнага поплаву,
І выязнымі калёсамі, калі я збіраўся ў госці,—
Паціху грабешся і чуеш,
як клыгі ў каменні клыгочуць,
Як стукаюць рыбы ў язы
і з шумам назад уцякаюць,
Як цёмным, халодным прадоннем
чарнее ў дне катлавіна.
А калі я жаніўся,
то лодка нясла на мой бераг вяселле.

Вы ж помніце, рэкі,
як сваццi вялі захмялелыя песні,
Як дзеці, па беразе скачучы,
«Плывуць!», а не «Едуць!» крычалі,
Як потым і я ў сваё падарожжа вясельнае ехаў —
З жонкаю рыбу лавіць...

Ведаць павінны мяне вы, мае беларускія рэкі,
Ціхія, сціплыя, нібы і край, па якім цечаце вы.
Сам я з Дняпра,
з-пад Оршы,
са шляху з вараг у грэкі,
Дзе яшчэ й сёння, здаецца, смаляць дыхтоўныя
лодкі —
Пахне смалою навокал,
у куродыме вэндзіцца Копысь.
А на Кабылянскіх закрутах заселі
нармандскія лодкі,
Як рыбы, пляскочуць хвастамі —
не сарвацца ніяк з перакатаў,
Хоць іх і чакаюць у Оршы
багатыя, шчодрыя румы,
Дзе топчуцца бочкі з мёдам,
нібыта цяжкія мядзведзі,
Дзе лён і пянька, як бароды далёкіх, аж з казак,
асілкаў,
Дзе сала, як зімныя гурбы
бялеюць сярод зяленіны...
На румах варагаў чакаюць дзяды памяркоўныя
нашы.
Трэба сабраць ім даніну:
ад лодкі — два локці тканіны;
Ад лодкі —
па белай вавёрцы,
і потым плыві сабе з Богам...

Ведаць павінны мяне вы, мае беларускія рэкі,
Ціхія, сціплыя, нібы і край, па якім цечаце вы,—
Бо я ж з берагоў дняпроўскіх,
са шляху з вараг у грэкі,
Са шляху суток вялікіх, па якіх, нібыта па венах,
І рыбакі, і рыбы назад у Прыроду вяртаюцца —
Ціхую, сціплую, нібы
і край, па якім цечаце вы.

* * *

Бяда чалавека гнала —
Па смерць чалавека гнала.
У лес чалавека загнала.
                    І раптам...
Нідзе яго раптам не стала,
Дзе б ні шукала бяда яго,
Дзе б ні шукала...

А ён у траву паваліўся,
У зялёных хвалях стаіўся.
Сышліся над ім тыя хвалі,
І вершаліны, як хвалі,
Над гэтым месцам сышліся —
Чалавека схавалі.

Суцішылі гоман краскі —
Пра бяду чалавечую слухаюць,
Суцішылі шчэбет птушкі —
Чалавечае сэрца слухаюць.
А дрэвы, усё разумеючы,
Над палянай ківаюць галовамі,
Сівымі галовамі.

Расказаўшы пра ўсё паляне,
Чалавек на бяду забыўся
І выскачыў смела са схованкі,
Ды прама бядзе у рукі.

Бяда паглядзела:
                радасны!
Э, гэта ж не той чалавек,
Не яе чалавек...

І цяпер яшчэ ў лесе шукае
Таго чалавека, дурніца!

## Адзінец

Калі ў зубровым статку
яго мудрасці стане цесна,
Калі яму надакучыць
непатрэбная мітусня,
Ён ідзе ў лістападны шоргат —
у сваю пажоўклую песню,
Дзе дрэвы, нібы стагоддзі,
над кожнай казюркай звіняць.
Ён пакідае дзялянкі,
сагрэтыя матрыярхатам,
І матрыярхатам прапахлых
яшчэ маладых зубранят...
Ён будзе прыходзіць штовосень
сюды, бы ў вясельную хату,
Каб прагна кахаць і лашчыць
слухмяны матрыярхат.
Цяпер ён застацца хоча
толькі сам-насам з сабою,
Каб аднаму праслухаць
невыразны ўспамінаў хор.
Можа, прымроіцца мамант,
з якім ледніковай парою
Побач яны выдзіралі
абледзянелы корм.
Ідзе ў свае ён стагоддзі,
дзе дрэвы, як вёрстаў цені,
Вядуць яго далей і далей —
у самы ціхі гушчар.
І яму саступаюць дарогу,
бы слугі, дзікі і алені.
Бачаць: ідзе, як філосаф,
іх непадробны цар.

* * *

Радня крылатых птушак — самалёты
На цёплай і прыветлівай зямлі
Настойліва шукаюць свае гнёзды —
Бяссонныя аэрадромы.

Яны людзей вяртаюць з розных выраяў:
Палярнікаў — з халоднай, снежнай поўначы,
Адпускнікоў — з ласкавых пляжаў поўдня
Вязуць дадому.

Гудуць вясёла ў небе самалёты,
Спакойна распластаўшы свае крылы,
Спакойна абганяючы аблокі
І хуткіх птушак.

І толькі на сваім аэрадроме
Ім хочацца, як птушкам, скласці крылы
І галаву стамлёную схаваць
Пад цёплае крыло.

І натапырыцца, і сцішыцца, як птушкам,
Каб перадумаць цяжкую дарогу,
Ў якую ім і заўтра на світанні
Збірацца зноўку...

## Марскі музей

— Увага, шаноўныя экскурсанты!
Падоўгу так не бачылі зямлі
Вось гэтыя цяжкія караблі.
Цяпер яны пацеюць перад вамі,
Прыбітыя зялёнымі вятрамі
Да берага прыціхлага музея.
Стаяць, слухмяныя,— не рыпне рэя,
І днішча да вады не дакранецца,
Не лопне ветразь, ветрам не надзьмецца —
Які там вецер з нашага дыхання,
Суцішанага намі. Аж да рання
Яны свой сум калышуць старадаўні,

Нібы на колішніх зімоўках даўкіх
Сярод палону льдоў. І вось тады —
Хоць бы глыток салёнае вады,
Хоць бы вятрыну нейкую прыгнала,
Хоць у паўбала — хай бы пагайдала!
Але навокал — сцены, сцены, сцены...
Як белыя ільды, сціскаюць сцены.
Так горача — гарачая ільдзіна...
І людзі ўсе — цікаўныя пінгвіны —
Працягваюць гарачыя далоні,
І караблі яшчэ ў адным палоне...
Тады у сны да іх прыходзіць мора,
Разгорнутае па усіх прасторах;
У ветразях не месяцца вятры,
На мосціку — зноў капітан стары,
Рыпіць лябёдка — якар паднімае,
З яго вада жадомая сцякае
І капае,
        і капае
                у цішу...
А вось і хваля іх ужо калыша...

— Экскурсія, таварышы, закончана. Караблі засынаюць: бачыце, ківаюцца...

## Працяг

I

Я вясною вёску люблю,
Калі жыццядайнасцю ўсё напята,
Дзе, як зерні, кінутыя ў раллю,
Прарастаюць дымкамі хаты.

II

Я люблю прарастання ўсялякага свята
І бучнасць усякага росту,
                        калі
Сцішваецца Зямля ў далонях шурпатых,
Як зернетка ў час прарастання
                        ў раллі...

## Лістапад

Ападаюць, злятаюць жоўтыя вырai,
Пакідаюць галіны — гнёзды свае,
У чароды збіраюцца,
                    ад зямлі адрываюцца
І настойліва хочуць у вырай ляцець
Лісты.

## Скарга прыручанага ваўка

— Дарагі таварыш дырэктар,
Адпусці са звярынца на волю.
Я хачу наглытацца ветру
І снегу
Уволю.

Я ў піліпаўку мару вярнуцца,
У марозныя, крохкія ночы,
Дзе блішчаць
І як дзюбы дзяўбуцца
Нашыя вочы.

Дзе клубяцца вяселлі нашы —
Ажно крэкча скаванае поле...
Дарагі дырэктар, таварыш,
Адпусці ты мяне
На волю.

Надакучыла нізкае неба
У клетцы —
Маёй дамавіне;
Дзе кусацца ваўку, мне, трэба,
Я мурчэць, нібы кошка, павінен.

Адпусці...
Не чакай маёй згубы;
Разарвецца ад крыўды сэрца;
Бо калі нават шчэру я зубы —
Вам здаецца,
Што воўк смяецца.

Цёпла.
Сытна.
Нібыта ў хаце...
Ды хіба да той хаты прывыкнеш,
Дзе ўсе лашчаць цябе, бы ягняці,
І «Ату!» нат ніхто не крыкне!

Адпусці.
Я, нагрэўшы, бы ўлетку,
Лагво пры далёкай ялінцы,
Цёпла ўспомню
Пра цёплую клетку
У цёплым звярынцы.

Адпусці...
Не можаш?
Тады хоць іначай
Клетку маю ў звярынцы трымайце,
Каб мяне не злавала,
Што здзекліва скачуць
Насупроць
Асмялелыя дужа зайцы.

* * *

Я ўночы прачнуўся...
Хто там?
Хто ходзіць, нязваны, па хаце
І лісцем апалым шуршыць,
Быццам цэлы сквер,
Над маім цішынёю аглушаным вухам...
Хто там?..
І што яму трэба, прыхадню,
Ноччу ў чужой кватэры?
Я чую: ён пахне дажджамі
І атрасаецца ля майго ложка,
Як мокры кот...
«Гэй, паслухай,
Чаго тут і хто шукае —
У мяне ж няма чаго красці!»

«Супакойся,
Я — восень,
Позняя восень...
Мне трэба забраць апошнія кветкі,
Што стаяць на тваім стале».

* * *

Без вёслаў лодка сніцца мне
На спіне кудлатай акіяна,
А ў ёй я сцішыўся, нібыта спавіваны,—
Без вёслаў лодка сніцца мне.
І гэты сон за мной ідзе старанна:
На караблі, ў далёкай старане
Без вёслаў лодка сніцца мне
На спіне кудлатай акіяна...

* * *

Дрэвы восенню — рэнтгенаўскія здымкі:
Як аголена глядзіцца кожны сук!
З вамі, дрэвы, сумаваць я пачынаю,
Калі вас нават птушкі абмінаюць —
Баяцца вашых голых, мокрых рук...

* * *

Не ведаю, што робіцца са мной:
Ад дабраты я плачу чалавечай,
Заўсёды плачу ад спагады нечай —
Не ведаю, што робіцца са мной!
А крыўда не ўгінае мае плечы,
Не нікну перад подласцю самой...
Не ведаю, што робіцца са мной —
Ад дабраты я плачу чалавечай.

* * *

Успамін...
Асцюкі успамінаў
Спаць не даюць па начах.
Успаміны, як парушыны
У яго закрытых вачах.

Рэжуць вочы да дня парушыны —
У іх свой няўмольны закон.
Успаміны... Цяжкія ўспаміны,
Дайце заснуць...
Дайце ўбачыць хоць сон
Чалавеку...

Пра ўспаміны будзе і ён...

* * *

Наш самы строгі кат — сумленне,
Што суд найправедны вяршыць:
Непакараных — на каленях
Усё жыццё прымусіць жыць.

Яна заўжды з табою — кара,
Яе ты не абыдзеш мук...
І прарастае праз ахвяру
Сумленне, як даўней бамбук.

* * *

О, колькі званняў з лёгкае рукі,
Не разбіраючы, мы шчодра надавалі,
Хоць ведалі, што будуць хваляваць вякі
Народныя без звання мастакі —
І кавалі,
            і сейбіты,
                        і ткаллі...

## Абдымкі

Я ведаю, мой брат, як рады ты сустрэчы —
Мяне ў абдымках сціснуў ад душы.
Я ж у тваіх руках успомніў довад нечы,
Што і ў абдымках можна задушыць.

* * *

Гэтулькі славы!
Я не бачыў, можа, адвеку,
Каб гэтулькі славы, ды ўсё аднаму чалавеку.
Вадаспад тае славы
падае,
падае градам,
А ён увагнуўся і скурчыўся —
маленькі пад тым вадаспадам.
Хвалі наўкол —
вяршынь не дастаць рукою,
Такія віры —
засмокчуць ураз з галавою.
Нябачна нідзе берагоў —
адно толькі пеннае мора.
Паводка такое славы
ў берагі ўваходзіць не скора.
Плёскаюць хвалі высокія
ў гэтай вадзе каламутнай,
Быццам апладысменты.
А болей нічога не чутна.
І мне неяк робіцца страшна,
бо мне напраўду здаецца,
Што вадаспад гэты можа
галоўнае выплюхнуць —
сэрца...

* * *

Па вузенькай сцяжынцы спрэчкі,
Якая, бы ў гушчарніку, пятляла,
Я бег, ледзь паспяваючы за думкамі,
Якіх таксама кідала ў бакі.

Падбіўся я.
Спацеў і так стаміўся,
Нібыта ў спёку цэлы дзень касіў
Тупой касою...
Раптам, як збавенне,
Мой мозг адчуў прыемнасць прахалоды —
Перада мной ляжала азярцо.
Была то паўза.
Паўза ў нашай спрэчцы.
І я у глыбіню яе нырнуў,
Бо то ж раскоша — свежасцю абдацца,
Каб потым зноў цярпліва даганяць
Пабегшыя уперад думкі
Па вузенькай сцяжынцы спрэчак.

## Бяскрылыя гусі

І свойскія гусі таксама
Добра ляталі калісьці,
І з ветрам умелі спрачацца,
І крылы аб воблакі чысціць.

Цяпер жа яны пасыцелі
І ветразі — белыя крылы —
Што небам, палётамі трызняць,
Да звыклай зямлі апусцілі.

З небам знаёмы па лужах —
Куляюцца ў неба праз спіны...
Жанчыны іх кормяць бацвіннем,
Іх б'юць хлабысцінай жанчыны.

А ім хоць бы што... Калі нават
Радня іх у вырай спяшае —
Скубуць на дажджы яны траўку
І нават галоў не ўзнімаюць.

Навошта ім вырай далёкі —
Дарога ж іх можа скалечыць,
А тут у іх хлеў будзе цёплы
І паранка толькі што з печы.

Гагочуць, валлё набіваюць,
Пра неба забыліся, мусіць...
Якія ж вы, ўрэшце, бяскрылыя,
Хаця і крылатыя, гусі...

## Слова ў спрэчках

Навошта так гучна —
Размова з сэрцам,
Калі ў той размове
Сэрца не б'ецца.

Навошта душу
Раскрываць гэтак смела,
Калі ў той душы
Бяздушнасць засела.

Навошта мне кропля
Твайго неспакою,
Калі ў гэтай кроплі
Мора спакою.

Навошта наогул
Вянок лаўровы,
Калі як хамут
Яго носяць галовы.

## Дуэль

Мы зноў нечакана сустрэліся
З табою, мой стары непрыяцель.
Цяпер мы ўжо вырашым пэўна
Нашую даўнюю спрэчку
На справядлівай дуэлі.
Спяшайцеся, секунданты-думкі,
Набліжайце хутчэй дуэлянтаў
Да ўстаноўленага бар'ера...

І вось мы ўжо блізка...

Страляй жа!
Нарэшце гучыць яго стрэл,
Як выбух карнавальнай ляскаўкі:
— Дзень добры!
І яму адказвае мой —
Ціхі, нібы асечка:
— Дзень добры!

О, д'ябал!
Зноў разважлівыя секунданты
Зарадзілі нашую зброю
Не тымі набоямі...

## Узнаўленне

Мы, нядаўнія лапы, робім складаныя рухі;
Мы, чалавечыя крылы,— звычайныя дужыя рукі,
Мы — нядаўнія лапы.

Мы так сёння песцім Зямлю, што абдзіраемся
самі,
Да крыві абдзіраемся яе ільдамі, лясамі, гарамі —
Так любім Зямлю...

Мы грэем яе, Зямлю, як грэе яйцо квактуха,
Каб з Зямлі чалавек праклюнуўся
і ў неба рукой пастукаў —
Так грэем Зямлю.

Колькі работы тады мы каля немаўля свайго маем,
У бель аблачын загортваем, промнямі спавіваем —
Колькі работы!

Бо ў далёкім, глыбокім зазор'і
Чалавек апярэдзіць мару,
А там яму будзе патрэбна кожная новая пара
Чалавечых рук,
Чалавечых крыл...

* * *

Вы кажаце,
ён памёр?
Не!
Ён проста стаміўся —
Адпачыць прылёг між разор,
Павярнуўся тварам да зор,
Каб неба
напіцца.

* * *

Вада па муку пабегла,
Каб стаць ад мукі гусцейшай;
Малачка шукае зацірка,
Каб стаць ад яго бялейшай;
Малачко пабегла па цукар,
Каб стаць яшчэ саладзейшым;
А цукар пабег па хлеб,
Каб стаць яшчэ болей смачнейшым.
А хлеб пайшоў спаць...

І як толькі хлеб прачнецца,
Як толькі яго разбудзяць —
Цукар стане смачнейшы,
Малачко — саладзейшае,
Зацірка стане бялейшая,
А вада тады стане гусцейшая,
І ўсе яны разам збяруцца
У тваёй у глінянай місе...

Ва ўсіх незлічоных войнах
Тлумачылі гэтак голад
Дзецям на мове дзяцей.

## Наручнікі

Ён уцякаў з фашысцкай катавальні,
З сабою ўзяўшы толькі свае сны —
Свабоды покліч прагны, развітальны.

Наручнікі звінелі, як званы,
Здавалася, ўвесь свет яны разбудзяць,—
Як здраднікі, стараліся яны,

Выслужваліся, як ліхія людзі.
О, як ён ненавідзеў іх тады,
Глытаючы свабоду на ўсе грудзі!

А на губах — ужо быў смак вады,
І рукі пад жалезам так свярбелі,
І на расе — халодныя сляды...

А кайданы усё мацней звінелі.
І што ні крок — грымотны пераэвон.
І кат ужо у звон у гэты цэліў...

Калі ж смяртэльна спатыкнуўся ён,
Зямля аж гулка загула, здаецца —
Такі стаяў на ўсёй планеце звон...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Уцекача знайшлі праз годы дзеці —
Яго, што ў волю блізкую ўцякаў,
Ды не знайшоў яе і на тым свеце.

Наручнікі, што скінуць ён жадаў,
Нібы аўчаркі, упіліся ў злосці,
І рукі сціснула жалеза, нібы ўдаў.

Ды вызвалення ўсё чакалі косці,
Каб вольна ў травах рукі распластаць...
Гніе жалеза так марудна штосьці...

А рукі пад жалезам усё яшчэ свярбяць.

* * *

Усё менш інвалідных калясак
Пад цяжарам вайны рыпіць.
Сімвал нашага мірнага часу —
Дзве нагі,
Дзве рукі!

Усё рытмічней робяцца крокі,
Усё ўпэўненей ногі стаяць.
І радзей на праспектах шырокіх
Грукат мыліц рыплівых чуваць.

І цыгаркі дзвюма рукамі
Ужо круцяць сёння дзядзькі;
І ідуць даўно за плугамі
І сякеры трымаюць самі —
Дзве нагі,
Дзве рукі.

А нядаўна на трох хадзілі,
Спатыкаліся неўпапад.
І махаў тады, нібы крыллем,
Доўга мыліцамі салдат.

Паміраюць салдаты нашы,
Забіраюць калек вякі.
Сімвал нашага мірнага часу —
Дзве нагі,
Дзве рукі...

І таму, можа, з гэткаю ласкай
Немаўлятак песцяць бацькі;
І глядзяць трывожна ў каляскі,
Адкуль вырастаюць, як краскі,
Дзве нагі,
Дзве рукі...

* * *

Я вельмі хачу ў мінулае —
У свет непалоханых птушак...
Добра было б сядзець між іх,
Як роўны з роўнымі,
І глядзець у птушыныя вочы,
Поўныя першабытнага даверу.
Разам грэцца каля агню,
Разам шукацьмець ежу
І потым дзяўбці сабе паціхеньку,
Не спяшаючыся...
Яшчэ болей я хачу ў будучыню —
У свет, не палоханы войнамі,
Дзе людзі не баяцца аўтаматаў і бомбаў,
Забыліся пра канцлагеры
І не ведаюць,
Як паміраюць цяжкапараненыя дамы,
Як назаўсёды змаўкаюць дзіцячыя вочы,
Як пасівелыя за хвіліну маці
Пачынаюць нязвыкла ўсміхацца
І тыднямі калышуць пустыя калыскі...
Людзі, я хачу ў будучыню!

* * *

Хоць і мінула столькі год
І цень вялікі сам я маю,
Ды ўсё ж і сёння ўспамінаю,
Нібыта казку, сонца ўсход.

На бацькавы я рукі ўзлез,
Але ўсё роўна мала толку:
Мой цень дабег да рэчкі толькі,
Яго — сягае аж за лес...

## Трыялет гадоў

Па беражку гадоў сваіх ідзём —
Якая гэта крохкая сцяжынка!
Пад намі, чуеш, крышацца ільдзінкі —
Па беражку гадоў сваіх ідзём.
І дні, як тыя ж крохкія ільдзінкі,
Ламаюцца ў халодны вадаём...
Па беражку гадоў сваіх ідзём —
Якая гэта крохкая сцяжынка!

* * *

Гады твае ў снег паўмярзалі,
Ссівеў ты, нібы Антарктыда,
Дзе людзі, нібы сталактыты,
Сябе ля завей саграваалі.
Хоць думкі твае адчувалі,
Што прыйдзе свабода, як выдых,—
Гады твае ў снег паўмярзалі,
Ссівеў ты, нібы Антарктыда.
Калі ж табе крылы прыслалі,
Ляжалі яны без патрэбы —
Далёкім здавалася неба,
Бо крылы ужо не ўзнімалі —
Гады твае ў снег паўмярзалі.

* * *

Апошні год свой дрэвы адчуваюць —
Яны цвітуць — ажно шалее цвет,
А восенню галіны іх ламае
Пладоў незаваёваны сусвет.

О, дрэваў векавое прадчуванне!
Я паміраць хацеў бы, як сады.
І да майго апошняга дыхання
Мяне хай ацяжарваюць плады.

* * *

Ужо даўно на тым баку планеты
Сланечнік утрапёна круціць галавою —
Маленькі спадарожнік сонца
Спяшаецца за сонцам паспяваць
Па колцу цеснаму арбіты...
У нас жа ноч... І каля нас па кругу,
Як конь сляпы, што спрэжаны з прыводам,
Няўмольна ў цемры ходзіць цішыня —
Яна часамі горш, чым нават лямант,
Не дасць заснуць. Калі ж у нашу памяць,
Асветленую гэтай цішынёю,
Бултыхне атам дробненькі — адразу,
Нібы кругі ад камня па вадзе,
Расходзяцца кругі яго арбіт —
Маршчыны нашых роздумаў над лёсам.
Зноў цішыня... І ў ёй зусім выразна
Мы чуем, як усюды на планеце
Спяшаюцца пясочныя гадзіннікі —
Перасыпаецца бязлітасна пясок...
Ну дзе ты, сонца? Цішыню напоўні
Рабочым гулам і рабочым рытмам:
Няхай усё забегае, заходзіць
Па пракавечных нітачках арбіт.
Вось штосьці дзынкнула... Нарэшце!
Гэта промень
Завёў сланечнік — сонечны гадзіннік.

* * *

Вітанне, раніца!
Пасля бяссоннай ночы
На стол прыселі вершы адпачыць.
Так падаюць на бераг птушкі,
Памераўшы на крылы акіян.

І ловяць дзюбамі разяўленымі промні —
Правеславаць не жарты ж акіян...
І на стале маім,
як стомленыя крылы,
Лісты паперы доўга шчэ трымцяць.

*З кнігі*

## «У ПОЎДЗЕНЬ, ДА ВАДЫ»,

1976 г.

## СТРОГАСЦЬ

* * *

Чысцінёй святліцца слова...
Новы год. Бялюткі снег.
Звонкі ранак, нібы смех,—
Пачынай усё нанова.

Першы дзень. І ты не жыў
На зямлі — ўяві! — ніколі,
Не араў, не жаў у полі
І па снезе не тужыў.

Першы ўздых. Глыток — да звону.
Гэты пругкі дар жыцця
Пі да самазабыцця —
Не спатоліш жад да скону.

Быў ты кепскі. Быў няшчыры.
Не аднеквайся — быў, быў!
І не светла часам жыў —
Пачынай жа новы вырай.

Новы год наўленне туліць.
У надзей — па палазу...
А снягурачкі-матулі
Снежанят дамоў вязуць.

Пад санямі рып, як змова.
Снежанятак чысты смех.
Новы год. Бялюткі снег.
Чысцінёй святліцца слова...

* * *

Здараецца, наплыне дабрыня
І так захопіць дзіўная чуллівасць,
Што ўсё на свеце хочацца абняць,
Да сэрца ўсё прылашчыць беражліва.

Зласлівец — быццам подлы не такі,
І дурань — разумнейшы можа здацца...
Ну, што ж, паганец,— не хавай рукі,
Хадзі бліжэй, не бойся парукацца.

Сп'янелы сонцам, збегшы ад хлусні,
Нібыта чмель, у леце я шчырую.
Усхваляваны ласкаю, усім,
Як волю, дабрыню сваю дарую.

Няслаўя многа меў я на вяку,
Яшчэ нямала ўперадзе такога.
Падай, давер, мне шчырую руку,
І хай пад ногі лашчыцца дарога.

Дарога лечыць, нібы чарадзей.
Дык дзякуй жа табе, зямля святая!
Расіне — «добры дзень!»
І промню — «добры дзень!»,
І звера ўсякага, як друга, я вітаю.

Насмелюся, як поўсць, пагладзіць рунь
І хатам, як бажніцам, пакланіцца;

Расчулены, з крыніцай гавару,
Ля дрэва кожнага, бы хмель, гатоў абвіцца.

Па красках, што сляды мае заткуць,
Я так спяшаюся, бо я павінен
Падняць галоўку кожнаму квятку
І ўзняцца кожнай памагчы травіне...

* * *

Як жа хораша ўваліцца
Пасля ўтомы ў лугакветкі,
Калі воддаль — камяніцы,
Калі поблізу — палеткі.

Перапоўнен ты гудою;
Вочы стомлены раллёю,
Ногі — доўгай баразною,
Рукі — плугам ці касою.

У цішы ляжыш адвечнай,
Распластаны, родны з ёю...
Нават чуеш — плечы ў плечы —
Ты зрастаешся з зямлёю.

І нічога больш не трэба,
І мана — нібы не тая.
Над табой высока неба,
Пад табой — зямля крутая.

Ты між іх. І ў гэтым цудзе
Аж не верыцца ў такое,
Што ляжаць калісьці будзеш
Між зямлёю і зямлёю.

Цішыня — сама нявіннасць,
Ды спакой — не дужа глыбак...

Зварухнулася травіна,
А здалося — ўпала глыба!

* * *

Раніца. Сонца. Ралля.
Трава ўся ў расе — як плача.
Неба. І навісь галля...
Дзе я ўсё гэта бачыў?

Туман. Рачулка. Лугі.
У кожнай расіне — па промню.
Краскі — яшчэ без смугі...
Адкуль я ўсё гэта помню?

Спакой. Цішыня. Авадзень.
Птушкі ўгары крыляюць.
Звініць, нараджаецца дзень...
Адкуль я ўсё гэта знаю?

Бы продак, ляжу ля ракі.
Раса мне ногі халодзіць.
І чую — інстынкт праз вякі,—
Як рыба ў глыбінях ходзіць.

Банальна ўсё. Так, было —
І луг, і птушкі, і дрэвы.
І сонца было, і крыло было,
Былі і птушыныя спевы.

І я, магчыма, ужо быў,
І я ляжаў, можа, гэтак.
І вось праз вякі не забыў,
Як прачынаецца лета.

Было ўсё, было... І ўсё ж —
Раніца. Неба. І промні.
І цёплы — праз сонца — дождж...
Чаму я ўсё гэта помню?

* * *

Чаго дамогся — не цікава,
Што збылося — драбната.
І слава, што была ласкавай,
Нібыта лашчыцца не так.

А мы праз славу, ды праз тую,
Зноў прагнем нейкіх новых дзіў —
Незадаволена прастуем
Шукаць, дзе шчасце нерастуе,
Дзе лёс нам радасць нарадзіў.

Бо нас хвалюе толькі тое,
Што недасяжнае якраз
І што, як промень, залатое,
На небасхіле дражніць нас.

А дасягнеш — і ўсё збудзённіць:
Бы попел сеў на вугалёк.
Паблякне ўсё, што яшчэ сёння
Святочна вабіла здалёк.

А мы ўсё роўна прагнем свята —
Аж да апошняе мяжы.
І дамагаемся упарта,
Бо дамагацца — значыць жыць!

* * *

Адзін аднога крыўдзім порадзь,
Пад сэрца самае — змяю...
І ўсе з крыўдзіцелем гавораць
І нават рукі падаюць.

А як бы добра — адвярнуцца,
Як продкі, выклясці навек,—
Калі усмеліў замахнуцца
На чалавека чалавек.

З пагардай вырачыся здзеку:
Адзін блукай, адзін жыві —
Бо чалавек жа чалавеку
Сваяк найблізкі — па крыві.

Ідзі, ідзі... Не хочаш з намі —
Палюй адзін: дазвол дадзім...
І ты — адзін. І побач — мамант
Скубе... Што зробіш з ім адзін?!

І ты брыдзеш — цяжкі, як вырак,
І крыўда, нібы мыш, шкрабе...
А родзічы у гурце шчырым
Палююць побач.
Без цябе...

* * *

Мой агонь пастарэў на год,
Маё вогнішча вечарэе.
Ачышчае мяне ад нягод
І звядае само, як лілея.

Гавары са мной, гавары,
Мой касцёр крутабокі, святлівы.
Аж да самай да цёмнай пары
Я з табой гаварыць шчаслівы.

Ачышчальная сіла агню,
Я люблю тваіх іскраў завею!
Можа, я тыя дні даганю,
Дзе гады яшчэ ў завязі спеюць...

Успаміны шуршаць і шуршаць,
Як апалае лісце пад восень...
Што ж мы будзем успамінаць?
І што высветліць памяць папросім?

Жыў, здаецца, без звад. Заўсягды,
Як дзяцей, гадаваў свае мары.
І дзівіўся — і дні, і гады
На касцёр ідуць, бы ахвяры.

Ну, ці быў жа шчаслівы, скажы?
Быў! — усім адкажу я натхнёна...
Той шчаслівы да скону, хто жыў
На зямлі на нашай зялёнай!

Нават той, каго лёс не грэў,
Высвятляе жыццё, нібы свята...
Не варушацца кроны дрэў —
Там, у гнёздах, спяць птушаняты.

* * *

А часам, як дрэву, хочацца,
Учапіўшыся за зямлю,
Убіраць адно сонца прагна,
Што шуршавіцца па галлю.

Падстаўляць, даспяваючы, промням
Плод: адзін, потым дру́гі бок.
І піць, у глыбінях здабыты,
Халодны і пеністы сок.

І з пладоў, і з лістоў спакойных
Ціхамірна пыл атрасаць.
Ні пра што, ні аб чым не думаць —
Проста маўчаць...

* * *

У траве пажухлай і счарнелай
Я знайшоў, нібы зялёны промень,
Летнюю травінку, што глядзела
На мае сагрэтыя далоні;

Як дзіця, прасілася на рукі
І аб пальцы цёрлася ў даверы.
Мне яе хацелася адхукаць
Ад дажджын цяжкіх, халодна-шэрых.

Бо навокал вецер шорстка шастаў,
І зямля лядзела ўвачавідкі,
А на ёй, халоднай і лабастай,
Аж святліўся промень гэты кідкі.

Асвятліла ярка наваколле
Полымя зялёнага успышка.
І здалося: адрастае голле,
Зноў лісты варушацца ў пупышках.

Нібы лета абагрэла далі,
Зноў буслоў дачуўся звонкі клёкат.

І здалося: разам заспявалі
Тыя птушкі, што ўжо так далёка.

Але гэта — толькі на хвіліну.
Зноў пры мне асенішча глухая.
Зноў гляджу на летнюю травіну,
Што пчалы настойліва чакае.

Знаў — над ёй сняжынкі будуць віцца.
Мне яе, пазяблай, было шкода...
Я — дзівак. А мо то асалода
Не ў пару вось гэтак нарадзіцца?!

І ў траве пажухлай, пачарнелай
Светла ззяць, нібы зялёны промень.
На зямлі халоднай і скалелай
Грэць чыесьці змёрзлыя далоні.

* * *

Сядзім, смяёмся за сталом
І весялімся, нібы дзеці.
Тады для нас на цэлым свеце
Няма бяды, не тхае злом.

А недзе там, а недзе там
Віруе подласць хваляй бруднай,
І чалавеку дужа трудна —
Так, недзе там. Так, недзе там.

А мы частуемся. Спяваць
Спрабуем шчыра і бадзёра,
Нібы няма на свеце гора
І сіл няма куды дзяваць.

А недзе плач, а недзе мор.
Наш незнаёмы друг распяты,
Укленчыў хтосьці перад катам,
А той — шукае ўжо тапор.

Як птушанё, душа крычыць —
Ты ў свет уключан, бы ў разетку.

І боль чужы — калючы гэткі...
Як памагчы, чым памагчы?

І лекаў для душы няма:
Ці падзяліцца словам шчырым,
Са светам — падзяліцца мірам,
Ці песняй праўду падтрымаць?

Сядзім. Спяваем. Спеў — пад столь.
Мы весялімся, нібы дзеці...
А болю — цесна болю: ў свеце
Перанаселенасць на боль.

* * *

Калі цябе пакрыўдзяць незаслужана
І крыўду гэтую
Сцярпець павінен ты —
Заходзіць сэрца,
Быццам леў узбуджаны,
Агрызкам кінутым разбуджаны,
Абнюхваючы моцныя пруты
Сваёй клеткі...

* * *

Я выходжу з раба пакрысе,
З-пад пачцівасці выбіраюся.
Выпрамляюся, выпраўляюся
І дзіўлюся: я ж як і ўсе.

Дык чаго ж я хадзіў па зямлі
Яе ўгнутым, нягодным сынам;
Мае вочы — дарогі мялі,
Мае рукі — у пыле, у гліне.

Як прыемна плечы размяць
І адчуць іх напятую сілу,

Песню тую на свет заспяваць,
Што даўно ўжо выйсця прасіла.

Ах, як хораша йсці ў повен рост,
Калі ўпэўненасць душу агорне:
Галаву — аж да самых нябёс,
Ногі — ў травы. Па самыя корні.

Як імя, сваю годнасць знаць,
Ад лісліваеці межавацца,
Сарамлівасць рабскую змяць,
І не ўкленчвацца, не прыніжацца.

Бог з ім, з даўнім табою,— з рабом!
Рабалепства, бы скуру, скідаю,
Разагнуцца, узняцца жадаю,
Сонца, неба напіцца нагбом.

Шчырым быць не баяцца ў жыцці
І не думаць ніколі: «што потым?»
Па зямлі — поўным ростам — ісці
І на свята, і на работу.

А калі давядзецца дагнаць
І калі дазволіць дарога,
Як бы добра раба вось такога,
Як сябе, з каленяў падняць.

* * *

Калі ты працаваў адзін за трох
І дыхаў больш, чым могуць твае грудзі,
Калі далей ішоў, чым нават мог,
А ногі не ішлі — ты поўз без ног
К людзям,—

Прашу цябе: застанься сам сабой
І не чакай хвальбы, слоў трыумфальных,
Сустрэч, прамоў, уклубленых у рой,
Згадзіся: ты — пакуль што не герой,
Ты проста чалавек.
Звычайны...

## Пазім'е

Вось і ўсё... Адвірыла лета.
І квятоў, і лістоў нараджала.
Нібы дрэў, напрарошчвала промняў.
І з сабою ўсё гэта забрала.

Толькі вецер застаўся. Нахаба,
Бач, як гойсае ён між садамі!
І апошнія птушкі, зацёртыя,
Як ільдзінамі, халадамі.

Бы краты — карэнне ў глыбіні
Лезе, там цеплыні шукае.
І зямля — рахманая, сцішная...
Засынае ўсё, засынае...

А ў марозы, у цёплай хаце
Прачынаешся сам ад трывогі:
Ці не холадна рыбе ў рэчцы,
Ці не мерзнуць у руні ногі?

* * *

Спатыкнешся аб чэрвень, бывае —
І зімою захочацца піць...
Быццам спёка, як смага, даймае,
Быццам сонца, як задуш, вісіць.

Разамлееш сярод завірухі,
І травою запахнуць снягі.
І сняжынкі, як лёткія мухі,
І сумёты, нібы мурагі.

І, здаецца, як летам — успомні! —
Ты пад сонцам на лузе ляжыш.
А цябе паказытваюць промні,
Бы нядократкі ці мурашы.

Спатыкнешся аб чэрвень зімою —
І забудзеш на ўсе халады...
Ты пабудзь, маё лета, са мною...
Ну, куды ж ты па гурбах, куды?

## Настрой

Надакучыла навісь слаты,
Дзень асенні, як дождж, надакучыў...
Адбярыце ў ветра лісты —
Ім жа балюча!

* * *

Дзе нам баліць, там і душа:
З душы ўвесь чалавек сабраны.
Мы адкрываем нечакана —
Дзе нам баліць, там і душа.
Таму чым большая душа,—
Даўжэй шчымяць і ныюць раны...
Дзе нам баліць, там і душа:
З душы ўвесь чалавек сабраны.

* * *

Ах, мілы конь, ах, мілы косю,
Прабач за даўні здзек. Даруй,
Што запрагаў цябе ў калёсы,
Што й сёння на табе ару.

Так, то ж абраза і пакуты:
Цябе, што вольніцай гуляў,
Спачатку я, схітрыўшы, спутаў,
Пасля — ў рот цуглі — зацугляў.

Кажу сягоння я такое,
Бо ты — нібы ўжо госць у нас:
Перад табою, за табою
Барозніць трактар твой папас.

Што ж, зноў вяртайся ў стан свой дзікі,
Туды, дзе воля, снег, імжа...
Не струнь вачэй на нашы крыкі,
На наша «косю» не зважай.

Калі ж, завеяны па вушы,
Ты цёпла ўспомніш пра аброць,
Тады з ласямі да кармушак
Па дружбе даўняй падыходзь.

Ды хоць спіну не муліць збруя,
Трава — што зблудзяцца чмялі,—
Па мне ўсё роўна засумуеш,
Бо мы ж з табою век зжылі.

І я, спыніўшы трактар раннем,
Цябе пабачыць захачу,
Тваё шчымлівае іржанне
У цішыні палёў пачуць.

І па начлегах, без прынукі,
Цябе пайду я сам шукаць,
Каб гарадскім сваім унукам
Тваё іржанне паказаць.

* * *

І прыйдзе смутак нечакана,
Падсядзе ціха да цябе;
І у абдымкі, госць нязваны,
Бы лепшы сябра твой, зграбе.

І ты сядзіш — не павярнуцца,
Клянеш даверлівасць сваю.
Не для цябе ўжо там смяюцца,
Не для цябе ўжо тут пяюць.

Затое — вырвешся на волю —
Зноў весялішся, як дзіця,
І ловіш, радасны да болю,
Малыя ўсцешынкі жыцця.

Ідзеш у свет — як на малебен,
І ўжо зусім не помніш зла...
Таму і смутак нам патрэбен,
Каб радасць большаю была.

* * *

Кожны дзень прачынаешся з прагаю цуду,
А яго ўсё няма — як будзёніцца ціш!
І дарэмна чакаеш нязвыклага гуду,
Пры якім, нібы ў космас, у свет паляціш.

Так, звычайна усё, як заўсёды — без свята.
І будзёняцца ў шэрані вочы твае,
І зашоргалі ў снежных сумётах лапаты,
І пад кранам вада, як пад лёдам, пяе.

Пад акном неразвіднелым сварыцца хтосьці,
І машыны спрабуюць па веі паўзці...
Ну, а цуд? Ну, а свята?.. Нячастыя госці! —
Ля цябе неяк збоку спяшаюць прайсці.

І сягоння зноў будзе усё, як і ўчора,
Будзе дзень, што на памяць, бы ўрок, завучыў.
І знаёмы аўтобус, і праца — да зморы,
І знаёмая крыўда — як стрэмка ў душы...

Ну, а можа, той цуд, як заўсёды, з табою,
Можа, лепшага свята на свеце няма —
Калі сонца, ўзыходзячы, ў гурбе прыстоіць,
Калі б'ецца, як мятлушка, ў шыбу зіма...

* * *

Пасівела душа, пасівела...
Дзе ж ты, коткая весняя радасць?
Зайздрасць нечая — зазімак белы
Атрасае лісты з майго саду.

І шукае завішна між лісця
Нечапаных пладоў пераспелых...
І дажджы мае быццам імглісцей,
І душа, як сады, пасівела.

Пасівела душа, пасівела
Ад балючай сяброўскай спагуды,
Што, здаецца, каб толькі прымела,—
За табой бы нясдавіла ўсюды.

А сняжынкі спяшаюцца збочыць,—
Мітусіцца завеіна злая,
Нібы сябра нядаўняга вочы,
Што цябе ў завуголлі аблаяў.

Ёсць такія — нічога святога,
Яны ўгразлі і ў плётках, і ў змане...
Не дай Бог вам дажыць да такога,
Калі сябра ваш ворагам стане.

Пасівела душа, пасівела,
Але ёсць і ў сівой свая радасць:
Гэты чысты спакой заінелы,
Гэта ціша зімовага саду...

* * *

Абнаўлення, хлопцы, абнаўлення
Прагнем, нібы ліўня, мы ў цішы.
Абнаўленне — гэта ўжо наўленне
У дарозе стомленай душы.

Абнаўленне — гэта калі промень
Ловіш, як някемлівы хлапчук.
Абнаўленне — гэта калі ў громе
Прагнеш прыручэння гул пачуць.

На ўвесь свет павінен сам іначай
Паглядзець, рассунуўшы галлё...
І сябе самога збоку ўбачыць —
Як чужога, іншага — здалёк.

Абнаўленне вырашае многа
І змывае бруд, нібы рака...
Ці вярнуцца да сябе малога,
Ці сябе ў старым ужо шукаць?

Абнаўленне, хлопцы, абнаўленне,
Абнаўленне кожнае пары.
Нашых крыл здарожаных наўленне
Нам гады паможа прымірыць...

* * *

Зноў мяне прыручаюць дарогі,
Зноў спрабуюць да тлуму змушаць.
Не стамляйцеся ўражвацца, ногі,
Не стамляйся здзіўляцца, душа!

Прыручайце, любімыя, смела —
Я і сам вашай памяці рад.
Колькі шчыра — душою збалелай
Сумаваў я без вашых прысад.

Быў адрокся ад вас — як зняважыў.
Зараз зноў трэба сцежкам гадзіць.
Я выходжу на ростані вашы,
Як малое, вучуся хадзіць.

Цяжка бачыць дарогі праз вокны,
Што шукаюць круты небакрай.
Так і хочацца ў пыльныя скокнуць
І пайсці — толькі кій свой трымай!

Дык прымайце, шляхі, мае ногі
І адразу — у пыл іх, у грунт:
Хай пазнаюць смакоту знямогі,
Хай успомняць загоены гуд.

А дарогі — заўсёды сустрэчы,
«Добры дзень» незнаёмых людзей,
І усмешка, як радасны вечар,
І размова, што ўрунены дзень.

А дарогі — заўсёды трывогі,
Насцярожаны крыху пагляд.
Так, прыемна збірацца ў дарогі,
Ды прыемней вяртацца назад.

А вярнуўшыся з дальняе далі,
Пасадзіўшы ўспаміны на ўлонь,
Ты прыпомніш, як сам на прывале
Прыручаў, бы вавёрку, агонь.

* * *

У няпростым гэтым свеце
Лад такі нязвыклы нам:
Спіцца соладка,
як дзецям,
Усяму-ўсяму спрытна.

Спяць лісулі-задавайкі,
Дрэвы спяць і песні спяць.
Нават пуджаныя зайкі
Спяць, што й стрэлам не падняць.

Спяць вавёркі-варушынкі —
Не ўзнімаюць галавы;
Нібы ў небе аблачынкі,
Спяць пушынкі ля травы.

Спяць шакалы-завывалы —
Не скуголяць між сабой;
Пахавалі змеі джалы,
Спяць, скруціўшыся ў сувой.

Мішка выпусціў гармонік —
Спіць...
А побач — дрэмле ўдаў.
І ў даверы грыву конік
На клыкі ваўку паклаў.

Цягніку дарога сніцца,
Трактар неба не капціць...
Нават побач,
на масніцы,
Цёплай плямкай сонца спіць.

Вее гэтакім даверам,
Першабытным гэткім сном.
І не рыпнуць дзверы зверам,
Дзень не ўскрыкне пад акном.

І ніхто не абзавецца.
Цацкі спяць. Спіць цішыня.
Будуць спаць, пакуль прачнецца
Гаспадар іх — хлапчаня.

Вось тады — гайда не тая:
Ранак грымне у дуду.
Зноў машыны загукаюць,
Паравозы загудуць...

I ўсё будзе як у жыцці.

## Там, у дзяцінстве

Там дарагое ўсё такое,
Там заўжды цёплая зямля,
Бо для дзяцей адно і тое ж —
Жыць і гуляць...

* * *

Калі з выраю птушка вяртаецца ў свой небасхіл —
У яе ўжо не два, а мільёны крыл.

Калі лань уцякае — далей ад няўвыклых трывог:
У яе не чатыры — мільярды ног.

А калі чалавек у свой вечар няблізкі ідзе,
Колькі ног ён вядзе, за сабою вядзе!

Іх пазнаць можа столькі стаптаных сцяжын і дарог,
Што хапіла б для ўсіх ненатомленых ног...

Маладых яшчэ ног.

## Вяртанне з хваробы

Спаталенне шорсткай смагі,
Вадаспадаў мройны гул...
I калючыя, як шпагі,
Вочы прывідных акул.

Адплываюць, падплываюць,
Б'юць хвастамі па вадзе...
Хто іх шчэлепы стрымае,
Хто іх вочы адвядзе?

Адплываюць. Там, дзе востраў,
Крута робяць віражы...
І нібы ў касілках,— востра
Зубы ходзяць, як нажы.

Засланяешся рукамі
Ад іх позіркаў тугіх...
Кожны ўсплёск — нібыта камень,
Нібы хвалі — берагі.

Зніклі ўсе. Не стала гушкаць.
Дзень па кроплі ў ноч цячэ...
Цішыня... Спявае птушка...
Сонца... Промень на шчацэ...

## Пералёт дажджу

Калі дажджуеш у самоце
Пад шэпт суцішаны дажджын,
Здаецца, з імі ты ў палёце,
А не вось тут — адзін, адзін.

Здаецца, з імі — ёсць патрэба! —
Ляціш, вяртаешся здаля
З халоднае краіны Неба
Ў краіну цёплую — Зямля.

Вяртаешся дамоў, як птушкі,
Ляціш, як вырай, на сады;
І вольным лётам пазагушканы,
Вясеннім небам пахнеш ты.

Дажджыны шэпчуцца наўкола,
Паспешна крыллем шапацяць.
А з імі ты ляціш, вясёлы,
Да ніў — зялёнага жыцця.

Спяшаюць з выраю дажджыны
У землянь, вясновы пах;
Хто зачапіўся за травіну,
Хто, бы ў калыску, ў ліст упаў.

Дурэюць, лашчацца малечы,
Куляюцца ў траве сваёй...
Бо ўсе мы радыя сустрэчы
З ласкавай, роднаю зямлёй.

І ўсё ж дажджынак шэпт трывожыць,
На іх спакусліва глядзець,
Калі ляцець ты ўжо не можаш,
Калі так хочацца ляцець...

* * *

Не вернуцца годы — мая радня,
Жыццё, нібы лета, міне...
Нашу настальгію па тых па днях,
Калі ўжо не будзе мяне.

А хто ў тым далёкім леце, чужым,
Як я, вось так прыйдзе на луг
І будзе ісці асцярожна — як жыць,
Каб не наступіць на пчалу.

І хто залюбуецца — гэтакі дзень! —
І ўсцешыцца святам маім:
Вось апляла травінка прамень
І лезе да сонца па ім...

* * *

Іду звычайнаю сцяжынай
Па лузе звыклым да ракі.
Звычайны ветрык лашчыць дрэвы,
Звычайны веташок вісіць.

Кусты срабрацца — як заўсёды,
Звычайна шэпчацца трава.
Нагою звыкла адчуваю
Тугія кропелькі расы.

Вось-вось узыдзе сонца звычна,
Птушыны грымне звыкла грай...
А я іду такі шчаслівы —
Нібы вяртаюся з вайны.

І думаю: о Божа мілы,
За што, звычайнага мяне,
Ты так адорваеш багата
Вось гэтай радасцю, зямля?!

## Уваходзячы ў мора

Ах ты мора, бяскрайняе мора,
Столькі хваль — не злічыць на вяку.
Я ж пазнаць хачу ў хвалі каторай
Свае рэкі, што ў мора цякуць.

Можа, Свіслач мне тут адгукнецца,
Прыпяць плясне,— як рыба амаль...
А Аршыца да ног прыгарнецца —
Як заб'ецца ад радасці сэрца:
Я пазнаю яе паміж хваль.

* * *

Прадвесне. Птушыныя гнёзды.
Без птушак сумуюць лясы.
А іней марозны — як роздым,
А сівер — як ждала касы.

Няўтульна ў настылых пушынах —
Халодзіць нагурблены снег.
І змёрзся тут шчэбет птушыны
І дрэў абвяселены смех.

І птушкі далёка ад хатаў.
А ў гнёздах, што цепляць жаду,
Пушыстыя, як птушаняты,
Вясеннія промні гудуць.

* * *

Ах, як вяселіцца гай пад сугрэвам,
Ах, як смяецца вясною лес!
Бы пад карыцу вясновым дрэвам
Смяюн-смяюнчык шчыкотны ўлез...

* * *

Ты хіба яго не стрэціў?
Ён жа толькі што праходзіў,
Шэрай світкай, нібы вецер,
Атрасаў расу ў гародзе.

Запрагаў каня ў калёсы
І кляпаў касу вясёла,
Па ваду спяшаўся босы —
Журавель рыпеў, што кола.

Падымаў кароў, цялушак,
Выганяў іх, рупны, ў поле;
І ў шпакоўні сам да птушак,
Каб збудзіць іх, шкробся голлем.

Пасабраў ён зоркі ў торбу,
Дзе было з цыбуляй сала,
Стуль жа выцяг сонца горбу,
Што на хлебе спачывала.

Ты хіба яго не стрэціў?
Ён жа толькі што праходзіў.
Ў шэрай світцы, нібы вецер,
Летні ранак дзень прыводзіў...

* * *

Такою ранішняй часінай
Мы бачым свет наадварот:
Не ў небе сінім, а ў расіне
Купае крылле самалёт.

* * *

Тры прыгаршчы вады ў крыніцы...
Чаму ж хвалюе так яна?
Чаму мне адусюль відна —
Тры ж прыгаршчы вады ў крыніцы.
І я спяшаю — пакланіцца,
Запомніць, плыткую, да дна...
Тры прыгаршчы вады ў крыніцы.
Чаму ж хвалюе так яна?

## Вада

> Вада — бясколерная, празрыстая
> вадкасць без паху і смаку.
>
> *З даведнікаў*

Хто сказаў — вада без паху?
Хто сказаў — вада без смаку?
Той, відаць, не смяг у спёку
І ад смагі ў суш не млеў.

Той, відаць, вадой не трызніў,
Не хапаў яе у жмені —
Калі боязна рассыпаць
Нават кропельку ў траву.

Той не мроіў ёй — да тлуму,
І не прагнуў — да трымцення,
Калі п'еш, і ўсё, здаецца,
Не спатолішся ніяк.

Той, відаць, не поўз пустыняй,
Не ўсыхаў у акіяне,
Калі пахі ўсе і смакі —
У глытку пітной вады.

У глытку, што як дажджынка,
У глытку, што як расіна,
На лістку, бы на далоні,
Гэтак зманліва дрыжыць.

І ўжо ў гэтай нават кроплі —
Усе колеры вясёлкі.
Хто ж яе знаў бескалёрнай?
Божа мой, які дзівак?!

Хто ваду наспех пакрыўдзіў,
Хто ваду спрытна абразіў?
Хто сказаць мог так будзённа
Пра таемнасць — пра ваду?..

Веру я: і ён, сасмаглы,
Толькі ўбачыўшы расіну,
Закрычыць, бы звар'яцелы,
З дзікай радасці:
— Ва-да-а!

## Малітва прашчура

Бог ураджаю,
Я цябе шукаю,
Я цябе запрашаю,
Я цябе малю —
Сыдзі на зямлю.
Зірні на нівы,
Зірні на колас:
Хай хмары грывы
Распусцяць наўкола.
Зямля просіць дажджу,
Чым я яе напалашчу?..
Пашлі ты нам Лівуна,

Пашлі нам Церабуна,
Пашлі хоць Цурчана,
А нельга — дык хоць Каплюна,
А ў засушы нас не пакінь.
Амінь...

Каб коласу даць напіцца —
І я згодзен так маліцца.

## Лета. Акварэль

Палі пасмяглі.
                    Навакол звінела
Паветра перасушана.
                              Густы
Быў поўдзень.
                    І дзе птушка села —
Кусціўся пыл.
                    Што жухлыя лісты,
Шуршэла лета.
                    Спёка, як трывога,
Вісела над жытамі.
                              І ратай
Глядзеў, задумлівы, на ніву.
                                        А дарога
Стамлёна бралася
                         на самы небакрай —
Далей,
Далей,
Далей —
У цень Зямлі...

## Сенаванне

І пахнуць мятлушкі лугамі,
Шуршавіць сена ля нагі.
І цішыня, як тая птушка,
Спусціла крылле на стагі...

## Эскіз

Прысланіўся да ліўня тугога спіною натомленай
 · і гляджу з-пад далоні, удзіўлены,
Як перад самай сцяною дажджу хапатліва
 мак пад сонцам таўкуць камары...

* * *

Бы схаваную ў кветкі мелодыю,
Шукаюць настойліва пчолы,
Я лаўлю гэты гуд вясёлы,
Бы схаваную ў кветкі мелодыю.
Я не бачу нікога наўкола,
Я сам-насам сягоння з прыродаю —
Бы схаваную ў кветкі мелодыю,
Шукаюць настойліва пчолы.

## Ручай

Сачу празрыстыя струмені
Сярод сутоння серабра.
Санлівай сіні сум асенні
Спяшаю ў песні пасабраць.

Звініць званком звонкагалоса,
Задумна зойдзецца здаля.
Ад звону зумкага, здалося,
Загалубілася зямля.

Булькоча балаўнік без стомы —
Бы бесядзь будняя бабуль.
Булькоча, быццам будзіць бомы:
Буль-буль, буль-буль...

За ім скакаў я бесклапотна —
Куды ж, пястун, мяне завёў?..
Баюся здацца старамодным:
Няма ўжо гэткіх ручаёў!

## Мелодыя на званах

Прысніў-
ся мне
звон дзіў-
ны ў сне.

Прыйшоў
я ў гай —
мой жоў-
ты край.

Дзе звон
травы —
як брон-
завы.

І звон
лістоў —
да сон-
ца зноў.

Чубы
відны,
нібы
званы.

Паглядзь,
любы́ —
звіняць
чубы!

Ад сон-
ца звон
у грон-
цы крон.

Той звон
бяроз
праз сон
прарос.

Прачнуў-
ся... Сны...

Зіма...
Спакой...

Як хто
стрымаў
званы
рукой...

* * *

Добры дзень табе, вечар!
Добры дзень табе, ноч!..
Сена пад плечы,
Зліпанне воч.

Добры дзень табе, раніца!
Добры дзень табе, дзень!..
Чалавек спяшаецца,
Пчала гудзе...

* * *

І ўсё ж не марна ў сцішанасці весняй
Чакаў, сасмаглы, дзіва я штодня:
Праз цішыню праклюнулася песня,
Як птушаня...

## Вясновае

Быў час любові. Ўсё спявала —
І між травы, і між галля.
Здавалася, яшчэ не знала
Такое раніцы зямля.

Скрозь — ад травы і да вярхушак,
Ад каранёў і да аблок
Кахаўся лес, сталіца птушак,
Буяніў сок.

* * *

А мы з табой, бы ў рай, у гэткі
Луг абраскошаны зайшлі,
Дзе матылі — нібыта кветкі
І кветкі — быццам матылі.

Дзе ўсё злілося —
неба, травы,
І сонца пах, і рук святло,
І дотык ветрыка ласкавы,
Як матылінае крыло.

Крыляюць мятлушкі і краскі—
І луг і неба ў матылях.
Здаецца, з добрай твае ласкі
У крылле ўбралася зямля.

Лятаюць мятлушкі — па пары,
Па пары — лашчацца квяты.
І мне з табой шчасліва марыць
Пра ўсё вось з гэтай ціхаты.

А цішыня — нібы цунамі,
Бы вецер, што наш луг садзьме...
І толькі мятлушкі над намі—
Усё па дзве...
Па дзве...
Па дзве...

* * *

Калі ў вачах — вачам аж цесна,
Калі ўміраеш ад уцех,—
Чаму, скажыце, гэта грэшна,
Чаму завецца гэта грэх?

А я за грэх. За той, што дорыць
Нам радасць новага жыцця.
За грэх святы, за той, каторы
Аж за стагоддзі — наш працяг.

Жыццё і грэх — заўсёды разам,
Не варта іх распалучаць.
І найвялікшая абраза
Любоў і Ласку грэхам зваць.

Калі шчасліва ласкавее
І добрыцца цнатлівы смех,—
Нашто, скажыце, як завея,
Як асуджэнне — слова «грэх»?

Пра грэх — каханне! — кожны марыць.
Што ж ты паказваеш, рука:
Супроць каго змагацца зараз
І дзе бязгрэшных мне шукаць?

Ад першага граху — ад Евы—
Мінула столькі лет і зім.
Ды што ж паробіш, калі ўсе мы
Той яблык і дасюль ядзім.

Грашым ласкава і цнатліва,
Нібы сумеўшыся крыху.
І ўсім у тым граху шчасліва...
Дык слава гэткаму граху!

А грэх, наш бусел, носіць дзеці
У хату, юрту і ў вігвам.
Адаме! Ева! Дзякуй вам:
З-за вас — і мы жывём на свеце!

## Чаканне цябе

Чакаю я цябе. А ты не звоніш:
Званок унурана маўчыць, бы хто наняў.
І нібы хрушч у стомленых далонях,
Шуршыць, як адзінота, цішыня.

Як холадна мне без цябе. Імглiста.
Пакой зімой і сіверам прапах.
Бы дзьмуць вятры з усіх бакоў са свістам,
А я стаю на гэтых скразняках.

Чамусьці толькі сэрца прадзімае,
І ля яго — ільдзінкай халадок.
Чакаю — як ільдзінку адганяю...
Чаго ж маўчыш, устуджаны званок?

Ах, холад! Што да сэрца прычапіўся?
Званок... Як спеў... Так звоніш ты адна...
Здалося, жаўранак з-пад купіны ўсхапіўся.
Павіс у небе... Ты — нібы вясна,
Мая каханая!

## Начная размова

— Мне прыснілася, родны мой:
Ты цалаваўся жадліва з другою.
Там, пад нашай вярбою, цябе абдымала
Дзяўчынка вясёлая, лёгкая, тая...

— Дарагая, няўжо ты яе не пазнала?
Супакойся, навошта — адразу з тугою?
То ж была, вер мне, ты...
Толькі тая яшчэ,
Толькі тая яшчэ,
Толькі тая яшчэ—
Маладая...

## Тваe рукі

Тваe рукі, тваe рукі нада мною,—
Нібы лебедзі над белаю зімою.
Як ласкава яны кружаць
І са мной па леце тужаць,
Нібы лебедзі над белаю зімой.

Цяжка, рукі, расставацца з вамі дужа
І без вас мне аставацца паміж сцюжаў...
Не ляціце, рукі, ў вырай,
Нада мной кружыце шчыра—
Нібы лебедзі над белаю зімой.

Я люблю, як твае рукі нада мною—
Нібы лебедзі над белаю зімою,
Як яны садзяцца міла,
Склаўшы крылы, склаўшы крылы,—
Нібы лебедзі над белаю зімой.

Калі лашчаць валасы мне твае рукі—
Слухаю, бы песню, я іх рухі.
А яны пяюць шчымліва
І крыляюць палахліва,—
Нібы лебедзі над белаю зімой.

## Музыка для закаханых

Адкуль, адкуль ён, гэты лёгкі сум?
Яны ж кахаюць, бачыце,— кахаюць.
Кахання свайго чыстую красу,
Як немаўля, абачліва люляюць.
Адкуль, адкуль жа гэты лёгкі сум?

Шчаслівыя. Нашто ім сумаваць
У гэтым свеце ласкі і пяшчоты,
Калі ад шчасця кружыць галава
І светла так ад шчырасці і цноты—
Шчаслівыя. Нашто ім сумаваць?

Ды ўсё ж — як музыка шчымлівая, туга
Праз радасць прарастае непрыкметна.
І шчасце — як адчай, і ласка — бы смуга,
І боязь, боязь страціць усё гэта.
Таму — як музыка шчымлівая, туга.

А рукі спазнаюць пяшчоту рук.
І вочы — вочы. Вусны лашчаць вусны.
І страшна гаварыць. Здаецца, змовіш гук—
І знікне ўсё. Няўтульна стане. Пуста...
Маўкліва спазнаецца ласка рук!

А музыка тужліва так шчыміць,
І ў светлаце так хораша на сэрцы...
Трывожна-радасна ў такой харашыні,—

Нібыта зараз трэба ім памерці...
І музыка тужлівая шчыміць,

Напоўнены каханнем, як жыццём,
Як цішыня — жадлівыя абое.
Памруць яны — памрэ, здаецца, ўсё;
І цэлы свет патушаць за сабою,
Напоўнены, як ласкай, пачуццём.

Адкуль, адкуль ён, гэты лёгкі сум?
Яны ж кахаюць, бачыце,— кахаюць.
Кахання свайго чыстую красу,
Як немаўля, шчаслівыя, люляюць.
Адкуль, адкуль жа гэты лёгкі сум?

## Рыфма пра каханне

Знай, дужы вецер, абы не зла дзея,—
Знайду — жывеце, рабыня, ў зладзея!

* * *

Было тады
Сяло Сады.
Цвілі гады,
Нібы сады.
Шумеў наш сад,
Не меўшы звад.
І ў полі спеў
Паволі спеў.
І ты была—
Квяты нясла.
І я ў вясне
Стаяў, бы ў сне:
Спакусны ўзлёт
І вуснаў злёт.
І ціш вачэй
Паміж начэй...

Сяло Сады,
Сяло Сады
Цвіло тады
Там, нібы дым,
Нам маладым...
Сяло, сяло...
Было... было...
Сады, Сады...
Тады... Тады...

* * *

Сумую я па лыжным следзе...
Спакусна лашчыцца лыжня,
А навокал, як вокам згледзець,—
Цнатлівы снег і цішыня.

Твой ціхі след пазнаю лёгка,
Бо ля яго суседзіць мой.
Да сварак, звад яшчэ далёка—
Адной мы дыхаем зімой.

І халадок зімы на вуснах,
Сняжынкі плавіць дабрыня.
І гэтак хораша, спакусна
Твой след, як вецер, даганяць.

Ці ведаў я лыжню такую?
Яе, магчыма, й не было...
Па гэтым проста я сумую,
Калі — па сэрца замяло.

А дзве лыжні я недзе бачыў,
А мо прыдумаў нават сам,
Як сімвал вернасці юначай
Тваім снягам, тваім лясам.

І я хацеў бы, каб заўсёды
Імчалі поруч дзве лыжні,
Абняўшыся, як тыя годы,
Вясёлыя, як тыя дні.

І ўспамінаюцца самотна
Зіма і снег — як даўні доўг.
А мы далёка ў незваротным
Ад той лыжні, ад тых слядоў.

Як час спяшаецца імкліва—
І толькі ляскаюць гады...
А я вяртаюся, бы ў дзіва,
І бачу тыя зноў сляды...

## Амаль буколіка

Я зноў, каханая, з табою.
Мы ў красках вязнем лугавых—
Не бачым неба над сабою,
Не чуем пад сабой травы.

Турбуе нас адзіны клопат,
Адзіны клопат нас вядзе.
І мы ідзём, прыроды вопыт,
Абняўшыся, як ноч і дзень.

Цяпер і мы — сама прырода.
Мы ў гэтым лузе прараслі,
І з нашых рук сасніла згода
Спляценне прагнае галін.

І мы — свае у гэтых раннях.
Хай бачаць дрэвы — хай сабе!—
Як я, стрыножаны каханнем,
Кружу слухмяна ля цябе.

## Чыстае слова

Не дакранайцеся да гэтай чысціні—
Навошта ўспамінаць яго будзённа!
Няхай яно, цнатлівае, звініць,
Бы свята ў нашай пошласціякдзённай.

Не мацайце здаволена яго,
Не пацірайце рукі ў нецярпенні
І не гукайце ў сыты карагод,
Як дзеўку, не садзіце на калені.

Навошта прыручаць яго, цугляць—
Няхай яно, як вецер, будзе вольным
І неаб'езджаным, бы ў стэпе дзікім коні,
Яму, як птушцы, дайце пакрыляць.

Не забаўляйцеся ім, сцішаным, прашу,
Як ледунец той, не качайце ў роце,
Бо жывіць слова гэтае душу
І цепліць сэрца, што жыве ў згрызоце.

Не дакранайцеся да гэтай чысціні—
Яго ж у знемажэнні ўспамінаюць...
Няхай яно, нявіннае, звініць,
Як свята,— слова чыстае: «Кахаю!»

* * *

Я хачу вярнуцца да цябе
Краскай ціхай ля ўтравелай сцежкі,
Засланіць зямлю сваёю ўсмешкай—
Я хачу вярнуцца да цябе.
Каб мяне пазнала ты ў жальбе,
Прыгарнула да свае усмешкі.
Я хачу вярнуцца да цябе
Краскай ціхай ля ўтравелай сцежкі...

## Жанчына спявае

Плытчэюць крыўды і плёткі,
Глыбініць песня жывая.
А, чуеце, здорова ўсё-ткі,
Калі жанчына спявае.

Не плача і не смуткуе,
Не сварыцца і не рыдае...

Сама для сябе такую
Ціхую песню спявае!

Значыць, усё ідзе ладам
І ў хаце, і ў цэлым свеце:
Няма дзе прыткнуцца звадам,
Няма дзе бядзе прысесці.

Сям'ю мінаюць хваробы,
І родзіць, бы лес той, жыта.
Соладка спіць круталобы
Сынок, накормлены сыта.

Значыць, і дом іх дыхтоўны,
Абмінулі каханне марозы;
Значыць, і муж цудоўны,
Прыходзіць дамоў цвярозы.

І ў самой удаецца работа...
Ціхата навакола такая!
Злагада ў чалавечых сотах.
Мір. Ні ў кога ніхто не страляе.

Ад кахання — ну тая ж дзяўчынка:
Цесна ў сэрцы і бэзу, і маю.
А на вуснах — быццам пушынка:
Кахаю,
        кахаю,
                кахаю...

Для песні трэба прычына,
Для песні трэба нямала...
Шануйма ж гэтак жанчыну,
Каб яна і ў будні спявала!

* * *

Калі, ад шчасця захмялелы,
Стаіш, як дурань, між дарог,—
Не ўспамінаеш, што балела,
І забываеш, што бярог.

Паволі развінаеш плечы,
А на душы — такі спакой.
Тады здаецца — будзе вечна
Імгненне радасці такой.

Няма тугі, няма напасці,
І не збалелы ты ані,
І задыхаешся ад шчасця,
Нібы ад стромай вышыні.

А навакол — смяюцца людзі,
Струменіць цёплае святло...
Спакойны да таго, што будзе,
І да таго, што ўжо было,

Стаіш. Трымціш ад прагі весняй.
Не бачыш, радасны, таму,
Як жаўранак з трывожнай песняй
У бездань неба патануў...

* * *

А збудзённіць паланенне,
Стоміць твой утульны рай,—
У другое вымярэнне,
Бы да бою, паспяшай,

Звыклы дзень — нібыта клетка,
Сцеражэ душу тваю:
Там і ўзімку, і улетку
Сам з сабой, з нудой ваюй.

Бы аплецен павуцінай
Твой пакой і твой спакой.
Выбірайся, нібы з ціны,
З насалоднасці такой.

І спяшайся на завею,
І пазнай мяцеліц смак
Там, дзе ўсё нязвыкла неяк,
І усё — не так, не так...

Давярацца сцежкам можна.
Ну і што, калі зіма!
Бач, і вецер спадарожны,—
Толькі ветразя няма.

Не бяда! Мы — ветры ў жмені
Пазбярэм, як лейцы, ўсе.
І ў другое вымярэнне
Нас завея панясе...

## Белыя вароны

«Белая варона» — кажуць пра тых,
хто «не ўмее жыць».

Трывожна ў небе крыляе
Чародка белых варон.
У іх вачыма страляюць,
Рагочуць ім наўздагон.

На іх паказваюць пальцам,
Злуюцца нават на іх—
Навошта, маўляў, выдурняцца
І родзічаў ганьбіць сваіх?

Былі б, як усе вароны—
Чорныя, як нуда.
А белыя — незаконна,
Белыя — нешта не так...

Да чорных мы ўсе прывыклі—
Ад дабра ж не шукаюць дабра —
Нашто белізна іх — як выклік,
Ну, што яны ўсё мудраць?!

«А можа, да сонца ляталі—
Ад промняў злінялі там?»
«Ну, што вы — таксама сказалі!
Якое тут сонца вам!»

Вось бачыце, як нялёгка
Белай варонаю жыць,

Вось так у аблоках высока
Над звыклым гуртам кружыць...

І ўсё ж сёй-той спачуваў ім —
Як чародцы гэтай сваяк...
Такі ж дзівак нечуваны,
Гэткі ж чуллівы, як я...

## У гасцях

І стаю я на вашай высокай вяршыні,
Я адбіўся ў рацэ вашай чыстай і сіняй,
Мне ваш вецер ласкава ўзлунаць памагае—
Запрашае ляцець над нязведаным краем:
Там, дзе песня віруе між скалаў глыбока,
Там, дзе мова — арлоў непрыручаны клёкат,
Там, дзе маці для кожнага ласку спяліла...
І ад шчасця ў мяне аж выростаюць крылы.
А не верыце, можа,— памацайце самі:
За спіною трапечуць яны ветругамі...

Я шчаслівы ад думкі: і ў мяне гэтаксама
Ёсць радзіма свая, свой народ, свая мама.

## Да біяграфіі майго народа. І

Паводле плана «Ост» фашысты планавалі знішчыць і выселіць на ўсход 75 % беларусаў, а 25 % — анямечыць.

*З БелСЭ*

І хадзіў бы Міколка Гансам,
І крычаў бы: «Цурук! Цурук!»
«Хайль!» — рычаў бы, нібыта ў трансе,
І ўскідаў бы кінжалы рук.

Боты, як капыты, падкавана
Яго б цяжка па свеце вялі.

І захопнікам звалі б паганым
На сваёй, на роднай зямлі.

І гарой — за радзіму чужую.
На сваю пакрыкваў бы: «Вэк!..»
Вось не знаеш імя, не чуеш —
І ты ўжо жудны чалавек.

Роў бы — фюрэру слава, слава;
Слава — жорсткасці, слава — вайне.
І не знаў бы: пад час аблавы
Нарадзіўся і сам пры сасне.

Яго мама — была партызанкай,
Партызанам — і тата быў.
Ля яго расстралялі іх ранкам,
Ён — радзіўся яшчэ да стральбы.

Сын айчыны і ціхай і смолкай,
Дзе пра волю — і хаты і лес...
Ну, няўжо б, скажыце, з Міколкі
Выйшаў некалі галаварэз?!

Не, не веру! Ў чужыне далёкай
Покліч роднай крыві б не зачах.
Ён пазнаў бы Радзіму лёгка
Па нянавісці ў добрых вачах.

І таму, калі нелюдзі зноўку
Будуць трызніць пра новы прымус,
Помніць трэба, што ты — Міколка.
З партызанскай зямлі.
Беларус.

## Паранены партызан

Я паўзу ўжо даўно па снезе,
І за мною — паўзе след даўгі.
Я ўлядзеў, абмарозіўся ў лесе...
Падпаліце снягі,
Падпаліце снягі!

Хай сняжынкі трашчаць, як ядловец,
Як лаўжы, хай сумёты гудуць.
За агнём —
чужаніцы не зловяць,
Што па следзе крывавым ідуць.

Ах, блакада — удаў валавокі!
Як тваё нас сціскалі кругі.
Я адзін... Лес абмерзлы навокал—
Падпаліце снягі,
Падпаліце снягі.

Каля снежнага полымя сяду,
І сагрэўшыся каля агню,
І адзін я прарву блакаду,
І атрад свой адзін даганю!

За блакадай — сябры баявыя,
Партызанскія нашы сцягі...
А аўчаркі блізка так выюць...
Ну, паліце ж снягі,
Паліце... снягі...

## Перамога

Берлін яшчэ дыміўся і смуродзіў,
І гарам пах — і зблізку і здаля,
А недзе на радзіме, як на сподзіў,
Зямлёй — і толькі! — пахла ўжо зямля.

Сяўба, сяўба там! Беляць лемеш гоні.
Ралля халодзіць ногі. Цешыць пот...
Здалося, заіржалі нават коні
З тых Брандэнбургскіх здымленых варот.

І гар перабіваючы, і порах,
Раллёй гарматы ўпахлі, як плугі.
Салдаты разумелі: скора, скора
Падсцелюцца пад ногі ім лугі.

Глядзелі з прагай на жалезных коней,
І «косю, косю» грэлася — як пах.
І так свярбелі з несцэрпу далоні,—
Нібыта лейцы — вось яны! — ў руках...

## Пытанне

У каго запытацца,
ад каго суцяшэнне пачуць
Вось на гэтым наш боль,
што адвеку кляты:

Няўжо
у адну вайну
ад салдата радзіўся хлапчук,
Каб у другую памерці салдатам?

* * *

Я люблю цябе да скону,
Я люблю цябе да звону,
Я люблю цябе з вагона,
З самалёта, з карабля,
Цёплы шарык мой зялёны,
Ціхі шарык мой зялёны,
Мікрашарык мой зялёны—
Несхадзімая зямля!

На табе — вясна віруе,
На табе — зіма снягуе,
На табе — і лета чуе:
Восень у лісці шуршыць.
Я цябе знайшоў такую,
Я цябе адкрыў такую,
Зберагу цябе такую,
Покуль буду сам я жыць.

Вось таму змаўчаць не можна,
Вось таму баіцца кожны:
Над табой, такой мурожнай,
У павевах вецярка,
Чуеш, як зусім трывожна,
Як нахабна і трывожна,
Дзесьці здружана трывожна
З мечам шэпчацца рука.

* * *

Гэта дрэва шукае свайго бусла,
Гэта лодка чакае свайго вясла.

Зачакаліся весніцы рыпу гасцей,
Комін — дыму са скваркай, ды найгусцей.

Кропля — ў лузе шукае найплодных мясцін,
Каб пасеяцца ў ім, хмаркай ціха ўзысці.

Неба птушак чакае, пупышкі — цяпла,
Сніць узятак зімою завейнай пчала.

Поле — прагне абуджаных сонцам зярнят,
Вёска — новых, праpослых ля вуліцы, хат...

Гэта ж песня гукае свой сціплы народ,
Каб у ім прарасці хоць на дзень, хоць на год.

* * *

У мяне шмат радзім не было,
У мяне — ёсць адна радзіма.
Беларусь! Нібы сцяга крыло,
Я гатоў цалаваць тваё імя.

## Роднае слова

> У 1697 годзе сейм Рэчы Паспалітай забараніў складаць дзяржаўныя дакументы на беларускай мове.
> У 1867 годзе царскі ўрад спецыяльным загадам забараніў беларускую мову.

Цябе забаранялі, як скрыжалі,
І адбіралі, быццам бы сцягі,
А крэслілі,—
здавалася, збівалі:
Як ад шпіцрутэнаў сінелі пісягі.

Цябе забаранялі, быццам свята,
Нібы злачынцу заціскалі рот.
А ты і з-за выкрэсленняў,
нібы з-за кратаў,
Глядзела на знямелы свой народ.

Бы ў цэлях, у архівах думкі вязлі...
А ўчуўшы покліч вольнае сурмы,
З-за кратаў словы,
нібы тыя вязні,
Сцягі жаданыя выносілі з турмы—
Да нас, пакуль нямых...

* * *

Зразумець, што ты — народ,
І ад радасці ўзвінуцца,
На любы яго зварот,
Як на імя адгукнуцца.

Са сваёй Радзімай ты—
Назаўжды адно і тое ж;
І маленькай свалаты
Ад яе ты не прытоіш.

Зразумець, што ты — народ,
Які ў свеце часта хваляць.

Жыць за племя, жыць за род,
Што схавалі часу хвалі.

Памагчы араць і жаць
Нетаропкаму ратаю.
Яго ніву паважаць,
Бо яна ў яго — святая.

Нібы маці, берагчы
Працаўніцу нашу — мову,
Бо яна — жыцця зачын
І пачатак песні новай.

За народ ісці на бой,
Помніць, правячыся боем,
Што стагоддзі за табой
І стагоддзі — прад табою.

Твае раны ўсім баляць.
Нас ратуюць, як ад смагі,
І спрадвечная зямля,
І раскрыленыя сцягі.

Зразумееш, ты — народ,
Крык, як радасць, не стрымаеш
І падыме, нібы ўзлёт:
Я народ свой, людзі, маю!

# РАСКАЛЬЦАВАНЫЯ ПТУШКІ

## Да біяграфіі майго народа. II

Хто мы такія і ці многа мы перажылі?
Спытайце пра гэта
Нават у нашых птушак.
Ды і мы самі можам расказаць,
Як нясмела пасля войнаў вяртаюцца
у спаленыя вёскі
Першыя ластаўкі;
І як потым —
Нечакана і нязвыкла —
Кідаюцца ў вочы іхнія гнёзды на папялішчах:
Светлыя —
На чорных, абгарэлых бёрнах-галавешках,
І чорныя —
На светлых,
Яшчэ не дарубленых вянцах
Новых хат...

## Адказ на анкету

— Што такое шчасце?
— Гэта дзеці,
Што ва ўсіх краінах свету
Пад развяселеным, някрыўдным
І зусім не страшным небам
Радасна і ўсмешліва
Махаюць ручкамі цягнікам —
Цягнікам, якія ўжо забыліся,
Што можна спяшацца на фронт,
І паціху, асцярожна вяртацца адтуль —
З параненымі...

## Да біяграфіі майго народа. III

Народзе мой, народзе!
І як ты толькі выжыў!
Ты ж мог звар'яцець.
Зайсціся ад плачу і гора.
Задыхнуцца ад крыку.
Памерці ад нянавісці
Пасярод звар'яцелага агню,
Які, з паразяўлянымі пашчамі,
Вартуюць аўчаркі, аўтаматы і...
Людзі.
Народзе мой, народзе!
Жудасна ўявіць нават,
Што рабілася ў тваіх спаленых вёсках,
У дымных хатах, хлявах і стадолах?
Што гаварылі дзеці,
Задыхаючыся полымем і дымам?
(Відаць, прасілі адпіхнуць ад іх агонь.)
Што рабілі дарослыя?
(Відаць, яны абгарэлымі рукамі
Трымалі палаючыя стрэхі —
Каб тыя не абваліліся
На дзіцячыя галоўкі,
І, мёртвыя, паміралі яшчэ раз —
У агні.)
Народзе мой, народзе!
Ты ж мог пасля гэтага
Зрабіцца чалавеканенавіснікам.
Здавалася б,
Хіба можна пасля такога смяяцца?
Жахліва!
Цалавацца?
Блюзнерства!
Сябраваць?
Немагчыма!
А ты застаўся дабрадушны,
Шчыры і ветлівы —
Такі, як і да вайны.
Ты зноў сябруеш з людзьмі,
Запрашаеш іх у госці.
І нават немцам гаворыш:
— Калі ласка, суседзі, паедзем у Хатынь...

## З успамінаў

— А мая ж ты матачка,
А мая ж ты дочачка,
А мая ж ты сястрычачка...
А пакінула ж ты мяне сіраціначкаю...
А яшчэ ж нядаўнечка
    мы з табою грэліся
    у цёпленькай хатачцы.
А яшчэ ж нядаўнечка
    мы з табою варылі
    нашым дзетачкам
    есцейкі.
А яшчэ ж нядаўнечка
    ты мяне разумела з паўсловачка
    і тваё полымка
    хінулася, куды мне трэба было...
А мая ж ты печачка!
Хто ж цяпер маіх дзетачак абагрэе,
Хто ж маіх сіраціначак накорміць...

Ноч.
Завіруха.
Вайна.
Папялішча...
Лашчыць печ,
Падсабляе дзяцей на яе, халодную, завеяную,
І, нібы па нябожчыку,
Галосіць па спаленай карнікамі хаце
Партызанская ўдава...
Яе галашэнне слухаць жудасна.
А ўявіце, як немагчыма чуць
Плач яе дзяцей...

## Закатаваны

Божа мой, вызвалі ты мяне ад сэрца:
Відаць, зараз гэта самая найвялікшая раскоша
і насалода —
Нічога не адчуваць...

* * *

Ты кінуў слова ў мяне.
Цяжкое, нібыта камень,
Сагрэты ў даланях
Ці, можа, нават запазухаю...
Вось яно ляціць —
Чуеце, як свішча, гэтае слова-камень?!
Тваe зубы сціснутыя.
Вочы — аж узрываюцца ад нянавісці.
А твар задаволены...
Ты з асалодаю абтрасаеш рукі,
Як чалавек, што ўрэшце
Паспяхова здзейсніў штосьці даўно-даўно задуманае —
Няхай сабе і брыдкае.
Камень імкліва вырастае
І на вачах павялічваецца ў памерах —
Відаць, так
Імкліва набліжаецца і вырастае Зямля
Для птушкі,
Якая праз секунду разаб'ецца аб засохлую дарогу.
Можа, адхінуцца?
Навошта!
Можа, пераняць гэты, нагрэты злосцю, камень
І кінуць яго назад —
Табе пад ногі?
Не варта!
Шкада толькі,
Што я не паспею —
Часу ж адна секунда —
Нават рассмяяцца
У твой пыхлівы твар...
Нічога, ты ўсё роўна абараняйся:
Я рассмяюся пасля —
Калі друзам і пылам ападзе ля маіх ног
Тваё слова-камень...

* * *

Чаму я ў юнацтве не збіраў дні,
Калі іх было так многа...
Якая б зараз была ў мяне калекцыя!

Можна было б адкрыць свой музей
Ці, на ўсялякі выпадак, хоць бы выстаўку.
Вось яны, дні —
Задумлівыя і развяселеныя,
Бесклапотныя і заплаканыя...

Зараз толькі — асірацелы, без юнацтва —
Зразумеў,
Што тады,
Калі я плакаў —
Трэба было смяяцца,
А калі смяюся —
Плакаць...

* * *

Вы кажаце, гэта дзед? Гэта ж бацька,
Што столькі сыноў павыкрыльваў у людзі,
А сам са старою застаўся ў прасторным, астылым
гняздзе.
І зараз глядзіць з-пад далоні напружана —
На ўсход і на захад, на поўдзень і поўнач глядзіць,—
З якога шчаслівага боку яны пазлятаюцца ў госці.

Вы кажаце, гэта бацька? То ж хлопец,
Які яшчэ чуб аніяк свой не можа прыгладзіць,
Які сарамліва, зацята сядзіць на ігрышчах,
Нясмела танцуе, бывае. Калі ж дакранецца знячэўку
Да дзявочых грудзей неразбуджаных — так чырванее,
губляецца:
Нібыта такое ў жыцці і ёсць непрыстойнае самае.

Вы кажаце, гэта хлопец? Не, хлопчык,
Якому хадзіць так нязручна, а поўзаць — так лёгка:
Па красках, масніцах і па каленях у маці;
Дзіця, немаўлятка, у якога ўсё яшчэ дзесьці
наперадзе
(Песні і праца, каханне і дзеці, розум і слёзы),
Усё, апрача аднаго — нараджэння.

Вы кажаце, то немаўлятка? Ага, немаўлятка!
Якое так плакала шчыра, калі прараразаліся зубы,
Якое смяялася радасна, калі абдымала каханую,
Якое радзела ад сілы, калі касавішчам махала,
Якому святлела ў хаце, калі ў ёй дзяцей
прыбаўлялася,
Якое вось так незаўважна ссівела і састарэла,
Што зараз ужо і не крыўдзіцца, калі яго называюць
Дзедам, дзядулем...

## Ау!

Я крычу:
— Адгукніся, мая будучыня!
Ты крычыш:
— Адзавіся, маё мінулае!
Ён крычыць:
— Адклікніся, маё сёння!
Дзіўна,
але ўсім нам
Адгукаецца рэха аднолькава —
Як у дзяцінстве:
— Ау!

* * *

А зямля,
Відаць, таму і круглая,
Каб ніхто
Не мог сесці ў цэнтры
Ці ў якім зручным кутку
І пагардліва сказаць іншым:
— Мы — абраны Богам народ,
А вы — нашы рабы...

Людзі,
Не давайце рабіць зямлю вуглаватай!

* * *

Давайце адзначаць дні нараджэння дрэвам!
Збяромся ў лес, пасядзем сярод іх
І, адкашляўшыся ў кулак — ад хваляванняI—
Пачнём прамовы юбілейныя казаць:
Маўляў, мы любім вас і паважаем,
Але, як і сябрам сваім найлепшым,
Саромеемся пры жыцці — у вочы —
Аб гэтым прызнавацца.
Ды вы й самі,
Нібыта продкі нашы — хлебаробы,
Не помніце сваіх дзён нараджэнняў —
Калі за працаю было іх святкавацьI
А ўспамінаў хто-кольвек вам між іншым —
Адмахваліся вы:
«Якое гэта свята!..»
Дык вось —
са святам вашым, цётка Елка!
(У вас кара — нібыта ў цёткі Лёксы
Ад сівераў парэпаныя рукі...)
І вас з днём нараджэння, дзядзька Клён!
(Прысадзісты, плячысты — вы падобны
На дзядзьку Аляксея, што нясе
Капішчу сена — як зялёны стог...)
І вас з семсотгадовым юбілеем,
Дзядуля Дуб!
Сабралі вы падлесак
І баіце малым, як казку, праўду
З жыцця дрэў пракаветных і лясоў.
(Вось так і нас сабраўшы ля сябе,
Калі усе былі на сенаванні,
Нам баіў гэтаксама дзед Кузёмка —
Але былі то казкі пра людзей...)
Са святам вашым кожнадзённым, Дрэвы,—
Цярплівыя і сціплыя, як Людзі —
У лесе ж знойдзецца штодзень хоць голька,
Якой якраз сягоння юбілей...
Давайце ж адзначаць дні нараджэння дрэвам,
Пакуль яшчэ далёка да памінак,
Калі — ля пнёў! — тужліва ўспамінаюць:
— Як сціпла пражыла на свеце цётка Вольха...
— Які харошы чалавек быў дзядзька Вяз...

* * *

Радзіма, дай мне аднойчы
забыцца на цябе,
расстацца з табою,
страціць цябе,—
Каб я, задыхаючыся ад настальгіі,
мог, зняверацы,
яшчэ больш зразумець,
як я люблю цябе...
Радзіма, калі і ты любіш мяне,
не карай гэтак сурова,
не дазваляй мне
такога жаху —
страціць цябе...

* * *

Недзе ў далёкім краі,
У тайговай драўлянай хаце,
Напаленай па-сібірску,
Ты, разамлелы, прылёг...
І ўжо закідвае невад
У свае глыбіні дрымота,
Каб налавіць, бы язёў тых,
Поўную хату сноў.

І раптам — як збуд сярод ночы —
На нізкай дашчанай столі
(Праз смугу палахлівай дрымоты
Пазнаў ты добра яго):
Скача імклівы коннік —
Сучкоў і ліній стварэнне —
Нібы прымчаў ён са столі
Бацькавай хаты тваёй.

І ўжо ў тайговым краі,
Дзе дрымота ўцякла за дзверы,
Табе хочацца конніка тога
У далоні цёплыя ўзяць,
Каб яго адагрэць, адхукаць,

Бо ён жа скакаў праз завеі
З далёкае бацькавай хаты,
З дзяцінства твайго
Да цябе,
У тайгу...

## Да пытання аб руках

Напалі на мяне ветры,
А я, хоць і з такімі рукамі-ручышчамі,
Не змог ад іх, чуеце, абараніцца...

* * *

Некалі
Нашы прашчуры
Віталіся за руку,
Каб праверыць,
Ці не стаіўся ў руцэ сябра
Які камень...
А я, нават і не вітаючыся з табою,
Ведаю,
Што ў тваім кулаку —
Валун...

* * *

Чаму мяне ў снах
Апошнім часам так даймаюць цягнікі?
Усе яны,
Не пазнаючы мяне, самотнага,
Імклівяць паўз вочы, не спыняючыся.
А калі і спыніцца каторы —
Дык усё роўна
Усе дзверы ў ім наглуха пазачыняныя,
Усе вокны шчыльна пазавешаны —
Паспрабуй сядзь!

І я зноў
Астаюся адзінокі на якімсьці незнаёмым і чужым
Паўстанку...
І гэта якраз тады,
Калі мне абавязкова трэба
Некуды ехаць,
Альбо — і таксама абавязкова!—
З далёкай далячыні
Вяртацца дадому...

* * *

Слухаю песню конікаў.
Слухаю толькі як музыку.
Я не хачу разумець іх мову
І не хачу дапытвацца,
Пра што яны
Так натхнёна размаўляюць...
Бо
Як жа мне будзе балюча,
Калі я, спазнаўшы іх мову,
Збянтэжаны і абражаны,
Зразумею раптам,
Што яны зусім не спяваюць,
А ўсяго толькі
Сварацца між сабою...

## Малюнак

Вазьміце шарготкае лісце,
Дадайце прыціхлае сонца,
Палі цішынёй ахініце,
З лесу павыганьце птушак,
Ваду ўхаладзіце у рэчках,
А ў неба, пабляклае неба,
Пусціце ключы жураўліныя —
Няхай невясёла курлыкаюць...

Цяпер адыдзіцеся крыху —
Здалёк на малюнак зірніце:

Так, атрымалася восень.
Але ж не стае ёй чагосьці,
Распранутай да сарамлівасці.
Магчыма, дажджу схаладалага
І смела-нахабнага ветру,
Што ліпне да кожнай пупышкі.

Ага, не хапае і дрэваў
З валасамі — галінамі мокрымі,
Дзе ад ветру хаваюцца кроплі —
Нібы слёзы стабуненых птушак;
Дзе, як сцюжа,— збялелыя, белыя —
Да малюнка, ужо ўхаладзелага,
Падкрадаюцца першыя зазімкі,
Без якіх яшчэ восень — не восень...

Што? Малюнак зімовіць вам рукі?
Вы на пальцы і пэндзаль падыхайце,
Каб закончыць хутчэй карціну
Да завей, што завязвае восень.
А то, крый Бог, яшчэ памарозіць —
Бач, як холад гусцее з'інелы —
Тыя веснія, цёплыя кветкі,
Што ўзышлі на суседнім малюнку...

* * *

Як прабабка мая казала:
— Жыта;
Як бабуля мая спявала:
— Жыцце;
Як мама мая ласкавела:
— Мова,—
Так і для мяне да скону —
Жыта;
Каб так і для сына майго —
Жыцце;
Каб так і для ўнука майго —
Мова...

Свая мова —
З веку ў век.

## Падарожнік

Аб краскі паабіваўся мой плашч,
Аб вецер сцёрліся шчокі,
Сонцам запарушыліся вочы,
Чаравікі і тыя збіліся аб дарогі...

Такой бяды!
Я нават босы — няхай збіваюцца і ногі!—
Усё роўна
Настойліва буду ісці
Да сваёй Меккі —
Да сваёй мэты...

# ВЯНОК САНЕТАЎ

## Жанчына

Ты — женщина, и этим ты права.
*Валеры Брусаў*

I

Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх
Пачаўся свет — ласкавы і пакорны.
А што было, скажыце мне, да іх
У заінелай з нелюбі прасторы?

Як грэліся б ад позіркаў цяжкіх
Мужчыны у сваім мужчынскім горы,
Калі б цябе не выснілі вякі —
Цябе, што гэтак шчодра ўсіх адорыць.

Прыйшла ты — кветкі выраслі ля хат,
І гнёзды нараджалі птушанят,
І цёпла стала ўсюды, нібы ў леце.

Мужчына усміхнуўся сам сабе,
Бо зразумеў, самотны,— за цябе
Няма нічога ласкавей на свеце!

II

Няма нічога ласкавей на свеце,
Як чуць тваё святочнае імя,
Цябе, яшчэ нядократкаю, стрэціць
І позірк сарамлівы пераняць.

І са спакусаю змаганне весці,
І зразумець, што свет твой — чысціня,

І лаяць вусны — іх жа не адвесці,
Іх, нібы хваляванне, не суняць.

Шаптаць у радасці «Кахаю» — як замову,
І цалаваць у лёце твае словы —
Мой дзень пагодзіцца ад іх, ад іх.

І, несучы святло тваё праз годы,
Да ісціны дайсці, што назаўсёды
З'яднала нас прырода удваіх.

III

З'яднала нас прырода удваіх,
Як два крылы — свайго палёту прыклад,
Як два вечназялёныя гаі,
Як хвалі дзве, што абняліся звыкла.

Я да цябе, сасмаглы ўвесь, прынік,
Ты да мяне, шчаслівая, прынікла,
І радасная тоеснасць, бы крык,
На ўсе вякі адна — адна! — узнікла.

І хто сказаў, што наш саюз — палон,
Што, нібы крыж, цяжкі і сумны ён?
Я ўсё жыццё яго гатовы несці!

З табою не цяжкі ніякі крыж:
На нас, сівых, ты строга паглядзіш —
І мы дабрэем пры табе, як дзеці.

IV

І мы дабрэем пры табе, як дзеці,
І галаву кладзём табе ў прыпол.
Мы, неслухі, даёмся нават песціць
І зла не заўважаем навакол.

І супакойваемся ў ціхай песні
Ад свету тлумнага, што меле нас на змол.
І нават чуем, як далёка дзесьці
Спадае ліст, бы мятлушка, на дол.

Калі ж ты і параніш нас, бывае,
Сама і лечыш — хутка зажывае,
Як ты душы кранешся, ран саміх.

І зноў ля нас засвецяць шчодра промні,
І мы тады з удзякаю успомнім:
Тваё жыццё — як бліскавіцы міг.

V

Тваё жыццё — як бліскавіцы міг.
Да войнаў — землятрусаў нечаканых —
Праводзіш ты мужоў, сыноў сваіх,
А сустракаеш — немасць пахаванак.

Свой чорны жаль на свята хоць здымі,
Ідзі на хрэсьбіны — у смех гулянак...
Хай крэматорыяў жахлівыя дымы
Мінаюць новых дзетак і каханых!

Ідзі, прымай жа новых немаўлят:
Паболей свят для новых трэба хат —
Застолле кожнае цябе прывеціць.

Твая прысутнасць нам спакой дае.
Як вочы добрыя і светлыя твае,
Твая усмешка век нам цёпла свеціць.

VI

Твая усмешка век нам цёпла свеціць,
І мы ідзём на гэтае святло.
Зімою ад яе, збудзіўшы вецце,
Давер'е — наша дрэва — скрозь цвіло.

І дзе б мы ні ўмярзалі на планеце —
Каханне ўсюды гнёзды ў нас віло.
Праз турмы, голад, холад, ліхалецце
Тваё святло дадому ўсіх вяло.

Вярталіся, адвыклыя, мы з войнаў
І слухалі, як у цішы спакойнай
Твой шэпт ля вуснаў радасна прыціх.

Усмешка плакала твая ад шчасця,
Што мы, мінаючы усе напасці,
Спяшаем да цябе з нягод усіх.

## VII

Спяшаем да цябе з нягод усіх,
Каб бачыць, як твае світаюць вочы,
Каб груз нялёгкі радасна насіць —
З сабой насіць і дні твае і ночы.

Мы не баімся рук тваіх зусім,
Калі яны абвіць нас шчыра хочуць.
Мы ведаем, ты волю нам дасі
І ласку ў сарамлівасці дзявочай.

Каханне — клетка? Дык такой бяды —
Хутчэй туды, хутчэй хачу туды,
Абы з табой — хай і ў няволю, ўрэшце...

Любіць цябе — як усё роўна жыць,
Нібы да сонца ліст, мой век к табе спяшыць,
Як на кругі свая спяшае вецер.

## VIII

Як на кругі свая спяшае вецер,
Так мы спяшаем на твае кругі.
Цябе шукаем, дзе сляды ў суквеццях,
Дзе ў сонцы і ў дажджынах спяць лугі.

Як хораша, пужлівую, прыкмеціць
Там, дзе няма ні сварак, ні тугі,
Дзе мы з табой дваіх. Ды яшчэ трэці —
Вялікі свет — нам шырыць берагі.

Табою, сарамлівай, любавацца
І разумець, што каб табе прызнацца,
Не хопіць ва ўсім свеце, мусіць, слоў.

І ўчырванець у гэты міг шчаслівы,
Што сам — усё ж нячысты, памаўзлівы,
А ты — святая, як сама любоў.

IX

А ты — святая, як сама любоў,
Цішэеш ад абуджанай надзеі.
Адчула: за дваіх віруе кроў
І за дваіх душа ўжо ласкавее.

Цяжарная, нялоўкая ты зноў.
Пакорнасць светліць з-пад дрыготкіх веек.
Надзею носіш, ціхая, без слоў,
І сама з надзеяй маладзееш.

Хвалюешся і плачаш, можа, ўпотай —
Твае не за сябе, а за яго турботы,
Хто прыйдзе ў свет наступнікам бацькоў.

Даруй нам, што ў балеснасці вялікай —
Заўсёды з плачам і заўсёды з крыкам —
Раджала фараонаў і рабоў.

X

Раджала фараонаў і рабоў,
Герояў і нікчэмных палахліўцаў,
Сама ж ішла ты чыстай між вякоў
І толькі чысціні магла маліцца.

Мы ўсе, мы ўсе з тваіх надзей і сноў...
А ты трывожышся, табе не спіцца:
Хто ж б'ецца каля сэрца зноў —
Сусветны геній ці які п'яніца?

Малодзяць маці ўдалыя сыны,
І старацць — як няўдалыя яны,
Хоць і раслі аднолькава як быццам.

І ўсё ж раджай, жанчына, нас раджай,
Гадуй, спялі, наш вырай памнажай,
Каб жыццядайнасць не магла спыніцца.

XI

Каб жыццядайнасць не магла спыніцца,
Ты ў гэтым свеце хараства жывеш.

Пакуль ты ёсць — працяг наш будзе віцца
За далеч часу — без канца, без меж.

Ты неперасыхальная крыніца
І поўная заўжды — не перап'еш.
Табой ніколі нам не наталіцца.
А дзе ж шукаць ратунак смазе? Дзе ж?

Яно нярэдка гэтак вось бывае,
Што смага — смагу большую раджае,
Дабро — несупакоенасць дабра.

І мы, да слёз расчуленыя самі,
Вяселімся, што ты заўсёды з намі:
Ты — маці, жонка; ты — дачка, сястра.

XII

Ты — маці, жонка; ты — дачка, сястра.
Ты маеш столькі за жыццё абліччаў!
Хоць ты — такі ж, як мы, мужчыны, прах,
А ўсе цябе аздобай свету лічаць.

Дачку мы не стамляемся гушкаць,
З сястрой — супольнасць шчырая за звычай,
Мілуем жонку, носім на руках,
І маму, калі цяжка дужа, клічам.

Былі дзяўчаткамі усе бабулі,
І ўсіх дзяўчатак старасць папрытуліць:
Там вочы ўжо не так, не так гараць.

Але, жанчына, сумаваць не трэба:
На гэтым свеце і пад гэтым небам
Твая заўсёды гожая пара.

XIII

Твая заўсёды гожая пара —
Красуе і вясною і пад восень.
І павуцінкі — завязь серабра —
Цябе малодзяць, нібы маю просінь.

Ты не саромейся гадоў. Гадоў гара —
Нібы для нівы спелае калоссе.
Хто будзе за ўраджай сябе караць?
За тое, што жыццё, як сон, збылося?

І восенню суцішнай, і зімой
Нам хораша, журботная, з табой
З красы жыцця і ў старасці дзівіцца.

І маладую у табе спазнаць
Не перашкодзіць нават сівізна —
Дазволь, жанчына, ў ногі пакланіцца.

## XIV

Дазволь, жанчына, ў ногі пакланіцца
За тое, што змагла мяне радзіць,
Што я трымаўся за тваю спадніцу,
Калі вучыўся, немаўля, хадзіць.

Што памагла каханню нарадзіцца,
Што навучыла ўсё вакол любіць,
Што свет адкрыла, ім дала здзівіцца,
Каб гэтым змог і ўнукаў я здзівіць;

Што, дзеўчанё, мяне пацалавала,
Што потым шчыра век мяне кахала —
І як нам хораша было ўдваіх!

Што засланяла ласкай ад няслаўя,
Што цеплыню заўсёды адчуваў я
Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх.

## МАГІСТРАЛЬ

Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх
Няма нічога ласкавей на свеце.
З'яднала нас прырода удваіх,
І мы дабрэем пры табе, як дзеці.

Тваё жыццё — як бліскавіцы міг,
Твая усмешка век нам цёпла свеціць.
Спяшаем да цябе з нягод усіх,
Як на кругі свае спяшае вецер.

А ты — святая, як сама любоў —
Раджала фараонаў і рабоў,
Каб жыццядайнасць не магла спыніцца.

Ты — маці, жонка; ты — дачка, сястра,
Твая заўсёды гожая пара.
Дазволь, жанчына, ў ногі пакланіцца.

*З кнігі*

## «УСМІХНІСЯ МНЕ»,

1984 г.

### Усміхніся мне

А ты ўсміхніся радасна-журботна,
Здымі цяжар і з сэрца і з душы,
Аб вусны маю стому патушы —
Як я пазнаю дотык іх ласкотны!

Быў дзень цяжкі, быў дзень завельмі слотны,
У сэрцы панамёрзлі ледзяшы.
Адхукай іх, мяне разварушы,
Каб я наноў зрабіўся бесклапотны.

Што я кажу! Прашу ў цябе спагады,
Хоць ты сама ішла праз тыя ж звады,
Трымцела на усіх вятрах жыцця.

І я якраз далонямі сваімі
Цябе адаграваць заўжды павінен —
Ты ласкі прагнеш, нібыта дзіця.

## Жыццё

Ціша над лугам такая,
Як птушка ў гняздзечку жыве.
Сонечны промень шукае
Штосьці ў зялёнай траве.

Краскі, бы гронкі салюта,
Святочна ўзлятаюць з зямлі.
Пахне і мята, і рута,
Гудуць клапатліва чмялі.

Вецер ласкавым павевам
Перабірае лісты.
Чутна, як дыхаюць дрэвы
І размаўляюць кусты.

Птушкі смяюцца і дзеці —
А смех іх шчаслівы такі!
Над імі — чысцейшы на свеце
Незамутнёны блакіт.

На лузе, нібыта на свяце,
Стаю ў неспатольнай любві...
Як боязна ўсё гэта страціць,
Як страшна ўсё гэта згубіць.

І быццам дзіця, гэтаксама
Ў здзіўленні гляджу на траву:
— Як рады, як рады я, мама,
Што проста на свеце жыву!

* * *

Варта ў крылы паверыць свае,
Трэба ў крылы свае паверыць,
А нам смеласці ўсё не стае,
Каб свой край на свой лёт перамераць.

Крылы нашы — для радасці, мар,
Крылы нашы — для працы і свята.

Крылы — лішнія, крылы — цяжар,
Калі ў іх не верыш зацята.

Крылы цісну́цца пудка к спіне —
І адкуль сарамлівасць такая?
Хто, як ветразі, іх развіне?
А Радзіма чакае, чакае...

Каб пад намі зямля паплыла,
Каб вятры захадзілі над намі,—
Трэба верыць у сілу крыла
І абняць Беларусь крыла́мі!

* * *

Як радасна, мой дружа, разумець,
Што наш народ не пагражаў нікому,
Не нападаў, не гнаў нікога з дому
І ў дом чужы не нёс ніколі смерць.

Ён ціха жыў і трудна працаваў,
Араў зямлю, навіў рупліва хаты,
Хоць сам ён жыў спрадвеку небагата,
Ды ўсім, хто прагнуў хлеба, хлеб даваў.

Зямля і воля мараю былі.
І на вайне ён спавядаўся полю,
Як птушку, грэў заўжды пад сэрцам волю,
Каб зноў араць і сеяць на зямлі.

* * *

З роду я хлебасеяў —
Сэрца ў ніве ўрасіў.
Я і сеяў, і веяў,
І араў, і касіў.

Сын нязводных ратаяў,
Унук жніва і сяўбы.
Пашанота святая
Стуль да ўсходаў любых.

Праўнук поля, што струніць
Рупна дзеда саха,
Я дажджу прасіў руні,
Сонца ніве благаў.

Спадкаемец зярнятам,
Пераемнік вазоў.
Для мяне было святам
Жыць паміж каласоў.

Там, дзе хлеб шанавалі,
Бы зямлю, я сталеў,
Дзе раллю цалавалі,
Быццам хлеб на стале.

Родзіч даўні палеткам,
І сярпам, і плугам.
За сяброў былі кветкі
Маім босым лугам.

Як дзіця — роднай хаце,
Жыту — крэўны сваяк.
І ў зярняці, бы ў маці,
Грэшны, верую я!

## Элегія

Мой бацька быў як зросшыся з канём
І, хоць ішоў па баразне за плугам,
Сам плуг цягнуў. Таксама і калёсы
Усцягваў на пагорак — стомлены, змакрэлы,
Ён напінаўся болей за каня,
Шукаў нагой зручнейшае апоры,
І дыхаў цяжка, і спяшаўся так,
Нібы ягонай пугай іх абодвух
Хтосьці невідомы падганяў.
З канём, здаецца, ён не разлучаўся,—
Хіба што еў асобна, а ваду
З адной ракі з ім піў, з той самай аблачынкі,
Што люстравалася ў нятоптанай вадзе,—

Адна на двух. Пароўну
Абодвух аблівалі іх дажджы,
Сушыла сонца, ветры прасавалі —
Аж пара туманілася вакол.
Сляпні ім, потным, дакучалі. Заедзь
У вочы лезла, а яны
Не разлучаліся ніколі — ўсё аралі.
І жаўрукова песня ім на спіны
Падала і разбівалася — званочкі
Скочваліся, бышцам пацеркі, ў барозны:
На жаўруковай песні, як на шчырым гноі,
Рос, кажуць, дужа добры ураджай.
І я з маленькім, танканогім жарабяткам
Пасвіўся на поплаве. Як хораша і бесклапотна
Падбрыкваць нам было пад сонцам на выгодзе,
Не думаючы ні пра што. І мы таксама
Павінны з ім былі зрасціся і па часе
З'яднацца у адно. З якой надзеяй
На нас глядзелі бацька мой і конь,
Конь, стомлены плугамі і гадамі.
І ўсё ж мы не зрасліся — воля лёсу!
А жарабятка — брат мой і таварыш —
Тым часам выбралася ў добрага каня.
Конь плуг цягнуў і вёз у пуню сена,
Снапы падвозіў з поля к малатарні,
І ўсё глядзеў, і ўсё мяне чакаў,—
Каб аб'яднацца з братам у адно...
Не дачакаўся — не пусціў мой горад,
Конь, мусіць, у чаканні састарэў,
Напэўна, недзе на барознах ці на лузе,
Падмяўшы пахкую, як лета, канюшыну
Ці ўжо набраклы восенню бульбоўнік,
Апошні раз зірнуў з тугой на сцежку
І сціх каля неперспектыўнай нейкай вёскі
(Што ж, конскі век каротшы за людскі).
А я астаўся — як адзін з блізнят,
Не спраўдзіўшы вялікую надзею
І бацькі, і каня. І вось цяпер,
Калі мне дужа зімна раптам стане,
Я, быццам вінячыся, грэюся маленствам
І ўспамінаю луг, як свет, шырокі,
Дзе мы дзяцьмі гулялі з жарабяткам,
Успамінаю бацьку, што заўсёды
Быў зросшыся з канём...

* * *

Шануйце зямлю нашу ўвесну,
Што ўся аддалася сяўбе.
Як ёй жывецца, балеснай,
Семя прыняўшы ў сябе?

Шкадуйце зямлюсю ўлетку —
Цяжарныя хлебам палі.
А ўсё, што з надзеяю гэткай,
Хіба зневажалі калі?!

Беражыце зямельку ўвосень —
Спакойна раджае няхай
Усё, што ў сабе яна носіць
Ад сеялкі і лемяха.

Не чапайце зямліцу зімою,
Што нібы парадзіха ў сне.
Гордая стомай сваёю
Няхай і яна адпачне.

* * *

Ты ласкі прагнеш, нібыта дзіця:
І радуешся шчыра і злуешся,
І плачаш адначасна і смяешся
Ад лішку чысціні і пачуцця.

Мы удваіх. Кудысьці у прасцяг
Імчыць Зямля нас нестрымана. Цешся,
Што мы адны на гэтых дзіўных сцежках,
Адны у непрадбачаных гасцях.

Ніхто нашу самоту не спагудзіць,
Уцёкі нашы зразумеюць людзі,
Разгледзеўшы і зблізку і здаля.

Ты чуеш космасу халоднага павевы?
Ляціць няўмольна некуды Зямля —
У самы знак задыякальны Дзевы.

* * *

І не абтросшы з ног дарожны пыл,
Пыл сцежак і шляхоў, пыл селяў і такыраў,
Я да знаёмай вёскі набліжаўся. І яна
Здалёк з'явілася на небакраі, як зярнятка,
І да яе сцяжынка ручаілася, пакуль
Зусім у гэту крапку не ўпадала. Як даўно
Не быў я ў гэтай вёсцы! І таму
З якім сардэчным заміраннем я глядзеў,
Як большала яна, расла увачавідкі,
І распускалася, нібы пупышка,
І разварочвалася шчыра прада мною,—
Як усё роўна хто пад шклом павелічальным
Паказваў мне яе. Спачатку я убачыў
Толькі дрэвы — жоўтыя, асеннія, як полымя,
Асветленыя сонейкам закотным. А затым
Пачаў ужо між іх распазнаваць
І ліпы, што спрадвек шумяць ля школы,
І вербы ля балотца, што на загуменні,
І яблыні чырвона-белыя ў садах.
Пасля і хаты ўбачыў, што смяяліся,
Здаецца, кожнаю асветленаю шыбінай,
І вуліцу між імі, што струменіла
Сцяжынкамі па мураве да хат.
О Божа мой! Напружыліся вушы —
Хутчэй схацелася наслухацца гамонкі,
Напружыліся вочы — ім хацелася
Дзяцей ля хат убачыць карагоды,
Напружыліся рукі — прадчувалі,
Як паціскаць прыемна шорсткія далоні,
Якія пахнуць полем і раллёй.
І вось яна сама, нарэшце, вёска —
Пустая вуліца, зарослыя сцяжынкі,
Што мне здалёк здаліся вадаводамі,
Забітыя аполкамі крыж-накрыж вокны,
Асверы, што рыпяць, самотныя, над студнямі,
І цішыня такая, бы на могілках,
І толькі ля маўклівых хат, як і заўсёды,
Напраўду пладаносілі сады...
Ішоў па вуліцы і цішу ненавідзеў,
Глух ад яе і ёю нерваваўся —
Хутчэй, хутчэй прабегчы б гэту ціш!
І раптам голас: — Добры дзень, сыночку!

— Дзень добры, баба Ева! — Яна несла
Ваду з калодзежа — адзінага жывога.
— А дзе ж ваш дзед Адам?
— Памёр, дзіцятка.

Вясной адсеяўся, памыўся, апрануў
Сарочку чыстую, нібы на свята,
Сказаў:
«Ну, баба, даганяй, пайду я ўжо дамоў».
«Чаго ж на лета ты сабраўся?» — «Зямелька
Цяпер мне падабаецца — і цёпленька, і мякка.
Я не хачу, ці чуеш ты, лажыцца
У мёрзлыя глыжы». Сказаў так і памёр.
А ты што робіш тут, маё дзіцятка?
— Я прыйшоў праведаць вас.
— Ну дзякуй, што успомніў
Старую бабу Еву.
Я узяў
Вядро ў бабулі з рук, і мы пайшлі
Да напята расчыненых варотцаў...
Да хаты, што адзіная у вёсцы
Вокнамі глядзела незабітымі...
Заходзіла ўжо восеньскае сонца. Неўзабаве
Над хатаю дымок завіўся — быццам вёска
Растком адзіным прарастала ў неба:
То баба Ева, як спрадвеку, госцю
Смажыла яечню...

* * *

Конь, сівы ад гадоў,
Як знайшоў ты мяне
У віры гарадоў,
У такой гамане?
Колькі ж вуліц зазнаў,
Абышоў, абабег,
Аж пакуль не пазнаў
Знерваваны мой смех.
Як мой конь заіржаў
Каля вуха майго!
Мусіць, сотня дзяржаў
Зразумела б яго.

Колькі ж часу імчаў,
Як пакінуў сяло?
А ў сумотных вачах
Па расіне было.
Ну, вітаю, мой конь!
Нам сустрэцца пара.
І ў раскід, абугонь
Мы умелі араць.
Бы наліпшы да рук,
Мне запахла ралля,
І заліўся жаўрук
Сваёй песняй здаля.
Мы дзялілі з табой
Наша поле і луг,
Дапаўнялі сабой
І калёсы, і плуг.
Зналі дождж і слату,
Зналі снег і мароз.
Кожны чуў за вярсту
Гоман нашых калёс.
Што я здрадзіў табе,
Ты даруй мне, прабач...
Конь заржаў у журбе,
А іржанне — як плач.
Сцяўся я ў мітусні,
Сэрца — нібы са швоў...
Конь, як прывідны, знік.
І тралейбус пайшоў...
І ніхто аніяк
Не ўчуў наўду маю...
Я адзін, як дзівак,
На прыпынку стаю.

* * *

Дружа мой!
Хочаш,
Я падарую табе
Самае-самае дарагое,
Што помню?

Я падарую табе
Ручавінку дыму
Над маёю роднаю вёскаю,
Над маёю ціхаю хатаю,
Над нашым шаноўным комінам,
Бруйку дыму,
Якую я берагу з дзяцінства
І якая пахне і сёння мне
Толькі што спечаным
Хлебам...

## З ранішнім ветрам

У невялікай вёсачцы, якая, пакінуўшы сабе толькі сцежкі, выраклася вялікіх дарог і схавалася ад надакучлівай цывілізацыі за яшчэ не асушанымі балотамі і не высечанымі лясамі;

У невялікай вёсачцы я выйшаў у вялікі сад, які аж пеніўся ад цвету, пахаў і ранішняй цішыні;

У невялікай вёсачцы, у вялікім садзе мне дачуўся раптам ласкавы і ціхі спеў твае жонкі, індус, якім яна будзіць цябе і сям'ю — як прыемна, мусіць, пад гэты шчаслівы напеў прачынацца: адплюшчыш вочы, а над табою, як закаханы пагляд, пяшчотная песня.

Мне дачуўся смех дзетак тваіх, нарвежскі рыбак, і плёскат халоднай хвалі аб тваю крутабокую лодку.

Мне дачуўся з ранішнім ветрам пах твае цыгарэты, амерыканскі фермер,— і я ўявіў, як ты, маўклівы і заклапочаны, збіраешся ў поле.

Мне дачуўся бясслёзны твой плач, горды індзеец,— так плачуць не па чалавеку, так па радзіме плачуць, якую адабралі гвалтоўна, нібы выцягнулі з-пад ног краявіды са скаламі, секвоямі і вадаспадамі.

Мне дачуўся смяротэльна паранены ўскрык твой, партызан-сальвадорац, мне запахла тваёю крывёю, што з раны дыміцца, і я нібы ўвачавідкі ўбачыў, як над табою зайшлася ў бязгучным рыданні жанчына — маці, жонка, а можа, сястра.

Мне дачуўся ваш рып, векавечныя дрэвы, у джунглях густых афрыканскіх,— яго, мусіць, вусцішна слухаць пігмеям, якія шуршаць па зямлі, што ніколі не бачыла сонца — такія над ёй густалістыя шаты.

Усе вятры нада мной прашумелі — і сірока з пякельным дыханнем пустыні, і містраль, што ў лядоўню ўмарожвае горад, і мусоны, і, пэўна, пасаты, галасы ўсіх краін яны неслі ў мой сад вялікі-вялікі ў маленькай-маленечкай вёсачцы.

Незаўважна выйшаў на ганак увесь сівы, нібы сад, дзядуля, з садам ён спярша павітаўся: «Дзень добры!», а затым, як дзіця, здзівіўся: «Зірні ты, як за ноч, мой садзе, расцвіў».

Беларускае гэта здзіўленне, беларускую гэтую радасць падхапілі вятры тыя самыя і панеслі ва ўсе бакі свету, і ўсюды людзі пачулі — на ўсіх кантынентах зямлі.

І шмат дзе гэтая радасць усцешыла, шмат каго навіна ўзрадавала: чулі вы, у Беларусі далёкай, у маленькай-маленечкай вёсачцы, што сцяжынкі сабе пакінула, ад грымотных шляхоў затулілася, у маленькай-маленечкай вёсачцы сад вялікі, як свет, расцвіў!

* * *

У самы знак задыякальны Дзевы
Ступіла сонца. Восень прывяло
К нам на Зямлю, дзе ўсё яшчэ гуло
Травою, жытам і птушыным спевам.

Але ж, але ж... Вясна, надзеі, дзе вы?
Спатканне з Оўнам подаўну было,
І Казярог — снягоў маіх жытло —
З зімой ужо віншуе неспадзеву.

А я люблю вясну. І мне здалося,
Ізноў вярнулася яна сама,
Напоўніла прасторы шматгалоссем...

Не, супакою і ў мане няма:
Дарогу жоўтым лістам сцеле восень —
Мінула ўжо вясна, наперадзе зіма.

## Бабуля

Ой, загасцявалася надзіва
Я ў тваім у горадзе, сынок.
Мне ўжо сніцца поначы сумліва
На маёй на хатачцы замок.

Гэтак жа даўно я не карміла
Трэскамі у печачцы агонь,
Доўжанька з дзвярмі не гаманіла,
Ганку не садзілася на ўлонь.

Печачка галодненькая ў хаце,
Студня ўсё чакае мяне там...
А ў цябе тут цёпленька, бы ў ваце,
І нагам, і сэрцу, і рукам...

Там жа маёй хатачцы не спіцца —
Холадна ў зіме адной дрыжэць.
І няма каму, каб заступіцца,
І няма каму яе сагрэць.

Разам жа мы ўсе зможам дакукі —
Што нам вецер, што нам той узвей!
Ведаеш, мы возьмемся за рукі
І удзвюх нам зробіцца цяплей.

Да шчакі прытулімся шчакою,
Разам будзем жытку ўспамінаць.
Толькі там, набыўшыся спакою,
Як пасля жніва, змагу я спаць.

Ты сабе, раднулечка, як хочаш,
Я ж сабе — таксама, як хачу.
Дзякуй твайму доміку, сыночак,
Я ў сваю хацінку палячу.

## Сялянскія рукі

Рукі, якія замешвалі сечку карове,
Рукі, якія рвалі, выполваючы, асот і
дзядоўнік,
Рукі, якія падціралі попку дзіцяці,
Рукі, якія падмазвалі дзёгцем калёсы,
Рукі, якія растрасалі гной перад ворывам,
Рукі, у якія за стагоддзі ўелася столькі
зямлі,—
Самыя чыстыя рукі на свеце.

Твае рукі, мама.
Твае рукі, тата.

## Вайдэлоткі

Выйдуць з лодкі вайдэлоткі,
Пойдуць сена варушыць,
Тыя самыя малодкі,
Што умелі мудра жыць.

Што ў хароміне Праўрымы
Вечны цеплілі агонь,
Каб ён вуснамі сваімі
Лашчыў кожную далонь.

Што ахвярніцы займалі
Чыстай памяццю сваёй

І што песнямі трымалі
Сувязь з роднаю зямлёй...

Як сучасна хусткі свецяць
Між абрэджаных дубоў.
Як ім хораша у леце,
Іх вянкам вакол галоў.

Мы глядзім, нібыта продкі,
І ўжо верым пакрысе,
Што з Багамі вайдэлоткі
Танцавалі па расе.

Ведаў іх у твар, напэўна,
І вярхоўны жрэц — Крывіч.
Ведаў іхні голас спеўны,
Што лагодзіцца ў крыві.

З імі раіліся, мусіць,
Ваяры і вадары,
Як нам жыць на Беларусі,
Як спяваць і гаварыць.

І ў свяцілішчах, здаецца,
Прысак даўні не ачах.
Песні, што трымцелі ў сэрцы,
На лугах усё гучаць...

Зноў паселі ў свае лодкі,
Адплываюць з астраўка...
Хіба ж гэта вайдэлоткі?
Бабы з граблямі ў руках!

## Сябры

Абое тэпаюць паціху,
Яны як даўнія сябры.
І ніякое гора-ліха
Іх не здалела пасварыць.

Ідуць. А стомяцца — прыстояць,
І пастаяць, і адпачнуць.
І сукаватыя абое,
І ўжо не молада ідуць.

Адзін мыляе словам губы,
Другі маўчыць, нібы глухі.
Адзін пазюкаць дужа любіць,
Умее выслухаць другі.

Ідуць здаўна, ідуць здалёку.
Пазбілі ногі аб свой шлях.
Гады — як жураўліны клёкат —
Нясуць асенне на плячах.

Расстацца? Жыць асобна? Што вы!
Давеку іх саюз такі...

Адзін — дзядуля стогадовы,
Другі — ягоны сябра. Кій.

* * *

Мінула ўжо вясна, наперадзе зіма
Махае мне рукой завейна-белай.
А нейкі матылёк, надзіва смелы,
Да сонца палящеў — яго і не стрымаць.

Ён нарадзіўся з болем нездарма,
З любоўю да святла неадбалелай,
І зараз у бязмежжы скарчанелым
Настойліва крыламі веславаў.

О дзіва! Ён на нейкае імгненне
Перакрыляў зямное прыцягненне —
І ў сонца паявіўся спадарожнік.

Пакуль гарэў, паверыць дапамог
У сілу апантанасці трывожнай:
Ахвярай стаў, а ўсё-ткі перамог!

## Дымок у збажыне

— Зірні, зірні, старая,
Ці гэта мне здаецца,
Ці, можа,
і напраўду на палосцы,
Што мы з табою хораша ўрабілі,
Дымок у спелай збажыне зацвіў...
Зірні, зірні, шаволіцца, нягоднік,
Нібы яго хто знізу раздзьмувае,
Тут, чуеш, недалёка да бяды:
А раптам за сцябліну ён ухопіцца,
Падымецца, лізне бліжэйшы колас —
Пажар зачне. Бывай тады, наш хлеб.
Ай, ходзяць
Тут розныя цікаўныя турысты
Па сцежцы, што ля нашае палоскі
Лезе аж на самую гару.
Вось нехта з іх і кінуў недакурак
У спелую, як порах, збажыну.
Давай жа мне хутчэй вядро з вадою —
Пайду яго залью.

Навошта, чалавеча? Не спяшайся.
Не тое робіш ты. І не туды ідзеш.
Ісці трэба не ўгору, а якраз уніз —
З гары.
Далей і ад свае палоскі,
І ад таго дымка.
Ніякай папяроскі
У збажыне сваёй ты не заўважыў.
Агню яшчэ няма, а той дымок
Усё шаволіцца, уецца між сцяблін.

— І што за д'ябал!
Вады агонь нябачны не баіцца.
Пайду вазьму хіба што капаніцу,
Што ля мяжы ляжыць, ды, можа, ўдасца
Яго мне закапаць...

Не трэба, чалавеча!
Табе не дапаможа капаніца —
Агонь, што здарыцца, ніякаю прыладай
Не ўдасца ўтаймаваць.

— Дык жа загіне
Надзея наша — ураджай, здабыты
Крывавым мазалём...

Хай гіне!
Ратуйся сам, надзею не ўратуеш.
Зямля вось-вось, з хвіліны на хвіліну
Заходзіць, загрукоча пад нагамі
І пырсне ў неба полымем высокім,
Высока ў неба камяні падкіне,
Якіх так і не выкарчаваў ты,
Хоць так хацеў...

— Не, чуеш, я не кіну
Свой ураджай і збажыну саспелую,
Якую гэтак шчыра я спяліў,
А гэты дым — пракляты, ненавісны —
Нагамі затапчу.

І ён пачаў
Дымок таптаць абедзвюма нагамі.
Толькі дзіва —
Чым больш ён гэты дым таптаў, тым болей
Нягоднік рос і моцы набіраўся.
А чалавек круціўся ля яго —
Нібыта ён зямлю вакол абтоптваў
Ля дыму-яблыні, якую на няшчасце,
Здавалася, ён сам і пасадзіў...

Убачыўшы, што дым усё гусцее,
Прыбегла на палоску і старая —
Адразу ў слёзы і адразу ў плач:
— Што ты, няўмека, кешкаешся тута —
Ратуй хутчэй наш даражэнькі хлеб...

І раптам узарвалася зямля,
І полымя ўзнялося аж да зорак,
І стала цёмна, быццам уначы,
І ў гэтай цемры жыхалі маланкі,
І лава пацякла уніз з шыпеннем,
А на тым месцы, дзе была палоска,
Са збажыной саспелаю палоска,
Узняўся кратэр —
Бы злавесны помнік

З'ядананаму з сам-хлебам чалавеку
І выспеленай ім жа збажыне.
А людзі,
Зміръўшыся з няпрошанай бядою,
Назвалі гэту сумную падзею
Даволі празаічна: «Вывяржэнне
Чарговага вулкана».

Мінецца час.
Вулкан гэты астыне.
І яго зноў жа будуць, як славутасць,
Паказваць новым стомленым турыстам,
І ніхто,
Бадай ніхто не ўспомніць,
Што тут была са збажыной палоска
І селянін з сялянкай утрапёна
Затоптвалі дымок між каласоў.

* * *

Адкуль я помню гэтакі малюнак?
Раўніны Кеніі бяскраю пад нагамі,
А ўверсе — кроны упляліся ў кроны,
А ўнізе — змрок ад гушчару акацый,
І шлях, стаптаны босымі масайя,
Якi вядзе з нікуды ў нікуды.
Нябачныя гіены. Толькі рогат,
Нібыта звар'яцелы іхні рогат
Гучыць уночы жудасна падоўгу
У апраметнай афрыканскай цемрыні...

Адкуль я помню гэтакі малюнак?

А можа, і не гэты, а вось гэты
Малюнак помню я наўздзіў яскрава:
Шумяць высозныя бразільскія гевеі,
На кожнай з іх — надрэз касы, глыбокі,
Што зроблен вострай дзюбкаю нажа.
А па надрэзах сочыцца сок латэкс —
Кроў дрэва, што каўчукам потым стане,—
І капае, і капае — сцякае

У гліняныя ёмістыя місы,
Падвешаныя да параненых ствалоў.

Адкуль і гэты помню я малюнак?

Не, пачакай, здаецца, бачу новы
Малюнак я ўжо. Быццам над гаямі
Какосавымі, а таксама
Над водамі рачулак малярыйных,
У Папуа, што Новая Гвінея,
Усходзіць сонца. Па дарогах
Ідуць, нібы на паляванне, папуасы
З праткнутым носам — перыной птушынай,
На галаве — таксама ўборы з пер'я,
З клыкоў кабанніх — важкія каралі,
Набедраныя повязкі з лістоўя...
Хоць чарапы яны і не палююць,
Канібалізм не помняць і старыя,
А ўсё ж і коп'і, ды і лук, і стрэлы
Заўсёды з імі. А вунь, бач, старая,
Усохлая, бязводная бабуля
Сядзіць на гэткай жа старой калодзе
І абірае каукау, а шалупінне
Кідае птушцы дзіўнай — насарогу,
З падрэзаным закрыллем — насарогу,
Каб той не мог ніколі узляцець...

Адкуль я помню гэтакі малюнак
Сярод зімы бялюткай беларускай?
Адкуль, навошта і чаму?

## Настальгія арабінкі

Хто прывёз цябе ў гэту краіну вечназялёнага лета,
Хто пакінуў цябе між экзотыкі джунглевай гэтай,
Хто цябе пасадзіў у зямлю жыватворна-такую,
Дзе ты сумуеш?

І зямля, хоць чужая, цябе шчодраю ласкаю
дорыць,
І рабінкі твае ў ёй растуць велікатыя, як
памідоры,

I святла, і цяпла — усяго табе тут хапае.
Што ж ты ўздыхаеш?

Сто вятроў прашумела над гадамі, лістамі
тваімі,
Ды і тут, без Радзімы, ты жывеш па часе
Радзімы:
Сярод вечназялёнага гулу трапічнай прыроды
Пазнаеш поры года.

Калі ў нас лістапад — ты лісцё, як і дома,
скідаеш:
Сто гадоў ужо белай, беларускай зімы ўсё
чакаеш,
Калі красавік Беларусь абнадзеіць — ты
адчуеш, і тут, як калісьці,
Прачынаешся ў лісці.

І глядзяць са здзіўленнем на цябе, нязвычнае
дрэва,
Вечназялёныя пышныя твае суседкі і справа,
і злева.
Ты ж адвыкнуць ніяк ад Радзімы далёкай не
можаш...
Памажы дрэву, Божа!

Не паможа тут Божа. Ніхто не паможа ніколі.
Без радзімы мы ўсе, хоць на волі, а ўсё ж у
няволі,
Настальгія, як рана, запаўняе збалелыя грудзі
Дрэвам і людзям.

* * *

Ахвярай стаў, а ўсё-ткі перамог!
Хвала такому шчыраму старанню,
Хвала твайму журліваму каханню,
Якім і я нарэшце занямог.

І паляцеў, пазбыўшыся трывог,
Насустрач спапяляючаму ранню,

Не бачачы нічога, бы ў тумане,
Не разбіраючы ні сцежак, ні дарог.

Палёт такі — як наталенне смагі,
Палёт такі — як пошук раўнавагі:
Ты ўвесь ад невядомасці трымціш.

Не беражэшся, радасны, спадману —
Якою вечнаю табе здаецца ціш,
Калі вось так лунаеш апантана.

## Прамова ў Ляўках

Дзядзька Янка! Вы чуеце — свята гудзе,
Наша слаўнае свята — Купала.
Колькі вашых сяброў яно, колькі надзей
Каля вас, як ля сцяга, з'яднала.

Дзядзька Янка! Вы бачыце — луг, як букет,
І шчаслівыя ўсмешкі, і радасць Радзімы.
Беларускія песні гучаць на ўвесь свет,
Песні нашых сяброў паядналіся з імі.

Дзядзька Янка! Вы ўмелі прывеціць гасцей,
Паважалі сябрыну, любілі бяседу.
Хай жа з розных краёў і зямель найчасцей
К нам на святы сябры вашы едуць!

Дзядзька Янка! Мы выйшлі з бядот і нягод,
Ды нягоды ў стагоддзях нас не згубілі.
І жыве родны край, і жыве наш народ,
Які вы гэтак шчодра любілі.

Дзядзька Янка! У свеце між іншых краёў
Многа шчырых сяброў Беларусь наша мае,
Беларуская мова ў сям'і дружнай моў,
Як руплівая птушка, лунае.

Дзядзька Янка! Мы ўнукам раскажам, зямлі,
Каб нашчадкам яны перадалі:
Мы шчаслівыя, мы на Купаллі былі —
Мы былі на стагоддзі Купалы!

## Ялта, Максім, кіпарысы

Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы,
Барвінак на магільніку гарыстым
Ён навучыў, здаецца, гаварыць.
Паўднёва сонца плавіцца ўгары,
Зямля гарачая, нібыта прысак...
Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы.

## Дождж ля вёскі Шастакі

Нас сюды сабрала Цётка
На лугі і паплавы,
Дзе аж пеніўся салодкі
Пах накошанай травы.

Гаспадыняю гасціннай,
У вянку, нібы вясна,
Свае родныя мясціны
Нам паказвала яна.

І яе тут пазнавалі,
Перад ёй на луг-зямлі
Цёткі граблі папрымалі,
Дзядзькі косы адвялі.

Заспяшаліся на свята —
Свят нам гэткіх не стае!—
І як пчолы каля маткі,
Людзі сціхлі ля яе.

А яна між іх сядзела
І са сцэны лугавой
Так узрушана глядзела
На народ спрадвечны свой.

Раптам лівень гэткі хлынуў,
Гэткі лівень зашумеў!
Мы — са сцэны пад галіны,
Пад густыя шаты дрэў.

Абвалілася залева —
Не раскрыць, здаецца, рот.
Не хаваліся пад дрэвы
Толькі Цётка і народ.

Моклі чыстыя абновы,
Ды — адзін ля аднаго —
Людзі хлеба
Праглі слова
Найраднейшага, свайго.

Хоць ад ліўня луг прагнуўся —
Так ліло, нібы са стрэх,
Ды ніхто не варухнуўся
І дадому не пабег.

І тады з-пад дрэў выходзіць
Пачалі няёмка мы.
Зразумелі пры народзе:
Слова ліўнямі не змыць.

Вінавата зноў паселі
Пад залеву, між вады...
Як у Цёткі пасвяжэлі
На вянку яе кветы!

Дождж ідзе, а слову светла,
Гром грыміць, а ўсе стаяць.
Дзякуй вам за свята гэта,
Цёткі, дзядзькі, сенажаць!

## Вечар паэзіі

Чытаюць вершы ў Крошыне паэты,
А мне здаецца, што і ён, хлапчук,
Сядзіць між імі ў клубе гэтым светлым
І галавою туліцца ў плячук.

Зусім дзіця, пятнаццацігадовы,
Успамінае, мусіць, з болем ён,
Як выпускаў і сам на волю словы,
Што зганьбаваў бязлітасны прыгон.

Зайграй, зайграй, хлопча малы,
І ў скрыпачкі, і ў цымбалы.

Ён спавядаўся вершамі пры ўладзе —
Сам Навасільцаў слухаў тут яго:
Адной рукою па галоўцы гладзіў,
Бізун шукаў паспешліва другой.

А як стараўся ўсёй душою Паўлік,
Як спадабацца слухачу хацеў!
Не ведаў, што сенатар і падстаўлен,
Каб дабрыню ператварыць у гнеў.

У Крошыне пан сярдзіты,
Бацька кіямі забіты,
Маці тужыць, сястра плача.
Дзе ж ты пойдзеш, небарача?

Элегіі журботныя гучалі,
Шуршалі, нібы полымя ў страсе.
Парабак не знаў: ягоны талент
Яму адно няшчасце прынясе.

Забралі хлопца ў рэкруты за вершы —
Так адлучылі ад зямлі і мар.
І гэта быў ягоны самы першы,
Ды, мусіць, не апошні ганарар.

Каб я большы не падрос
Ды ад бацькавых калёс!

Чытаюць вершы ў Крошыне паэты,
А мне здаецца, што і ён, хлапчук,
Сядзіць між намі ў клубе гэтым светлым,
І радасць мгліцца, як сляза, ўваччу...

* * *

Кайсын Куліеў, мудры горац,
Пра сціпласць гаварыў майго народа.
Я долу вочы сарамліва апускаў,
Бо я таксама беларус звычайны —
Кроўная радня свайму народу.

* * *

Калі вось так лунаеш апантана
Без павадоў, без лейцаў, без прынук,
Нібыта сам сабе шукаеш мук,
Якія лекамі здаюцца закаханым.

Далоні саднеюць, і нам баляць іх раны,
Хоць павады не абдзіралі рук.
І сіл ужо няма стрымаць наш рух,
Страсць, што узнікла так неспадзявана.

Пад намі — цемра акіяна зеўрыць,
Над намі — неба яркае Венеры
Аранжавай прынадаю гарыць.

Але не будзем дакараць сябе, калі
Нам жыць захочацца усё-ткі на зямлі,
Дзе нас чакаюць сцежкі і бары.

* * *

Мятлушка-шматкалёрніца,
Сцішыўшы чуйныя крылы,
Сок бярозавы п'е.

Якая музыка — цішыня!
Як яна пульсуе, нябачная,
Калі замоўкнуць транзістары!

Тады чуваць нават робіцца,
Як мятлушка-шматкалёрніца
Сок бярозавы п'е.

Свет заціх і не дыхае:
Мятлушка-шматкалёрніца
Сок бярозавы п'е.

А яна ўзмахнула крыламі,
Стала вялікай-вялікай,
А потым знікла зусім.

Нібы яна села на промень
І стала звычайнаю краскаю
Між звычайнай зялёнай травы.

А можа, якраз цішынёю —
Той, што пульсуе, нябачная,
Калі замоўкнуць транзістары.

## Дзівак

Даўно-даўно, яшчэ вясною,
Ён узляцеў на гэтае дрэва,
Сеў спаміж лістоў
І, нібы свой, быў сярод іх шчаслівы:
Весяліўся з імі і сумаваў,
Смяяўся і шаптаўся.
Незаўважна прайшло лета.
Завятрылася восень.
Абляцелі ўсе яго новыя сябры —
Лісты,
А ён адзін застаўся на мокрай
І голай галінцы —
Не ведаў, што восенню
Трэба разлучацца з ёю,
І яшчэ не разумеў,
Каму трэба быць верным —
Дрэву ці лістам.

## Думка

На штабель выносістых сосен
І тугацелых елак
Лесаруб прысеў адпачыць.
Электрапілу прысланіў да пня,
Зняў каску, пот рукавом
Сцёр са спатнелага твару
І ўдыхнуў на поўныя грудзі
Пах свежаспіленых дрэў.

Божа, о як яно пахне,
Дрэва, што зрэзана толькі што —
Ніяк не надыхацца ім...

І раптам — нібы папярхнуўся,
І раптам — нібыта ўдар грому —
Думка працяла навылет:
Каб дрэва вось гэтак пахла,
Трэба
Зарэзаць
Яго.

* * *

Дзе нас чакаюць сцежкі і бары,
Узяўшыся за рукі, мы з табою,
Як прывіды, шчаслівыя абое
Ідзём, і нам не трэба гаварыць.

За нас гавораць зоркі угары,
Гавораць нашы вочы з цішынёю,
Гавораць нашы рукі між сабою,
І іх ніхто не зможа пасварыць.

Мы, здзіўленыя, разам адкрываем:
Фасфарасцыруе казюрчына любая,
Шукаючы каханага хутчэй.

У цемры і тваё святліцца цела
І белатой сваёю — белай-белай —
Асвечвае спакусна змрок начэй.

* * *

Лятаюць рыбы у вадзе, бы ў небе,—
Бяскрылы, як у сне, палёт.
І дзівіцца крылаты самалёт:
Лятаюць рыбы у вадзе, бы ў небе.

А рыбы дзівяцца: нібы ў вадзе, у небе
Плыве імкліва, лёгка самалёт.
На чым трымаецца яго палёт
У гэтакім бязводным моры — небе?

І ўсё ж шануй, прырода, іх палёт
І беражы усіх у іх патрэбе:
Рыб, што ў вадзе ляцяць, як самалёт,
І самалёты, што плывуць у небе.

* * *

А як жа, ці чуеце, дрэвам,
Пахаваўшы ўвосень
Столькі сваіх дзяцей-лістоў,
Зноў
Радавацца вясною
І над іхняю магілаю
Так апантана раджаць
Новых немаўлят?!

* * *

Жыла ў мяне радасць —
Цёплая, ласкавая і пушыстая.
Я засланяў яе, нібы ад маразоў удзень,
Я захінаў яе, нібы агеньчык ад ветру, увечары,

Я карміў яе з рук, як вавёрку ў парку,
Я даверліва гаварыў з ёю,
І яна, усё разумеючы,
Ласкава цёрлася ля маіх ног —
Цёплая, пушыстая, даверлівая.
І варта было толькі мне
Крыху адысціся ад яе,
Як выпадковыя сабакаловы
Злавілі маю радасць,
Прыняўшы, чамусьці, яе
За звычайнае бяздомнае
Сабачанё...

* * *

Быццам саксаул з ранетам,
Перайшоўшы грэх мяжы,
Я хачу верлібр з санетам,
Як садоўнік, падружыць.

Хай сябруюць, спеляць одум,
Хай карэняцца ў траве.
Хопіць месца ім абодвум
І на нашай мураве.

* * *

Асвечвае спакусна змрок начэй
Надзея незнаёмая, як згадка,
Ёй летуценяць, сцяўшыся, дзяўчаткі
І хлапчукі — не зводзячы вачэй.

А колькі неспазнанага яшчэ
У летуценні гэтым напачатку,
Калі усё здаецца дзіўным святам,
Хаця трывога ўжо як боль пячэ.

І чыстыя, пяшчотныя памкненні
Заўжды ў такія светлыя імгненні
Прарастаюць нязвычнаю журбой.

І ўжо дрыжаць на пудкіх вуснах словы,
І ўжо яны іх выдыхнуць гатовы,
Як мы, калісьці стрэўшыся, з табой.

* * *

Аж прагінаецца бетон,
Як самалёт садзіцца цяжка.
І гэтаксама гнецца ён,
Калі па ім паўзе мурашка.

Спяшаць насустрач, лоб у лоб...
Здаецца, ў гэтае імгненне
Чакае кожны — не было б,
Не стала б толькі сутыкнення.

І нас халодзіць, нібы лёд,
Чаканне гэта — клопат важкі...
Садзіцца цяжка самалёт,
Імчыць на лёт яму мурашка.

## Сусветнае

Скульптуры пад кіслотнымі дажджамі
Растаюць, нібыта ледзяшы.
Хварэюць дрэвы, сцежкі, нават камні,
Хварэюць моры, акіяны самі,
І ў азёрах пуста — ні душы.

Ні рыбіны, ні водарасці — чыста.
У той вадзе жалеза растае,
Сталь раствараецца ў вадзе празрыстай,
І робіцца тут вусцішна-вятрыста,
Калі вятры шматаюць сон яе.

Не веру ні сірока, ні барэю —
На крылах іх хваробы шэры пыл.
Вятры хварэюць, воблакі хварэюць,
Хварэе снег і туманы старэюць,
Хварэюць васількі каля магіл.

І кроплі падаюць, бы яд, на нашы словы,
На каласы, зярняты, галаву,
На малако, што сабяруць каровы,
Якія ўпохапкі, уросіўшы галовы,
Скубуць ужо кіслотную траву.

Хварэюць і не ведаюць прычыны
Ні рэчкі, ні палеткі, ні бары.
І чалавек не зазнае спачыну,
Каб ад дажджоў кіслотных павучыны
Уратавацца. Хоць іх сам стварыў.

## Паляванне, сумныя трафеі

Здалося потым: на паляне спалі —
Настолькі было ціха між раслін...
А к двум саскам двайняткі так прыпалі,
Нібы да іх навечна прыраслі.

## Сон, быццам ява

Учапіліся за мае рукі
Звяры, дрэвы, птушкі,
Рэкі, травінкі, мурашы.
Учапіліся
І просяць выратаваць іх.

«Вядзі нас»,— просяць.

Куды ж мне весці вас,
Браты мае старэйшыя —
Зубры і дразды, дубы і мурашы?
Падкажыце, вы ж мудрыя,
Вы ж ужо былі на гэтай зямлі,
Калі я прыйшоў на яе...

Як жа мне выратаваць вас,
Сёстры мае старэйшыя —
Кветкі, рэкі, мятлушкі і крынічкі?
Я ж думаў, што вы вечныя,
Што вы застанецеся і пасля таго,
Як я пакіну зямлю.

«Ратуй нас»,— просяць.

І тады я ўбачыў,
Што стаю не адзін,
Што навокала многа людзей
І ўсе яны справай занятыя:
Хто выцірае ад сажы лісцё —
Каб лепей дыхалася дрэву,
Хто адмывае зліплае ад мазуту пер'е —
Каб чаіца зноў узлятала ў неба,

Хто абгароджвае мурашнік,
Хто памагае кітам,
Якія з бруднай вады
Выкінуліся на бераг
І не хочуць зноў вяртацца ў акіян...

Тады і я схапіў у рукі маленькае птушанятка,
Якое, задыхаючыся, бездапаможна
Білася аб дарогу крыльцамі,
Паспешна ўзяў яго дзюбачку ў рот
І, як у дзяцінстве,
Пачаў паіць сваёю сліною.

І ўзрадаваўся,
Адчуўшы, як птушанятка
На вачах пачало наліваццa сілаю.
І — о дзіва! — гэтая ягоная сіла
Напаўняла і мяне.

І тады я пачуў голас:
«Аддаючы — набываеш.
Яны — гэта ты сам.
Ратуючы птушанятка,
Ты ратуеш самога сябе».

І прачнуўся.
І зразумеў,
Што гэта быў менавіта мой
Голас.

* * *

Лятай, лятай, маленькі каралёк,
Кармі, кармі чужое птушанятка,
Насі яму і зблізку, і здалёк
Па каліву у дзюбцы, па зярнятку.

За дзень ты так стаміўся ад турбот,
Аслаблі крылы і ўжо ледзьве носяць.
А ён, зірні, ўсё раздзірае рот,
А ён, зірні, ўсё ежы прагна просіць.

Тваіх дзяцей з дупла павыкідаў —
Яму і аднаму там стала цесна.
А ты, дурненькі, ўсё яму аддаў,
А ты шчыруеш ля яго, балесны.

І ўсё ж лятай, маленечкі шчырэц,
Кармі падкіданца ў сваім гняздзе зацята,
Бо шчыраванне гэта пад канец
Тваёй міжвольнай зробіцца адплатай.

Ён замуруе у дупле сябе,
Дупло сабой запоўніць даастатку...
Лятай, лятай, маленькі верабей,
Кармі, кармі ў гняздзе зязюленятка.

## Кветка

Яна ў супакаенні спала,
Пялёсткі склаўшы ў цнотным сне.
Нішто яе не хвалявала,
Нішто не вабіла яе.

І раптам — дзіўнае ўзбуджэнне,
Нібы палашчылі вятры,
Бы чмель бахматы ў дзень вясенні
Паказытаў яе знутры.

І нарадзіўшыся ў глыбінях,
Трымценне большала, расло,
Запаланіла мрояй сіняй
І, быццам промень, загуло.

Раскрыла у дрымоце клейкай
Пялёсткі. Нібы самацвет,
Зірнула зрэнкаю з-пад вейкі
На чымсьці ўсхваляваны свет.

І тут жа ўчула: па пялёстках
Прамень кунежліва правёў.
І узрушэнне, нібы лоскат,
Дайшло да самых каранёў.

Стаіўшы радасна дыханне,
Праменьчык лашчыла святла,
Трымцела ўся і хвалявання
Ніяк суцішыць не магла.

Яна дрыжэла, знемагала,
Непадуладная сабе,
І промень ласкава хавала
Усё глыбей, усё глыбей.

Ёй стала гэтак светла ў стоме
І ўцешна — сіл няма трываць.
І захацелася той промень
На ўсё жыццё ў сабе схаваць.

Яна звяла пялёсткі млява
У насалодным забыцці...
І стала прывіднаю ява,
І стала горача ў лісці.

І доўга стомлена трымцела,
Супакойваючы кроў,
Ахаладжваючы цела,
Заціхаючы наноў.

Жыла шчаслівым прадчуваннем,
Надзеяй, што як жар пячэ:
Каб заўтра гэта хваляванне
Паўтарылася яшчэ.

* * *

Як мы, калісьці стрэўшыся, з табой
У вёсачцы заснежанай, далёкай,
Пад поўняю — начнога неба вокам —
Дзівіліся зімовай светлатой.

І ты была тады маёй вясной,
Маім неадбуяным юным сокам,
І я нібыта чуў буслiны клёкат
Па-над сваёй асенняй галавой.

Я сам прасіў: на мне раскінься лісцем
І ліўнем майскім на мяне праліся,
Каб і я зазелянеў, як ты сама.

Абуджанай, шчымлівае пяшчоты
Не суняць. Мы ведам заўсёды:
Не, на каханне ланцугоў няма.

* * *

Быў час лагоды і спакою,
Як на зямлю сышлі квяты,
Між іх руплівілася ты —
Быў час лагоды і спакою.

Я вар'яцеў ад пекнаты
І задыхаўся ўвесь табою.
Быў час лагоды і спакою,
Як на зямлю сышлі квяты.

* * *

Калі снегапад раптоўна
На горад наш упадзе,
Завея пялёнкаю роўнай
Усе сляды замяце.

Калі пад вечар ці ўранні —
У змроку зусім не відно —
Неба пушыстым стане,
Нібы са сняжынак яно.

Калі закруціць завея,
Прашу, пачуй яе смех,
Прашу, здагадайся, дзе я,
І выйдзі таксама ў снег.

З табой не сустрэнемся, можа,
А мо размінемся якраз.
Упоразь, страшліва і гожа,
Абдыме мяцеліца нас.

Калі ж давядзецца сустрэцца,
Мы будзем хадзіць і маўчаць.
Сняжынка аб вусны трэцца...
Чаму яны ўсе гарчаць?

Будзем моўчкі слухаць з надзеяй,
Што мяжуе з ціхай журбой,
Як гудуць самалёты над веяй,
Раз'яднаныя з блізкай зямлёй.

А сесці не могуць ніяк...

* * *

Стаю абдожджаны.
З маіх галін сцякаюць кроплі —
Ціхія і спавольныя.
З маіх лістоў выпараюцца дажджыны —
Я нават чую, як промні
Адрываюць іх ад зялёнай маёй скуры.
І сонца над самаю кронаю.
І над табою — таксама сонца.
І ты, уся абмытая ліўнем,
Такая чыстая, зялёная і юная.
Мне хочацца падысці да цябе,
Абняць цябе
І расчулена пагладзіць па тваіх зялёных лістах.

Але ж карэнне!
Карэнне замінае
І не дае падысці да цябе,
Хоць ты і стаіш гэтак блізка!
І ўсё ж я вырвуся з абдымкаў зямлі!
І атрасаючы дзёран з карэння,
І распырскваючы цёплую дажджавую ваду ў лужынах,

Наўскач, як хлапчук, пабягу да цябе.
І мае галіны сплятуцца з тваімі,
І я прыгарнуся да цябе так шчыра,
Што нават не буду чуць,
Як скочваюцца з тваіх лістоў
За кару мне кроплі
І як трывожна абсыхае
Маё, разлучанае з зямлёю,
Карэнне...

## Каханне

Ісці к табе трывожна і спакусна,
Нібыта набліжацца да агню,
І загарэцца ад тваіх спякотных вуснаў,
І спапяліць цнатлівую браню.

І ўвайсці ў агонь. Пламеннем задыхацца,
Лавіць яго, і жыць і дыхаць ім.
Згарэць на попел. З попелу узняцца,
Каб зноў глытаць агню вярэдны дым.

І ачышчацца ў полымі упарта,
Згарэўшы зноў, вяртацца з небыцця,
Бо той, хто уцякае ад цябе,— не варты
І ні цябе, ні самаго жыцця.

Бо толькі так і можна жыць на свеце:
Згарэўшы ўшчэнт, застацца зноўку жыць,
Каб пры жывым табе твой попел стылы вецер
Зайздросна мог, як памяць, варушыць,

* * *

Я люблю цябе,
Я люблю цябе,
Я люблю цябе, цішыня.
Толькі вочы скрозь,

Толькі рукі скрозь,
Толькі вусны твае,
Што цыкадамі
Неспатольнымі ўсё звіняць.
А навокала — толькі колеры,
Толькі колеры уваччу.
Толькі сінія і зялёныя,
Толькі жоўтыя і чырвоныя,
І з-за іх, з-за іх,
Гэтых колераў,
Нават шэпту твайго
Не пачуць.
А навокала — пахі светлыя,
А навокала — сенажаць.
Толькі сена пах і паветра пах,
Толькі сонца пах і блакіту пах,
А з-за пахаў тых,
А з-за пахаў тых
Не, нічога нам
Не відаць.
Я люблю цябе,
Я люблю цябе
І ўвесь свет хачу — ўвесь! — абняць.
Столькі вуснаў тваіх,
Столькі рук маіх...
І шчаслівы май,
І пакутны рай,—
Як дзіця твае, цішыня.

* * *

Не, на каханне ланцугоў няма:
Платы жывыя з кактусаў ламае,
Настойліва з вігвамаў уцякае,
Каб зразумець яднання вечны смак.

Квяткуе лета, снежыцца зіма...
І травастой бамбукавы хавае
Уцекачоў. І цішыня такая
Паміж завей стаіць тады, як зман.

І смехаток прыглушаны, спакусны
У нашым пахкім сене беларускім
Няўпэўнена і радасна гучыць.

Ды радасцю нягоды не спатоліш,
І цішынёю зваблівай ніколі
Трывогі свету нам не заглушыць.

* * *

Нібы па струнах нехта гучна
Ударыць раптам пяцярнёй,
Слова даўняе «Аблучча»
Запахне даўняю тайгой.

І даўні вецер уварвецца —
Нібы ў вагоннае акно.
Крык цягніка абудзіць сэрца
І ўзрушыць хмельна, як віно.

І прыгадаецца агеньчык,
Што глядзіць з начной тайгі.
Той успамін — нібы каменьчык
Далёкай, спраўджанай тугі.

І колы зноўку загрукочуць,
І зарыпіць наноў вагон,
І зноў злавіць захочуць вочы
Настальгічны той агонь.

Бы толькі гэтай астаноўкі
І не ставала у жыцці,
Табе захочацца ізноўку
У цемру, як тады, сысці.

Ісці сцяжынкаю кедровай,
Чужэць вагонным галасам,
Нібыта ў хатцы той тайговай
Здавён-даўно жывеш ты сам.

І ў гэтай цемені абложнай
Спяшаць таропка напрасткі,
І ўжо не чуць, як дзесь трывожна
Цябе гукаюць цягнікі.

## Песня

Жаўцеюць восеньскія дрэвы,
І лісце кружыцца, шуршыць.
Сустрэчы нашы, дзе вы, дзе вы?
Як мы без вас змаглі пражыць?!

Ці помніш луг, што мы кахалі,
Ці помніш травень наш, скажы,
Дзе цалавацца заміналі
Нам птушкі, кветкі, мурашы?

Нам птушак не пазнаць увішных,
Лістоў, што зноў на луг ляцяць...
І мурашы ужо на іншых,
Нібы на нас тады, глядзяць.

* * *

Не стане і мяне.
І чалавецтва — як паветра, як вада —
Бясшумна зойме маё месца,
Па пустаце раптоўнай расцячэцца,
Мае сляды адразу зараўняе,
Запоўніць вызваленую прастору,
Дзе толькі што ў віры жыццёвым
І плакаў, і смяяўся я.

А недзе ў той жа час,
Як парастак настойлівы,
Галоўкай кволаю, што цемечкам пульсуе,
Праб'е дзіцятка тоўшчу кісларода,

Паветра крыкам у бакі рассуне
І прыйдзе ў свет, запоўнены дазвання
Бялкамі, хларафілам і людзьмі,
У свет, дзе заўжды
Плачуць і смяюцца.

* * *

О радасць абнаўлення плачам —
Ты той і ўжо не той нічуць:
Ты бачыш тое, што не бачыў,
І чуеш тое, што не чуў.

І як шкада, што сам з гадамі
На слёзы стаў такі скупы,
Што не абновішся слязамі,
Абраз не выплачаш тупых.

## Асенняе раўнадзенства

Стаю між дрэў, узняўшы галаву,
І цішыня нябёс на мокры твар спадае,
З лістамі жоўтымі планіруе ў траву,
А ў цішы той — нібы журба якая.

Мне шкода дрэў, што вецер абтрасе,
Застудзіць голле, кроны паскудлача...
Расінкі на лістах, травінкі — у расе,
І мне здаецца: ўсё па леце светла плача.

Наперадзе і холад, і імжа.
Як без лісця ўсяму жывому грэцца?!
Там востры, быццам бы лязо нажа,
Як рану, раскрывае сэрца вецер.

А дрэвы весяляцца ў ласцы дзён,
Нібыта восень — не для іх пагроза.

Яснее ясень, залацішча клён,
І песціцца ў прызімніку бяроза.

Стаю між дрэў. І ўсведамляю я
Сярод асенне-сонечнай залевы:
У дрэў няма журбы. Журба гэта — мая.
А я хачу ўзваліць яе на дрэвы.

* * *

Трывогі свету нам не заглушыць:
Забойцы-хвалі кружаць ля Бермудаў,
І голас шторму неадольным жудам
Халодна разрастаецца ў душы.

І варта толькі пустку ўзварушыць —
Пяскі Сахары, зыбкія прыблуды,
Засмоктваюць, нібы дрыгва, вярблюдаў —
І тут віхрам, як груганам, кружыць.

Пасля любві — рэальнасць зноў чакае:
Сланы і зебры на зямлі знікаюць
І з мора выкідаюцца кіты.

Мы жыць чужымі бедамі павінны.
Ці чуеш, недзе ўскрыкнула жанчына,
Шчаслівая такая ж, як і ты?

* * *

Стамілася сэрца. Спынілася.
Маленькі такі кулачок.
А колькі крывёй нахадзілася
Па цесных сцяжынах праток.

Такое не дзіва намарыць,
Каб гэтак, малечы, жывіць

Сто тысяч сцяжын-капіляраў,
Сто тысяч дарог для крыві.

За нейкае там паўхвіліны
Сцяжынкі усе аббяжыць,
Бо кожная клетка павінна
Жыць,
        жыць,
                жыць...

Стамілася сэрца. Досыць.
Замоўкла, як кінуты пуць.
А цела жывое просіць
Хоць кроплю крыві удыхнуць.

А новыя сэрцы, што з клеткі
Гадуюць у цемры ячэй,
Яшчэ пачуваюцца летка —
Банк сэрцаў пустуе яшчэ.

І толькі штучнае сэрца —
Самаробна-гулкі працяг —
І ў мёртвым старанна б'ецца,
Грымотна грукоча ў грудзях.

Здаецца, чуваць між абвалаў,
Чуваць — між лясоў, між муроў:
Яно як ні ў чым не бывала
Пампуе ў аорту кроў.

І нават сэрца жывое
Сціскаецца ў камячок —
Нібы чуе побач з сабою
Пластмасавы халадок.

* * *

Дываны выбіваюць зацята — нібыта малоцяць,
Густа плямы цямнеюць на белым
                                        на снежным пуху.
Мне ж здаецца,
                    што недзе і зараз распускаецца лотаць,
Толькі я да яе дацягнуцца ніяк не магу.

Я высока, на восьмым паверсе,
гняздо сваё маю,
На ўзроўні палёту птушынага
і ПО-2 — даваенных стракоз.
Самалёты ж цяпер
гэтак нізка ужо не лятаюць,
Яны ўсе перабраліся вышай —
да самых захмарных нябёс.

Між аблокаў жыву. І з балкона, бы птушка,
За зямлёй назіраю,
за людзьмі неспатольна сачу.
І мяне, як на крылах, пачынае ўжо гушкаць,
І здаецца мне, быццам я з птушкамі побач
лячу.

Мы ляцім над зямлёй,
і нам хораша ў гэтым палёце,
І мільгаюць пад намі дарогі,
нам насустрач вёскі бягуць.
І ўжо вунь, нібы сонца,
праз снягі праразаецца лотаць,
І здаецца, вось-вось да яе дацягнуцца змагу.

Толькі раптам
як стрэлы залопалі за небакраем,
І палёт мой, як ветразь без ветру, ачах...
Я вярнуўся назад.
Дываны пада мной выбіваюць —
Плямы пылу на снезе парушынящца зноў у
вачах.

* * *

Ты ўсё сцябаеш пугаю каня,
Настойліва драцянаю сцябаеш.
Сядзіш у скасабочаных санях,
А пад табой гудзе трава густая.

Прайшла зіма, сквітнелася вясна,
І лета ператравілася недзе.

Ты ж паганяеш коніка без сна —
Табе здаецца, што усё ты едзеш.

Рытмічна так сцябаеш па зямлі,
І нокаеш, і тузаеш за лейцы.
Не бачыш, што яны зусім згнілі
І сані ўжо даўно стаяць на месцы.

Здох конь даўно. Ад воўчага выцця.
Ваўкі аб'елі косці ўсе як маеш.
А ты сцябаеш па яго касцях,
А ты па духу конскаму сцябаеш.

Табе праграма пэўнаю была:
Сцябаеш — значыць, у пункт А прыбудзеш...
Мой мілы робат! Быццам бы са зла
З цябе знарок пажартавалі людзі.

І ты сцябаеш не каня, сябе —
Каня свайго ніколі ўжо не згледзіш...
Як звыш праграмы мне шапнуць табе,
Што ты ў пункт А ніколі не прыедзеш.

## Тлумачэнні камп'ютэру

1

Кажуць, камп'ютэр усё ведае. Кажуць, камп'ютэр усё разумее. Болей і лепей за чалавека. І раптам гэтая істота з адной толькі галавы, гэты мудры мозг спытаўся: «Што значыць хвалявацца? Ці не адно гэта і тое ж, што падымаць хвалі?»

Не, памыляешся, мой дружа,—
Няма нідзе ніякіх хваль,
А ты хвалюешся задужа,
А ты гайдаешся амаль.

Нахопіць дзіўнае трымценне,
Заб'ецца сэрца, нібы птах.
Злуеш на ўзнёслае імгненне,
На свой незразумелы страх.

З якой, не ведаеш, нагоды
Ты непакоішся тады:
Ці ў прадчуванні насалоды,
Ці ад няўхільнасці бяды.

Ты дакранешся да каханай,
І хваляванне — нібы ток...
Хвалюе кожны новы ранак,
Паветра пругкага глыток.

І лес хвалюе, луг хвалюе,
Хвалюе возера, рака.
Хвалюе ўсё:
як воўк палюе
І як палююць на ваўка.

Хто не хвалюецца, тым можна
Усёй душой паспагадаць.
Ты сам хвалюешся трывожна,
А хваль,
як бачыш, не відаць.

2

І яшчэ ён спытаўся: «Ці значыць слова
«нічога» лічбу «нуль»?»

Ну як, мой дружа, растлумачыць
Зямною моваю людзей,
Што лічба «нуль» дакладна значыць
І як між нас сябе вядзе?

Звычайна нуль — як дзірка ў плоце,
Але трымайцеся, калі
К адзінцы хітранька падкоцяць
Такія два ці тры нулі.

Не дай ты Бог — якая пыха!
Нос не дастанеш качаргой.

Ужо не коціцца — паціху
Нясе жывот, як гонар, свой.

І не руплівец, не работнік,
А горда высіць галаву.
Нулі бываюць, што як сотні,
А то і тысячы жывуць.

Ці зразумеў ты што, мой дружа?
Чаму зняможана сапеш?
Над намі тыя словы кружаць,
Што не адкрыюцца табе.

І ты няўцямна будзеш зіркаць,
Па схеме хуценька пятляць...
І што такое «ў плоце дзірка»
Зноў давядзецца высвятляць.

Не, мусіць, нельга перайначыць
Нам, людзям, розуму твайго...
Ты зноў пытаешся, што значыць
«Дастаць да носа качаргой»!

3

> А ён, лыпнуўшы лямпачкаю, яшчэ раз пацікавіўся: «Ці не азначае слова «холадна» тэмпературу ніжэй нуля?»

Як зноў жа лёгка памыліцца,
Жалезнаплечы браце мой!
І вельмі шчыра памаліцца
Недакладнасці самой.

Не лыпай зноў здзіўлёна вокам —
Няма шматмернасці мяжы.
Бывае, летам смажыць спёка,
А ты ад холаду дрыжыш.

Калі прыгледзецца цвяроза,
Бывае ўсё наадварот:
Трашчаць калядныя марозы,
А з цябе ліецца пот.

Хоць сам ты сталы па узросту,
Душа ж —
нібыта ў немаўля.
Як табе ўсё здаецца проста:
Вышэй нуля, ніжэй нуля.

Вы дужа дзіўныя, машыны!
І абыякія.
Па вас
І вусны любае жанчыны
Для ежы створаны якраз.

Няма ад гэтага лячэння,
Хоць вам і множацца гады.
Для вас і людзі —
спалучэнне
Бялкоў, жалеза і вады.

Душа не паддаецца лекам,
Душу найлепш адразу мець.
Стаць, мусіць, трэба чалавекам,
Каб так, як мы,
ўсё разумець.

* * *

Нас кожная раніца старыць,
Хоць верым: малодзіць святло.
І заўтра ўжо будзем мы марыць
Пра тое,
што ўчора было.

А ўчора заўсёды малодзіць —
І мы ўжо ў юнацтве тады.
Пасемся усе на выгодзе,
І нас не хвалююць гады.

І лёгкія, нібы стракозы,
Над намі дні стракацяць.
Яшчэ так далёка марозы,
Што выйшлі ўжо нас пераняць.

* * *

Шчаслівая такая ж, як і ты,
Была яна зусім яшчэ нядаўна,
І гэтак жа смяялася забаўна,
І задыхалася ад пышнай пекнаты.

Яна кахала — і цвілі сады,
Яе кахалі — ў свеце было слаўна,
Яны кахалі — як бывае здаўна,
Ля іх кахання грэліся квяты.

Забіты ён,— а з памяці не сцерці,
Яна паранена ягонай смерцю.
Куды ёй зараз і нашто ісці?

Здаецца ёй: ні пры якой нагодзе
Такой душы ніколі не знайсці
Ва ўсёй жывой і нежывой прыродзе.

* * *

Ачаг сямейны — звыклы тэлевізар —
Ледзь тлее, і вуркоча па-кацінаму,
І нешта шэпча млява-шапялява,
А за акном — дажджы, дажджы, дажджы.

Шыпіць ачаг, нібы сырыя дровы,
Патрэсквае часамі, як вуголле,
А на экране — ўздыбленае мора
І ў ім змагаецца са штормам карабель.

Гляджу і слухаю. Міжволі ўспамінаю:
Сямейная утульнасць — гэта гавань,
Ціхая, спакойная, куды заўсёды
Спісваюць старыя караблі.

І думаю, як прымірыць нам, людзям,
Такі вунь шторм, што аж экран ламае,
З утульным, млявым шэптам тэлевізара
Увечары, калі ідуць дажджы?

## Цішыня ў свеце

Узмахнуў крыламі матылёк
У нейкай невідомай старане —
Хваля дакацілася здалёк,
Як цунамі ўдарыла мяне.

* * *

Што з табой, свеце мой любы,—
Нашто ты гадуеш бяду?
Зубы скрыгочуць аб зубы,
Сэрцы на сэрцы ідуць.

Бачыш, як мятлушка б'ецца
На жудна-нейтроннай вярсце,
І часам напраўду здаецца,
Свеце, што ты звар'яцеў.

Стаім мы на ўздыбленай глебе,
Пад намі вулканіцца жвір.
Кажуць, чым горай, тым лепей,
Кажуць, вайна — гэта мір.

Не чуюць надзеі вушы,
І вочы не бачаць змен,
Нібы заблудзіліся душы
У лесе жалезным антэн.

Замежжа, Замор'е, Загінне...
Спыніце вашу гайню!
Хто любіць людзей, той павінен
Насмерць ненавідзець вайну.

Нараджаецца атамны вецер,
Ён хаты, бы гнёзды, змяце.
А ў гняздзе, што Зямлёй завецца,
Кормяць матулі дзяцей.

І рукі набраклі работай,
Сэрцы пульсуюць дабром...
Навошта ж атрутная слота,
Навошта ядзерны гром?!

* * *

Ва ўсёй жывой і нежывой прыродзе
Ніхто не ладзіць ловы на людзей.
Без дай прычыны звер не нападзе
На чалавека — зводдаль абыходзіць.

Акулы ля ахвяры карагодзяць,
Калі з'яўляецца пагроза іх вадзе,
Ваўкі абараняюцца ў бядзе,
Калі ім выць па-воўчы перашкодзяць.

Усе шануюцца цара прыроды,
Яму саступяць сцежыну заўсёды,
Даруюць крыўды горкія спрадвек.

Ды на зямлі ўсё ж ёсць адна істота,
Ад якой усе непамыслоты:
Сам на сябе палюе чалавек...

* * *

Даўно ўжо тое мінула,
сягоння так не бывае,
Сягоння так не бывае
і заўтра сатчэцца іначай.
Над хворым, збалелым дзіцяткам
шчыруе бабуля сівая
І шэпча, нібыта плача,
у веры святой і гарачай:
— Трасея, Агнея,
Хрыпунея, Халадзея,
Выйдзі, дакука,
Паздароў унука...
Даўно ўжо тое мінула,
сягоння так не бывае,
Сягоння хвароба ўжо іншая
і клопат таксама іншы.
Нібы перад нейкаю згубай
цішыня маўчыць, як нямая,
Толькі шчоўкае дзесьці нейтрон —
быццам кропля капае ў цішу.

Сягоння зямля захварэла —
грудзі забіты трацілам,
Яна кашлянуць баіцца —
каб не разляцецца на часткі...
Ах ты, бабуля, бабуля,
можа б, як ты упрасіла,
Каб да тваіх хоць гадоў дажылі
наіўныя сёння дзяўчаткі.

— Бамбея, Снарадзея,
Атамея, Нейтрынея,
Свет, я цябе малю —
Паздароў зямлю!

Не, бабуля тут не паможа.
Сягоння — ужо не ўчора.
А заўтра ў чаканні трывожным
падцяла збялелыя губы.
Уцякаць нам з зямлі няма куды
ў прадчуванні сусветнага гора,
І толькі, як меч, пытанне:
«Што з табой, свеце наш любы?»

— Людзея, Нарадзея,
Краінея, Планецея...
Дзе я?
На-дзе-я-я!

* * *

Маці было сорак гадоў,
Сыну было дваццаць.
Маці стала шэсцьдзесят гадоў,
Сыну стала дваццаць.
Маці мела восемдзесят гадоў,
Сын меў тыя ж дваццаць.
Маці памерла ў сто гадоў,
Сын забіты ў дваццаць...
Зямлі будзе мільярд гадоў,
Хлопцу будзе дваццаць.

* * *

Яна ў руцэ шчаслівая ляжала,
Шчакою саграваючы далонь,
Падцяўшы лапкі і схаваўшы джала,
Суняўшы спапяляючы агонь.

Як радасна, што праляцела міма
І чалавеку — раны ніякой!
Яна радзела ласкамі усімі,
К далоні прытуліўшыся шчакой.

Хаця якія ласкі ў гэтай згубы,
У гэтай папярэдніцы крыві,
Што гэтак абяскроўлівае губы,
Надзею адбіраючы: «Жыві!»

Няма ў яе ні лапак і ні джала —
Круглёная, адкуль ні паглядзець,
Век іншага жыцця яна не знала,
Як смерць.

Кавалачак малы вялікай смерці,
Кавалачак халоднага свінца,
Яна была шчасліваю, паверце,
У той руцэ задымленай байца.

Нікога не забіла, дзякуй Богу,
Нікога у магілу не звяла...
Смерць на жыццё мяняла перамога,
І куля ўжо апошняю была.

## Неба вайны

Гудуць цяжарныя жалезныя пачвары,
У іх раскрываюцца вялізныя жалезныя
чэравы
І адтуль, як эмбрыёны зла і няшчасцяў,
Бомбы ляцяць на зямлю.

* * *

А спачатку
Бомбы
Дзецям здаюцца зусім не страшнымі.
Яны нагадваюць ім
Сімпатычныя, даверлівыя
Мордачкі дэльфінаў,
З якімі так і хочацца,
Агалосіўшы ўсё навокал
Сваім радасным смехам,
Пазабаўляцца,
Падурэць.

Няўжо гэтаксама
Думаюць і дарослыя,
Калі пачварную атамную бомбу,
Нібы немаўлятка,
Называюць так ласкава:
«Малыш»?

Дык чаму ж тады яны,
Скінуўшы яе на дзіцячыя галовы,
Вар'яцеюць самі?!

## Жывы са спаленай вёскі

Ля цябе хораша, мой касцёр,—
Цёпла і весела,
Светла і ўтульна.
Я люблю, як ты,
Нібы ласкавае кацянятка,
Круцішся ля маіх ног дымам,
Лашчышся да мяне полымем
І, нібы вінячыся, лісліва-дагодліва
Спрабуеш лізнуць маю руку...

Цела адаграваецца ля цябе,
А душа марозіцца ўспамінамі —
Яна ненавідзіць цябе!

Кожны твой яркі лісток — ненавідзіць,
Кожны пялёстак — ненавідзіць,
Кожны новы парастак,
Што зачынаецца на смаловым сучку,—
Ненавідзіць,
Бо ты — родзіч тым кастрам,
Якія спальвалі жывых людзей,
А я — родзіч тым чужым людзям,
Якіх яны спалілі.

Мусіць,
Так яно і застанецца назаўсёды:
Цела будзе любіць цябе,
А душа — ненавідзець.

## Спачуванне

Ты, Сальвадор, і нам баліш,
Як наша колішняя рана:
І мы караныя былі
За спачуванне партызанам.

За спачуванне цішыні,
За спачуванне сонцу, ранню,
Цябе караюць дзень пры дні
За спачуванне, спачуванне.

Распяты на крыжах вайны
Бацькі твае, і іх караюць
За тое толькі, што яны
Сваім жа дзецям спачуваюць.

Дзяцей расстрэльваюць звяры —
І дзеці зноў жа вінаваты,
Што бацькам сваім наўзрыд
Спачуваюць, немаўляты.

За спачуванне да зямлі,
За спачуванне да радзімы
Людзей спяшаюцца спаліць,
Надзею, волю — разам з імі.

Караюць смерцю гарады,
Гарадзь лясы, палаюць вёскі.
За тое, што далі вады,—
Калодзежы і хаты ўроскід.

І паляць у дамах жанчын,
І топчуць немаўлят у іле,
І мы ад болю іх крычым —
Нас так таптапі, так палілі.

Мы помнім звар'яцелы час,
Калі ў агонь людзей зганяюць...
Матулі гэтак, як і ў нас,
Дзяцей сабою засланяюць.

А іх — галоўкаю... насмерць...
А іх, падкінуўшы,— мачэтэ...
Скажыце, як не звар'яцець
Матулям, бачачы ўсё гэта?!

Як пераносіш гэты жуд,
Далёкі, блізкі нам народзе?!
Крывава найміты і тут
Рукой тваіх забойцаў водзяць.

Ты, Сальвадор, і нам спаўна
Баліш, нібыта наша рана:
Яны страляюць і па нас —
Мы ж спачуваем партызанам!

* * *

Сам на сябе палюе чалавек,
Трацілавыя ўстройвае засады,
Прыдумвае нейтронныя блакады,
Удасканальвае найноўшы здзек.

Крывавая вада ваенных рэк
Нікому ў свеце не бывае ў радасць,
Бікфордавы шнуры, як тыя гады,
Спружынящца нахабна ля павек.

І як злавесны сімвал хараства
На востраве далёкім Раждзества,
Злаатамнымі ўспышкамі спавіты,

Іх пацалунак высветліўся нам,—
У водсветах апошніх Ён, Яна...
Ты паплач, каханая, адкрыта.

* * *

На трэцяй ад сонца планеце —
радасць,
На трэцяй ад сонца планеце —
звады.
На трэцяй ад сонца планеце —
вясна,
На той жа планеце —
вайна, вайна.

На трэцяй ад сонца планеце —
дзеці,
Смяюцца і плачуць на той жа
планеце.
На трэцяй ад сонца планеце —
людзі...
Няўжо згарыць яна ў атамным
гудзе,
Няўжо яе болей у свеце
не будзе —
Прыгожай, трэцяй ад сонца, планеты?!

## Калыханка

Бацька:

Ты расці, мой сын, ты расці хутчэй,
Будзеш мне тады ты памочнікам:
Станем з косамі — упракосім луг,
Стог складзем удвух — залюбуешся,

Воз уціснем мы — нібы лялечка,
Хату новую з табой выстружам —
На ўхвалу усім нашым дзедзічам...
Ты расці, мой сын,
Ты расці, мой сын,
Ты расці, мой сын,
Там — сяўба.

Маці:

Не спяшайся, сын, так расці, малю,
Буду век табой я лагодзіцца,
Я цябе люляць буду ласкава,
Я цябе насіць на руках буду,
Я цябе карміць буду з лыжачкі
І, шчаслівая, назіраць буду,
Як ты з ручкамі забаўляешся...
Не расці, мой сын,
Не расці, мой сын,
Не расці, мой сын,
Там — вайна.

Радзіма:

Ты расці, мой сын, ты расці званчэй,
Абыдзі, прашу, гэту просьбу-плач,
Разумею я сэрца матчына,
Бо і я ж сама — маці вам усім
І за кожнага з вас крываўлюся.
Але ж ты расці, мой заступнічак,
Не давай сябе люляць лішняе,
Лыжку сам бяры — не прасі карміць,
І на ножкі ты станавіся сам —
Не звыкай да рук, абаронца мой.
Будуць ворагі — барані мяне,
А прагоніш іх — жыта, сыне, сей,
І касі траву, і святліцу стаў...
Ты расці, мой сын,
Ты расці, мой сын,
Ты расці, мой сын,
Там — жыццё!

* * *

А сатана — людзей і Бога вораг —
Бывае, шэпча ціхенька на вуха:
«Паслухай,— шэпча ўнікліва,— паслухай,
Што табе разумныя гавораць.

Паслухай — і хадзем са мною смела».
Куды хадзем? Галоўнае — навошта?
«Якая розніца — ратуй спачатку цела,
Усё даруецца — якой крывёй і коштам!»

Чакай, а як душа? Яна ж святая!
Смяецца ў самы твар тады нягоднік:
«Душа? Ты што — у воблаках лятаеш?
Няма душы! Не да яе сягоння!»

Дык, значыць, без душы аром і сеем?
Дык, значыць, без душы дзяцей люляем?
І без душы мы ненавідзім змея,
Які з нейтроннай бомбаю гуляе?

Нячысцік, згінь! Душа мая са мною
Заўжды была і будзе — як сумленне.
І яе ні ласкай, ні маною
Не адбярэ ніхто ні на імгненне!

## Трывожная радасць

Гляджу, як радуецца шчыра ўсё вясне,
І сам сябе, хоць і з трывогай,
супакойваць мушу:
Не! Усё-ткі не ўяўляецца, зняверанаму, мне
І рэчка без вады,
і лес без дрэў,
гняздо — без птушак.

## З мінулага

Здаецца, бачу сам балючыя стагоддзі,
Задымлены і цьмяны небасхіл.
Здаецца, чую: ногі мне халодзіць
Астылы прысак селішчаў-магіл.

Стаю над продкамі, што чужакі стапталі,
Вачыма лашчу мёртвых ваяроў
І адчуваю, як ва мне праз далі
Пульсуе іхняя святая кроў.

Вакол — вясна. Пара араць і сеяць,
А цішыня такая, што аж мне
Здалося: разам з ёй і сам нямею —
Няма нідзе ні сейбітаў, ні жней.

І раптам на ўтравелым беларускім полі
Я згледзеў постаць дзіўную, як зман.
Яна ішла, няспешная, паволі,
Ступала на здзічэлы ўжо дзірван.

Быў гэта Час. Як земляроб, рупліва
Ён пазіраў на поле і на луг.
Ён у адной руцэ трымаў вязьмо для жніва,
Другою нецярпліва гладзіў плуг.

І ўбачыўшы, як уставалі людзі з мёртвых,
Як ураблялі за вярстой вярсту,
Я зразумеў: зноў на маёй зямлі гаротнай
І людзі, і зярняты прарастуць.

* * *

Ты паплач, каханая, адкрыта,
Я цябе, тужлівую, прашу,
Бо слёзы супакойваюць душу
Ад усяго, што цяжка пражыта.

Нам трэба зноў араць і сеяць жыта,
І я табе, заплаканай, кажу:

Ты ведаеш, і я ў сабе нашу
Слёз і надзей няспраўджаных набытак.

І ты сябе ніколькі не няволь —
Хай са слязьмі выходзіць вечны боль:
Яшчэ чысцейшай зробіцца крыніца!

Надзею і праз слёзы прытулі,
Каб зноўку ад нягодаў абудзіцца
Для радасці ўрачыстай на зямлі.

* * *

І нарадзіў кагосьці хтосьці,
Той зноў кагосьці нарадзіў.
Раджалі шчодра ягамосці,
Раджалі плодныя наўздзіў.

Святых раджалася ўсё болей —
Ім трэба шапкаваць здалёк.
А жыта красавала ў полі,
І цвіў на ўзмежку васілёк.

І ў тым, мы зналі, наша сіла,
Радзелі кожную вясну,
Што зерне — зерне нарадзіла,
Трава — траву, сасна — сасну.

І я, як той далёкі продак,
Свой добра ведаю выток...
Мая рэлігія — прырода,
Мой Бог — заземлены расток.

* * *

Якое дзіва!
Сонца зноў, як і ўчора,
Узышло раніцою!
Яго промні ласкавыя дакрануліся да Зямлі.

Стала цёпла і сонечна.
І ўвесь дзень абяцаўся быць сонечным...
Узышло наша сонца, сонейка!

Падумалася:
А што б было,
Каб Зямлю
Асвятляла не Сонца,
А нейкае зусім іншае
Нябеснае цела?

Скажам, Меркурый?
Узышоў Меркурый,
І адразу стала меркурна.
Меркурныя промні
Ласкава дакрануліся да Зямлі.

Альбо Юпіцер?
Усе чакалі ўзыходу Юпіцерка.
Ён ўзышоў, і адразу стала
Юпіцерна.
Дзень быў юпіцерны.

Ці Сатурн?
Свяціў Сатурн,
І мы,
Прыкрыўшы галовы шапкамі ад Сатурна,
Песціліся ў яго ласкавых
Сатурнавых промнях...

Бог ведае што такое!

Падумалася:
А што б было,
Каб мы жылі не на Зямлі,
А на нейкай іншай планеце?
Скажам, на Марсе?
І тады ўжо:
Не «зямелька любая»,
А «марсік наш родны».
І тады ўжо:
Ласкавыя промні Меркурыя
Асвятлілі ярка наш Марсік.
Беражы нас, свеце ўсямогі!

І ўсё ж —
Зямелька любая,
Сонейка ласкавае!
І ўсё ж —
Якое дзіва:
Узышло ласкавае сонейка,
І стала светла і радасна
На нашай роднай зямельцы...

Як хораша гэта, быццам малітву,
Паўтараць кожную раніцу!

* * *

Для радасці ўрачыстай на зямлі
Зусім нямнога — і нямала! — трэба:
Галінку пасадзіць ласкава ў глебу
І жыватворным сокам наталіць.

Затым плады настойліва спяліць,
І дыхаць чыстым сінямройным небам,
І лашчыць вокам светлыя ад хлеба
Такія спаконвечныя палі.

І радавацца пры суладдзі гэткім
Дамоваю святой пчалы і кветкі,
Рэжымам працы і спакусы іх.

Як вусны, кветка дотыку чакае...
Не адганяй і ты вачэй маіх —
Травой траву ніколі не стрымаеш.

* * *

Вядзі мяне, зялёная радзіма,
Туды, дзе я пачаўся, як ручай,
Дзе мяне помняць мята, малачай,—
Вядзі мяне, зялёная радзіма.

Там сціхне боль, прытупіцца адчай,
І там я ўспомню кожнай краскі імя...
Вядзі мяне, зялёная радзіма,
Туды, дзе я пачаўся, як ручай.

## Дойлід

Пчала за ўзяткам рупна паляцела,
І птушка мільганула каля дрэва,
І песня увінцілася ў блакіт,
А я адзін стаяў паміж прастораў
І вечнаю будоўляй любаваўся...

Ага, ага, спачатку толькі гэтак:
Не парушаючы закон геатрапізма
(Карэнне — ўніз, галіны — строга ўгору),
Расці і будавацца. Трэба помніць,
Што крона размяркоўвацца павінна
Заўсёды па акружнасці ствала
Разумна, раўнамерна. Трэба ведаць:
Усе сістэмы жыццядайнасці будынка
Павінны безадказна працаваць:
І скарыстання сонечнай энергіі,
І тэрмарэгуляцыі, і сілкавання,
І цеплаізаляцыі. І трэба не забыцца
Разлічыць лакальнае напружанне
На кожную галінку. Бо, да прыкладу,
Вось тут калісьці плод вялікі выспее
(Адкуль вядома? Дойлід мусіць ведаць!),
І каб ён не зламаў галінку,
Яе адразу трэба ўмацаваць.
Адсюль нахопліваецца часта будзе вецер
(І гэта зноў жа дойліду вядома!),
А каб ён не перакуліў будову,
Нагою ў дол мацней трэба ўперціся,
Паставіўшы карэнішча наперад. А яшчэ,
Як здарыцца бязлітасная засуш
(Ага, і гэта дойлід добра ведае —
І год, і месяц можа прадказаць),

Дзе браць ваду? І ён карэнне
У самыя глыбокія пласты выводзіць
І кансервіруе — няхай пакуль чакаюць,
Калі той спёкі зваліцца пара.
Усё павінен дойлід прадугледзецьІ
Як з шэрае зямлі, нябачнага паветра
І залацістых сонечных праменняў
Знойдуцца чырванабокі яблык,
Зялёны ліст і кветка шматкалёрная
І загайдаюцца у ветра на руках...

Пчала назад — з узяткам — палящела,
І птушка — з кормам — у гняздо вярнулася,
Скружылася, нібы лісток, з нябёсаў песня
І села на галінку, склала крылы...

А я стаяў і, як зачараваны,
Будоўляю дзівоснай любаваўся,
Глядзеў, як дрэва — вопытнейшы дойлід —
Узводзіла само сябе.

* * *

Травой траву ніколі не стрымаеш,
І ветрам ветру, мусіць, не спыніць,
І полымя не спаліш у агні —
Яно з агня яшчэ вышэй шугае.

Як вецер дзьме са зваблівага гаю,
Не трэба нам баяцца вышыні,
Рашуча ўсе сумненні адхіні —
Няма адчаю, калі так кахаешІ

І здрадзіўшы абвыкламу настрою,
І восень пераблытаўшы з вясною,
Хачу я ў тваіх травах патануць.

Усе часіны года у адну
З'яднаць. І там астацца ўдвух з табою,
Дзе сцежкі ведаюць цябе адну.

## Жыццяпісы

### *Воблака*

О як плысці нязвычна ўсё-ткі ў небе
Таму, хто нарадзіўся на зямлі,
Не адчуваючы нядаўняга цяжару,
Што аддзяліўся, быццам успамін.

Я разлучылася — па кропельцы — з зямлёю
І ў небе, невагомае, плыву.
Я — возера нядаўняе. І зараз
Жыву сваім давоблачным жыццём.

Успамінаю зарасні аеру,
Сваю сукенку лёгкую — туман.
А як шчыкотна мне было ад рыбы,
Якая аж вірылася ўва мне.

Лілеі помню, помню крыгі, лодкі
І губы коней, пацалунак іх,
І целы чалавечыя тугія,
Ад якіх аж вар'яцела я.

Хаця я кожнай кропелькаю помню
Да скону незабыўную зямлю,
Чамусьці мне настойліва здаецца:
І ў небе я калісьці ўжо было.

І вось лячу я, гнанае вятрамі,
Каторы раз над роднай старaной.
Ёсць у мяне ў запасе асалода —
Праліцца светла на зямлю дажджом.

Але ж пакуль магу, цярплю, трываю,
Бо асалода гэта — мой канец.
Нашто трываць?! Хутчэй уніз, на травы!
Няхай — канец! Абы — ізноў зямля!

### *Парастак*

Даўно і ўпарта выхаду шукаю,
Яго ж нялёгка ўпоцемку знайсці.
Я прабіваюся як быццам з таго свету
Да вольнага паветра і святла.

То галавою стукнуся ў камлыжку —
Яе, натужыўшыся, сам я раскрышу.
А то вось на шляху папаўся камень —
Яго ўсё-ткі лепей абысці.

А на мяне зямля, як глей, наліпла —
Мой пот вільготніць навакол падзол...
Нарэшце пройдзена апошняя камлыжка.
О радасць, радасць: добры дзень, святло!

Я ад зямлі абтросся.
Пот свой выцер.
Тады з далоняў выпусціў сцябло.
Няхай вышэй, вышэй, вышэй імчыцца,
Раскручвае зялёныя лісты.

Я ўсё зрабіў, хоць гэта было цяжка,
Я ўсё прайшоў — ад цемры да святла.
І гэты свет табе дарую, кветка,
Здабыты ўсім, што меў,— сваім жыццём.

Табе ж сабраць лісточак да лісточка,
Пялёстак да пялёстка далучыць.
Па колерах, па выгляду, па паху
Усю сябе, як дзіва, нарадзіць.

Жыві і ўспамінай, як я буруніў
Дзеля цябе зляжалую зямлю,
Каб ты магла сваёю прыгажосцю
Здзівіць усіх і ўсё зачараваць.

*Хата*

Калі я нарадзілася — не помню,
Здаецца мне: была заўсёды я,
Вось так стаяла між травы пад сонцам,
І сонца лашчыла мне кожнае акно.

З людзьмі сумленнымі спрадвеку сябравала,
А іх наслухацца за век свой не змагла:
Яны заўсёды рупіліся ў полі,
Я ж гадавала, няньчыла дзяцей.

Як я любіла іх дзіцячы шчэбет,
Іх смех, іх гульні, нават іхні плач!

Тады і я, здаецца, маладзела
І станавілася, нібы яны, дзіцём.

І ўсё-ткі ноччу, калі ўсё сціхала,
Мне сніліся загадкавыя сны:
Лес, мокры ад дажджу. Ігліца. Лапкі.
А навакол — грыбы, грыбы, грыбы.

І доўга пахла потым мне грыбамі,
Суніцамі, зайцамі, дзеразой!
І так хацелася мой лес хоць раз убачыць,
Ды не магла пакінуць я дзяцей.

Я шанавала, ў крыўду не давала
Ніколі ні дарослых, ні малых.
Віхуры крылле аб мяне ламалі,
На ганку паміралі маразы.

Паразляталіся, як птушкі, мае дзеці
І прыжыліся ўнукі ў гарадах.
А я жыву адна. Як рот мне, дзверы
Замкнуў цяжкі, заржаўлены замок.

Мінулае жыццё успамінаю,
Перабіраю ласкава па днях.
Цяпер мне сняцца дзеці, дзеці, дзеці...
Як я хачу пачуць дзіцячы смех!

* * *

Дзе сцежкі ведаюць цябе адну,
Хачу пасябраваць з тваёю казкай,
Твае лугі зялёныя і краскі
Да грудзей шчымліва прыгарнуць.

Мае гады далёкія вярнуць
З юнацкай, летуценістай папаскі.
Пяшчотай перапоўнены і ласкай,
Цябе галубіць, як сваю вясну.

І ўсё ж... Не высвятляючы прычыны,
Дазволь вярнуцца ў восень мне маю,
Дзе ветры ўсё задумлівей пяюць.

Ты ж зноўку мрояй зробішся нявіннай.
І я успомню чысціню тваю,
Калі мая закончыцца сцяжына.

## Пасля журбы

Як жабракі складаюць торбы
Пасля дарогі, пад вярбу,
Складзем і мы сваю журбу,
Як жабракі складаюць торбы.

Дадзім спачын душы, гарбу —
Журба ж і моцных нават горбіць...
Як жабракі складаюць торбы,
Складзем і мы сваю журбу.

* * *

«Ненавідзець — гэта ўсё ж любіць»,—
Хочацца сказаць табе на ростань.
Зразумеў, навучаны узростам:
Ненавідзець — гэта ўсё ж любіць.

Тое, што мінулася, забыць
І нялёгка, і зусім не проста.
«Ненавідзець — гэта ўсё ж любіць»,—
Хочацца сказаць табе на ростань.

* * *

Ёсць жа людзі: пагляд — нібы ў кобры,
Вочы — быццам халоднае шкло;
Хочуць, каб і самім было добра
І каб кепска ўсім іншым было.

А душа наша — ўся са спагады,
Спачуванне з жыццём нам далі.
Хіба хто-небудзь зможа быць рады,
Калі іншаму дужа баліць?!

Вось таму непрытворна хачу я
У людскім разнамоўным гаю
Боль чужы і бядоту чужую
Адчуваць векам век як сваю.

* * *

— Я пайду ў гарод
Агуркі палоць.
— Мама, я з табой.
— Ну, хадзем, дачка.

— Я пайду на луг.
Сена варушыць.
— Мама, я з табой.
— Ну, хадзем, дачка.

— Я пайду на лан
І жытцо дажну.
— Мама, я з табой.
— Ну, хадзем, дачка.

— Я пайду туды,
Скуль дарог няма.
— Мама, я з табой.
— Не! Туды, дачка,
Я пайду адна...

* * *

Калі мая закончыцца сцяжына,
Я не пакіну родную зямлю,
Якую гэтак роспачна люблю,
Цябе таксама, боль мой, не пакіну.

Каля цябе, каханая жанчына,
Я волю дам зялёнаму галлю
І сокам лісце ссохлае налью —
Няхай яно шапоча над Айчынай.

Лістамі дрэў пачну нанова марыць,
Кветкаю з травы, нібы радарам,
Услухаюся ў блізкі ўжо сусвет.

І збоку будзе бачыць мне нязвычна,
Як паміж сузор'яў і планет
Ляціць Зямля — наш карабель касмічны.

## Матчына сэрца...

З усіх гукаў, якія зведаў,
гэты быў самы першы —
яго я пачуў яшчэ да свайго нараджэння:
як прыслухоўваўся я і як мне спакойна
было ў ім — ён, здаецца, мяне атуляў,
як паветра, з якім пазнаёмлюся потым.
Гэты гук, калі я нарадзіўся,
быў таксама заўсёды са мною,
ён мацнейшым здаваўся
за ўсе гукі і вёскі і горада:
за рыканне кароў і рыпенне трамваяў,
за спевы птушак і галас транзістараў,
за пошум дрэў і ўздых стадыёнаў,
калі там забіваюць гол.
І хоць гук быў нямоцны, па ім
я заўсёды звычайна знаходзіў,
дзе на той час была мая мама:

ля студні, у полі, пад лесам
ці на кладзішчы...
І хоць мамы даўно ўжо няма,
я і зараз біццё яе сэрца чую
і лягчэй засынаю, натомлены,
пад яго супакойлівы тукат —
як пад гоман ціхага летняга ліўня
альбо пад задумліва-светлае
ціктаканне
звыклае
ходзікаў...

* * *

Учора — не маё: яно ў чужых руках,
І сёння — не маё: мільгне і стане ўчора.
А заўтра, што здалёк крыляе, нібы птах,—
Маё. Мне з ім дзяліць і радасці, і гора.

І што было — прайшло. Што будзе — то міне.
Так дзень за днём знікаць у вечнасць мусяць.
Чым, хуткакрылы птах, парадуеш мяне,
Што прынясеш мне ў дзюбе на спакусу?

Ну дзе ж ты, Заўтра?! Хораша чакаць
Твайго, асветленага мараю, світання!
Бо кожнаму, як сябрава рука,
Заўсёднае на заўтра спадзяванне.

* * *

Ляціць Зямля — наш карабель касмічны,
Дом для дваіх і для усіх зараз.
Крыху зацесны дом гэты для нас,
Але ж такі нязводны і магічны.

Заселены каханнем шматаблічным
Усіх краёў шматколерных і рас,

Які ж ён непаўторны без прыўкрас,
Аквечаны дзіцячым смехам зычным.

І недзе ў нашай беларускай хаце
Пачуўся крык шчаслівы немаўляці,
Якому годна між усіх звінець.

І ты, сцвярджаючы жыцця непераможнасць,
Нават у напружанні трывожным
Усміхніся мне.

## На завяршэнне кнігі

Бывай жа, радаснае мліва,
Бывай, рукой нагрэты млён!
З табою нам было шчасліва
Сярод завейных, снежных дзён.

І сярод весніх дзён спатолі
Нам не было аж да начы.
Сады цвілі — а мы у полі,
Лугі квітнелі — мы палолі,
Не мелі часу на спачын.

І лета з восенню мільгнулі,
Мы і не ўбачылі — калі.
Спявалі птушкі — мы не чулі,
Гулі камбайны — ў іхнім гуле
Мы, як знячэўныя, былі.

І вось закончылася праца,
Цяпер гуляй, блазнуй, жыві.
А нам з ёй шкода расставацца:
Без працы — быццам без крыві.

Бо з ёю нам было шчасліва
Сярод клапотна-звыклых дзён.
Дык дзякуй, радаснае мліва,
Да стрэч, душой сагрэты млён!

*З кнігі*

# «ВЕЧА СЛАВЯНСКІХ БАЛАД»,

1988 г.

## Сяўба

**Беларуская балада. XX стагоддзе**

На папялішчы, на пачарнелым
Яна сядзела — жанчына ў белым;
На чорнай пляме відна здалёку,
Нібы цяпельца ў халодным змроку,
Ля галавешак — былога ганка —
Сядзела ў одуме партызанка.
А навакола вясна буяла,
Трава пад попелам бушавала,
Трава рассоўвала ўбок вуголле —
Жыццё ірвалася зноў на волю.
І ўжо фашыстаў — нідзе, нікога,
Ідзе, вяселіцца перамога,
І ёю пахне усё на свеце:
Лісцё і неба, зямля і вецер,
І папялішча, дзе каля ганка
Сядзіць у одуме партызанка.
А на каленях — дзіцячай жменькай —
Ляжыць вузельчык, такі маленькі,

Дзе знемагае ўжо столькі летаў —
Сяўбы чакае насенне кветак:
У садку сваім семя тое
Яна сабрала перад вайною
І з таго часу з сабой заўсёды
Яго насіла ва ўсе нягоды,
Як талісман той блюла на радасць:
З ім прахадзіла яна блакады
І праз балоты яго, сухое,
Як порах, несла над галавою —
Збудзіць баялася ў ім, ціхмяным,
Бучную сілу жыцця зарана.
Бо калі зерне ды прарастае,
Хто ў вузялочку яго ўтрымае?!
Яна развязвала дужа рэдка
Вузельчык гэты, дзе млелі кветкі.
Упершыню яго развязала.
Калі мужа свайго хавала —
У маёвае тое ранне
Сябры прынеслі яго з задання...
Закрасаваліся на магіле
Зноў кветкі тыя, што так любілі
Іх даваенны гарод, каторы
Яны, звязаныя нават, снілі...
Тады ў вузельчык сыпнуўся порах
(Яна набоі рабіла мальцам,
І парашынкі прыліплі к пальцам).
А ў другі раз насенне брала,
Калі сына свайго хавала —
Яго прывезлі з цяжкога бою
З ацежалелаю галавою...
Зачырванелі над хлопцам макі...
А ў вузел трапіў панюх табакі
(Крышыла маці табаку мальцам,
І парашынкі прыліплі к пальцам).
А ў трэці раз яго развязала,
Калі дачушкі малой не стала,
Яе заняньчыў касцісты голад —
Яна памерла ў блакадны холад.
І засталося дзяўчо ў той выспе,
Над выспай кветак гародчык выспеў,
А ў вузялочку запахлі крошкі.
(Дзяўчынка хлеба прасіла трошкі,
Збіралі крошкі ўсе па кішэнях,

Сабралі крошак цэлую жменю,
Ды толькі позна — дзяўчо згарэла...)
Таму сягоння на пачарнелым
На папялішчы вясновым ранкам
Сядзіць самотная партызанка...
А з вузялочка, што у прыполе,
Зярняты прагнуць упасці долу —
Як цягне, цягне іх да зямліцы,
Каб абудзіцца, праз дзёрн прабіцца!
Вось партызанка ўзнімае вочы,
Яна развязвае вузялочак,
Нібы пупышка — набухлы гэткі...
— Ўзыходзьце, кветкі, буяйце, кветкі!
Не асыпайцеся вы ніколі —
Перамажыце той чорны колер,
Які зялёным, вясновым ранкам
Сустрэў няветліва партызанку.
А калі можаце — хоць бы трошкі!—
І вы ўзыдзіце, хлебныя крошкі.
Як будзе голад — і ўдзень і ўночы
Хай лазяць дзеці у мой гародчык!
Яшчэ прашу я — ўзыходзь, табака!
Я зацягнуся табой са смакам,
Бо я прывыкла курыць задужа —
Куру за сына, куру за мужа...
І толькі порах — мой даўні вораг,
Не узыходзь, не дамешвай гора!
Звяжыце моцна яго, карэнні,—
Хай задыхнецца ў зямных скляпеннях...
На папялішчы на пачарнелым
Яна хадзіла — жанчына ў белым...
На чорнай пляме відна здалёку,
Нібы цяпельца ў халодным змроку.
Ля галавешак — былога ганка —
Кветкі сеяла партызанка.

## Мячык

**Польская балада. XX стагоддзе**

Скача мячык, скача мячык,—
Паспрабуй ты дагані!
За калючым дротам мячык
Скача весела ў гульні.

Ах, які харошы дзядзька,
Хоць і немец:
Пагуляць даў мяч-прысядзьку,
Мяч-шаленец.
Дзядзька ж доктар. Ну, а дзеці
Добра знаюць,
Дактароў благіх на свеце
Не бывае.
Дактары заўжды вясёлыя
Прыходзяць
І хваробы ўсе уколамі
Выводзяць...

Скача мячык, скача мячык,—
Паспрабуй ты дагані,
Калі ў роце, апроч плачу,
Ні халоднай, ні гарачай
Ежы не было ані.

Ах, які харошы доктар
Немец гэты —
Абяцае місу ўкоптар
Бульбы грэтай...
Падагрэтай — пасля ўколаў
Абяцае.
Ну ці скора тыя ўколы?!
Бо іх голад, бо іх голад
Так чакае...
Ну, а доктар кіпяціць, напэўна,
Шпрыцы,
Каб пры ўколах ім, малым,
Не заразіцца...

Скача мячык, скача мячык,
Скача весела ў гульні.

Бульба ж варыцца — няйначай...
Пахне, мусіць, бульба смачна...
— Гэй, гані яго, гані!

Колькі радасці наўкола —
Як чакаюць дзеці ўколаў!
Бегаць вучацца нанова
На нагах — сцяблінках кволых,
І смяяцца (зноў — нанова),
Як у садзіках вясёлых
Ці на перапынку ў школах.

Ажывілі дзетак гульбы.
Скача мячык... Пахне бульба...
Мячык... бульба...
Бульба... мячык...
Скачуць...

. . . . . . . . . . . . . . . . .

А ты, хлапчанятка,
Чаму не смяешся з усімі
І не спрабуеш дагнаць
Развяселены мячык?
Чаму ты глядзіш на гульню тужліва,
Вачыма такімі —
Як плачаш.
Ідзі,
Дзядзя доктар табе вунь махае рукою...
Усё ўжо гатова —
Ад лякарства ўгінаецца столік...
— Я ведаю, вы забойца.
Мяне вы заб'еце.
І толькі за тое,
Што я по́ляк.
Вы — фашыст.
Вы ніякі не доктар.
Я ведаю добра таксама,
Што не лякарства,
А смерць гэтак доўга вы нам рыхтавалі.
Мама!
Пракляні гэты мячык, мама,
Які нам фашысты далі!
І выгукнуў смела хлопчык,—
Адкуль ён сабраў столькі сілы! —

Верш, што калісьці ў школе
хорам вучылі:
«Хто ты естэсь?
Поляк малы!
Які знак твуй?
Ожэл бялы!..»

Скача мячык, скача мячык...
А дзяцей той крык спыніў.
За калючым дротам мячык
Скача сумна, не ў гульні,
Мячык, што гульні дзіцячай
Так бязлітасна зманіў...

## Урок

**Сербская балада. XX стагоддзе**

> «Пуцайце, я і сада држым час»[1],— словы Мілае Паўловіча, настаўніка з Крагуеваца, сказаныя фашыстам, калі яны расстрэльвалі 300 школьнікаў...

Дзеці, супакойцеся,
Мы правядзём сягоння з вамі
Апошні свой урок...
Па-першае, давайце мы паўторым
Мінулае.
Хто ведае, скажыце мне,
Што значыць радасць, воля, смех, Радзіма?
О, столькі рук —
Засвоілі вы добра урок мінулы.
А цяпер давайце запішам тэму новага урока...
Прабачце, не запішам, а запомнім.
Увага, Глішыч! Не глядзі спалохана
На аўтаматы...
Не круціся...

[1] «Страляйце, я і зараз вяду ўрок».

Значыць, тэма:
«Звяры дваццатага стагоддзя».
Мэта:
Вас навучыць хачу я ненавідзець
Такіх звяроў...

Страляйце ж, крывасмокі!

Чакаеце...
Ну што ж, тады прадоўжым
Урок наш, дзеці... Перад вамі экспанаты,
Не выкапнёвыя — жывыя экспанаты
І жорсткасці, і трусасці звярынай:
Яны ж баяцца нават вас, малечы,—
Безабаронных,
Вяснушчатых,
Кволых,
Хоць кулачкі адны — ўся ваша зброя...
Цішэй, не шморгай носам, Йовановіч!
Баяцца...
А таму, зірніце, абчапляўшыся
Гранатамі,
Нажамі,
Кулямётамі,
З дзяцьмі ваююць смела, неданоскі...
Не чысці, Крсціч, у фашыста боты —
На іх дыміцца кроў тваіх бацькоў...

Страляйце ж, ваўкаўё!

Марудзяць кулі...
Пойдзем тады далей,
Каб лепей разабрацца ў нашай тэме.
Звярніце ўвагу, дзеці:
У фашыстаў
Тупыя, абыякавыя твары,
А ў галаве пустой
(Хоць і такой вялікай!)
Не хопіць месца і маленькай думцы...
Не плач на ўроку, чуеш, Мілаевіч!..
Зірніце:
Вось — вышэйшай расы людзі,
Ніжэйшыя па думках за жывёлу,
Бо нават і ў сабачаняці вашага,

Вы помніце,
Якая мордачка разумная была...
Урок вы зразумелі, дзеці?
Можа,
Пытанні ў каго будуць? Задавайце.
Бо зараз зазвініць званок...

Званок той быў чаргою кулямётнай,—
Яго ўжо дзеці не змаглі пачуць...

## Еш!

**Славенская балада. XX стагоддзе**

Калі ў канцлагеры закончыцца вячэра,
Ацiхне бразгатанне кацялкоў,
Яны спяшаюць у зацемненае месца,
І кожны нешта пад крысом нясе:
— Еш!

Адзін — баланду, злітую ў бутэльку:
Як бы самога ўсцешыла яна!..
Другі — акрайчык, што дзяўбе ў далоні...
Спакуса яго несці пад крысом!..
— Еш!

Знябытыя, зняможаныя вязні
Нясуць свае галодныя пайкі...
Як доўжыцца кароткая дарога —
Хутчэй, хутчэй бы ўсё яму аддаць!
— Еш!

А калі есць ён — прагна, хапатліва,
І чмякае (наглядчык бы не ўчуў!),
Як ласкавеюць земляныя твары:
Аж радасць загараецца ў вачах.
— Еш!

— Еш, дарагі наш. Ты — збавіцель,
Адзіная надзея на жыццё.

Ён чмякае... І мускулы мацнеюць...
Круглее твар... Ён чмякае гучней...
— Еш!

Як радасна — ужо рукі ягонай
Ніхто не зможа ў лагеры сагнуць!
Паспрабавалі ўдзесяцёх падужаць —
Параскідаў, нібы той бык снапы.
— Еш!

Як здорава, што гэтага абралі!
Як ён сыцее — проста на вачах.
Сыцее ён — бліжэй, бліжэй расплата,
А там і вызваленне, можа быць...
— Еш!

І вязні ўсе пайкі свае і сілу
З надзеяй аддаюць яму штодзень,
Каб ён стаў моцным, каб ён змог падужаць
Наглядчыка, што здзекуецца, кат.
— Еш.

Еш... Вязні не маглі нават падумаць,
Што той, хто пайкі іхнія жарэ,—
Не сябра ім. Ён здраднік, здраднік, здраднік,
Якога сам наглядчык падаслаў...
— Падавіся!

## Пытанне

**Македонская балада. XX стагоддзе**

Ён звозіў даспелае жыта —
Адпрэглі каня чужакі.
Пытаюць са здзекам бандыты:
— Скажы нам, а хто ты такі?

— Я — Коча Маркоўскі. Мо чулі?
Я — македонец, мужык...

І пахне так порахам руля,
І сэрца ўжо б'ецца аб штык.

— Які македонец, хамула?
Тут — Грэцыя, мы на вякі!
І ты, мусібыць, Фамапулас
Альбо Пікіёніс які.
А ён бізуноў, хлопцы, хоча,—
Дайце, каб помніў: ён — грэк...

На возе маленькі сын Кочы
Плача ад крыўды за здзек.

Пытанне ізноў сцебанула,
Нібыта бізун той цяжкі:
— Ну, дык ці ўспомніў, хамула,
Хто ты, урэшце, такі?

— Я — Коча Маркоўскі... Не чулі?
Я — македонец, мужык...

І зноў пахне порахам руля,
І зноў сэрца б'ецца аб штык.

— Відаць, было часу замала —
Не ўспомніў нічога, дзівак...

Нагайка ізноў засвяшала —
Ты — грэк... Толькі так... Толькі так...

— Ну, а цяпер, можа, ўспомніў,
Хто ты ўсё ж! Досыць маніць!

Маўчыць. І не дыхае. Промні
Над ранамі — як авадні...

— Шкада, што забілі... Слабы ўсё ж...
Што грэк ён,— цяпер нам не ўчуць...

І раптам рашуча ўсхапіўся
На возе маленькі хлапчук:

— Я — Ташка Маркоўскі, бандыты,
Я — македонец, мужык!

На воз верне руля сярдзіта...
Як сэрцайка б'ецца аб штык!..

## Кветкі

Сербская балада. XX стагоддзе

І пахнуць разамлела гэтак кветкі,
І кружыць галаву іх даўкі пах...
Трымае ён букет вялізны гэткі,
Цяжкі такі — аж млявасць у руках.

А колькі радасці ў вачах ягоных!
Так, падарыць букет ён будзе рад...
Вось-вось праедзе тут наследнік трону —
Сам найсвятлейшы герцаг Фердынанд.

Чакае... Побач войска маршыруе.
Пяюць салдаты — аж за вушы рот:
— Хвала краіне,
                    дзе свінец красуе,—
На кулі, значыць, будзе умалот!

Зняважаная швабамі краіна,
Па вуліцах тваіх
                    на Відаў дзень
Пыхліваю,
            крыкліваю лавінай
Салдатчына чужацкая ідзе.

Якая урачыстасць! Барабаны
Салдатам
            збіцца не даюць з нагі.
Закрыты школы.
                    Нават паздыманы
З усіх флагштокаў сербскія сцягі.

Яны спяваюць, што даўно залежа
Ад іх, ад іх і гэты мужны край...
— Хвала,— пяюць,—
                    што ў нас расце жалеза —
Гармат мы здымем новы ураджай!

А ён адзін на вуліцы з букетам...
І апусціўшы вочы злыя ўніз,
Яго абходзяць сербы за край свету:
— Вар'ят, напэўна.
                    Можа, блюдаліз.

Злуюць: — Нас швабы гэтак абражаюць —
На Відаў дзень зрабілі свой парад,
А ён, зірніце, кветачкі трымае...
Вар'ят! Вы ж самі бачыце — вар'ят!

А можа, робіць лёгкую кар'еру?
А мо яго адолеў здрады сверб?..
Стаіць з букетам, радасны праз меру,
На вуліцы вернападданы серб.

А вось і Фердынанд яго прыкмеціў,
Яму, яму памахвае рукой.
І ён, шчаслівейшы з усіх на свеце,
Да герцага ірвецца цераз строй.

Якая ўсмешка шчырая — як свята!
Так усміхацца можа толькі друг...
І ўражаныя ўсмешкаю салдаты
Пускаюць серба цераз свой ланцуг.

Нідзе ніякіх кветак не ўручалі,
А тут букет — і ўдвух не абхапіць...
«Падумаць трэба пра яго медалі,
А можа, нават ордэн пачапіць»,—

Так думаецца Фердынанду-Францу,
Які прымае швабаўскі парад.
А серб хвалюецца: «Шчырэй трэба ўсміхацца.
Ты ж рад...
ты ж рад...
ты дужа-дужа рад...

А ў цябе ў руках бярэма кветак,
Нясеш ты кветкі...
кветкі...
квет...»
І раптам стрэл уздрыгвае з букета —
Страляць умеюць, чуеце, і кветкі,
Калі у іх схаваны пісталет!

Запахла порахам, нібы вайною,
Сарваны у Сараеве парад.
І вяжуць серба швабы ўсёй гурмою:
— Забіў наследніка! Ды хітрасцю якою...
Вар'ят! Вы ж самі бачыце — вар'ят...

## Зброя

**Балгарская балада. XX стагоддзе**

Зялёным зацьменнем —
Турэцкі сцяг.
Шарсцяць па каменні,
Нібы па касцях.

Блішчаць ятаганы,
Дымяцца крукі.
Па ранах, па ранах
Ідуць чужакі.

Іх стрэлі без страху —
Ды нельга спыніць...
Паўмесяц на сцягу,
Як рана баліць.

І сонца не свеціць,
Сады — не відны.
Жанчыны і дзеці
Сумуюць адны.

Спыніце паганых
Хутчэй вы, сябры!
Ды — рана ля раны —
Маўчаць ваяры.

А башыбузукі
Ідуць і ідуць...
Жаночыя рукі
Перац труць.

Бо ў іхніх праклёнаў
Памочнік адзін:
Перац чырвоны —
Зброя жанчын.

Трыце ж, жанчыны,
Зброю хутчэй
Для гэткай лавіны,
Для столькіх вачэй!

У ручках маленькіх
Перац дрыжыць:
У жменях і жменьках
Зброя ляжыць...

Зялёным зацьменнем
Турэцкі сцяг:
Ідуць па цярпенню,
Нібы па касцях,—
Бліжэй...
бліжэй...
бліжэй...

## Пустэльнік

**Руская балада-легенда. XIX стагоддзе**

Хто я такі?
Пустэльнік, вязень тайгі сібірскае,
Які ахвяруе самохаць сябе гэтай белай цішы.
Вось мая келля самотная,
што ўночы акенцам бліскае,
А ля мяне навокал — апроч звяроў — ні душы.

Я толькі што снег расчысціў — бач,
як завея сцелецца! —
Дроў накалоў смалістых, у келлю бярэма ўнёс.
І доўга ў ёй пахла снегам,
марозам і пруткай мяцеліцай,
Пакуль аганёк, нарэшце,
паміж смалякоў не прарос.

Паліцца грубка весела...
Толькі падкідваю дровы я.
Снежань...
Як хораша думаць мне каля грубкі такой!
І ў мяне гасцюе мінулае — адолела далі кедровыя!
Божухна! Гэта ж сёння дзень нараджэння мой.

Там, у царскіх пакоях,
святочна рыпяць, мусіць, дзверы ўсе,
Там збіраюцца, пэўна, як свята,
мой дзень адзначаць,
А ў мяне тут ціха, спакойна...
І ўсё-ткі дзіўна, ці верыце,—
У сорак восем памёршы —
восьмы дзесятак страчаць.

Хто я такі?
Я старац, Фёдар Кузьміч... Пустэльнік,
Які сам сябе тут, на заімцы, у келлю-турму запёр...
А я ж — імператар, людзі.
Каб зналі — здзівіліся б вельмі,
Што я — Аляксандр Першы,
той, што раптоўна памёр.

Я нарадзіўся ў Зімнім.
І маё нараджэнне багатае
Адразу ж, з пялёнак,
зрабіла мяне як быццам святым.
Усе навакол несумленныя,
усе навакол вінаватыя,
І толькі адзін харошы,
сумленны і чысты — ты.

Што я ні скажу — як хараша!
Што я ні зраблю —
як правільна!
Згінаюцца, запабягаюць —
нібы перад імі Гасподзь.
Я знаю:
пад Аўстэрліцам бітва была правалена,
Таму што ніхто не асмеліўся
мне слова сказаць насупроць.

Людзі шукаюць святога,
я імі таксама быў створаны.
Я пахвалю — яны рады,
аблаю — ходзяць, як ноч.
І мае міністры, прыдворныя — чорныя,
чорныя вораны —
У рот мне глядзяць аддана,
не зводзяць з мяне сваіх воч.

Хто ж я такі,
каб пакідвацца вашымі лёсамі, бедамі,
Хто ж я такі,
урэшце,
каб вашым сумленнем быць?!
Што я забойца бацькі,
вы, падданыя, ведалі,
Але і нават на гэта усе спрабавалі забыць.

Вось тады і пачаў мне сніцца бацька мой — ціхі,
пакорлівы.
Прыйдзе,
здаецца, сядзе побач са мною ён.
І яго журботныя вочы
гэтак жа сумна-дакорліва,
Тужліва і доўга ўглядаюцца ў свой
(у мой ужо!) трон.

І мне захацелася скінуць
цяжар мае святасці царскае,
І мне ўцячы заманулася ад усяго, ад усіх...
І тады ў Таганрозе памёр гасудар
з паставай гусарскаю,
А ў томскай тайзе з'явіўся
на цара так падобны мніх.

У дзікай тайзе акенца — як вока ваўчынае,
белае...
Ціха... Снег зарыпеў пад валёнкамі...
Хтосьці ідзе да агню...
«У імя айца і сына...» —
малітва гучыць скачанелая.
Хтосьці прыйшоў на параду.
Пайду я яму адчыню.

Ах, людзі! Якія ж вы дзіўныя.
Вы самі святых ствараеце.
Прагнеце,
каб хоць нехта быў над вамі ўладаром.
Ідзяце да мяне па марозе.
І ў мяне развагі шукаеце —
У таго, хто не змог вас разважыць,
будучы нават царом.

## Валы

**Балгарская балада. XIX стагоддзе**

Хутчэй на бераг! Родная зямля,
Як па табе хайдукі сумавалі!
Не дачакаўшыся прычалу карабля,
Яны скакалі у траву здаля,
І падалі, і прагна цалавалі
Зямлю сваю.

Бывай, захоплены знячэўку параход,
Што высадзіў атрад ля Казладуя,—
Плыві далей... А змагары — ў паход:
Іх так чакае стомлены народ,
Якім турэцкі ятаган кіруе
Даўно ўжо так.

Дзве сотні іх... Хутчэй, туды хутчэй,
Дзе ў бойцы захлынаецца паўстанне,
Дзе так бракуе маладых плячэй,
Дзе гасне разам гэтулькі вачэй,—
Хадземце з намі, цеслі і сяляне!
Хадземце, людзі!

Вось плужыць на валах шматок зямлі
Надзіва супакоены араты...
— Там рэвалюцыя! Не чуў хіба? Пайшлі!
— Што! Рэвалюцыя? А мне няма калі —
Араць мне трэба: я ж не так багаты,
Каб траціць час...

— Тады хоць нам валоў сваіх прадай:
На іх мы пакладзём патроны, зброю...
— Што? Вам прадаць? — пытаецца ратай.—
Ды колькі вы дасцё?! Вы ж голыя бадай,
А туркі мне рукою — менш скупою —
Заплацяць больш...

— Тады валоў на час хоць зможаш даць?
Пад'едзем троху — забярэш, нябога...
— Вы ж пастраляеце,— ды вас і не відаць,
А туркі вернуцца і тых пачнуць страляць,
Хто вам валоў даваў на дапамогу...
Не, я не дам.

— О, бедная радзіма,— бачыць Бог! —
Як здзекуюцца туркі, чарбаджыі!
Для рэвалюцыі б я ўсё аддаў, што мог,
Паўстанню б я крывёю дапамог,
А ён шкадуе і валовай шыі...
Пайшлі хутчэй!

І Хрыста Боцеў, задушыўшы гнеў,
Павёў юна́каў пешых у Балканы —
Там падалі сябры, там бой грымеў...
Ён рэвалюцыі аддаў усё, што меў,—
Там з куляю ён стрэўся гэтак рана
На Вол-гары...

## Шыбеніца

**Беларуская балада. XIX стагоддзе**

— Каго любіш?
— Люблю Беларусь.
— Так узаемна!

(Пароль
паўстанцаў
1863 года)

Як вецер над плошчай прагуў кірмашовай,
Аж снег ад дыхання, здаецца, растаў.
Спакойна прыйшоў пад нядрэмнай аховай
І горда сам-насам з пятлёю ён стаў.

Канечне ж, сябры па паўстанню ў народзе
Стаяць і спакояць бунтоўную кроў.
І сам ён на плошчы таксама прыходзіў,
Калі там каралі вось гэтак сяброў.

Стаяў між людзей, нібы смяг ачышчэннем,
Хоць бегчы ад жуду хацелася прэч,
Нібыта ў вачэй ён прасіў прабачэння,
З якімі ніколі не будзе сустрэч.

Цяпер і ў самога ўжо доля такая —
Ён пойдзе к сябрам, пакарыўшыся ёй...
А віселья ў Вільні чакае, чакае,
Няверніkі-каты гуляюць з пятлёй.

Жывога хутчэй збыць у мёртвыя хочуць,
А можа, і ў іх страх знайшоўся на дне?
— Мне так замінаюць ягоныя вочы...
— Ты знаеш, яны замінаюць і мне...

Ах, каты! І вам ужо вусцішна стала.
Нялёгка і вам дастаюцца харчы.
Не толькі мы кормім вас хлебам і салам,
Мы ўмеем і праўдзе мужыцкай вучыць.

Вось так цэлы край узялі і забілі
І вырвалі мову з глытніцы жывой,
І памяць забралі, каб казкі і былі
Навек зараслі бадылём, крапівой.

Са школаў павыгналі роднае слова,
У світцы мужыцкай не ўлезці туды.
На шчырых, сумленных наладзілі ловы,
Як воўчыя ямы — царовы суды.

Нянавісць, што доўга пад стрэхамі спее,
Рабам за жыццё нават стане важней.
Той жне, хто пасее, той жне, хто пасее,
Хто праўду пасее, той волю пажне.

Мне блізкая цемра выстуджвае грудзі,
А катам, здаецца, акропна ўдвайне...
— Мне так замінаюць сагнаныя людзі.
— Яны замінаюць, ты знаеш, і мне.

Бывай, мой народзе! Жыві ж ты, багаты!
Спакойна памру я, крывіна твая —
Зямлю атрымае, гавораць, араты,
А шляхты паменела як не ўдвая!

Яшчэ не прасохлі паўстання скрыжалі
Ад дымнай крыві і няскораных слёз.
Мяне ж, як асочніка, каты змушалі,
Каб я на сяброў па змаганню данёс.

Вось так маю чэсць і мой гонар караюць,
Ды к самапавазе і тут я прыйду.
Я быў пракуратарам цэлага краю,
Ці ж мне апускацца ў такую брыду?!

З дзяцінства прыстойнасці знаю прычыны
І сам ненавідзець прывучаны зло.
Звычайная шчырасць — заўжды дабрачыннасць,
Шпіёнства — заўсёды агідным было.

Усё, што жывецьмець,— навечна мінае,
У вочы магільнае цемрыва тхне...
— Ты знаеш, а мне цішыня замінае.
— Яна замінае, ты чуеш, і мне.

Нялёгка і горка зямельку пакінуць,
Але ж, мой народзе, за праўду тваю
Дазволь твайму шчыра-трывожнаму сыну
Памерці на віселыні, нібы ў баю.

А ты не чакай дабрадзеяў, народзе,
Ніхто табе волі не дасць самахоць.
Пасейся ў свабодзе, радзіся ў свабодзе
І здзейсні сваю векапомную хоць!

І нашых з табой намаганняў не сцерці.
Сказаць я хачу пасля стольхіх нягод,
Што большага шчасця няма, як памерці
За вольную волю і вольны народ.

Марознае, ясна-халоднае ранне.
Абражаны віселыняй злюднелы пляц.
Вось-вось, касінеры, змаганца не стане.
Кастусь Каліноўскі...
Вяроўка...
Пятля...

А каты ізноў апусцілі галовы,
Як быццам нявідзежны нехта іх гне.
— Ты знаеш, мне чуюцца нейкія словы.
— Яны замінаюць, ты чуеш, і мне.

Над плошчаю — ціша.
На плошчы — маўчанне.
І ўсё ж, аж, здаецца, хістае зямлю,
Маўкліва грыміць,
Нібы кліч да паўстання:
— Люблю Беларусь!
— Узаемна люблю!

## Арыштант

**Украінская балада. XIX стагоддзе**

І зноў марозна доўгая дарога,
Наскрозь прамерзлі нават кайданы.
Ім да Табольска грукаць яшчэ многа,
І вёрсты будзяць, як званы, яны.

Мяне зноўку разлучылі
З роспачным Падоллем —
Мусіць, гэткая ў Кармеля
Гараватка-доля.

Шлях на катаргу пачаўся
Ад кузні вясковай,
Дзе мяне заланцужылі,
Закулі нанова.

Твар нанова стаўравалі,
Хоць таўро ўжо тое
Не было дзе нават ставіць
На чало крутое.

Не тужыце, дабралюдзі:
Я і тут вас бачу.
Як успомню гвалт над вамі,
Дык і сам заплачу.

Гэта ж трэба, каб у раны
Столькі ўцёрлі солі,
Каб для вас мачылі доўга
Розгі у расоле.

Каб прыгонныя красуні,
Быццам бы панятак,
Малаком, грудзьмі кармілі
Панскіх цуцанятак.

І ў дарозе чую — мною
Страшыце вампіраў:
«Пачакайце, Кармалюка
Вернецца з Сібіру.

Ён тады вам і пакажа,
Як загляне ў «госці».
Вы за ўсё,
за ўсё плаціцьмець
Кроўю, ягамосці!»

А вось і лета па Сібіру крочыць.
Нагрэліся, спацелі ланцугі.
Цяжкія стомадні і стоманочы
Матаюць кайданы ў клубок тугі.

І раней плаціў спаўна ім
Я за вашы болькі.
Як над дурнямі глуміўся,
Каб вы знали толькі!

Жабракам у торбы сыпаў
Панскія дукаты
І за беднага аднога
Лез на сто багатых.

Я круціў над галавою
І на пасавішча
Так кідаў, бывала, пана,—
Што аж вецер свішча.

Піў гарэлку ў корчмах з імі,
Піў і на вяселлі,—
Дазнаваліся назаўтра,
З кім яны сядзелі.

Пра мяне ў мяне пыталі,
Знаць, дзе я, хацелі.
І я сам ім — сам! — падказваў,
Як злавіць Кармеля.

Мне ж таксама давялося
Слёзамі давіцца,
Як з сынамі і Марыяй
Быў на вачавідцы.

Горнуцца сыны да бацькі
З радасцю дзіцячай.

Я ж піхаю ад сябе іх,
Хоць душою плачу.

А яны не разумеюць —
Зыраць вачаняты,
І спалоханыя вусны
Шэпчуць:
— Тату!
— Тату!

Я ж кажу:
— І іх не знаю,
І іхняга енку!
Вы ўзялі за Кармалюка
Ваську Гаўрыленку.

На мяне глядзяць малечы,
Потым зноў на маці...
Не, няма цяжэй нічога
За слязу дзіцяці.

Дарога чвякае, пад ногі лезе,
І сам у твані тонеш да вушэй,
Набракла восенню і холадам жалеззе
І ад гразі зрабілася цяжэй.

Што ж, чакайце мяне, людзі,
З катаргі чакайце,
На свайго Кармалючэньку
Зноў надзею майце.

Бізуны,
батогі, плёткі,
Канчукі, нагайкі...
На спіне не зажываюць
Іх шрамы і спайкі.

Колькі ў вежах насядзеўся,
Да слупоў прыкуты!
Ды ўсё роўна вырываўся
Я з жалезных путаў.

Пад канвоем быў я вольны,
Не баяўся гаўя,

І чым болей было варты,
Тым лягчэй збягаў я.

На сцяне ў турме як толькі
Лодку намалюю —
Мы з сябрамі ў яе сядзем
І з-за крат вяслуем.

Тройчы з катаргі ўцякаў я —
Дагані Кармаля!
Не, няма такіх кайданаў,
Каб мяне стрымалі!

Зноў дамоў вярнуся скора...
Дам я радасць глотцы —
Крыкну так, што цар пачуе:
— Ну, здаровы, хлопцы!

І ўжо свабода, блізкая такая,
Казыча твар, знабкі ад ледзяшоў.
І ў думках ён, шчаслівы, уцякае
Адтуль, куды пакуль што не прыйшоў.

## Ёлка

**Чэшская балада. XVIII стагоддзе**

Гаспадар — барон аўстрыйскі
Да сваіх імчыць суседзяў,
Да сяброў багатых едзе
Гаспадар — барон аўстрыйскі.

— Хоць зірнуць на нашу ёлку
Запрашаю на Каляды.
О, з вас кожны будзе рады
Хоць зірнуць на нашу ёлку.

— Не прасі — мы не паедзем:
Там паўстанне — стрэляць раптам,

А страляюць ходы трапна,—
Не прасі — мы не паедзем.

— У мяне ёсць толькі ёлка,
У мяне няма паўстання,
Ходскіх стрэлаў — анізвання:
У мяне ёсць толькі ёлка.

Як убрана гэта ёлка!
А якія на ёй цацкі!
Я і сам люблю, прызнацца,
Як убрана гэта ёлка...

Запрасіўшы ўсіх суседзяў,
Ён вяртаецца дахаты,
Накрывае стол багаты,
Запрасіўшы ўсіх суседзяў.

Вунь, зірніце, едуць госці —
Снег капыцяць гулка коні,
Нецярпліва бомы звоняць —
Вунь, зірніце, едуць госці.

Бачаць госці — перад замкам
Ёлка калядная ззяе,
Ёлка іх, гасцей, страчае,
Бачаць госці перад замкам.

Гляньце, што гэта за дзіва?
Заміж цацак карагоду
Там вісяць паўстанцы-ходы.
Гляньце, што гэта за дзіва...

Ай, барон! Ай, малайчына!
Ведаў, чым сяброў усцешыць:
Гэтых ходаў толькі й вешаць —
Ай, барон! Ай, малайчына!

І пры радасці ляклівай
За сталы садзяцца госці.
Толькі муляе ўсё ж штосьці
І пры радасці ляклівай.

Весяляцца і не бачаць,
Што на ёлцы цесна стала,

Што жывых на ёй нямала,—
Весяляцца і не бачаць.

Дзе сп'янелым ім убачыць,
Што за імі сочаць рулі
І штуршка чакаюць кулі,
Дзе сп'янелым ім убачыць!

А на ёлцы помста вісне —
Ходы з мёртвымі ў абдымку.
Зараз стрэляць... Шчэ хвілінку...
Вунь, на ёлцы помста вісне...

Загрымелі стрэлы раптам,
Нібы хлопаўкі між голля,—
Парадзела ўраз застолле...
Так, страляюць ходы трапна!

## Крылы

**Руская балада. XVIII стагоддзе**

Крылаў няма ў чалавека,
Каб падмінаць імі неба,
А яно гэтак звабліва вісне
Над табою — куды ні глянь.
Топча раллю ён лапцямі —
Аж пыліць перасохлая глеба...
Бывай жа, такая ласкавая
І такая злая Разань.

Прабач, не паспеў ён у спеху
З табою як след развітацца:
Бег колькі сіл па гародах,
Бег уцалік, па карчах.
Той шарадром ужо ззаду,
Скуль хацеў ён у неба узняцца,
Дзе агонь, што шар дымам напоўніў,
Мусіць, яшчэ не ачах.

За небакрай ужо дрэвы
Заходзяць, як жоўтыя сонцы,
Высозныя дрэвы-званіцы,
Да якіх ён нарэшце дарос...
А як ён ляцеў, усеўшыся
У пятлю забрытанага шара,
Над макавінамі самымі
Дужа высокіх бяроз!

Зайшлі ўжо бярозы... І толькі
Ледзь-ледзь залаціцца званіца,
Аб якую вецер вярховы
Разбіў яго ўскрылены шар...
Калі за званы, за вяроўкі
Чапляўся ён, каб не зваліцца,
О, як званы зазванілі —
Нібыта на мор ці пажар.

Выбеглі людзі з хатак,
У неба рукамі загрукалі:
— Ды ён, ірад, д'яблу служыць,
Ды ён — сын нячыстых сіл.
Як на яго цюгакалі,
Бы на ваўка, агатукалі
За тое, што лётаць уздумаў,
Не маючы з роду крыл...

Кідалі каменнем, білі
Яго і ягоную мару,
А потым з горада гналі —
Ідзі, куды хочаш, цмок...
Крылаў няма ў чалавека,
Каб падмінаць імі хмары,
Добра, што ёсць хоць ногі —
Як бы без іх ён уцёк?!

Крылаў няма ў чалавека,
Каб падмінаць імі неба,
А яно гэтак звабліва вісне
Над табою, куды ні глянь.
Топча ён сцежку лапцямі —
Аж пыліць перасохлая глеба...
Бывай жа, такая ласкавая
І такая злая Разань...

## Лазня

**Балгарская балада. XVIII стагоддзе**

Мы — аркестр рабоў.
Мы цягнем мелодыю гэту,
Даўгую — быццам дарога дадому,
Цяжкую — нібы бурлакам карабель на мелі,
Сумную — што нашы вочы.
А хіба вочы вясёлымі будуць,
Калі людзі эміра (якія там людзі!)
Адабралі ў іх колеры,
А ім толькі чорны пакінулі —
Колер зацьмення:
Чорныя кветкі,
Чорнае неба
І чорнае сонца
На чорнай чужыне...
Іх палохалі нашы вочы —
І яны іх выпеклі, вылюдкі.
(Маўляў, вочы, што бачаць колеры,
Замінаць толькі будуць аркестру.)

Мы — аркестр рабоў,
У мармуравай лазні эміра іграем.
Ён толькі што выкупаўся ў басейне
І цяпер абсыхае, выстарак.
А ў басейне яго
Паланянкі-балгаркі купаюцца,
Перад ім,
Перад намі купаюцца...
Мы іх ведаем добра,
Хоць ніводную ў твар не бачылі,
Толькі ж кожную мы пазнаём
Па дыханню,
Па кроках,
І па тым, як рука ваду паслухмяную чэрпае
І, ўзняўшы, на плечы крутыя ліе,
І па тым, як вада па целе
Сцякае —
Пазнаём.

Мы — аркестр рабоў.
Нас трынаццаць.

Іх таксама, здаецца, трынаццаць.
О, як мы іх да болю кахаем!
Вылка — тую, што вельмі ласкава ступае,
Асен — тую, што, нібы крылом,
рукою ледзь чутна махае,
Я — тую, што дужа часта ўздыхае.
І як мы пакутуем,
Калі эмір выклікае на ложа каго з іх,
Каб сваю старэчую прагнасць спатоліць!
Сціхніце...
Зноў кагосьці пальцам паклікаў...
Анямейце, птушкі ў залочаных клетках!
Дзівакі,
Навошта вы гэтак стараецеся?
Як і нам, вам жа выпеклі вочы,
Каб вы лепей спявалі,
Каб толькі спявалі,
Сціхніце,
Дайце паслухаць,
Хто ж ідзе на эмірава ложа клятае,—
Ці тая, што дужа ласкава ступае,
Ці тая, што, быццам крылом, рукою махае,
Ці тая, што цяжка ўздыхае?..

Мы — аркестр рабоў.
О Божа!
Яна, зноў яна, ідучы, уздыхае...
Вось яе абціраюць вялыя еўнухі,
Успамінаючы нешта далёкае,
Дакрануўшыся да грудзей знячэўку...
Вось кладуць яе ля эміра —
Перасохлага, нібы мошчы, турка...
Божа!
Аглушы мяне, Божа,—
Як я знябыўся слухаць
Такія любоўныя пакуты
Маладога і старага цела...
Застагнала струна мая...
І адразу шчаку запякло ад далоні хормайстра.
О, яны ўмеюць да нас, сляпых, падкрадацца
Ціха, нячутна — як кошкі;
Біць,
Каб зноў выпрамляць мелодыю:
Мы ж — аркестр рабоў...

Хто тут?..
Хто ля мяне?..
— Ангел! Абдымі мяне, Ангел...
— Гэта ты?!
І адкуль ты ведаеш,
Што з цябе я вачэй не спускаю?
— Абдымі... Пацалуй...
Я...
Яго...
Задушыла...

## Кукіш

**Руская балада. XVIII стагоддзе**

І ён са мною у палоне,
Віноўнік арышту майго,
Нявінна сцяўся на далоні,
Аж шкода, беднага, яго:
Як кацяня, заплюшчыў вочы —
Здаецца, зараз завуркоча.
Маленькі і несамавіты...
І напалохаў ён чаму
Хлусоў вучоных цэлу світу,
Што нас заперлі у турму?

Не, тут не кукіш вінаваты,
А я — чарнасашонца сын:
Бо ў іх вучоныя палаты
Зайшоў, зірніце, селянін.
Навуцы — гора, гора, гора:
Сярод вучоных — сын памора.
Таму не могуць прымірыцца,
Даносы пішуць кожны дзень,
Сварыцца любяць і бажыцца,
Што не вучыўся я нідзе.

А я ж вучыўся у народа —
Мне гэты вопыт дарагі...
Настаўнік першы мой — прырода,
І праца шчырая — другі,

А трэці мой настаўнік будзе
Заўсёды — людзі, людзі, людзі...
Таму я веру, што Неўтонаў
Патрэбна дома нам шукаць,
Што можа і сваіх Платонаў
Расійская зямля раджаць.

Але пыхлівасць чужаземцаў
Спяшае Русію скарыць.
І з мовы рускае смяецца,
Бо ёй не ўмее гаварыць.
І ў акадэміях лапоча
Па-свойму кожны — як хто хоча.
Яны сцвярджаюць, што ў Расіі
Карысных выкапняў няма,
Сцвярджаюць, быццам бы ў Расіі
Адзін ёсць выкапень — чума.

О што вы, што вы, прайдзісветы!
Не можа беднай быць зямля,
Дзе так буяе ў красках лета,
Дзе пахне цёпла так ралля,
Дзе вышай воблакаў — вяршыні,
Дзе ў рэчках нашых столькі сіні,
Дзе сонца стоміцца, няйначай,
Пакуль завершыць свой абход,
Дзе людзі адначасна бачаць
І захад сонца, і усход.

Багацце нашы горы лучыць —
Нам трэба выхад даць яму.
А нас ці збэсцяць, ці адлучаць,
Ці так во ўкінуць у турму,
Каб мы далелі ад навукі,
А ўсё ішло праз іхні рукі,
Якія зноў пасля даносаў
Навуцы чэшуць аглаблю.
А я, Міхайла Ламаносаў,
Ілюмінацый план раблю...

Мне шкода сіл, якіх не вернеш,
Бо ўсё ж уведаць трэба мне,
Калі зямлі даверыць зерне,
Калі спачын даць баразне.

З начальствам часта я сваруся
Ды так, бывае, і сарвуся
Як гэты раз, калі пры сведках
Я лаяў невукаў-шышоў,
Калі пад нос, пыхлівы гэткі,
Мой кукіш дужа ж падышоў.

Цяпер са мною у палоне
Віноўнік арышту майго,
Нявінна сцяўся на далоні,
Аж шкода, беднага, яго:
Як кацяня, заплюшчыў вочы —
Здаецца, зараз завуркоча...
Такі вялікі, самавіты.
І напалохаў ён таму
Хлусоў вучоных цэлу світу...
Дык слава кукішу майму!

## Кузня

**Руская балада. XVIII стагоддзе**

Ля крывабокай кузні — коні,
Цароў адпрэжаны вазок.
А ў кузні гром, жалеза звоніць,
Цяжкі гагоча малаток.

Каваль паказвае малойцу,
Дзе трэба па кавадлу біць,
І лае на чым свет стаіць
Няўмелага малатабойца.

— Куды ты б'еш, куды ты плешчаш?
Хіба не бачыш, слепанда?
Даў Бог табе такія плечы,
А галавы, відаць, не даў.

Ах ты убоіна, ах неслух,
Бач, заманулася каваць!..
Ах, растакую тваю таць
Чаго цябе сюды прынесла!

Лепш грэў бы свой высокі трон
(Цішэй! Кавадла зараз хрусне...),
Дык не, у Тулу едзе ён —
Цара мая цікавіць кузня.

Куды, куды, куды ты б'еш?!
Які ж ты, дурань, крывалапы!
З табой нічога не скуеш,
З табой жалеза папсуеш,—
Ідзі ты лепей дзевак лапаць.

Што за цары ў нас, Бог святы!
На вочы слеп і глух на вушы...
Балбеса гэткага, як ты,
Каваль ніякі не навучыць.

А той рагоча, як лясун,
Вясёла молат-волат ходзіць...
— На сёння, можа, Пётра, годзе,
Бо вунь вячэру нам нясуць...

Сядзяць. Вячэраюць. Адкрыта
Глядзяць адзін другому ў твар
Каваль Дзямідка, сын Мікітаў,
І Пётра Першы — гасудар.

— Прабач, калі табе дадзеў,
І на мае не гневай словы,—
Кавацьты будзеш адмыслова,
Не збрэша молат твой нідзе.

Цябе аблаяў я пад зло,—
Прабач. Скажу табе я прама,
Што любіць наша рамясло
І крык, і лаянку таксама.

Без мацюка я — што без рук,
А з ім, бы воск, жалеза стане:
Хоць прыкладай яго ты к ране
Ці выкуй волас, нібы гук.

І ты, Пятруша, куй і куй,
Бо сам жа знаеш,— не загана,
Калі і цараву руку
Мазоль пазнае нечакана.

Я навучу цябе, павер мне,
Кавацъ ты будзеш — часу дай.
Тады з табой мы горы звернем...
Давай, Ляксеіч, прыязджай...

Кафтан цара, халопа світа...
Развітваюцца ля двара
Каваль Дзямідка, сын Мікітаў,
І Пётра Першы, што ў царах.

Той Пётра, жорсткасць што ўзгадуе
І страх нагоніць на людзей;
Той Пётра, які флот збудуе
І ўздыбіць Русь — аблог надзей.

Ды гэта будзе потым, потым —
Калі яго цяжкія боты
Зашаргацяць па коткіх днях...
Пакуль жа цар, прапахлы потам,
Куе з Дзямідкам, як раўня.

## Званні

**Харвацкая балада. XVIII стагоддзе**

Мы ўдзячны, капітан Мікашыновіч,
Што вы не гэткі, як усе харваты,
Што разумееце нас, немцаў, лепш за іншых
І, калі свой народ не тое робіць,
Вы смеласць маеце яго не падтрымаць.
А то, вы бачыце, паўсталі гранічары —
Не даспадобы ім усім прыйшлося,
Што імператрыца Тэрэзія Марыя
У Банскую Харвацію прыслала
Для плугароў дзве тысячы мундзіраў
Нямецкіх, новых. Вы ж вось зразумелі,
Што нельга без мундзіраў абысціся,
Калі ствараеш новыя палкі —
Для вашай жа, вядома, абароны.
Чаму ж яны ўсе скардзіцца ўзяліся,
Што няма чым плаціць ім за мундзіры?!

А калі ў тых, хто не агораў грошай,
Пачалі браць і прадаваць жывёлу,
Каб было ўсё ж за што купіць мундзіры,
То і загаласілі — іх, бач, зневажаюць!
Ім абясконьванне здалося страшным здзекам,
Маўляў, хто ведае, той разумее добра,
Што не бывае селяніна без каня.
Абраза, ганьба!
Бач, для афіцэраў
Найлепшыя ў іх адбіраюць землі,
Дзе яны самі ўласнымі рукамі
Павінны ставіць новыя дамы
Для тых, каго спрадвеку ненавідзяць.
Няўдзячныя, няўдзячныя сяляне!
Замест таго каб багавець прад намі
І дзякаваць за ласку і за клопат,
Яны клянуць злашчасныя мундзіры
І супраць іх паўстанне паднялі.
Правадыры свае, зірні, знайшліся,
Да зброі клікнулі.
І гэты
Былы кнез Тодар Кіук, самазванец
(Дарэчы, ён жа, знаю, ваш пляменнік),
Прызнаўся сам правадыром народа,
Такую ўладу ўпэўнена прысаміў,
Нібы наноў укняжыўся, нягоднік,
Абтупаў усе вёскі Банавіны,
Рыхтуючы да бунту гранічар.
Ну і пляменнічка ж вы мелі!
І як добра,
Што вы злавіць яго дапамаглі нам,
Зазваўшы да сябе дадому,—
Нібыта для сакрэтных перамоў.
Таксама імператар мне знайшоўся!
Няхай, няхай, зламыснік, зразумее,
Што за мянушку «правадыр» заўсёды
Плаціць даводзіцца высокаю цаною —
Хутчэй за ўсё жыццём.
Пляменніка,
Як і папа яго Піліпа Трбуховіча,
Як іншых пералоўленых паўстанцаў
Чакае шыбеніца.
Дарэчы,
Я шчыра дзякую, як немец, вам за помач.

Не ён, а вы харват, харват сапраўдны,
І я віншую вас з чарговым званнем,
Маёр Мікашыновіч!
А палкоўнік
Мікашыновіч, кажуць, яшчэ болей,
Яшчэ люцей сваё ўсё ненавідзеў,
Як ваўкалак, накідваўся на край свой
І, вырачнік, адрынуты народам,
Зацята ваяваў супроць яго.

## Чубы

**Беларуская балада. XVII стагоддзе**

Заманулася і нам, беларусам,
Паказакаваць, пагуляць без прымусу.
Сотнікі і есаулы з ахвотай
Запісалі ў рэестры галоту.
Пагадавалі мы ўсе чубы —
І ўжо кожны казак нібы.
Былі сяляне ніўныя, былі сяляне рольныя,
А цяпер мы — казакі вольныя.
Чым хочам, тым і займаемся:
Хочам, у карчме забаўляемся,
Калі хочам, жнём, калі хочам, косім —
Словам, работы не просім.
А было ж, што не ўгадуем —
з'есць панская з'едзь,
А ты хоць па смерць на голадзе едзь.
Ды вось зноў хочуць зрабіць з нас цягло.
Але не тут-то было,
Бо вольны казак з нас любы —
У нас жа чубы!
А нас б'юць, як і ўсіх, бізунамі,
Здзекуюцца ваяводы над намі!
І з нас, нібы з мужыкоў барадатых,
Патрабуюць падатак.
Тады кожны казак (навошта таіць!)
Крычыць на чым свет стаіць:

— Ты ўважлівей зірні на мяне, душагуб,—
У мяне ж чуб!
А калі прымушаюць ісці на працу —
Казакі ведаюць, як адмаўляцца:
— Не хочам вашае ласкі,
У нас свой парадак — наскі.
Мала, што я вам не люб —
У мяне ж чуб!
Зрываецца з губ:
— У мяне чуб!
Хваліцца любы:
— А ў нас чубы!
І тады ваяводы ўсім чыста
Пазразалі чубы ўрачыста.
Думалі, што мы без чубоў
Будзем араць паслухмяна зноў;
Думалі, што мы, лысыя, як раней, будзем сеяць —
Казакі ж без чубоў, маўляў, казакаваць не ўмеюць.
Але мы дакладна і пэўна,
Самі бясчубыя, падпускалі чырвоных чубатых
пеўняў
Пад стрэхі панскія вечныя...

Бачыце, і без чубоў казакі небяспечныя!

## Пагоня

**Славацкая балада. XVII стагоддзе**

Аж задыхаліся двое —
Так улукаткі бягуць,
Не віжуючы дарогі,
Не шукаючы сцягу.

Людзі дзівяцца — не знаюць,
Каму трэба памагчы:
Ці таму, хто уцякае,
Ці таму, хто ўслед імчыць.

І рашаецца каторы:
Што тут доўга мудраваць,

Чалавек жа уцякае —
Памажы яму ўцякаць!

Даганялу дай падножку.
Але той, што ўслед бяжыць,
Плача:
— Ён жа ў маіх дзетак
Хлеб з рук вырве.
Памажы!

Значыць, іншаму падножку —
Хай зазнае сам багна!
Чалавек жа даганяе,
Памажы яму дагнаць.

Але й той пачаў прасіцца:
— Уцяку — і я жыву.
Калі ж ён мяне дагоніць —
Адсячэ мне галаву.

Паспрабуй тут разабрацца,
Што жыццё уткне яшчэ...
Памажы таму — дагоніць,
А другому — уцячэ.

І давалі людзі сцежку,
Саступалі ўсе на край.
— Уцякай жа хутка, хутка!
— Ты ж, як можаш, даганяй!

І не ведалі пакуль што,
Ачмурэлыя ад звад:
Хто ўцякае — той ахвяра,
Хто ўслед гоніцца — той кат.

А па даўняй завядзёнцы
Хто з-пад вісельні збяжыць,
Хто ад ката адаб'ецца,
Будзе век свабодны жыць.

Бег і клопат іх супольны,
Дай Бог вязню сілы шмат:
Уцячэ ён — стане вольны,
Але страціць працу кат.

Не ўцячэ — і ў ката зноўку
Праца з'явіцца ў руках,
Будзе зноў ён сеч галовы,
Задушыўшы свой жа страх.

І бягуць, бядой з'ядналы,
Ва ўвесь дух, у дых увесь
Той, хто хоча жыць астацца
І хто хоча проста есць.

Напрамкі яны спяшаюць,
Нават плот для іх не плот...
Дай жа вязню ногі, Божа!
Спатыкніся, жываглот!

Бег слабее. Лес бліжэе —
Насалода для вачэй.
Вязень: скора, скора, скора...
Кат: хутчэй, хутчэй, хутчэй...

Першы ў лес, як зай, ускочыў —
Паспрабуй яго знайдзі!
Кат жа ў полі спатыкнуўся...
Божа мой — ужо адзін!

І упаў ён, і заплакаў,
На ўвесь свет, як воўк, завыў,
Бо чакалі хлеба дзеці,
Што апухлі ад травы!

Але ўсё ж такі і ў ката
Радасць тлелася: «Жыві!» —
Хоць і будзе ён без хлеба,
Але ж будзе й без крыві.

Мой шаноўны свет, віншую
Ад сягоння і навек:
Нарадзіўся у другі раз
Сын твой, свеце,— Чалавек!

А папраўдзе, дык абодва
Нарадзіліся ў бядзе:
Той, хто мусіў быў памерці,
Ды і той, хто жыць хацеў.

## Ростань

**Руская балада. XVII стагоддзе**

— Пазнасіў снапы, мой ты добры муж,
З нашай постаці — што на жабін скок,
Змалацілі іх мы у два цапы,
Потым цэлы дзень жорны шоргалі —
Гэта ў дзве рукі млён круцілі мы
І так хораша мілаваліся:
Вусны пахлі ў нас жніўнем сонечным,
І саломаю, і зярнятамі,
І мучыцаю пытляванаю...
А цяпер бывай, мой ласкавы муж:
За спіною ў нас — холад ростані...
— Што гаворыш ты? Што ты ўздумала?
Чым, скажы хутчэй, я ўгнявіў цябе?
Мoжа, быў з табой я няласкавы,
Можа, вочы меў дужа колкія,
Можа, ласка рук была грубая,
Можа, вусны мае — схаладалыя,
Што марозяць цвет, нібы летнікі?
— Не кажы ты так, мой жаданы муж:
Твае вочы мне — сонца ўскотнае,
У руках тваіх няма грубасці,
Вусны спелыя — гэта ягады,
Што на сонейку выграваюцца...
— Ну, а можа, ты закахалася
У каго-небудзь — скажы шчыра мне.
Я няволіць сам і не ўздумаю,
Бо я ведаю, што на двух дзяліць
Сваю ласку ты век не ўздолееш.
— Як ты думаць так мог, мой сокале?!
Ты, харошы мой,— на ўвесь свет адзін.
— Дык а што ж тады разлучае нас?
— Ты прадай мяне, мой ласкавы муж,
Закладзі мяне багачу ў заклад,
А купі сабе каня спраўнага,
Паспяшай у рацьКузьмы Мініна —
Згані ворагаў з нашай Русь-зямлі,
Што ў палоне ўся нецярплівіцца...
А як вернешся з перамогаю,
Прадасі каня — мяне выкупіш.
Не паспееш ты даць «дабрыдзень» мне,

Як цябе, мой свет, зацалую я.
Зажывём з табой мы, шчаслівыя,
Будзе жыта ў нас — гоман гоманам,
Будзе хата ў нас — з сосен жоўценькіх,
А у хаце ў нас — дзетак загучна,
А у клеці ў нас — жыту зацесна,
А у місе ў нас — скварак загуста,—
Вось тады ўжо ды дамілуемся,
Будуць вусны ў нас пахнуць, як цяпер:
І саломаю, і зярнятамі,
І мучыцаю пытляванаю...
Дык бывай, мой муж, сокал ласкавы!
Я сама б пайшла за табою ў рацы,
Толькі два кані як жа купім мы?

Лепш прадай мяне...

## Будоўля

**Беларуская балада. XVII стагоддзе**

Што ж, цесляры, невясёлыя —
Сякера аж падае з рук?
Што апусцілі вы галавы,
Сумна глядзіце на зруб?

Бёрны усцягвайце новыя
І заразайце вуглы...
Хораша пахне будоваю,
Стружкамі ў кроплях смалы!

Дзе ж ваша радасць з уцехаю?
Вунь як святлее вакол!
Над магілёўскімі стрэхамі
Ў неба ірвецца касцёл.

Сцены вышэюць касцёльныя,
Кладзецца вянец на вянец
Бёрнамі жоўтымі смольнымі
З вашых жа хат і з сянец.

Касцёл узнімаецца нанава —
Хаты ніжэй і ніжэй:

Кузьмова, Пятрова, Раманава
Раскрыты да самых дзвярэй.

Бёрны, што млелі пад кроквамі,—
Аж у падмурак ляглі,
А што рыпелі пад крокамі —
На завянчэнне пайшлі.

Што ж, цесляры, невясёлыя?
Паўстання не здзейсніўся план...
Што апусцілі вы голавы,
Пётра, Кузьма і Раман?

Кроквы вяжыце і лацiны,
Ладзьце вянок пад страхой.
Ды спаласніце улазіны
Конаўкай брагі якой...

Нельга. За кожнай саломінай
Сочыць ахоўнікаў шмат:
Рубяць паўстанцы хароміну
З родных разбураных хат.

І ўсё ж, напачатку нясмела так,
Ціхенька — Божа бароны! —
У стружках, як мятлушка белая,
Закапашыўся агонь.

Вось яна, радасць з уцехаю,—
Гляньце, як светла вакол:
Над магілёўскімі стрэхамі
Ў неба шугае касцёл,
Новы палае касцёл...

## Саранча

**Украінская балада. XVII стагоддзе**

Засланіла неба хмара,
Стала цёмна, што ўначы.
Змоўклі нівы, бы ахвяры,
Пад крыламі саранчы.

Каб прабіцца праз мярзоту,
Нават сонцу мала сіл.
Толькі чуеш шум палёту,
Толькі чуцен шорах крыл.

І садзілася імкліва
Цьма — крыло каля крыла.
Стала шэраю ўміг ніва,
Што зялёнаю была.

Ваяваць дарма з той сілай —
Што палохаць і крычаць!
Усё вакол запаланіла
Саранча.

З саранчы адной — паветра,
Саранчой усланы дол,
Саранчаць вада і ветры,
З саранчы ўсё навакол.

Лезе ўсюды, як зараза,
Ва ўсе дзіркі лезе зброд.
Слова мовіш — і адразу
Саранчою поўны рот.

І садзілася на вусны,
Бы пладзілася ў вачах,
Набівалася ў нос гнюсам
Саранча.

Свечкі ўдзень палілі ў Сечы,
Без іх кожны — як сляпы.
Курані забіла нечысць
І канюшні, і скляпы.

І дарогі ўкрыла. Коні
Не адважацца ступіць,
А як іх усё ж падгоняць,
Бруду — ажно да ступіц.

Толькі шум — ратоў мільёны
Усё зялёнае жаруць:
Лес зялёны, луг зялёны,
Лан зялёны не ў пару.

Аж рушніцы затрашчалі —
Зброю так змаглі абсесць,
Бы марціры і пішчалі
Заманулася паесць.

Што рабіць, як з'едзь такую
Перамогчы, Бог святы?
Толькі сківіцы працуюць,
Толькі шамкаюць раты.

А ўзняліся, паляцелі —
Аж дыханне заняло:
Стала чорным, бо паелі
Усё, што зелена было.

І пасля такога роя
На аголенай зямлі
Засталася толькі зброя —
Зброю з'есці не змаглі.

У людзей было багата
Зброі — нават не злічыць.
Ды мушкетам і арматай
Не адпомсціш саранчы!

## Конь

**Руская балада. XVII стагоддзе**

Ратай ідзе паціху за сахою,
Што так спавольна сунецца ў зямлі,
І часта ўсё спыняецца — цягло
Стамілася: ў пярэдыхах маленькіх
Чуваць, як цяжка хакаюць траіх.
Але іх не падгоніш, «Но!» не крыкнеш,
Не свіснеш ёмка пугаю-звіванкай,
Якую ўзяў з сабой ратай па звычцы
І круціць сарамяжліва ў руках...
Тут пуга не патрэбна — сошку цягнуць
Сівая маці з прыгажуняй-жонкай,
А каля іх, нібыта жарабятка,
Шчыруе прыпражны сынуля-жэўжык —
Ён напінаецца, здаецца, больш за ўсіх.

Ратай ласкава так глядзіць на сына
І просіць:
— Ты цішэй цягні, Івашка,
А то не паспяваю за табой я,—
Саха ляціць, нібы за жарабком...
І раптам да ратая незаўважна
Пад'ехала людзей на конях процьма,
А іх галоўны (мусіць, пан вялікі:
Зялёныя саф'янавыя боты,
Кафтан на ім,— ды гэткі ўжо шыкоўны,
На галаве — з чырвоным верхам шапка...)
Знячэўку крыкнуў:
— Што ты робіш, кат!
Як ты пасмеў араць зямлю на людзях?!
Ратай збялеў і пану — бух! — у ногі:
— А што ж рабіць мне, беднаму, паночак:
Каня няма — забралі за падаткі.
— Эх ты, мужчына! — пан злуе і злазіць
З каня свайго і аксамітны повад
У чорныя парэпаныя рукі,
Якія ўсё яшчэ дрыжаць ад страху,
Ён аддае:
— Бяры майго — ары,
А я твайго у пана забяру...
І сам пайшоў.
І коннікі за ім
Паехалі паволі.
А ратай
Стаяў з канём і ўсё, як ашалелы,
Сябе шчыпаў, каб неяк апрачнуцца,
Калі ўсё гэта сон. А потым
Шчыпаць каня пачаў.
О, радасць! —
Конь селяніна раптам убрыкнуў!
Ратай стаіць з рассечанай губою,
Размазвае па твары кроў, смяецца
І радасна крычыць:
— Івашка!
Дык конь жа, брат, сапраўдашні, не прывід —
Зірні, як моцна б'ецца капытом!
А сын глядзіць на пыльную дарогу,
Дзе ўперадзе вялізазнага войска
Пайшоў багаты пан той пехатою
(На галаве — з чырвоным верхам шапка,

Кафтан на ім — ды гэтакі шыкоўны,
Зялёныя запыленыя боты...)
Па іхняга каня да багацеяў
Пайшоў незразумелы гэты пан —
Сцяпан Разін.

## Вадзянік

**Лужыцкая балада. XVI стагоддзе**

На дыбкі ўстае рака
Ля жытла вадзяніка:
Во віруе, во бушуе —
Сам сябе, відаць, не чуе.
Жонку гоніць з хаты ён —
Жонка вінаватая.
З ёй, русалкай, лаецца,
К дзецям прыглядаецца.
І абнюхае усіх,
І абмацае усіх:
Пяць, як ёсць, вадзянікі,
Ну а гэты — не з ракі:
Пахне хлопчык горкаю,
Дымнаю махоркаю...
— Хто ж русалку цалаваў,
Хто на Мінку дым пускаў? —
Вадзянік наш прагне буры,
Вадзянік жа сам не курыць:
У вадзе набухне
Папяроска — стухне...
Спамінае грозна:
Жонка дужа позна
У раку вярталася,
Весела смяялася:
Мо тады, дарэчы,
Мінка йшла са стрэчы?
Зноў абнюхае сыноў
І усіх агледзіць зноў...
Пяць, як ёсць, вадзянікі,
Ну а шосты — не такі:
Пахне хатай новаю,
Стружкаю смаловаю...

А хай яно спрахне —
Чалавекам пахне!
Папрыціхлі ў рэчцы ўсе —
Вадзянік раку трасе,
Барадой зялёнаю,
Нібы злосць ягоная.
— Разбуру я ўсё датла!..
Дзе ж, русалка, ты была
І куды хадзіла?
Мінка, з кім блудзіла?..
Мінка ціхенька глядзіць,
Мінка плача цененька
І спалохана сядзіць,
Нібы мыш пад венікам!
Вінавата — праз карчы
Мінка бегала ўначы,
Калі слаўся морак,
Вунь на той пагорак.
Кіта дом там будаваў,
Кіта Мінку цалаваў.
Хлопец ведаў яе змалку —
І дзяўчынай, не русалкай.
Кіта — нават піва гнаў,
На вяселле ўсіх склікаў,
Ды... раптоўная замінка —
Вадзянік сасватаў Мінку...
А цяпер вось вадзянік
Аж шалее... Чуеш, крык:
— Пакараю я цябе,
Праганю я ад сябе —
Да сваіх жа — марш! — людзей,
Пажыві там у бядзе:
Я цябе караю —
Людзям зноў вяртаю.
Хай цябе абсушыць неба...
Ну а Мінцы гэта й трэба!
Мінка к Кіту з рэчкі йдзе,
За руку сынка вядзе,
Сын глядзіць адкрыта —
Выліты ўвесь Кіта...
Ад варот рыпучых —
Кіта ім насустрач.
Пахне ён махоркаю —
Дымнаю і горкаю...

## Каханне

**Кашубская балада. XVI стагоддзе**

«А мора — дыбкі, а вецер — валіць,
І я не бачу, куды плысці...
Гэй, хваля, хваля, мая ты хваля,
Мяне дадому ты адпусці».

«Ты што, мой любы, ты што, рыбача,—
Цяпер вяселле нас не міне.
Ты ж столькі ў моры, хіба не бачыш,
Што спадабаўся даўно ты мне».

«Вяселле, кажаш? Ці ж гэтак можна —
Я ж да жывога ўсяго жадзён.
Я любаваўся табой, прыгожай,
Пакуль мой бераг мне быў відзён».

«І ўсё ж са мною хадзем, рыбача,
Ты — прытуліся, я — абдыму».
«А дзеці? Сын мой, ці чуеш, плача,
Хто слёзы вытра з вачэй яму?»

«А сыну цацку анёл змайструе,
Ён і заціхне ў кутку пустым».
«А жонка?»
«Жонка? Ну, пагаруе,
Паплача крыху, ды і на тым.

А потым выйдзе другі раз замуж
І будзе з новым спяваць і жыць.
З ім будзе ў рыбу хадзіць таксама,
Цябе забудзе — не ўсё ж тужыць».

А вецер енчыць, а мора вые,
Кульгае лодка на два вяслы.
Ах, сілы цемры, ах, сілы злыя,
Ваш чуцен холад глыбінны, злы.

«Мяне не пусціш, тады на бераг
Вярні хоць лодку сям'і маёй».
«Мне й лодка трэба. Я лодцы веру —
З табой паплаваць хачу на ёй».

«Тады хоць песню вярні на волю,
Дамоўкі, к людзям яе пусці».
«І песню возьмем з сабой. Спатолю
Урэшце мару ў сваім жыцці.

Як я зайздросціла, вар'яцела,
Калі вы ў лодцы плылі дваіх.
Як ты спяваў ёй — о як хацела
Я прыгарнуцца да слоў тваіх!

Дык паспявай жа і мне, каханы,
Я, як умею, так падцягну.
Я ў пырскі, нібы ў вянок, прыбрана,
Не пакідай жа мяне адну».

Накрыла хваля сабою лодку —
Ад нецярпення сама дрыжыць.
Далее неба, і дно шарготка
Усё бліжэе праз цень імжы.

І той жа момант рыбачка мужна
Нырнула ў мора — назло штармам.
«Аддай мне, хваля, вярні мне мужа —
Я не напелася з ім сама!»

Зламаўшы хвалі крыло цяжкое,
Дагнала лодку на дне сваю.
Забрала мужа. Там, пад вадою,
Яны і зараз дваіх пяюць.

## Кароль

**Харвацкая балада. XVI стагоддзе**

Нарэшце, Мація Губец,
Цябе карануюць сёння.
Бачыш, колькі сабралася
Тваіх засмучоных сяброў...
Што ж зробіш — гэта падзея,
Хоць сумная, ды падзея,—
Калі селянін на троне
Вянчаецца на караля.

А табе ж гэты трон ці трэба —
Колькі было ў цябе тронаў!
На лузе — купіна мяккая,
У лесе — цёплы пянёк!
Там, умакрэлы ад працы,
Сядзеш, бывала, паважна,
З полуднем клунак развяжаш —
Ясі, як сапраўдны кароль.

А калі ты з угрэтага поплава
Ехаў на возе сена,
Тваёй вышыні зайздросцілі,
Здавалася, каралі:
Галава — высока-высока,
За яе аж хмурынкі чапляюцца,—
Гэтак, як сена ахапкі
Чапляюцца за платы...

Сёння дадуць табе ў рукі
Цяжкі каралеўскі скіпетр,
Але да яго не прывыкла
Твая з мазалямі далонь.
Дайце ёй лепш тапарышча,
Цапільна ці нават грабільна!
А як яна, Божа, пазнае
Выслізжанае касцё!

І як абудзяцца рукі,
Што так сумуюць па працы,
Будуць касіць і грэбці,
Грэбці і зноў касіць...
Забярыце свой д'яблаў скіпетр —
Селяніну ён непатрэбен:
Гэтай парожняй бразготкай
Забаўляцца сорам яму!

А табе яшчэ, Мація Губец,
І карону на голаў уздзенуць.
А навошта? Хіба ў ёй за плугам
Босы пойдзеш па баразне?
Як жа гэтай дзіраваю шапкай
Галаву ад сонца заслоніш,
Ад асцюкоў уратуешся,
Звозячы з поля снапы?..

Не, ні скіпетр, ні трон, ні карона
Не былі табе, Губец, патрэбны,
Не з-за іх ты сяброў на паўстанне
Ад касьбы, ад жніва адрываў.
Ты хацеў свабоды сялянам,
Ты хацеў справядлівасці толькі —
Каб селянін на полі
Вольна араў, як кароль.

Вось за гэта цябе й карануюць —
Каралеўствам гарачым караюць.
Бачыш, вораг як распраўляецца
З сялянскім сваім каралём:
Вунь твой трон стаіць ясны,
Разагрэты, нагрэты дачырвана,
І карона, і скіпетр
Зырка ззяюць, нібы вугалі.

Моцна сціснуўшы скіпетр распалены
І карону рукою паправіўшы,
Ты спакойна ўзышоў
На жалезны палаючы трон...

І сягоння яшчэ
Твой народ не забыўся — ён помніць,
Як на троне адзін селянін
Паміраў каралём.

## Падатак

**Балгарская балада. XVI стагоддзе**

Галашэнне бабак, галашэнне матак —
Зборня панаехала адбіраць падатак.

Па ўсмешцы роднай — ад кожнага плачу,
Ад кожнае хаты — па гульні дзіцячай.

Па маленькай ручцы — ад кожнае міскі,
Па адной надзеі — ад кожнай калыскі.

Ад зямлі пакутнай — ды па хлебасею
Абыяка, звыкла беруць ліхадзеі...

Забірае зборня жудасны падатак,
Адбірае зборня ў матак немаўлятак.

Павязуць малых іх у зямлю чужую,
Дзе не так гавораць, дзе не так сумуюць.

Там дадуць адразу ім чужое імя:
Так прымусяць здрадзіць — без віны! — Радзіме.

А яшчэ навучаць ненавідзець люта
Бацькаўшчыну, дом свой, што даўно ў пакутах.

І яны прыедуць у свой край са зборняй,
І ад іх таксама сёлы жах агорне.

Можа, з іх каторы нат у свайго брата
Адбярэ падатак — кволых немаўлятак.

## Кантрабанда

**Беларуская балада. XVI стагоддзе**

Стаміліся белыя коні і цёмнымі сталі ад поту,
Стаміліся бомы звінець пад дугою —
Матляліся ўжо неахвотна,
Ахрыпла іх песня — яна наглыталася пылу
І ўжо задыхалася ўся,
Калі варта рыплівую брычку спыніла,
Дзе кожнае кола візгліва жаданага дзёгцю прасіла...
— Гэй, што ты вязеш праз граніцу? —
Чужая злавалася мова,
Пыталася варта сурова,
Шукала упарта ахова,
Шукала яна кантрабанду
У брычцы, як позняя восень, парожняй,—
Не верыла,
Што праз граніцу парожнімі ездзіць можна.
— Дык што ты вязеш?
— Вы ж бачыце самі — нічога.

— А можа, схаваў што?
— Навошта? Пабойцеся Бога —
Вы бачыце ўсё, што са мною...
— Ясна адно,— галадранцы!
Ездзяць тут розныя швэнды,—
ахова ўжо стала злавацца.—
А можа, ты кнігі вязеш? Бо з Прагі тут нейкі Скарына
Кнігі злаўчыўся вазіць на радзіму,
Якую чамусьці пакінуў.
— Кнігі?
Ад іх толькі зло...
Бэсцяць кнігі наш люд паспаліты...
— І ты супраць кніг, падарожны?!
Які малайчына, глядзі ты!
А ведаеш, думаю я, што прыйдзе часіна такая:
Нам скажуць Скарыну таго затрымаць,
І мы, будзь ты пэвен, яго затрымаем!
І кнігі тады мы яго
Папалім усюды ў краіне...
— Чакайце, а кнігі ж святыя, пра Бога...
Дык як жа паліць іх?..
— Павінен
Сказаць я табе, чалавеча,
Што ты — кацянятка сляпое:
Можна паліць і святое, калі нам загад ёсць на тое.
Ты знаеш, і Бога самога
Мы можам паслаць на спаленне,
Калі непрыдатным ён стане
Для нашага раптам малення...
Я веру, Скарыну таксама,
Касцёр наш падсобіць на неба —
Асудзяць яго на спаленне нашчадкі...
— Так яму, неслуху, й трэба!
— Ну, едзь, падарожны...
Чакай, а хто там сядзіць у фурманцы?
— Гэта ж фурман мой.
— Бач, з форсам катаюцца нават такія,
як ты,— галадранцы!
Ну, едзь — не мазоль нам вачэй...

Весялей зацілімкалі бомы,
Яны адпачылі крыху —
Дзе падзелася пыльная стома!
Спяшаўся дадому Скарына (а гэта быў ён — вы пазналі?).

Коней сцябалі абое —
І «пан», і «фурман» коней гналі.
Глядзеў на «фурмана» з усмешкай Скарына —
Усё-ткі правёз кантрабанду ён з Богам!
Бо гэты «фурман» — быў найлепшы друкар,
Украдзены ў караля самога.
Ехаў Скарына Францыск друкаваць свае кнігі дома.
Цілімкалі
Весела
Бомы...

## Вяселле

**Беларуская балада. XV стагоддзе**

Што ж ты, дзень мой, канчаешся хутка,—
Дай хоць промні твае расчасаць.
Затрымайся яшчэ на мінутку,
Пасвяці мне яшчэ хоць мінутку,—
Не хачу я цябе адпускаць...

Зелле-гарэліца
Коціцца ў рот,
Вяселле вяселіцца,
Як карагод.

І куды ж ты спяшаешся, вечар,
Бы імчышся на чорным кані?
Захіні мае белыя плечы,
Сваім чорным крылом мае плечы
Захіні, захіні, захіні...

Гасцюйце часцей,
Частуйце гасцей!
Топні, лапаць, топні, бот,—
Хай жывецца без клапот.

Што ж ты, ноч, нібы чорная знічка,
Прамільгнула ў вясёлай гульбе?
І ўжо раніца — мыш-невялічка,
Нібы шэрая мыш-невялічка
Спрытна точыць і точыць цябе.

Сп'янела застолле,
І хмель — нібы дым...
Дайце ж вы ўволю
Паспаць маладым
Адным!

Што ж ты, раніца, цэдзішся рана?
Ці ў цябе спачування няма?
Бачыш, замуж іду я за Яна —
За раба я выходжу, за Яна,
І рабою раблюся сама.

Песня застольная,
Гульба, як жальба:
Увечары — вольная,
Раннем — раба.

І ўжо сонейка ля небакраю
Зашыпела... А што я зраблю?!
Я сама сябе гэтак караю,
І каханнем, і раем караю,
Бо я ж Яна больш волі люблю!

Госцейкі п'яныя,
Бачыце, вунь
Па мяне ад пана,
Па рабу так рана
Бяжыць цівун,—

Бо ўжо сонца ўзышло-о-о...

## Касцёр

**Чэшская балада. XV стагоддзе**

Летні дзень спякотаю дыміўся
І давіўся смагай, як смалою.
А ля Рэйна баўна так, спаволі.
Разгараўся прывідам касцёр.

У задушным сонечным засціле
Полымя кастра было не бачна,
Толькі чулі людзі, як трывожна
Ля зямлі патрэсквае агонь...

Да плячэй накладзеныя дровы
Муляюць рагатымі сукамі,
І вяроўкі мокрыя, як змеі,
Да слупа прыціснулі яго.

Што вяроўкі! З імі вязень звыкся
У халоднай цэлі падзямелля,
Дзе ляжаў, прывязаны да бёрнаў:
Днём — за ногі, і за рукі — ўноч.

А вось людзі... Хоць сабе і гэты —
Кормны, як свінчо тое, вяльможа,
Што спакусна гэтак адрачыся
Прапануе у апошні раз...

Ён яшчэ касцёр можа раскідаць,
Полымя заліць, што ў суччы б'ецца...
І — жывы! — ты ўрадуешся цішы,
Неспатольна ўгледзішся ў палі...

Праз чужыя гоні, можа, згледзіш
Гусінец — мястэчка на пагорку,
Што цябе праводзіла у Прагу,
Матчыным замглёнае акном.

Помніш,— маці, што вяла да лесу,
Несла гусака табе пад пахаю:
«Вось, сынок, хоць гусаком аддзячыш
Тых, хто цябе возьмецца вучыць...»

Помніш, ён залопаў раптам крыллем,
Вырваўся гусак той нечакана.
Колькі ні лавілі — не злавілі:
Не схацеў у Прагу гагатун.

Ну, а ты і без яго дамогся
Знанасці вялікае і славы:
Ты ў шыкоўнай вопратцы магістра
Нават каралеву спавядаў!

А як ехаў на сабор канстанцкі,
На сабор, які касцёр падпаліць,—
Людзі выбягалі аж за горад,
Каб цябе убачыць хоць здаля.

Нават папа — нехта дваццаць трэці —
На саборы збэсціў адлучэнне,
Далучыў ізноў цябе да Бога —
Ненадоўга, праўда, далучыў...

Грамату ахоўную ўрачыста
Уручыў, як сябру, імператар:
Ты, Ян Гус, маўляў, недатыкальны
І дадому вернешся жывы.

І — касцёр... Каля агню ўжо скачуць
Радасныя, подлыя сугнеі,
Хто на словах — быццам бы святыя,
А на справе — ўсе ерэтыкі.

Скачуць, скачуць... Можа, нават з імі
Скача поп з царквы Святога Яна,
Той, што, ў косці ўсё папрагуляўшы,
Бег ад прастытуткі галышом.

З імі, пэўна, поп таксама Тынскі,
Што ў алтар прывёў аднойчы дзеўку
І яе залашчыў на прастоле —
Давялося храм наноў свянціць.

Тут і ён, архіепіскап Збынек,
Што паліць умее добра кнігі,
А чытаць, дурнота, навучыўся,
Залучыўшы толькі гэты чын.

Тут, відаць, і тыя прайдзісветы,
Што зракліся мовы сваёй, звычак,
Што мяняюць чэшскія імёны —
Толькі б іх за немцаў прынялі...

Адрачыся? І народу здрадзіць?
Скінуць душны плашч, з агню пашыты?
Прадаваць панесці індульгенцыі
Тым, каго вучыў любіць свой край?

Не, ніколі!

Полымя шугае...
Што ж маўчыш, магутны імператар,—
Грамата ахоўная затлелася,
Грамата твая, зірні, гарыць?!

Што ж прыціхлі, прагныя святошы?
Можа, вы міжволі зразумелі:
За касцёр сягонняшні трывожны
Будзе век апраўдвацца царква.

Змоўклі ўсе... А нейкая бабуля,
Дужа ўжо набожная, глухая,
Трэскі папраўляе утрапёна —
Мусіць, каб лаўчэй трашчаў касцёр...

## Грунвальд

**Балада ўсіх славян. XV стагоддзе**

Ссекліся аддана
З ворагам славяне.
Раніца — як рана,
Поле — бы ў тумане.

Ноч была няўлежнай —
Ветранай, дажджлівай:
Рыцарам жалезным
Слізка асабліва.

Нібы ў кузні, звоняць
Коп'і і сякеры.
І сцягі з пагоняй
Зацкавалі звера.

Клінам войска гордым
На багной паляне
Расшчапляюць ордэн
Рыцаркі славяне.

Каб было вядома,
Дзе свае яскрава,—
Па пучку саломы
Пачапілі славы.

Ордэн ціха вяне,
Тонуць воі ў твані...
І куды ні глянеш —
Скрозь адны славяне.

Горача ў жалезе —
Гэтак смажыць ліпень!
У балота ўлезеш —
І яно, як кіпень.

А славянам лёгка
Без жалезнай стомы...
І як згледзець вокам —
Скрозь пучкі саломы.

Рыцары цяжкія
Тонуць — не узняцца.
Як сабакі кія —
Помсты так баяцца.

Сталі на калені
(А ішлі пыхліва!),
Літасці — не меней —
Просяць палахліва.

І ўсё далей, далей
Ад вазоў сваіх жа,
Што ў палон забралі
Разам з іхнім крыжам.

Ведалі і самі
Той закон спрадвечны —
Побач з ланцугамі
Здавацца небяспечна.

А ў вазах схавана
Ланцугі звінелі:
Іх «дарыць» славянам
Крыжакі хацелі...

## Званы

**Беларуская балада. XIV стагоддзе**

— Што, званы, вы захадзілі,
Так трывожна зазванілі?
Хіба можна
Так пужаць
Ноччу соннай
Гараджан?

— Мы пачулі:
Недалёка
Свішчуць кулі—
Чулі клёкат?
То няйначай
Вораг гоніць:
Коні ў звоне...
Скачуць
Коні...

— Што, званы, вы застагналі?
Штосьці, дурні, мы праспалі...
І куды
У цемры йсці?
Дзе нам ворага
Знайсці?

— Вораг вас увёў у зман:
Ён жа тут
Ля нашых ран
І ля пакут...
Вы ідзіце
На наш звон
І убачыце,
Дзе ён.
Нас здымаюць
Са званіц,
Нас кідаюць доле
Ніц —
Мы ў няволі...

— Што замоўклі вы, званы?
Вашы стогны не чутны.

11—482

А без вас
Уночы
Не, не бачаць
Вочы.

— О, які цяжкі ў нас
Лёс!
Нас вязуць
Праз рэкі слёз
І наўскач
Праз лямант,
І праз плач
Таксама...
Каб маўчалі,
Не званілі,—
Языкі нам
Прышчамілі.
А ў такім палоне,
Як жа мы зазвонім?!

Горад змоўк...
Счарнеў ад дум...
На званіцах
Дрэмле сум...
Калі вывезлі званы—
Значыць,
Здаўся горад без вайны.
Плача...

## Разня

**Кашубская балада. XIV стагоддзе**

— Мамачка, мамка, а дзе ж наш татка,
Чаму не ідзе ён дахаты?
— Сыне мой, сыне, мусіць, дзіцятка,
Татка ўсё ў моры заняты.

— Мамачка, мамка, а што там за крыкі?
Чуеш, здаецца, там плачуць...
— Сыне мой, сыне, то ж вецер вялікі —
Бура пачнецца няйначай.

— Мамачка, мамка, а што вунь за цацка
У дзядзькі, што грукае ў дзверы?
— Сыне мой, сыне, гэта ж знянацку
За цацку прыняў ты сякеру.

— Мамачка, мамка, чаму, паглядзіце,
Чырвоная рэчка такая?
— Сыне мой, сыне, у ёй не вадзіца—
То ж кроў наша, сыне, людская.

— Мамачка, мамка, нас выручыць хочуць?
Бяжыць чалавек на наш ганак...
— Не чалавек ён, а мой ты званочак,
Гэта ж
крыжак паганы!

## Чараўніца

**Лужыцкая балада-казка. XIV стагоддзе**

— Што ж ты, хросніца, ніколі
Не прыходзіла ка мне?
— А ўсё часу, хросна маці,
Ды ўсё часу не было.

— Што ж ты бачыла, цікава,
Да матулькі ідучы?
— Чатырох сабак сустрэла—
Беглі з косамі на луг.

— Што ты, хросніца, гаворыш?
Не пазнала ты, відаць:
Гэта ж беглі не сабакі—
Беглі парабкі касіць.

— І авечачкі чатыры
Неслі граблі на плячах:
Заклапочана спяшалі
На той самы, пэўна, луг.

— Не авечкі гэта, Ганьжа,
А паслужніцы мае.

Хіба іх пазнаць так цяжка
Па абрэзаных хвастах?

А каго на панадворку
Ты убачыла, скажы?
— Там былі чатыры мышкі,
Што дурэлі на траве...

— I у кожнай — луста хлеба,
Што ад шмальцу аж блішчыць?
— Так...
— Дык гэта ж мае дзеці,
Дзеці любыя мае!

— Зазірнула я ў стадолу—
Там малоцяць бараны.
— Гэта парабкі таксама...
Хіба ж ёсць баран без рог?!

— Пад паветкай кошка звыкла
Доіць, бачыла, кароў.
— Гэта ж трэба зблытаць кошку
Са служанкаю маёй!

— Тут жа конь загнаны. Масла
Капытом у бойцы б'е.
— Што ты, хросніца, балбочаш:
То ж мой муж — татулька твой!

I наогул, дужа многа
Знаеш, дзеўка, пра мяне...
А мой двор не мае куркі,
Каб мне золата дзяўбла.

Ці не схочаш ты, дачушка,
Быць нясушкаю пры мне?...
Ганьжа мелася пярэчыць—
Кудкудакнула ў адказ.

* * *

Казкі ўпэўнены: павінна
Дабрыня перамагчы!
Але часам і у казках
Пераможа раптам зло...

## Адчай

**Сербская балада. XIII стагоддзе**

Уцякайце ж вы, нашы дзетачкі,
А куды ўцякаць — мы не ведаем,
Ратавацца як — не навучым вас:
Жываглот ідзе страшна-жудасны,
Вурдалак ліхі, ненажэрны цмок,
Той, хто ўлёт ляціць, хоць і сам без крыл,
Хто і без кап'я працінае ўсіх,
Без мяча сячэ — не стамляецца
І без паліцы забівае ўсіх,
Хоць зусім без ног, а ўслед гоніцца,
Хоць не мае рук, а хапае ўсіх,
Есць спрытна людзей без спатолення,
Ні старых-малых не шкадуючы,
І пасля яго — вёскі мёртвыя...
Уцякайце ж вы, малалетачкі,
Хоць мы ведаем — не ўцячэце вы:
Ён дагоніць вас, кожан-кожнага,
Знойдзе ўсюды сам, пахаваных вас,
Забярэ з сабой, кволых, сцішаных,
Бо страшыдла той — голад, дзетачкі...

## Пыл

**Балада Кіеўскай Русі. XIII стагоддзе**

Яшчэ
Не асеў на дарогах пыл,
Табунамі чужацкага войска ўзняты.
Усё яшчэ сеецца ён
На голыя дрэвы,
Для якіх восень прыйшла вельмі зарана—
Улетку:
Іх зялёнае лісце
Скарміла сваім коням
Батыева саранча...

Яшчэ падае ён, гэты пыл,
На крывыя шаблі захопнікаў,
І там, дзе не высахла покуль кроў,
На блішчастых палосах
Бярэцца шэры налёт земляны,
Як на тварах смяртэльна параненых вояў.
Яшчэ на бадыгах крукастых,
Якімі прыхадні сцягвалі з сёдлаў
Белагаловых воінаў,
Матляюцца шматкі іх запыленых доспехаў.
Яшчэ не дагарэлі
Вогненныя дзіды,
Якімі Батый спаліў Кіеў,
І пыл яшчэ асядае на пажарышча,
Як гарачы попел...
А ўжо знайшоўся баян,
Які, пярхаючы ад пылу, спявае:
— Слава, слава, слава Батыю!
І дзякуе, дзякуе «вызваліцелям»
За нагрэты ў запыленых бурдзюках
Ханскі кумыс...
А можа,
Пярхаецца яму не толькі ад пылу?
Бо чаму ж тады
Ён так баязліва,
Як вінаватае сабачанё на гаспадара,
Пазірае на харобрых ваяроў,
Што паўтыканыя чужацкімі стрэламі,
Як вожыкі,
Ляжаць навокал.
Не бойся, палахлівец!
На тваё шчасце
Яны не змогуць расказаць пра тваю здраду,
Нават не змогуць перадаць наступнікам,
Якім імем звалі цябе сябры, маці,—
Яны ж мёртвыя...

## Развітанне

**Заключная балада**

Прабачце, даўнія стагоддзі,
Што патрывожыў я ваш пыл,
Што, абмінуўшы змрок магіл,
На веча вашае прыводзіў
Сваіх сяброў — з той далячыні,
Што светла мроілася вам,
Што вашым снілася сынам,
Як сніцца лета ў зімняй стыні.
Мы пасядзелі,
                    як схацелі,
Пагаварылі,
                    як змаглі.
Раздзьмуўшы нанава вуглі,
Ля вашых вогнішчаў папелі.
Ваш боль,
                    ваш сум не абміналі
І вашу радасць перайшлі...
І дні — стагоддзямі міналі,
Стагоддзі — нібы дні прайшлі.
І вось яна,
                    часіна тая,
Калі развітвацца пара:
Камяк у горле — як гара,
Сляза — шчымлівая такая.
Бывайце ж, даўнія стагоддзі,
Мы зноў вяртаемся ў свой час,
Дзе над галовамі у нас,
Як радасць, сонца светла ходзіць...

*З кнігі*

**«АХВЯРНЫ ДВОР»,**

1991 г.

## ПАЭМЫ Ў ПРОЗЕ

### Варзоб

Збіраецца чалавек
у якую-небудзь далёка-далёкую далеч,— сам радуецца, а душа плача: куды і навошта ты цягнеш мяне?
Вяртаецца чалавек
з той далечы, цешачыся, што хутка абвяселяць позірк родныя краявіды, асветленыя самымі прыгожымі ў свеце вачыма,— сам зноў жа радуецца, а душа, як і раней, плача: а ці ўбачу я ўсё вось гэтае хараство, гэтае дзіва, што пакідаю, калі-небудзь зноў?
Стаю
пасярод вясенняга Душанбе, які зялёнымі галінкамі адмахваецца ад нечаканага снегу, што спрабуе ўбяліць яго, і ўсур'ёз пытаюся ў сваіх новых сяброў — таджыкаў:
— А ці далёка
да Гісарскай упадзіны?
Я хачу палюбавацца ёю.

— Дык любуйся,—
таксама ўсур'ёз адказваюць, Зіё і Камол,
Сайф і Абдулхамід адказваюць.— Яна ў цябе пад нагамі, гэтая ўпадзіна. На ёй стаіш
ты, стаім мы і нават стаіць наш цяжкалёгкі
Душанбе.
Дзіва!
Можна стаяць на крыле птушкі і, калі яна
вялікая, не здагадвацца пра гэта, пакуль
птушка не ўзляціць.
Можна бачыць
заснежаныя горы на небасхіле і думаць, што
гэта ўсяго толькі белыя воблакі.
І можна вось так упэўнена
стаяць на самым дне Гісарскай упадзіны і,
ці чуеце, марыць пра тое, як бы яе пабачыць — хоць краем вока.
Мы ж дамовіліся:
мае вочы — твае вочы. Глядзі імі колькі
хочаш, глядзі як хочаш і куды хочаш,—
яны не стомяцца паказваць табе ўсё, што парадуе цябе, што здзівіць цябе, што напоўніць
цябе,— гэтак жа, як парадавала, здзівіла,
напоўніла і мяне.
Мужчына без жанчыны — ніхто.
Так сабе, нешта сярэдняе — яно. І толькі
жанчына робіць мужчыну мужчынам. І толькі пры жанчыне вырастае і атрасаецца ад
бруду Ён. Жанчына з загатоўкі, з аморфнай
і не выразнай масы выточвае Мужчыну.
Даруй мне, алах, такое блюзнерства—
для Азіі гэткія думкі ўжо самі па сабе—
крамола.
Хаця чаму ж крамола?
А гэта тады што, калі не крамола?
«Так балюча мне, сяброўка,
толькі ты адна прыгожая, так балюча мне,
пакутніку, толькі я так закаханы»,—
прамаўляе Рудакі.
«Адкрый свой твар:
садоў, поўных руж, я прагну; адкрый свае
вусны: мёду салодка-прыемных рос прагну»,—
плача Румі.

«Мілай спаць,
табе ж да рання думаць пра яе з журбой»,— журыцца Саадзі і дадае: «Не магу з маёй любімай кветкі аніякай параўнаць».
«Я вусны цалаваў твае,
а ты кусаеш іх»,— здзіўляецца Хафіз.
«Рай для мяне там,
дзе я магу цябе пабачыць»,— прызнаецца Джамі.
«Малю,
каб ты прыснілася у сне хоць, ды ад кахання не магу заснуць»,— скардзіцца Мушфікі.
І праўда,
жанчына — пакоўня спакусы, пажадлівасці і распусты для ханжы. Але ж якая чыстая яна для закаханага чалавека! Але ж паспрабуй без яе здзейсніць самае святое таінства— нарадзіць чалавека!
Сядай жа, мая радасць, мая жанчына, хутчэй у машыну, ды паедзем: ты ўсё роўна са мною, хоць я і адзін тут, у гасцях.
Паедзем шукаць Варзобскую цясніну.
Спытаўся:
— Як сказаць па-таджыкску «я кахаю цябе»?
— Шырын,— адказалі мне.
— А «вельмі моцна кахаю»?
— Шырын-шырын.
Што значыць: салодкая-салодкая.
Чуеш, як далікатна,
нібыта ласкава дакранаючыся вуснамі да чагосьці пяшчотнага і цнатлівага, спяваюць хлопцы саадзіўскага «Сарбона»,— верш, які стаў народнаю песняю.
Абдулхамід і Сайф, Камол і Зіё спяваюць. Спяваюць, як усё роўна нясуць — усе разам — нейкае чароўнае крышталёвае дзіва.
І словы ўсе — нібыта крышталь.
Словы Саадзі,
які адмовіўся прыняць з рук могучаў спакуслівы лёс прыдворнага паэта і стаў сябрам кожнаму караваншчыку на пыльна-сасмаглых караванных шляхах.
«Эй, сарбон, пагоншчык вярблюдаў,
не спяшайся так, не паганяй вельмі сваіх

марудаў: ты ж ведаеш, што з табою, з тваім караванам іду і я. Дык зрабі ж так, каб я паспявала за тваімі вярблюдамі, коньмі і ішакамі».

«Эй, сарбон, паганяй жа ты хутчэй сваіх марудаў, бо я стамілася чакаць цябе— мае рукі стаміліся, мае вочы стаміліся, мае вусны стаміліся чакаць цябе, а ты так няскора ідзеш са сваім караванам».

«Эй, сарбон!

Падварушвай жа хутчэй вярблюдаў— не бойся, я, невідомая, што з табою і без цябе, што дзялю з табой дарогу, хоць і далёка зараз ад яе, што зажураная без цябе і шчаслівая поплеч з табою, не ўпаду з вярблюдзіцы ў падняты тваімі нагамі пыл. Я чакаю цябе і ніяк не магу дачакацца». «Калі такое з ёй расстанне, якая ж будзе з ёй сустрэча!»

Песні цесна ў машыне,

песні цесна ў Варзобскай цясніне, якая робіцца ўсё вузейшай і вузейшай,— і песня б'ецца крыламі аб горы, аб каменне, як птушка б'ецца аб час і прастору, але ўсё ж астаецца жывою, адно выглядае крышачку стомленай.

Эй, мая салодкая-салодкая! Эй, караваншчык! Каравана няма. І вось ён ужо як перад вачыма. Ідзе мернаю, спакойнаю хадою. Упэўнена і настойліва ідзе. А вось і ён, сарбон,— той, па кім так зажурана сумуе стомлены чаканнем дзявочы голас...

Што ж,

«голас горнасці не чутны ў перазвоне караванным,— плачу, нібыта званочак на апошнім ішаку».

Што ж,

«пакуты — радасць, калі ў іх сустрэчы мроіцца чаканне».

Шчаслівай дарогі — да кахання.

Ад кахання і да кахання.

Бо дарога заўсёды, мусіць, пачынаецца ад кахання і вяртаецца зноў жа да кахання.

Пачакай, чуеш?

Гэта ўжо другі караван і другі караваншчык.
«О мой жорсткі!
Зайздрослівых ворагаў ты ашчасліўіў ось зараз, уходзячы,— закрычала ўжо другая жанчына, убачыўшы, што яе каханы падняў вярблюдаў у дарогу.— Ты са мною пабудзь ці хоць шчыра скажы, з караванам ты вернешся зноў ці навек застануся адна я?»
І сарбон здаўся:
«Не спяшайся, вярблюд. Памарудзь, дарагі. Недарэмна ж назваўся ты сябрам маім. Хай трава табе будзе, як амбра, салодкай. Заўтра, заўтра мы рушым у пекла пустынь».
І караваншчык,
зноў разуючыў вярблюдаў і зноў іх паклаў, каб яшчэ дзень пабыць з каханай.
«Чужому шчасцю не зайздросці, падумай, а ці не зайздросцяць табе, шчаслівец, самаму?»
А я вось стаю
у вузкай Варзобскай упадзіне — без цябе. Пад нагамі ў мяне цвітуць гульбарфы— снежныя кветкі, прабіснегі, ці, як у нас кажуць, сон-трава.
Ружова цвіце на схілах горны міндаль.
З двух бакоў навісаюць вострыя і настылыя яшчэ з зімы камяні — здаецца, расстаў толькі рукі, і далоні ўпруцца ў вечнахалодныя, вечнашэрыя, вечнавечныя, такія шурпатыя шчокі гор.
Бачыш,
зелянее трава, блакітнее неба.
Бачыш,
пад нагамі — смарагд, над галавою — біруза — абодва вельмі пашаноўныя камяні Усходу.
Бачыш,
злева і справа, за бясконцымі ўтравелымі вяршынямі — ужо снежныя: здаецца, праз зеляніну вечным холадам дыхае ў твар першароднасць снегу і неспазнанасць жыцця.
І ўсё ж,—
«такая светлая родная зямля,
такая пахкая зеляніна лугу,

такое ядранае маё віно,
такая пяшчотная мая сяброўка».
Лезу ўверх і думаю:
горы — яны толькі здалёк горы, а зблізку— гэта ўсяго толькі шэрае каменне пад рукамі, нагамі і вачамі, толькі дэталі гор, а не самі горы.
А каб па-сапраўднаму ўбачыць горы, каб да іх наблізіцца, ад іх трэба адысціся. На паважную адлегласць адысціся.
Лезу, караскаюся,
і здаецца, варта толькі падняцца на гэтую вось вяршыню, і ты падамнеш пад сябе ўжо ўсе вяршыні свету. Але і за ёю вырастае раптам новая, за новаю — яшчэ адна, і ты адчуваеш, што і гэтая не апошняя: падняўшыся на яе, ты заўважыш, колькі яшчэ нялічаных вяршынь хавала яна за сваёю несамавітаю спіною.
Паўстаюць за вяршыняю вяршыня,
і табе ўжо здаецца, што і канца і краю ім ніколі не будзе.
Дзіўна,
горы нараджаюць у чалавека крылы: вочы становяцца крылатымі, рукі — таксама, ногі і тыя адчуваюць на сабе крылы. Ужо не кажучы пра душу — яна вольна лунае над тлумам і тленам лагчын.
Дзіўна,
маленькія вяршыні засланяюць сабой вялікія. Недзе вось тут, перад вачыма, блізка-блізка і далёка-далёка славутыя сямітысячнікі — і пік Камунізму, і пік Леніна, і пік Рэвалюцыі, і ляднік Федчанкі, і жамчужына Паміра — горнае Сарэзскае возера.
Але іх не відаць—
нейкія маленькія вяршынькі, усяго толькі стометроўкі, падымаюцца перад табою і не даюць воку сягнуць да самых высозных пікаў, якія так прагнеш ты пабачыць.
А недзе
вось у гэтым баку — Іран, а там — слынны Шыраз — горад прыгажунь, і Харасан —

край, дзе ўзыходзіць сонца і дзень і ноч
ззяюць прыгажуні.
А вунь там, злева,
схаваўшыся за бясконцымі вяршынямі,—
Панджруд, горны кішлак непадалёку ад
Зераўшана, дзе ўзышоў між камянёў і травы
Рудакі.
Ага, недзе там,
надзейна ахаваны снежнымі заносамі — перавалы закрыты, і туды можна дабрацца толькі верталётам — і сам Памір — галоўная
гара таджыкаў.
Там жывуць блакітнавокія таджыкі.
Як з'явіліся яны ў гарах,
адкуль прыйшлі, такія нечаканыя тут блакітныя вочы?
Таджыкі жартуюць:
«Мы жывём між цяснін,
сонца не паспявае з-за адной гары выйсці, як ужо хаваецца за другую. Таму мы многа глядзім на неба. Вось ад неба і з'явіўся блакіт нашых вачэй».
Ах, сябры,— можа, яно і так...
А можа, ён, незразумелы блакіт, ад тых арыйцаў, якія ішлі праз гэтыя горы — з нашага Дняпра ў вашу Індыю?
Дарэчы,
Індыя таксама блізка — яна вось тут, за
Памірам, з якога ўжо відаць Гімалаі...
Шуміць унізе па камянях
зеленаваты, колеру марской хвалі, Варзоб,— бачыце, заўсёды памятае пра мора галоўная
рака таджыкаў.
Іншыя перасыхаюць,
агаляючы рэчышча і лабастае, абточанае вадою каменне ў ім, ад чаго глядзець на такую нежывую раку балюча і тужліва — як на пакінутыя гаспадарамі хаты ў нашых вёсках
на Беларусі.
Пакінутыя вадою рэкі.
А гэтая — шуміць.
Праўда, яшчэ не моцна,
бо вады ў ёй пакуль не вельмі, але хутка Варзоб загудзе па-сапраўднаму: дзесьці ў

маі пачнуць раставаць леднікі, і тады неўтаймоўны, радасны, вясёлы гул будзе чуваць і ў Душанбе.

Дык адкуль жа ўсё-такі яны, блакітныя вочы таджыкаў? У Зіё, Камола і Сайфа, як і мае быць у Азіі,— цёмныя, а ў Абдулхаміда — блакітныя. Адкуль, Абдулхамід?

Зіё вельмі перажывае — на з'ездзе пісьменнікаў яго пакрытыкавалі. Нічога не можа зразумець—дасюль усе яго хвалілі, а тут раптам узяліся крытыкаваць.

Прывыкай, хлопча.

Ты выбраў сабе шлях, які не ўсе і не заўсёды разумеюць і падтрымліваюць.

«Табе атруту дасць мудрэц — атруту гэту выпі, табе нягоднік лекі дасць—ты не прымай тых лекаў».

На гэтым шляху часцей за ўсё зайздросцяць, спакушаюць і падстаўляюць ногі. Літаратура, каб ты ведаў, хлопча, гэта якраз той лан, на якім яднаюць сваю злосць і нізы, і вярхі: вярхі злуюцца, што нехта ўзнімаецца вышэй за іх, а нізы — таму, што нехта не апускаецца, зноў жа, да іх. Ведай гэта, Зіё, і табе лягчэй будзе на абраным табою шляху.

«Апасаецца вяроўкі той, хто ўджалены змяёй».

Помніш Рудакі?

Таго самага выдатнага паэта і выканаўцу сваіх вершаў, чый голас і чый уд раскашаваліся ў Бухары пры двары саманідскіх валадароў,— саманіды палюбілі яго і ўзвысілі над усімі прыдворнымі паэтамі. Таго Рудакі, хто ў няміласці дажываў свае дні — саманіды западозрылі, што ён спачувае народным хваляванням, прагналі з двара і ўсе астатнія дні яму зрабілі начамі — асляпілі яго.

Вялікія казалі:

«Не, не высакародны той, хто на грудзі ўпаламу наступіць».

«Якая брыдкая валадара душа:
пачціва гаварыць з ім без дыхання мусіш».

«Скарынкаю будзь сыты, ды на волі,
хоць у рыззі, ды шчырае красы»...
Блакітная дабрата
бліснула ў карых вачах Насруло — адна, здаецца, дабрата жыве ў гэтых вачах.

«Ведаеце, як я навучыўся чытаць? — усміхаюцца яго ласкавыя вочы.— У мяне было шаснаццаць брацікаў і сястрычак. Так што работы хапала. Я калыхаў люльку з сястрою. А сам — з кнігаю. Засне сястра — мне дадуць новую работу. Давядзецца пакласці кнігу. Дык я, калі сястра пачне засынаць, ушчыкну яе, яна зноў заплача. Маці здзівіцца: «Нешта малая доўга не спіць, ці не захварэла?» Суцішыцца, я ізноў — даруй, сястра! — ушчыкну. Так з кнігаю і праседжу ўвесь дзень. Так і навучыўся сам чытаць. Маці дзівіцца, бацька дзівіцца. Кажуць: «Бог даў».

О, гэты Бог!

«Божа мой! Ты ў сэрца мураша
Цэлы неабдымны свет змясціў,
Не расшырыўшы пры гэтым сэрца мураша,
Свет не звузіўшы ані на волас,
Божа мой»...

Сайф расказвае пра свой боль.
Ён і апавяданне пра гэта напісаў. Усім спадабалася. «Бамадары» называецца. «Без маці», значыць.

Калі яму было тры гады,
яго кінула маці. Ён сам вырас, ажаніўся. Сына займеў. Абедаць хадзіў у дыетычную сталоўку — крыху прыхварэў. Аднойчы расказаў пра сваё жыццё афіцыянтцы. Тая расплакалася — чуллівая была, спагадлівая. А потым прыйшла посуд прыбіраць і прызналася:

«Я ж твая маці».

Потым
так прывязалася да ўнука — яму ж зараз тры гадкі, якраз столькі, колькі было Сайфу, калі яго кінулі,— што ўжо і ён не ведаў, што рабіць: усю ласку, якую не аддала сыну, яна, вінаватая, аддавала ўнуку.

Але ж душу гэтым не залапіш:
ні сынаву, ні тым болей сваю — у ёй усё
роўна будзе дзірава.
«Калі вялікая ў табе душа,— дары яе ўсім
без роздуму,
калі малая,— то няхай яна ў табе самім,
нібы лампада, ззяе».
А у блакітных вачах Абдулхаміда
мільгнулі карычнева-цёмныя іскры азіята.
— Вось там,—
усміхнуўся ён і паказаў за вяршыні, за якія
нават воку сягаць было і далёка, і балюча,—
там Куляб, і там жыве і сёння Музафар.
І расказаў быль пра Музафара.
Вайна.
Сакратар райкома гаворыць: «Немцы Маскву
ўзялі. Трэба нешта думаць». А Музафар—
начальнік міліцыі. «А што нам думаць,—
будзем Куляб абараняць»,— адказаў ён.
Узяў усю зброю, што была ў міліцыі, і—
у горы. Вайна скончылася, а ён і пасля вай-
ны Куляб абараняе. Нікога не падпускае да
сябе — заняў адзін кругавую абарону і стра-
ляе па кожнаму, хто пакажацца ў гарах.
І ніяк нельга яму перадаць, што вайна даўно
скончылася, што Куляб ужо не трэба абара-
няць.
І ўсё ж неяк перадалі, неяк пачуў ён:
«Музафар!
Маскву немцы не ўзялі, і Куляб не трэба
абараняць».
Пачуў ён і пакінуў свой умацаваны раён.
Але ж яго сустрэлі няласкава —
ён жа, выходзіць, злачынец. Музафара вы-
рашылі звязаць.
«Ну добра,—
згадзіўся ён.— Звяжыце сабе, але не сур'-
ёзна».
І дазволіў гэта зрабіць сябру.
Аднак—
і сярод людзей, як і сярод сабак, часам ёсць
такія тыпы: радаслоўная — цудоўная, а мор-
да — брыдкая...

Аднак —
ох ужо гэтыя звычайныя чалавечыя слабасці! — сябру спадабалася роля канвойцы: ён бгнаў Музафара (са звязанымі рукамі!), бягом гнаў у Куляб, у яго родную міліцыю, як і трэба гнаць злачынцу. Музафар злаваўся, лаяўся, хацеў ударыць нягодніка нагою, але на баку таго зараз ужо была і сіла, і ўлада — звязаныя Музафаравы рукі, Музафарава плётка і нават Музафарава стрэльба, з якою
ён абараняў ад немцаў Куляб.
«Ну, пачакай жа, скаціна!
Я табе пакажу, як толькі ты мяне развяжаш»,— злаваўся ён і рашуча, як ашалелы
бык, круціў галавою.
Але Музафара не развязалі — яго пасадзілі.
«Мой сябра з маім ворагам сягоння быў».
«Уцякай ад матыля, калі ён побач з гадам быў».
Вярнуўся Музафар у Куляб самотны —
жонку, аказваецца, забраў той сябра-канвойца, які з такой асалодаю гнаў яго ў Куляб.
Але Музафар перш за ўсё пайшоў да жонкі:
«Па карану ты мая жонка».
«Дык у мяне ж сямёра дзяцей ужо, Музафар».
«Ну і што, што сямёра.
Але ж па карану ты ўсё роўна мая жонка.
І твае дзеці стануць маімі».
Што ж, бывае і такое:
чым больш нас крыўдзіць каханая, тым
больш мы любім яе.
І сёння ў Кулябскім раёне
жыве селянін Музафар і гадуе многа сваіх
і зноў жа сваіх дзяцей і ўнукаў.
Чужыя дзеці
становяцца сваімі, калі ты любіш таго, хто
нарадзіў іх.
«Нам, дэрвішам, навошта гаворыш ты аб раі?
Наш рай — гэта жыццё вось тут, у родным краі».
А Варзоб шуміць унізе,
а вяршыні бялеюць уверсе, а гульбарфы—
сама чысціня, белыя, з блакітным адлівам,
кветкі — уважліва глядзяць на цябе — не ты
на іх, а яны на цябе.

Недзе на схілы гор выйшлі ўжо ангорскія авечкі — як статак шэрых камянёў, сцішыліся яны між зялёнай травы, недзе ў лагчынах ужо сеюць бавоўнік, а між цяснін у блакітных вачах горных памірцаў, як у блакітным небе, адбіваюцца, мусіць, вось такія самыя воблакі, што імкліва праплываюць і над намі.

Уверсе, мусіць, моцны вецер — ён разрывае воблакі, разрывае малюнкі, у якія яны сплываюцца,— выкручвае рукі чалавеку, ламае напал дрэва, разбурае быццам сапраўдную хату, і тая развальваецца, разлазіцца на вачах — і ад такога хаосу ў небе і на душы робіцца неяк трывожна-трывожна.

А затым — сівы, падцягнуты дзед з ордэнамі і медалямі на пінжаку распытвае пра Проню, якую ён вызваляў; актрыса Мар'ям Ісаева ўспамінае беларускі лес, у якім яна была ў Дні дэкады таджыкскай літаратуры і мастацтва, і журыцца па нашых спаленых вёсках; Курбаналі Раджаб, знаны выканаўца народнага эпасу «Гуруглі» — «Чалавек, які нарадзіўся ў магіле», кажуць, гучыць у яго выкананні як найлепей,— задумваецца раптам і, гледзячы на горы, трывожна пытаецца:

«Дык што ж гэта ЯНЫ робяць?!

І я разумею, што не пра горы ён кажа, не пра Гуруглі ён гаворыць, не пра чалавека, які нарадзіўся ў магіле, думае, а пра ўсіх нас, хто нарадзіўся нармальна, на зямлі, непакоіцца.

Ён пытаецца пра тых нягоднікаў, якія, нібы вар'яты, носяцца з жахлівымі ідэямі: зачарніць, да прыкладу, бялюткія шапкі Паміра — каб яны сцяклі вадою ў нізіны. Во колькі тады паліву будзе! А потым яшчэ прагнуць спусціць з гор найпрыгажэйшае Сарэзскае возера — скарбніцу, крыніцу чыстай пітной вады.

А тады што?!

«Яны прагнуць дабываць ваду з агню,
а з вады агонь жадаюць высеч».

«Яны нікчэмныя такія, хачу зраўняць я іх з асламі,
Парожнія, як барабаны, хоць і наўючаныя справамі».

Не, самая жудасная, мусіць, жывёліна на зямлі ўсё ж — чалавек. Асабліва калі гэты чалавек — дурань з ініцыятывай.

Як нам зрабіць, каб адабраць у яго хоць ініцыятыву? Хай ужо застаецца сабе дурнем — што зробіш! — толькі без ініцыятывы.

Хаця і дурні, здаецца, патрэбныя. Каб узвышаць разумных. На іх фоне вялікія робяцца яшчэ болей вялікімі. А перад імі, вялікімі, ужо ў сваю чаргу мізарнеюць яшчэ больш мізэрныя.

Самі дурні мізарнеюць...

Кветкі да ног вялікіх.

Да ног Авіцэны, слыннага Ібн Сіна, які раззлаваў султана Махмуда, адмовіўшыся служыць пры двары.

Кветкі да ног, а запомніліся чамусьці рукі. Рукі лекара і спагадніка.

Стаўлю кветкі да ног вялікага Рудакі, які заплаціў вачыма за волю і непаслушэнства, стаўлю кветкі да ног, а бачу зноў жа толькі рукі — рукі сляпога, які бачыць і чалавека, і дарогу рукамі.

Кветкі да ног Айні.

«Чыёй поўняю ты гэтай ноччу была
і чыёй насалодай была,
чыю хату ўсю ноч асвятляла
і чыёю спакусай была?»
«Вось я памру
і сіратой пакіну жыць сваю тугу».

«Ты бачыў свет, ды ўсё, што ў ім знайшоў,—
лухта,
І ўсё, што чуў твой слых, што слова меў,—
лухта,
Усё, што з краю ў край ты абышоў,—
лухта,
І ўсё, што ты купіў, набыў, прыдбаў,—
лухта!»

Я паклаў бы кветкі
і да ног Амара Хаяма, але, на жаль, тут няма помніка яму.

Мы з вамі, вочы, на свяце.

А свята — гэта заўсёды гасціннасць. Усюды так і гучыць: «Хуш амадзед». Я ўжо ведаю, што па-нашаму гэта будзе: «Калі ласка».

Ведаю,
што Зухра — гэта наша зорка Венера, што Зулейха — гэта палка і безразважна закаханая жанчына, пра якую марыць кожны мужчына, што Харут — гэта анёл, якога Багі скінулі з нябёсаў за каханне да звычайнай зямной жанчыны.

Услухоўваюся ў незнаёмую мне мову,
і да мяне прыходзіць радасць, што я нічога не разумею, што яна такая далёкая ад маёй руплівіцы. Прыходзіць радасць і трывога.

Успамінаю,
што недзе чытаў, як у падмаскоўным санаторыі паміраў Лахуці. Перад смерцю ён разгаварыўся. Доўга, выразна і зразумела, гаварыў ён нешта на фарсі, на сваёй роднай мове, але там не знайшлося ніводнага чалавека, які б зразумеў, пра што гаворыць, у чым спавядаецца, развітваючыся з жыццём, паэт.

«А хто прайшоў наш шлях,— назад не прыйдзе,
Няма ў каго спытаць, дзе лепей,— там ці тут».

Шуміць веснавы Варзоб,
бялеюць чысцюткія вяршыні Паміра, цвітуць гульбарфы і пахнуць такой жа свежасцю, як і пыркі ракі, як і сняжынкі вяршыняў,— яны сёстры, бо вада Варзоба — гэта тыя ж сняжынкі, толькі ўжо аблашчаныя сонцам.

Дык дзе ж яно, віно дружбы, сябры?
Дык за што?
Канечне ж, за гэтыя горы і за гэтыя гульбарфы!

Мы і самі не зломкі,
мы і самі сёе-тое можам, але ж давайце запросім за наш дастархан вялікіх — Рудакі і Хаяма, Хафіза і Джамі запросім.

«Віно — як вораг п'яніцу, з цвярозым дружыць
крута:
Не многа п'ём — лякарства ў ім, а многа п'ём—
атрута».

«Хутчэй віна сюды, не час цяпер для сну,
Я славіць ружамі грудзей хачу вясну,
Але я розуму, дакучліваму старцу,
Каб усыпіць яго, у твар віном ліну».

I ўжо:
«Глядзі, як паддаецца розум
Падману дочухны лазы!»
I ўжо:
«А можа, досыць, што ў мячэці
Не буду лашчыць я дзяўчат?!»
Ах, гэты Хафіз!
Ах, гэты багахульнік і жартаўнік!
«Кахаць красунь я не адмоўлюся
I піць віно, і піць віно».

Э не, гэта табе не Юсуф, народжаны Джамі.
Той, што ўцякаў, як вар'ят, ад Зулейхі,
якая аж пылала ад страсці і кахання:
«Яна яго жамчужыны хацела,
I ракавінай млела яе цела».

Э не, гэты не такі:
«Прыгажунь мы ўсіх паловім,
Перап'ём усё віно!»
«Хушамадзед»...

Мне чуецца гэтае запрашэнне як адно слова. Хоць у галаве ўжо іншыя словы, якія па-іншаму пачынаюць хваляваць і непакоіць:
«Да пабачэння!»

Віно развітання прыспешвае віно сустрэчы.
На сотні вярблюдаў вязу я табе захапленне табою.
Сустракай жа мой караван, каханая.
Цяпер ужо твае вочы — мае вочы.
Яны раскажуць, што адбылося ў нас за той час, пакуль я слухаў таямнічы Варзоб, любаваўся белымі, зманлівымі снежнікамі Паміра.

Час дадому...

Тым больш што гульбарфы, прынесеныя ў цудоўную гасцініцу, пастаўленыя ў шыкоўную вазу, завялі імгненна на вытанчаным стале. Іх, канечне ж, не трэба

разлучаць з гарамі. Яны павінны чуць шум
Варзоба, адчуваць пад сабою халадок каменя
і бачыць белыя вяршыні Паміра.
Гэта — абавязкова.
Як сонца і зямля — абавязкова.
Гэта іх жыццё і іх радасць.
Дык няхай жа вечна бялеюць незачэрненыя
вяршыні гор!
Няхай радасна блішчаць між цяснін чыстыя,
не спушчаныя на зямлю, азёры!
Няхай шуміць Варзоб
і цвітуць там, дзе яны ўзышлі, гульбарфы!
Дома сумуе чалавек па дарозе,
а ў дарозе — па дому.
Што ж,
«тую дарогу, па якой прайшоў ці праехаў,
з сабою не забярэш».
І яшчэ:
« — Які край самы прыгожы і самы лепшы?
— Той, дзе ты!
— Які горад самы цудоўны?
— Той, дзе ты!»
Добрай раніцы, родныя мае вочы...
Што тут у нас?

## Ахвярны двор

Усе мы госці на гэтай роднай зямлі.
Кожны чалавек нарадзіўся толькі для таго,
каб памерці.
Ужо нараджаючыся, мы паміраем: упершыню
ўдыхнуўшы паветра, мы выдыхаем
яго ў апошні раз.
Час хавае ў сабе і спеліць расстанне.
На вельмі кароткае імгненне з'яўляемся мы
ў гэты свет.
Дык навошта прывыкаць да яго так, як прывыкаем
мы да вечнасці?
Навошта нам гэтак прагна трымацца за тое,
што ўсё роўна неўзабаве, нібы чужую
цацку, давядзецца аддаваць?

Усе зважаюць на час, і толькі сам час ні на кога не зважае.

Усе мы лішнія тут?

А гэты свет — чужая цацка, і яна не для нас?

Не, няпраўда,— і не чужая, і менавіта для нас!

Усё, што пасеяў час,— узыходзіць.

І нараджаючыся, чалавек не памірае, а ўпарта жыве, бо паміж першым уздыхам і апошнім выдыхам — такая несхадзімая прастора, такое віраванне і такі шал жыцця, што мы паспяваем начыста забыцца, што свет не вечны, а мы — усяго толькі госці ў ім.

Не, не лішнія мы на зямлі!

І свет памірае для нас паасобку, бо ён памірае з кожным з нас.

Але ён вечны сам па сабе. І жыве пасля нас. І будзе жыць заўсёды. Разам з тымі, хто застаўся хваляваца на вечных скрзняках жыцця.

Так думалася ў самалёце над Арменіяй. Над Эчміядзінам думалася. Куды ўжо даўно прастуе мая душа па сваёй невідомай і нетаптанай сцежцы.

Хоць з вышыні і відаць столькі сцежак і дарог. Зверху ўсё здаецца відней. І ўсё хочацца паправіць.

Навошта, да прыкладу, вунь той дарожцы абгінаць лясок, калі можна прайсці прамей — вунь праз гэтае поле.

І чаму так пятляе рака — робіць столькі лішніх заваротаў, спяшаючыся да мора?

Не, гэта толькі душа імкнецца напрамкі, не зважаючы ні на горы, ні на моры, ні на перашкоды.

А дарога ці сцежка так сабе не робіцца.

Колькі людзі папаходзяць спачатку, папамераюць усюды зямлю нагамі, пакуль адважацца на дарогу, адважацца пачаць яе.

Дарогаю ўсё апраўдана і выверана — кожны яе паварот: калі яна абгінае лес —

значыць, так і трэба, значыць, па-іншаму ісці нельга.

Дарога — жывая, яна — для жыцця.

А мы часам не задумваючыся забіваем яе — колькі ў маёй Беларусі абыяка заарана дарог і сцяжын да мёртвых, неперспектыўных вёсак...

Хоць дарога і здаецца нам вечнаю і ўсёадольнаю.

Якой бы высокай ні была гара, яе ўсё роўна пераможа дарога — яна пройдзе па самай вяршыні.

Якой бы гразкаю, непраходнаю ні была нізіна, час і дарога перамогуць і яе — па твані і дрыгве пабяжыць гасцінец ці прасёлак.

Цікава, а ці круціцца яшчэ ў пройме кола самалёта?

Разагнанае зямлёю, яно, і ўзнесенае над ёю, доўга круцілася і ў небе, пакуль не схавалася за срабрыстымі створкамі пад крылом.

Самалёт ідзе на пасадку.

А ў гэты час аднекуль з паўночнага ўсходу, з далёкага ад Эчміядзіна сяла, што схавалася за рабрыстым Памбакскім хрыбтом, выходзіць дзядзька, руплівы дзядзька Ашот, з пеўнем пад пахаю і таксама кіруецца ў Эчміядзін.

Мы яшчэ не ведаем адзін аднаго, не ведаем, што сустрэнемся, але сустрэнемся абавязкова.

Ногі, канечне ж, не самалёт, але яны надзейней: з імі абавязкова прыйдзеш туды, куды задумаў.

Шкада, што на іх можна хадзіць толькі па зямлі. Цікава, ці круціцца яшчэ кола ў люку? А неба, канечне ж, толькі для птушак. І яшчэ для прыдуманых намі самалётаў. Але не для людзей. Чалавек чужы небу. Ён калі і дасягае неба, то толькі ў пазычанай у зямлі, украдзенай у зямлі герметычна закаркаванай прасторы паветра.

Неба — яно для нашага позірку. І для нашай думкі — знізу ўверх — таксама.

Думка знізу ўверх — адкрыццё неба.

Думка зверху ўніз — адкрыццё зямлі.

Мікаэл, сусед па крэсле, расказвае:

— Майго бацьку туркі забралі ў армію. Асталіся ў яго старыя бацькі, маладая жонка і малыя дзеці — аж сямёра. А тут пачалася разня. Бацька ўцёк спачатку ў Персію, затым пераехаў у Францыю. Там я і нарадзіўся. Бацьку зараз за дзевяноста гадоў. Мая маці ў бацькі ўжо другая жонка. А тую, першую сям'ю — усю парэзалі. У бацькі ў Арменіі аставаліся яшчэ двое братоў з сем'ямі. І іх таксама ўсіх...

Ці круціцца яшчэ кола?

А ў дзядзькі, што выходзіць з двара, пытаецца сусед:

— Куды сабраўся, Ашот?

— У Эчміядзін пайду, Карапет.

— А певень навошта?

— Ты ж ведаеш, што я пеўня паабяцаў Богу. Сказаў яму:

«Калі вернецца жывы і здаровы мой сынок, мой Гагік, з арміі, я ахвярую Усявышняму самага лепшага свайго пеўня». Сын, ты ж бачыў сам, вярнуўся яшчэ ўвосень, а ахвяраванне я, нягоднік, затрымаў. Зіма ж ужо, бачыш...

Язычніцтва гэта, але што ж зробіш, калі яно дружыць і з праваслаўным Ашотам.

Жыццё дорыць чалавеку не толькі гора, але і радасць.

Адкрыліся проймы, і з іх зноў выкаціліся колы.

Яны, здаецца, яшчэ круціліся.

Ці то ад таго, як узляталі, не спыніліся, ці то закруціліся ўжо зараз — ад прагі, нецярплівасці хутчэй сустрэцца з цвёрдай зямлёю, хутчэй дакрануцца да яе.

Неба, канечне, для самалётаў, але зямля ўсё ж надзейней. І нагам, і колам на ёй спакайней.

Дзень добры, старажытная зямля!

Зямля Месропа Маштоца, вялікага азбукатворцы, на якога моляцца армяне, бо стварыць азбуку — гэта тое ж самае, што стварыць дзяржаву: была б толькі азбука, а дзяржава знойдзецца!

Зямля векапомных камянёў і мудрых кніг!

Камяні часам бунтавалі, а кнігі запаміналі гэта.

Матэнадаран — сховішча старажытных рукапісаў — усё помніць: у ім спрасаваўся час, спрасавалася вечнасць.

Той час, які ніколі не спыняецца.

Той час, які ніколі не нараджаецца і ніколі не памірае, нідзе не пачынаецца і нідзе не канчаецца.

Старажытныя летапісы, увабраўшы час, расказваюць, як раззлаваліся самі па сабе камяні ў Аюдзоры ў восьмым стагоддзі; як магутны землятрус разбурыў горад Дзвін у дзевятым стагоддзі;

як у дзесятым стагоддзі абараняўся ад ашалелых камянёў Звартноц, але так і не змог абараніцца;

як у чатырнаццатым стагоддзі ў руіны ператварыўся Татырскі манастыр з універсітэтам Ані, а пасля рассыпалася і сама сталіца старажытнай Арменіі; як у семнаццатым стагоддзі падземны грымак разбурыў язычніцкі храм Гарні...

«Каменне ўпала на нашы галовы»,— ва ўсе часы ўздыхалі каля руін армянскія старыя — і мудрацы, і звычайныя людзі.

Не паспееш абжыцца, а ўжо трэба пакідаць абжытае.

Не паспееш паставіць хату, а ўжо трэба разбіраць яе.

Не паспееш пасадзіць сад, а ўжо трэба яго выкарчоўваць, каб забраць з сабою.

Амаль паўтары тысячы разоў за паўтары тысячы гадоў нашай эры камяні землятрусу падалі на галовы армян.

Колькі ж армян засталося пад гэтымі камянямі?!

А яшчэ кажуць: «Камяні — гэта дзеці землятрусаў...»
Дык якія ж гэта дзеці, калі яны разбойнікі?!
Хаця — усё правільна: якія бацькі, такія і дзеці.
Ад землятрусу і павінен нарадзіцца нягоднік.
«Пайду-ткі я напрасткі»,— думае Ашот.
А напрасткі — гэта не заўсёды прама. І не заўсёды па дарозе. Часцей за ўсё — не па дарозе.
Не па дарозе нагам, затое па дарозе сэрцу.
«Ага, пайду напрасткі,— згаджаецца сам з сабою Ашот.— Няхай мяне вядзе ў Эчміядзін душа, а не ногі. І няхай павадыром мне, як і ўсім армянам, будзе наш святы Арарат — гара, якая відна кожнаму армяніну з кожнага кутка Арменіі — з узгорка і з лагчыны, з хаты і з высотніка».
Гара, якая здаецца самаю высокаю ў свеце: яе ж не затапілі нават раз'юшаныя воды сусветнага патопу.
Гара, з якой пасля патопу разляцеліся па ўсім свеце птушкі, разышліся жывёлы, распаўзліся змеі, рассяліліся людзі.
Гара, якую відаць, хоць яна і не бачна.
Гара, якая за стагоддзі стала зоркаю.
Пуцяводнаю.
А па дарозе, думае, я, канечне ж, на Севан зайду, пастаю там над святою, абмялелаю вадою, пацепаюся ў халодных, такіх густых і кудлатых воблаках — яны будуць плысці па маіх нагах, намотвацца будуць на рукі, казытаць будуць мне твар.
У Сардарабад зайду.
Пакланюся там нізка каменным быкам, якія, наставіўшы рогі, гатовы з гонарам сустрэць любую небяспеку, што можа здарыцца на армянскай зямлі.
І Звартноц, вядома ж, не абміну.
Ён па дарозе — і душы, і нагам па дарозе.

Там храм урарцийскіх ахвярапрынашэнняў быў.

Язычніцкія храмы пасля таго, як армяне згадзіліся стаць хрысціянамі, разбураліся паўсюль. А гэты — стаяў. Чатыры стагоддзі яшчэ стаяў. Нават каталікос баяўся разбураць. Вельмі многа яшчэ язычнікаў было ў Арменіі.

А ўсё ж разбурылі, а на месцы яго царкву пабудавалі. На падмурку урарцийскага храма паставілі.

Торас Тараманян усё сваё жыццё прысвяціў гэтаму храму. Усё даказваў яго форму. А памёр — разабраліся: і праўда, форма такая, якой і ўяўляў яе Тараманян.

А я яшчэ забягу ў Лондан, заскочу ў Парыж, а можа, і ў Нью-Йорку пабуду.

Каб родзічаў і землякоў там пабачыць.

Нагам, праўда, гэта далёка, а вачам — блізка.

Чалавек ідзе далёка, а яго душа ідзе яшчэ далей.

Чалавек залежыць ад дарогі, а душа ні ад кога і ні ад чога не залежыць. Яна вольная.

І на зямлі, і на небе вольная.

Сто пар чаравікаў стопча дзядзька Ашот, пакуль дойдзе да Эчміядзіна.

А я — нічога не стаптаў. Самалёт абутак шануе — нічога ў крэсле не рвецца, нічога ў лёце не носіцца.

Толькі што быў у Мінску, а ўжо ў Эчміядзіне.

Эчміядзін — сталіца армянскай веры.

Для армянскай апостальскай царквы гэта як Арарат — з усяго свету глядзяць набожныя і ненабожныя армяне ў бок Эчміядзіна.

Царква святога Карапета.

Васковая свечка і звычайны крыжык няхай будуць мне самым дарагім сувенірам з Эчміядзіна.

Эчміядзінскі храм — гістарычны. Ён першы хрысціянскі храм на тэрыторыі нашай краіны.

Зноў музей. А ў ім кнігі. Тыя, што ведаюць і помняць усё.

Дарэчы, а як дарага каштуе чалавечае жыццё?

Яно унікальнае і бясцэннае — няма такой меркі, якою можна было б вымераць каштоўнасць чалавечага жыцця.

Тым больш — няма такіх каштоўнасцей, за якія б можна было купіць чалавечае жыццё.

І ўсё ж чалавечае жыццё часам можа каштаваць усяго толькі пяць кніг.

Усяго толькі? Цэлых пяць кніг!

Купіць жыццё ні за якія скарбы нельга, а вось аддаць яго за каштоўнасці — можна.

Пяць кніг перапісала за сваё жыццё манашка Маргарыта Алексанян — на кожную з іх адшкадавала па пяць сваіх год.

Пятую не паспела дапісаць, аслепла — працавала ж кожны дзень пры свечках, а гэта, самі ведаеце, якая тонкая і ўважлівая работа.

«Рука мая знікне, а напісанае мною, застанецца».

Трон вярхоўнага патрыярха і каталікоса ўсіх армян Вазгена Першага.

Перламутравы і недасяжны.

Алтар з ружовага, як узыход сонца, мармуру, які нарадзіўся, дарэчы, у Італіі.

Люстры з чэшскага шкла.

На мармуры, прыгожым і таямнічым, малюнкі — яшчэ больш прыгожыя і таямнічыя.

На галаве ў Яго Святасці — чорная накідка, нібы чорны мяшок з крыжам — ён нібы чорная харугва спадае на плечы.

На шыі — знак на ланцужку з выяваю немаўляці; якраз такога, кажуць, знайшлі пасля чарговага землятрусу: як купалі ў ванне, так і ляжыць — маці раздушана, вада раздушана, зледзянела, а яно

ляжыць у адубелай вадзе і толькі ножкамі сучыць.

Сівая барада і мудрыя ад тугі і роздуму вочы. Ад чакання бяды і радасці аднachасова.

Любой радасці Яго Святасць радуецца разам з народам, у любой бядзе імкнецца супакоіць народ.

«Пасля малітвы і жалобы павернем нашы твары да ашаломленага трывогаю народа і да нашых разбураных гарадоў, са скрухаю і смуткам у сэрцы, але без адчаю, не адчуваючы сябе пераможанымі. Са светлаю вераю, нязломным духам, моцнымі рукамі стойка прымем наш лёс, мужна выцерпім любыя выпрабаванні... Менавіта ў такія хвіліны народы могуць даказаць сваю дабрачынную сутнасць, сілу самаахвярнасці, сапраўдную любоў да Радзімы».

А як інакш скажаш, калі раптам звар'яцеюць камяні?!

Калі пачнуць стагнаць першыя параненыя — без вайны?

Калі аціхнуць забітыя — у мірны час?

— Ай-яй-яй, што ж гэта ты, нягоднік, робіш?! — пляснуў даланёю аб далонь — шорсткаю аб мазольную — дзядзька Ашот.

Певень, як і зняволены чалавек, таемна разбарсаў за дарогу шнуркі, развязаў-вызваліў ногі і, вырваўшыся з дзядзькавых рук, паімчаўся як дуж па дарозе, валакучы за сабою вяроўку.

Але паімчаўся не ў Эчміядзін, а назад паімчаўся, за Памбакскі хрыбет пабег — дадому.

Нібы душою адчуў: Эчміядзін блізка.

Нібы сэрцам зразумеў: ахвяравальны двор побач ужо.

А каму, якой ахвяры, скажыце, хочацца хутчэй на той ахвяравальны двор, на тыя ахвяравальныя камяні?

Калі норкі ў Беларусі адчулі, што іх гадуюць не на жыццё, а на каўняры, яны палічылі за лепшае самагубства.

Калі кіпарысы ў Танзаніі зразумелі, што іх гадуюць на драўніну, на знішчэнне, яны самі пачалі ўсыхаць. Ад вярхушак да каранёў.

Кажуць, на кіпарысы напаў нейкі мор, нейкая чума, а мне здаецца, што гэта таксама самазабойства.

Калі норкі ведаюць, што іх будуць забіваць,— гінуць.

Калі кіпарысы ведаюць, што іх будуць зразаць,— таксама гінуць, паміраюць самі.

А певень бяжыць назад, за Памбакскі хрыбет — абы далей ад зненавіднага ахвяравальнага каменя.

А за ім бяжыць і дзядзька Ашот.

І злуецца: «Ну і сілы ж сабраў у мяне падпахаю, нягоднік,— не дагнаць».

І сам сябе ўшчувае: «А які ж ён нягоднік — яму ж проста дамоў хочацца».

І шкада яму пеўня — самага прыгожага і галасістага ў сяле.

Але што зробіш: паабяцаў Богу.

Вунь Гагік ужо і адпачыў пасля арміі, ужо і ў школе настаўнікам працуе, а ён пеўня яшчэ не аддаў.

Добра, што вяровачка па зямлі валачэцца — з вяровачкаю далёка не ўцячэш.

Дагнаў дзядзька Ашот вяровачку, наступіў на яе, а пасля ўжо і самога пеўня дагнаў.

«Куды ты ўцякаеш, харашун?»

Маўчыць певень. Толькі цяжка дыхае і глядзіць на дзядзьку сваім круглым чырвоным вокам.

Цяжка дыхае певень, цяжка дыхае і дзядзька Ашот...

— Слухай, ты не хочаш зірнуць на наш ахвяравальны двор? — пытаюцца армянскія сябры.— Успомніць сваё язычніцтва?

Вядома ж, хачу!

Я і сам пакланяюся Богу — таму, што ў нас і вакол нас, таму, што ёсць ісціна і ёсць парадак, таму, што ёсць камень і ёсць вада, сонца і трава, дрэва і біяполе, слова і думка.

Цесны двор за храмам і царквою, за апартаментамі каталікоса.

— Дзень добры, дзядзька Ашот! Вы ўжо тут?

Ага, ногі, я ж казаў, зручней за самалёт. Таму, што яны служаць зямлі, а не небу. Ногі, значыць, і самалёт перагнаць могуць.

Стаіць дзядзька з пеўнем падпахаю і не ведае, што рабіць.

Вяровачка з пеўневай нагі да самай зямлі звісае, пыл з дзядзькавых чаравікаў змятае.

Тут ужо многія працуюць: хто авечачку асвяжоўвае, хто нават цялятка не пашкадаваў, аджалеў, а дзядзька з пеўнем стаіць і не ведае, як абысціся: не можа ён зарэзаць свайго пеўня, хоць плач — дома на гэтую справу ён заўсёды ўгаворвае свайго суседа Карапета.

Але свет не без добрых людзей — і тут знаходзяцца памочнікі.

Калі яны руйнуюць пеўня, дзядзька Ашот толькі адварочваецца — самы ж прыгожы за ўсім Памбакскім хрыбтом певень быў, сама голасна ў тым баку ён пяяў.

Свяжуем дзядзькавага пеўня, варым яго ў самым вялізным чане — меншыя ўсе занятыя.

Прыходзьце, убогія і калекі, прыходзьце, бяздомныя і няшчасныя, прыходзьце, уніжаныя і адрынутыя, прыходзьце ўсе, хто халодны і галодны, прыходзьце есці з намі дзядзькавага пеўня.

Дарагі быў Ашоту певень, але яшчэ даражэйшы яму сынок Гагік — ён шчасліва адслужыў у войску, шчасліва вярнуўся з арміі — і зараз дзядзька Ашот аддае Богу Богава.

«Дзякуй, Божа, што ты захаваў мне сына»...
Ядзім дзядзькавага пеўня — аблашчаныя і недарэкі, пры пасадах і беспрацоўныя, пры гальштуках і ў лахманах,— і думаем пра дабрату і міласэрнасць.
Няхай не паміраюць у мірны час людзі!
Няхай і ў ваенны не паміраюць, бо ваеннага часу не павінна быць на зямлі.
І вось ужо мне час развітвацца з дзядзькам Ашотам.
Мне — на самалёт, яму — зноў на ногі.
Мне — на неба, яму — зноў на зямлю: з зямлі і на зямлю, значыць.
І тут зноў звар'яцелі камяні.
Жыццё дорыць чалавеку не толькі радасць, але і гора.
Абваліліся, аселі гарады Ленінакан, Кіравакан, Спітак.
Абвалілася і сяло дзядзькі Ашота — нікога ў ім не засталося.
Ні чалавека, ні пеўня.
Абвалілася і школка, дзе прывыкаў ужо да радаснай працы Гагік, і пад яе руінамі назаўсёды застаўся разам з дзецьмі і настаўнік.
Гагік, які шчасліва вярнуўся з войска...
«Зноў каменне ўпала на нашы галовы!» — як звар'яцелы, закрычаў асірацелы дзядзька Ашот.
Ты чытала, мая зажураная, пра гэта ў газетах?
«Жахлівае землетрасенне абрынулася на Арменію».
«Калі адкапалі аднаго чалавека ў Спітаку, ён падняў рукі ўгору — думаў, што пачалася вайна, і іншаземных выратавальнікаў прыняў за акупацыйныя войскі».
«Гляджу, аж гэта гарыць мой брат. Цела яго гарыць. Я цягну яго, а ён, нежывы, гарыць».
«Выратавальнік з Беларусі. Убачыў, як паднялі пліту, раздушаных маці з дзецьмі, і тут жа ўпаў мёртвы: разрыў сэрца».
«Каменне ўпала на нашы галовы».

Гул самалётаў не сціхае над Ерэванам: гэта свет гаворыць з журботнай Арменіяй.

А пад гэты трывожны гул Яго Святасць каталікос усіх армян думае, як супакоіць Ашота і натхніць на жыццё свой разгублены ад гора народ.

## Одзіум

Ойча наш, калі ты ёсць на нябёсах!

Два браты і сястра з нетутэйшымі імёнамі — Катаклізм, Апакаліпсіс і Катастрофа — нецярпліва, прагна ўглядаюцца ў тутэйшую зямлю і ласкава гладзяць па раскудлачаных валасах сваю нашчадніцу, спадкаемніцу, якая, ці чуеце, мае такое ўжо тутэйшае імя — Бяда.

А цялятка было такое чысценькае.

А траўка, на якой яно падбрыквала, такая зялёненькая.

А сонейка, якое спяліла іх, такое ласкавае.

А ветрык, які гуляў з цяляткам, такі ўжо ахайны.

А кароўка Святоха, ад якой яно нарадзілася, такая здаровенькая.

А яны яго не прымаюць — кажуць, што цялятка бруднае.

«Самі вы брудныя, нячысцікі,— злуецца бабка Параска.— І душою, і целам брудныя».

Цялятка ж было такое харошае.

І траўка была такая чысценькая.

І сонца было такое шчырае.

Дык што ж тады, людцы, здарылася?!

Хіба чыстая вада можа быць бруднаю?

Хіба чыстая трава можа быць нячыстаю?

Хіба цялятка можа быць забруджаным, калі яно п'е чыстую вадзіцу і скубе чыстую травіцу?

Чарнобыль.

Чорнае слова, як чорнае сонца, бязлітасна ўскацілася на беларускі небасхіл.

Яно, нібы чорнае зацьменне, усё пачарніла — і зялёную траву, і празрыстую ваду, і блакітнае неба.

Трава зелянее, але яна чорная.

Вада свіціцца аж да дна, але яна чорная.

Неба блакітнае, але і яно чорнае.

Здаецца, нават жудаваты ветрык і халадок, як пры зацьменні, пайшоў па зямлі.

Птушкі, здаецца, змоўклі, куры, каровы і коні пачалі трывожыцца.

І зарыва ад зацьмення ўспыхнула не такое, як звычайна — яно было чорнае, з чорнымі сполахамі і пратуберанцамі, хоць само свяцілася і ззяла.

Чорная быль — Чарнобыль.

Чорны баль — Чарнобаль.

Чорная бель — Чарнобель.

Чорны боль — Чарноболь.

Усё, з чым дружыў чалавек і што дружыла з чалавекам, пасварыў Чарнобыль.

Зараз усё забаронена — сунічка і рамонак, баравічок і шчаўлінка, яблык і крынічка, хата і расіна, ніва і ялінка забаронены.

Усё з сяброў ператварылася ў ворагаў.

Усё з ласкадаўцаў, абаронцаў, карміцеляў пераўвярнулася ў забойцаў.

Стаіць дрэва і не ведае, навошта яно стаіць.

Цячэ рэчка і не ведае, навошта яна цячэ.

Узыходзіць рунь і не ведае, навошта яна ўзыходзіць.

Дзеці спрадвек радаваліся яблыку, а зараз яго трэба баяцца: гэты зманлівы чырванашчокі ласунак, заўсёдная ўцеха малых,— ужо вораг дзяцей, і яго нельга есці.

І вось гэты беленькі цёпленькі, смачненькі сырадойчык, які здавён лячыў усе хваробы,— ужо забойца дзяцей, і яго нельга піць.

І вось гэты вусаценькі шматрадковы каласок — атамная бомба з трыццаццю бое-

галоўкамі-зярнятамі, і яго нельга браць у рукі.

Раней мы стыдаліся, стараніліся такіх нязвыклых слоў, як цэзій, бэр, нукліды, мілірады, празеадым...

Яны абыходзілі нас, а мы абыходзілі іх — думалі, што нашы лёсы ніколі не пераскрыжуюцца.

А зараз усе гэтыя словы папрыклейваліся назаўсёды да нашых вуснаў: стронцый, кюры, дазіметр, плутоній, ізатопы, рутэній, мілірэнтгены, радыяцыя...

«Усё лета я хаваўся ад радыяцыі»,— хваліцца хлопчык з той страшнай зоны, бо пакуль яшчэ не ведае, што схавацца ад радыяцыі нельга.

«Доктар сказаў, што ў мяне дужа многа радыяцыі»,— сумуе дзяўчынка з той жа самай зоны, бо ўжо ведае: тое, што з ёй, з ёй назаўсёды — радыяцыя не прастуда, яна не выводзіцца.

«Бабулечка, родненькая мая, я так хачу да цябе ў вёску, але напішы мне, калі ж ты выганіш са свае хатачкі радыяцыю?!» — рыдае малое, бо здагадваецца: не бабулечка выгане радыяцыю, а радыяцыя выгане бабулечку з хаты.

Бо гаспадыняю ў хаце ўжо не бабулечка, а радыяцыя.

Атамнікі пасварылі чалавека з усёю прыродаю.

З жывою і мёртваю пасварылі.

І нават жывую прыроду зрабілі мёртваю.

Чыстае зрабілі брудным.

І зараз патрабуюць ад нас:

Жыць ля вады і не мець вады.

Спяліць яблыкі і не есці іх.

Бачыць траву і не хадзіць па ёй.

Жыць ля хлеба і быць без хлеба...

На лавачку каля хаты не садзіся.

А дзе сядзець?

Па зямлі не хадзі.

А дзе хадзіць?

Усё мае сваю мяжу, і толькі цярпенне наша, о Божа, бязмежнае!

Хай свяціцца імя Тваё, хай прыйдзе Царства Тваё, хай будзе воля Твая.

Брудная зямля, брудная вада, бруднае паветра, бруднае малако...

Божа наш літасцівы, вярні ранейшае значэнне гэтым спрадвечным паняццям!

Каб бруднаю зямлёю для нас была толькі раскаўзаная ў гразь дарога.

Каб брудным малаком, як і раней, было толькі малако з бяскрыўднаю крыхою гною, што знячэўку ўвалілася ў дайніцу.

Была, ці чуеце, вёска, а стала зона адсялення.

Было поле, а стала зона адчужэння.

Быў лес, а стала зона пастаяннага радыяцыйнага кантролю.

Былі грады, а стала зона перыядычнага дазіметрычнага кантролю.

Была пчала — пацешная такая, выпацканая ўся ў жоўты дзьмухаўцовы пылок, а стала маленька-вялікаю атамнаю бомбаю.

Было семка, якое хацела зазямліцца і прарасці, ды раптам нечакана для сябе стала неўтаймоўным рэактарам.

Пятая частка зямлі маёй сёння за калючым дротам.

Яна памерла жывая. І жыве мёртвая. У мёртвай зоне.

Высозныя тэрыконы змагіленай зямлі, звезенай з радыяцыйных палёў і вуліц, зямлі, якая пачала ўжо зарастаць мёртва-зялёнаю травою.

Усюды надпісы:

«Не піць! Забруджана!»

«Не есці! Небяспечна!»

«Не хадзіць! Заражона!»

«Стой! Страляць буду!»

Такога надпісу няма, але ён маецца на ўвазе.

Зона. Агароджаныя калючым дротам нівы і паплавы, лясы і сцяжынкі, крыніцы і дарогі, хаты і рэчкі.

Ягады і грыбы, промні і слёзы, трава і вераб'і адгароджаныя.

Світанкі і вечаровыя прыцемкі адгароджаныя.

Дажджы і туманы, прарослыя высокай адчужанаю травою, адгароджаныя.

Ад жыцця адгароджаныя: каб не выпусціць нікога і нічога адсюль.

Каб лугі не выйшлі адсюль, каб палі не выйшлі адсюль, каб пакінутыя хаты, трактары і калодзежы ніколі не выйшлі на чыстую зямлю.

Каб пудзілы назаўсёды засталіся тут — гэта ж столькі гадоў яны ўпарта махаюць сатлелым ашмоццем, адганяючы птушак, якіх няма, ад градаў, якіх таксама няма...

І як, вы думаеце, усё гэта называецца зараз?

Палескі дзяржаўны экалагічны запаведнік!

Смяюцца з нас, здзекуюцца ці пацяшаюцца з хворай зямлі, нячысцікі?!

У зямлі такая рана, а яе не відаць.

Так яна рэнтгенаточыць-крывавіць, а бачыць гэта, выходзіць, не кожны.

Перагукваюцца ў зоне, але не людзі, а вятры.

Шчабечуць у зоне, але не птушкі, а дазіметры.

Ламаецца гук, ламаецца вецер, ламаецца сонечны промень, ламаецца слова.

Нібы на якую невідомую перашкоду наткнуўшыся, ламаюцца...

Баімся зямлі, баімся вады, баімся паветра...

Як на нябёсах, так і на зямлі.

Колькі дзён пад час аварыі чарнобыльскія вятры дзьмулі на Беларусь.

На Брагінскі, Нараўлянскі і Хойніцкі раёны дзьмулі.

І нават на мой зубрэвіцкі лес дзьмулі, які шуміць так далёка ад Чарнобыля: у ім нельга збіраць грыбы.

І гэта, як кажуць, у самай чыстай на Беларусі Віцебскай вобласці...

Плылі, здавалася, звычайныя аблокі, але з іх сеяліся незвычайныя дажджы.

І была спакуса, і хацелася прасіць вецер: — Адпіхні, вецер, ад мае зямлі гэтае стронцыева-цэзіева воблака... Падзьмі куды-небудзь, вецер...

А куды яму дзьмуць, гэтаму ветру?

Усюды ж людзі...

А можа, у бок тых атамаманаў, якія і нарабілі гэтае ліха?

Толькі іх, шэльмаў, не адшукаеш. Бо яны невідзімкі. Яны ёсць, і іх няма. Пазашываліся, як тараканы, ў шчыліны і адтуль крычаць: «радыяфобы!», «радыяфобія!»

А пра тое, што самі «падверглі атамнай бамбардзіроўцы» Беларусь і Украіну, маўчаць.

А што зямлю забілі, таксама маўчаць.

Вецер, піхні ў іхні бок іх жа «мірны» атам, іхняе стронцыева-цэзіевае воблака!

Не, не дастане яно іх, не пральецца такім жаданым для вучоных невукаў, такім светла-чорным дажджом.

Ніякая хмара іх, нягоднікаў, не дастане.

Ніхто і ніколі іх, сытамордзенькіх, не дастане: яны, нібы тыя кашчэі,— несмяротныя.

Засудзіць такі пад смерць зусім невінаватага чалавека і не адказвае за гэта.

Зашые скальпель у жываце хворага — і не адказвае.

Зробіць Чарнобыль — і хоць бы што. А то яшчэ і медаль за гэта пачэпіць.

Каля сотні ордэнаў упрыгожылі доблесназлачынныя грудзі будаўнікоў Чарнобыльскай АЭС.

Планы былі велічныя, а справы сталі велішныя.

Плацяць звычайна зусім не тыя, хто вінаваты.

Сэрцы вінаватых за Чарнобыль, здаецца, абраслі поўсцю, яны адно толькі пацяшаюцца з нас.

Пра разумных людзей як пра дурняў гавораць, а дурняў разумнымі абражаюць.

Хто бачыць і крычыць, той для іх радыяфоб, а той, хто бачыць і маўчыць,— разумненькі-разумненькі.

Гэта яны не адмянілі дэманстрацый у райцэнтрах — пад самым бокам у звар'яцелага рэактара. Падумаеш, маўляў, дзеля пасяўной не адмянялі, а з-за нейкай там радыяцыі адмяняць будзем!

Дзеткі шчыра, старанна падмялі радыеактыўныя вуліцы і плошчы.

Самі надыхаліся радыеактыўным пылам, але ж мільярды партатыўных рэактараў асталося на зямлі, і па іх, па самыя калені ў ізатопах, шчыра маршыравалі ўжо разам — і дзеці і дарослыя — і шчасліва крычалі «ўра!».

Дарэчы, а што мы выпрацоўваем, што гадуем на плошчах і дэманстрацыях?

Нікому непатрэбны прадукт, які вельмі хутка псуецца,— ура!

Ура ў тысячах дэцыбелаў, ад якіх аж закладае вушы.

Вось і «вытвараем» на радыяцыйных плошчах радыяцыйнае «ўра!».

Вось і сеем радыяцыйнае насенне ў радыяцыйную зямлю. І заворваем радыяцыйнымі плугамі. І лашчым, і спялім радыяцыйнымі рукамі.

На хворай зямлі перавыконваем здаровабязглуздыя планы, бо хіба можна на бруднай зямлі выспеліць чысты колас?!

Хлеб наш надзённы, дай нам днесь...

А бабуля Параска не верыць у забруджванне. І ўсё здзіўляецца: «Дык якое ж яно бруднае, калі яно такое чыстае?»

Хіба чыстая вада можа быць бруднаю?
Хіба чыстая трава можа быць бруднаю?
Хіба цялятка, якое і ела і піло толькі ўсё чысценькае, можа быць бруднае?
А яны, нячысцікі, не бяруць яго.

У калгасаў бяруць, у саўгасаў бяруць, у комплексаў жывёлагадоўчых бяруць тысячамі, а ў яе не бяруць.

Бабка Параска думае, што ёй рабіць са сваім чысценькім радыяцыйным цяляткам, а ўсе мы жнём і сеем, косім і веем, спім і ядзім побач з мільёнамі нязвычных рэактараў, якія раптоўна пачалі пульсаваць на Беларусі.

Бо звычайная птушка з зоны — гэта ўжо рэактар. Няма калючага дроту для крыл, як няма агароджы для выпраменьвання: радыенукліды таксама, паганцы, крылатыя.

А колькі такіх птушак разляцелася па ўсёй Беларусі!

І звычайная сялянская печ — таксама рэактар: яна спажывае радыеактыўнае паліва — звычайныя дровы са звычайнага лесу.

Хоць вучоныя і раяць перад тым, як спальваць радыеактыўныя дровы, мыць іх вадою,— беражы нас, Божа, і ад гэтакіх дроў, і ад гэтакіх вучоных!

А колькі такіх печаў ціхамірна вараць і пякуць, смажаць і грэюць па ўсёй Беларусі!

Усё зараз можа быць рэактарам: і копка сена, далёкая ад зоны,— рэактар; і дрэва, якое жыве тут спрадвеку і нікуды ад гэтых мясцін не адыходзілася,— таксама рэактар.

Карова — рэактар, сцежка — рэактар, і нават кучка памёту ад бабкіпарасчынага цялятка — зноў жа небяспечны рэактар.

І чалавек абпраменены — рэактар.

Асабліва моцны гэты рэактар, калі чалавек памёр ад прамянёвай хваробы.

Чалавек мёртвы, а рэактар жывы: на тысячу гадоў яго хопіць.

Колькі здаровых людзей ён можа зрабіць хворымі, жывых — мёртвымі.

Таму жывыя і задумваюцца, як пахаваць мёртвых — радыеактыўныя адыходы,

што нядаўна былі чалавекам: цынкавай труны нябожчыкам ужо мала, ім трэба браніраваная.

І магілкі такія трэба ўжо на картах пазначаць, як месца захавання радыеактыўных адыходаў.

Жывая зямля прымае хворых на радыяцыю людзей і сама становіцца мёртваю.

Хворая зямля забірае здаровых людзей, але сама ад гэтага не здаравее.

Каму зажадалася забіць здаровую зямлю, пасеяць на ёй мёртвае?!

Два браты і сястра з нетутэйшымі імёнамі — Катаклізм, Апакаліпсіс і Катастрофа — тройца, але не святая, а клятая,— нахабна шыбуюць па тутэйшай зямлі і вучаць сваёй чорнай, д'ябальскай працы сваю нашчадніцу з такім ужо, ці чуеце, тутэйшым імем — Бяда...

На картах радыяцыйнай абстаноўкі палова Беларусі заштрыхавана, закрэслена.

А ўся — забруджана.

Мы ж доўгі час рабілі выгляд, што нічога не здарылася.

Хатынь сабрала пад сваё неба чатыры сотні знішчаных вайною вёсак.

А колькі мёртвых, хоць і ацалелых, вёсак забярэ без вайны, праглыне Чарнобыль?

2670 вёсак і 27 гарадоў знаходзіцца сёння на забруджанай зямлі...

А ў іх жыве і на штосьці спадзяецца 2 мільёны чалавек, сярод якіх — столькі дзяцей!

Быў — кожны чацвёрты, зараз — кожны пяты.

Мы ўсюды і ва ўсім спяшаліся быць першымі: першымі жадалі прыбегчы ў камунізм, першымі выракліся роднай мовы...

А сёння мы першыя яшчэ і па радыяцыі.

Радуйцеся, нявернікі: на сто гектараў сельгасугоддзяў па нуклідах ніхто нас не можа перагнаць!

Чорна на душы, як на тых чорных плакатах, што чарнелі на мітынгу:

«А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.
А што яны нясуць на сваіх плячах?
— Радыяцыю»...

Ах, дзядзька Янка! Зажураны, засмучаны дзядзька Янка! І вы, выходзіць, гаруеце разам з намі на чарнобыльскім мітынгу...

Кажуць, Чарнобыль — гэта дзесяць такіх бомбаў, што скінута на Хірасіму.

Кажуць, сем з іх упала на Беларусь.

У Японіі ёсць ахвяры атамнай бамбардзіроўкі.

А ў Беларусі іх няма.

У Японіі ёсць хібакусі — людзі, якія былі ці маглі быць у зоне атамнай бамбардзіроўкі.

А ў Беларусі — няма хібакусі.

У Японіі хібакусі жэняцца толькі паміж сабою — каб аберагчыся ад мутацый.

У Беларусі як хто хоча, так і жэніцца.

Мы не баімся мутацый, бо ўсе мы — хібакусі.

З'езд шуміць — народныя дэпутаты спаборнічаюць у красамоўстве.

А мы сеем на мёртвых землях мёртвым насеннем.

Чыноўнікі хваляцца аб перавыкананні планаў па галоснасці на сто гектараў усё тых жа сельгасугоддзяў.

А мы здымаем мёртвыя ўраджаі.

І ўсё імкнёмся схаваць, засакрэціць — каб, крый Бог, не дазнаўся хто пра гэта.

Медыкі павінны крычаць, бо яны ўсё ведаюць.

Медыкі маўчаць, быццам яны нічога не ведаюць.

Маўчаць прыдворна-атамныя акадэмікі — усе, як пудзілы, у ордэнах, маўчаць чыноўнікі — усе ў балбатні, маўчаць медыкі — усе ў бессаромнай ілжы.

Калі нехта гаворыць праўду пра нашу бяду, рассакрэчвае нашу дурноту,— мы

злуемся і лямантуем, што ён робіць шкоду роднай уладзе.

А той, хто ўзарваў над Беларуссю, Украінай і Расіяй столькі атамных бомбаў,— ніякай шкоды ніякай уладзе не зрабіў.

Аказваецца, не той небяспечны, хто шкодзіць.

А той, хто рассакрэчвае гэта.

Семдзесят гадоў жылі мы ў падмане, але і тое, пра што гаворым сёння, падман ёсць.

Стронцыева-цэзіевае воблака плыве на Маскву.

Усе на абарону горада — не падпусціць яго да сталіцы!

І вось

вайны няма, а гарматы страляюць,

навальніцы няма, а грыміць,

хмара не дажджавая, а дождж ідзе...

І вось

стронцыева-цэзіевае воблака ўжо не ў небе, а на зямлі.

І яно ўжо не плыве, а ляжыць. Ці, як кажуць дасведчаныя, сядзіць.

Яго «пасадзілі» на Магілёўшчыну зенітчыкі.

На Маскву нельга.

На Слаўгарад — можна.

Тры гады хавалі Магілёўшчыну ад людзей.

А на Магілёўшчыне радыяцыя большая, як у самім Чарнобылі: аж да ста кюры ўвабралі ў сябе лугі і нівы, хоць зямля, кажуць, можа трываць толькі пятнаццаць...

Там нельга жыць і апрацоўваць зямлю.

Там жывуць і апрацоўваюць зямлю.

Жыць нельга, а жывём.

Есці нельга, а ядзім.

Маўчаць нельга, а маўчым.

Горш таго — гаворым!

І што гаворым?

«Мы справімся сваімі сіламі».

«Нам не трэба ніякай дапамогі».

І што гавораць нам?

«Вы нахабнікі. Вы на Чарнобылі хочаце пагрэць рукі. Мы вам і так ужо многа далі».

Хіба можна многа даць народу, які гіне?!

Яму трэба даць толькі столькі, колькі трэба, каб не памёр!

Не мы ж самі ўчынілі на сваёй зямлі гэтую бяду — нам падарылі яе ліхадзеі.

«Неба круглае, а зямля квадратная» — так хочацца крыкнуць, успомніўшы, як часам лаяліся ў старажытным Кітаі.

І пакінь нам даўгі нашы, гэтак жа, і мы пакідаем даўжнікам нашым.

Беларусаў не трэба вучыць спагадзе: яны самі ведаюць, што значыць спачуванне і міласэрнасць.

У раёнах, зруйнаваных землетрасеннем, мы будуем беларускія пасёлкі.

А са сваіх раёнаў, што знебыліся ад радыяцыі, не можам перасяліць людзей — няма ні сіл, ні сродкаў.

Гомельшчына збірае грошы для чарнобыльцаў.

І разгублена глядзіць, як у сваіх вёсках імкліва набіраюць звышлімітныя бэры, глытаюць нукліды нічым не абароненыя ад злыбяды людзі.

Дзякуй табе, родны мой народ, за дабрыню, за міласэрнасць і спачуванне дзякуй!

За высакароднасць дзякуй.

Дзякуй за спагаду да чужой бяды.

Але нехта мог бы і падказаць табе: «Памажы і сваім нівам і птушкам, рэкам і дрэвам, хатам і людзям».

Дзецям сваім памажы!!!

Бо спагада нараджае спагаду, дабрыня нараджае дабрыню, міласэрнасць нараджае міласэрнасць.

І толькі зло заўсёды нараджала зло.

Чорная быль. Чарнобыль.
Чорны баль. Чарнобаль.
Чорная бель. Чарнобель.
Чорны боль. Чарноболь.

Белае малако — чорнае. І бруднае: яно забруджана невідочнымі радыенуклідамі.

Светлая вада — чорная. І брудная: яна забруджана ўсё тымі ж радыенуклідамі.

Цярпліва мы трываем здзекі твае, наш «дабрадзею» — самы мірны ў свеце атам.

Гэта ж ад цябе —

параненыя без вайны,

забітыя ў мірны час.

Гэта ж ад цябе —

смерці не відно, а радыенуклідныя сабакі выюць.

Ніхто, кажуць, ад радыяцыі не памірае, а сабакі выюць.

Людзі паміраюць ад сэрца, ад почак, ад лёгкіх, ад жывата, урэшце, паміраюць, а ім кажуць, што радыяцыя тут ні пры чым.

На цэлы народ паставіў ты крыж, зненавідны наш «мірны» атам...

І ўжо часам, калі мы распранаемся дзе ў далёкіх гасцях, нам пад ногі — о Божа! — сцелюць газету — каб не растрасалі па хаце, як вошай, свае нукліды.

І ўжо ад дзетак нашых у піянерскіх лагерах шарахаюцца, як ад пракажоных — каб не набрацца, вітаючыся, як каросты, незнаёмай да гэтага заразы.

Нават анекдоты пацяшаюцца ўжо з нас: «Харошы быў народ — беларусы»...

Хто ж аплача цябе, о мой ты спрадвечны і, хочацца верыць, нязводны народзе?!

Чарнобыль...

Одзіум,— як казалі старажытныя рымляне,— прадмет нянавісці і нараканняў.

Мільёны людзей прайшлі праз гэты одзіум.

Дзе сёння тыя салдаты, якія голымі рукамі збіралі ў пагнутыя вёдры радыеактыўны графіт?

Дзе тыя дэзактыватары, якія голымі рукамі здзіралі з дахаў радыеактыўную бляху?

Дзе тыя героі, якія ў самае пекла, у самы радыеактыўны шал спяшаліся як найвышэй і найхутчэй узнесці і развінуць

высока-высока над звар'яцелым рэактарам чырвоны сцяг?

Разумныя людзі звычайна ратуюць сцягі.

А мы наадварот нясём іх пад тысячы кюры — на верную смерць і загубу.

Для дрэў ёсць смяртэльная доза радыяцыі — колькі іх папамерла і ў зоне, і па-за зонаю.

А хіба, думаеце, для сцягоў няма такіх доз?

А для людзей?

Як адчуваюць сябе тыя сяляне, якія ўсе гэтыя гадыаруць радыеактыўную зямлю ў кучаравых воблаках пылу?

Яны раптоўна паміраюць, а мы абзываем іх радыефобамі.

I на хворай зямлі настойліва перавыконваем хворыя планы.

Як гэта страшна: зона, рэжым, калючы дрот — вайна без вайны.

Як нялёгка бывае чалавеку вырашыць:

Пакінеш, застаўшыся ў зоне, партыйны білет — жыццё аддасі.

Пакінеш, выехаўшы з зоны, жыццё — партыйны білет аддасі.

Якія дробязныя ваганні!

На вайне прасцей: чалавек ведае, што сваю зямлю абараняе, Радзіму засланяе сабою.

А тут што ён засланяе, што абараняе?

Дурноту абыякавых людзей абараняе!

А навошта? Яны і самі выкруцяцца. Як выкручваліся дагэтуль.

Павысіўся радыеактыўны фон у вадзе ў сто разоў, яны ў сто разоў нормы павялічваюць.

I ўсё ўжо як мае быць: жывіце, людзі, і радуйцеся — радыеактыўны фон адпавядае норме.

Аж шалее на зямлі радыяцыя, аж захлынаюцца ад бэраў і кюры прылады, а яны загадваюць: не падносьце да самай зямлі дазіметры, мерайце як мага вышэй.

I ўсё зноў жа ў парадку: норма!

Але ж ногі не дазіметры: яны абавязкова павінны ступаць на зямлю...

«Ці чуеце,— даверліва шэпчуць нам нячысцікі,— а радыяцыя ж карысная».

«Ці чуеце,— пераконваюць нас няшчырнікі,— ваша радыяцыя — гэта тыя ж самыя радонавыя ванны: яна лекавая».

I не ўводзь нас, Божа, у спакусу.

Не заўважаюць прайдзісветы разгубленасці народа, не чуюць яго роспачы.

Яны не бачаць — а каб і бачылі, дык што ім да таго! — як нараўлянскія ці брагінскія маці кормяць сваіх дзяцей.

Даюць дзеткам хлеб, а самі дрыжаць ад страху, даюць малачко, а ў саміх слёзы на вачах, даюць яблык, а ў саміх аж да спазмаў сціскаецца сэрца: колькі ж бэраў ці кюры з'есць малое з тым хлебам, малачком ці яблычкам?!

Яны даюць, а хочацца адабраць.

Яны ўгаворваюць есці, а хочацца закрычаць: «Не еш!»

Даюць ежу, а разумеюць, што даюць атруту.

Лясы ў нас заложнікі, хаты — заложнікі, вуліцы — заложнікі, крыніцы — заложнікі...

I дзеці — таксама заложнікі.

Хто ж і калі вызваліць іх?!

За што ж ты пакараная гэтак, родная зямля?!

«Трэба разбіць люстэрка Чарнобыля»,— раяць нам.

«Хопіць у яго глядзецца»,— загадваюць нам.

У Фінляндыі — перапалох, у Швецыі — перапуд, у Францыі — паніка...

А ў нас — ціша і спакой.

У нас толькі і хапае розуму, каб упарта, як нябожчыкаў, мыць са шлангаў асуджаныя на смерць хаты.

«Упусціце ў душы радасць і прыгажосць»,— нашэптваюць нам прайдзісветы.

А як яе ўпусціць, тую радасць, калі нашыя сэрцы і душы перапоўнены болем — няма ў іх месца на весялосць.

Кажуць, толькі трыццаць пяць бэр можа прыняць у сябе чалавек за семдзесят гадоў жыцця.

Нашы дзеці з забруджаных мясцін набяруць гэтыя бэры да трыццаці год...

Радыяцыя перш за ўсё б'е па дзецях.

Толькі сорак кюры — гранічна дапушчальная норма забруджвання зямлі.

А на лузе — усе дзвесце кюры — смяротэльная доза для жыцця зямлі...

Ціхамірна пасуцца каровы, скубуць сабе траву, а разам з ёю і мірны наш атам.

Траву бачаць, расу на ёй бачаць, а кюры — не бачаць.

Разлучыў мірны атам дзяцей са спрадвечнымі сябрамі — ім не дазваляюць сустракацца з лугам, лесам, рэчкаю.

Але што ж гэта за дзяцінства без лугу, без лесу, без рэчкі?

І дзеці ідуць у партызаны: таемна бягуць пасля школы на рэчку і купаюцца там, уцякаюць, каб ніхто не бачыў, у лес і ласуюцца такімі жаданымі і такімі забароненымі зараз ягадамі.

Мы гулялі ў вайну, а яны гуляюць у радыяцыю.

Дзеці вайны і дзеці радыяцыі.

Але, радыяцыя — гэта ж таксама вайна: успомніце іх, нашых дзетак, разгубленых, напалоханых, з клуначкамі ў руках, на чужых незнаёмых вакзалах...

Таму яны, як і мы, гуляюць і ў эвакуацыю.

Мы радаваліся хмаркам, а ім трэба іх баяцца.

Нам было радасна бегаць па траве, а ім трэба баяцца яе.

Мы елі яблыкі, а ім іх нельга браць у рукі — яблык, хоць і не міна, а забівае.

Бо такі яблык — хвароба і смерць навырост.

Абаронім дзяцей ад яблыкаў!

А ад ягад? Ад вады, зямлі і паветра?

Адзін высокі раённы чыноўнік, ратуючы сваіх дзяцей, вывез іх з небяспечнай зоны. Яго прымусілі вярнуць іх назад.

Ірады! Трэба было ўсяго толькі прысіліць яго вывезці, як сваіх, і ўсіх астатніх дзяцей раёна ў няшкоднае месца...

Чалавеку радыяцыя не даспадобы, а прыродзе яна, здаецца, спадабалася.

Зірніце, як, ачмурэўшы ад яе ласкі, буяюць травы, бучнеюць дрэвы, якія вялікія і крамяныя растуць плады.

Але не радуйся гэтаму, душа,— у такім буянні, здаецца, пачатак канца: яно таксама смерць навырост.

Ці можа мінулае забіваць будучыню?

Вось, к прыкладу, клетка — надзейная схова для будучыні.

Заўсёды яна ведала, да якой мяжы ёй дзяліцца, каб ліст быў лістом — у дрэва, а рука рукою — у чалавека.

Радыяцыя ўсё пераблытала, зняла абмежавальнікі, і таму клетка, як ашалелая, усё дзеліцца і дзеліцца, не рупячыся пра тое, што яна народзіць.

Мінулае забівае будучыню, нараджаючы калек у жывой і нежывой прыродзе.

Мутацыя...

Яна спараджае гігантызм у дрэў і жывёл.

Травіна расце нібы дрэва.

Лятаюць вялізныя, як вароны, камары, а вароны — быццам цяляты.

Жабы і то што тыя львы — такія вялізныя.

То няма зусім ног, то іх не хапае, то яны лішнія.

Жарабятка з адных толькі ног — цягнічок, ды і годзе. А правільней — сараканожка.

То няма зусім вачэй, то іх — не злічыць.

З адных толькі вачэй сабрана галава ў цялятка.

Мутацыя — дзіця радыяцыі.

І хоць усё гэта — нібы з нейкіх кашмарных сноў, не трэба ўсміхацца і махаць рукамі: во, маўляў, выдумляе!

А яны ўсё гэта хочуць схаваць.

І баяцца слоў. Але яшчэ болей баяцца, ці чуеце, маўчання.

І ўратуй нас ад нячысціка...
Гадзіна смутку і маўчання — гадзіна жалобы ў дзень нараджэння бяды.
Чорныя свечкі паміж чорных цюльпанаў.
Чорныя сцягі і чорныя харугві.
Чорны вечар і чорнае маўчанне.
І ніякіх прамоў.
Дзесяць тысяч стаяць моўчкі.
Маўчаць, як крычаць.
А маўчанне больш палохае вінаватых, чым самы моцны крык.
Бо само маўчанне і ёсць крык.
Ці не таму непадалёку цэлы вечар надрываўся аркестр — хацеў перакрычаць маўчанне.
Спалохана гарлапаніў бадзёрыя мелодыі — мусіць, каб супакоіць самога сябе.
Наіўныя! Хіба і праўда нехта верыць, што можна перакрычаць маўчанне?
А пад бадзёрыя крыкі аркестраў Беларусь — цудоўная, як сцвярджаюць некаторыя, рэспубліка — змагаецца за выжыванне.
За жыццё змагаецца.
А «аркестранты» змагаюцца за сваё.
Калі ёсць дзе лапінка чыстай, не забруджанай радыенуклідамі зямлі, трэба яе забрудзіць.
І радыеактыўных цялятак мы выпраўляем на чыстыя лугі.
І чыстыя лугі становяцца бруднымі,— бо кожная кучка памёту — як маленькі разбураны рэактар.
З Віцебшчыны, якая, здаецца, трошкі чысцейшая, бульбу мы вязём у Маскву — і радасна-радасныя, і шчаслівыя-шчаслівыя, што яе ў нас бяруць.
А на Віцебшчыну вязём з Гомельшчыны і Магілёўшчыны — тую, што выгадавалі на зямлі, «непрыгоднай для сельгасдзейнасці».
Разумны чалавек заўсёды ратуе свой народ, а дурны яго забівае.
Калі ёсць у нас хоць адзін хібакусі, трэба каб у Беларусі былі ўсе хібакусі.

І мы робім усё, каб так яно і было.

Памагаем растоптваць па ўсёй рэспубліцы радыяцыю.

Ботамі і чаравікамі, лапцямі і красоўкамі, гумовікамі і адзідасаўкамі, сандалетамі, а то і босымі нагамі растоптваем.

На калёсах і на санях, на лодках і легкавушках, самазвалах і веласіпедах развозім.

Спатрэбілася нам раптам муфта.

У нас няма, а ў зоне — ёсць: там жа на калгасных дварах уся тэхніка як пакінута, так і стаіць.

Бярэм пропуск, едзем у зону, здымаем муфту, ускідваем яе на машыну.

А заадно яшчэ і тэлевізар сабе прыхопім.

Вязём з-за дроту два новыя рэактары — адзін затым у нас на полі працуе, а другі — у хаце дзейнічае.

І на чыстае поле мы не хочам ехаць араць, а просімся на бруднае — там болей плацяць.

Грошы, грошы... Трунавыя грошы.

Тупнеш пасля такога ворыва нагою — і, як калісьці пыл, ва ўсе бакі радыяцыя.

Выдыхнеш на ўсе грудзі — і ва ўсе бакі радыяцыя.

Але ўсё роўна вяртаюцца ў родныя, асірацелыя хаты за калючым дротам самасёлы.

Пакідаюць новыя хаты і вяртаюцца ў старыя.

Спаць не могуць у новых. Быццам ходзіць нехта пад вокнамі і ўсё, як смерць, кліча іх — жаласна і настойліва: «Ганна! Ганна!», «Пятрок! Пятрок!».

Хто ж ходзіць пад вокнамі і хто кліча іх?

Сум? Журба? Туга?

Туга ж — не радыяцыя: ад яе не ўцячэш.

А можа, і праўда старыя хаты, якія так ссумаваліся па гаспадарах, клічуць іх?

І рвуцца на іх кліч людзі — за калючы дрот ірвуцца.

З волі ў няволю рвуцца.

Бо там іх хаты, а дзе хаты — там і лёс.

Бо стаміліся людзі, збалеліся душы:

«Нам нічога ўжо не трэба. Мы ўжо нічога не баімося. Дайце нам толькі памерці ўдома».

Жывуць і чакаюць. П'юць радыеактыўную ваду, ядуць радыеактыўныя грыбы і чакаюць.

Жыцця ці смерці чакаюць?

Памажы ім, Божа!

Калі ёсць царства, сіла і воля Твая...

Іграюць на маёй зямлі бравурныя аркестры.

І крычаць прамоўцы, каб перакрычаць маўчанне.

Але бабка Параска не чуе гэтага — яна не слухае радыё, бо глухая.

У газетах атамнікі бессаромна сцвярджаюць, якая выдатная на Беларусі радыяцыйная абстаноўка.

Але бабка Параска не ведае гэтага — яна не чытае газет, бо сляпая.

Яна думае, як ёй зрабіць чысцейшым і так ужо чыстае цялятка.

Калі ёсць бяда, трэба, каб была і надзея. У бабкі Парасі ёсць надзея.

Дачка прывезла з горада моднага мыцельніку — індыйскага, ці што, парашку.

«А давай-тку я ім памыю цялятка»,— прыдумвае старая.

Тое цялятка, якое нарадзілася ад чыстай-чыстай кароўкі Святохі.

Тое цялятка, якое падбрыквала на чыстай-чыстай траўцы.

Тое цялятка, якое піло чыстую-чыстую вадзіцу.

І бабуля закасвае рукавы і доўга шаруе дэфіцытным парашком такую цёпленькую ад чыстага сонца поўсць цялятка.

Пыску яму шаруе, спінку яму шаруе, ножкі яму шаруе, хвосцік яму шаруе...

Хоча змыць усе бэры і кюры, усе нукліды.

Хоча адмыць ад яго цэзій і стронцый, радыеактыўны ёд і плутоній.

У згубленай між лясоў беларускай вёсачцы індыйскім парашком мые бабка Параска

атамны рэактар — звычайнае беларускае, з белаю зорачкаю на лобе, цялятка.
А колькі такіх рэактараў бегае і лятае, ходзіць і поўзае, цячэ і ездзіць па роднай нашай Беларусі!
Нахабна спраўляюць свой жуд, раскашуюцца на тутэйшай зямлі два браты і сястра з нетутэйшымі імёнамі — Катаклізм, Апакаліпсіс і Катастрофа — а за імі аж скуголіць ад задавальнення іхняя мутнавокая спадкаемка з быццам бы тутэйшым імем — Бяда...
Чорная быль: Чарнобыль.
Чорны баль: Чарнобаль.
Чорная бель: Чарнобель.
Чорны боль: Чарноболь.
Зазямліўся на далоні парашуцік дзьмухаўца — нібы задумаў прарасці на далоні.
Зямлі яму, бачыце, мала.
Не, зямлі многа, але не верыць парашуцік зямлі.
А колькі іх, саміх хворых, прыпала за гэтыя гады да збалелых грудзей карміцелькі.
Ці ўспомняць яны, калі прарастуць, дакуль дзяліцца клетцы, каб не раджаць мутацыйных гігантаў?
І ўсё ж, падай, семя, на маю зняможаную зямлю!
І прарастай.
І спялі такую патрэбную нам зараз надзею.
Бо калі ёсць бяда, трэба, каб была і надзея.
Хай сабе да яе яшчэ так далёка.
Аж дваццаць чатыры тысячы год — такі перыяд паўраспаду радыеактыўнага плутонія.
Людзі жывуць коратка, а радыенукліды доўга.
Але ж мы цярплівыя.
Будзем чакаць!
З веку ў век.
Амін.

## Хата

У кожнага чалавека, які мусіць жыць на зямлі, павінна быць свая хата.

У яго ж ніколі не было сваёй хаты.

У кожнага чалавека павінна быць свая жанчына, якая б кахала яго, і свая сям'я, якая б радавала яго.

У яго ж не было ні сваёй жанчыны, ні сваёй сям'і.

У кожнага чалавека, які хоча назаўсёды астацца сярод жывых, павінны быць свае дзеці.

У яго ж не было сваіх дзяцей.

Кожнаму чалавеку, здаецца, наканавана мець харошых і шчырых сяброў.

Сябры ў яго, праўда, былі. Але яшчэ болей было ворагаў.

Усё жыццё ён шукаў сяброў, а знаходзіў часцей за ўсё ворагаў.

Кожны чалавек нараджаецца вольны і шчаслівы.

Ён жа нарадзіўся ў гэты свет рабом.

Рабом быў яшчэ і не народжаны, бо маці яго Кацярына Якімаўна, бацька Рыгор Іванавіч адвеку ведалі сябе прыгоннымі сялянамі.

Яны яшчэ толькі цалаваліся, яны яшчэ толькі мілаваліся, а ён ужо — навырост!— быў рабом!

Так і памёр ён нявольнікам.

Бо хіба можна адчуваць сябе вольным, калі твае браты і сёстры — прыгонныя і ты не можаш іх выкупіць.

Яны — рабы, і ты, кроўны ім, хоць і адпушчаны,— таксама раб...

Цяжкое, свінцовае неба над укрытаю лёгкім і светлым снегам зямлёю.

Нават праз тоўстыя мікрапорыстыя падэшвы адчуваеш, якая яна, карміцелька, цёплая пад снегам, якая шчодрая і ласкавая напярэдадні свайго свята — вясны.

Канеў.

Чарнечая гара.

Самая высокая і самая святая гара Украіны.

Свой Казбек, свой Арарат, свая Джамалунгма.

Свае Альпы, свае Кардыльеры, свае Гімалаі.

Джамалунгма Украіны, што завецца так проста і так звыкла — Тарасова гара.

Халодныя, заінелыя прыступкі, адарваныя ад зямлі, вядуць на вяршыню...

Ідзеш над зямлёю — як па небе...

Гэта ж трэба: столькі на яго любай Украіне было хат,— беленькіх, чысценькіх, светленькіх, дагледжаных, мазанак, святліц ля стаўкоў і рэчак, між мора збажыны і край стэпу, пад таполямі і з садкамі вішнёвымі пад вокнамі,— столькі гасцінных і зычлівых хат!

А ў яго не было сваёй хаты.

Сёння любая хата была б рада стаць ягонаю.

Была б шчаслівая, каб ён толькі адчыніў дзверы, каб толькі ўважыў яе.

А ў яго не было сваёй хаты.

Неба над галавою было, а хаты не было.

Страха над галавою была, а хаты не было.

Была, праўда, бацькава хата — падслепаватая, цесненькая халупка, што гаротліва насунула на самыя вокны страху-кучомку і, нібыта прыжмурыўшыся — адно акно меншае, другое большае,— думала сваю нялёгкую долю — яна таксама была прыгоннаю.

І слухала, як стогнуць ґрэчкасеі і хлебажнеі, з якіх розгамі ды бізунамі здзіраюць скуру.

Тая хата, з якой ён, самотны хлопчык, збягаў далёка ў стэп — шукаць вялізныя жалезныя слупы, што падпіраюць неба,— і адкуль яго ўжо ноччу прывозілі дадому чумакі — стомленага, уражанага і разгубленага: дык а слупоў жа, ці ведаеце, нідзе няма!

Была яшчэ страха над галавой, калі пасля смерці бацькоў хлапчаня — адзінаццаць гадкоў і ўжо круглы сірата — наймаецца да дзяка-п'яніцы Паўла Рубана, крывога Саўгіра, шкаляром-папіхачом. Дзяк змушаў яго насіць ваду, змушаў чытаць псалтыр над нябожчыкамі, вучыў нават красці.

Але ж ён вучыў хлопчыка і яшчэ сямутаму — даваў яму чытаць перапісаныя ад рукі крамольныя вершы Скаварады!

І ўсё ж аднойчы, калі дзяк напіўся з панамаром Іонаю Лымарам і спаў п'яны, Тараска звязаў яго — самага першага, як яму тады здавалася, дэспата роду чалавечага, адсцябаў розгамі і ўцёк.

Хіба ж гэта была хата, калі з яе ўцякаць захацелася?

Былі ў яго яшчэ і харомы.

Халодныя, гулкія апартаменты памешчыка Паўла Энгельгардта, у якога прыгонны Тараска служыў казачком.

У халодным Пецярбургу, куды маленькі раб разам з чэляддзю прыйшоў пехатою аж з Вільні зімою, па лютаўскіх снягах і маразах — услед за кібіткаю і вазамі пана.

Але хіба могуць харомы стаць сваімі, калі ў іх табе нічога не належыць, а твой крык і плач, калі пан б'е толькі за тое, што ты ўмееш і хочаш маляваць, рэхам адбіваецца ад нямілых сцен?

Праўда, б'юць часцей за ўсё розгамі і не ў харомах, а на стайні, але ўсё ж...

Э не, харомы — канечне ж, не хата: у іх холадна і няўтульна.

Як і ў тых сценах Сената і Сінода, якія ён потым распісваў.

Была ў яго і казённая хата, пра якую ён усё жыццё не мог успамінаць без жаху і грэблівасці,— задушлівая казарма ў стылых стэпах Заўралля, куды яго, «як надзеленага моцным складам цела», схаваў ад любай Украіны сам цар Мікалай Першы, з пісьменніка і мастака зрабіўшы радавога салдата Арэнбургскага асобнага корпуса і сваёю ру-

кою напісаўшы: «Трымаць пад найсуровейшым наглядам, забараніць пісаць і маляваць».

Гэтую сваю «хату», дзе амаль нічога не відаць ад дыму, дзе чад, здаецца, і зараз, калі мы глядзім, выядае да слёз вочы, ён, расхінуўшы, як занавеску, сцяну, паказаў нам на сваёй сепіі — карычнevата-пыльным малюнку, фарбу для якога яму, здаецца, аддавала са свайго чарнільнага мяшка каракаціца.

Вунь у паўзмроку сядзяць і ляжаць, як нявольнікі, салдаты, вісяць шынялі і штаны, стаяць чаравікі і боты, а збоку журбоцішча і ён — самотны і задумлівы салдат Шаўчэнка.

Здаецца, адсюль, як сцяг ярэмніка, перанесена ў музей і вось гэтая салдацкая сарочка — яго сарочка, якая прапахла потам і шматлікімі фортамі, дзе яму давялося гібець.

Але ў яго ж была і ласкавая хата, дзе яму аддалі ў расхваляваныя рукі радасць — яго вольную:

«1838 г. Красавіка 22 дня, я, ніжэйпадпісаны звольнены ад службы гвардыі палкоўнік Павел Васільеў сын Энгельгардт, адпусціў вечна на волю прыгоннага мне чалавека Тараса Рыгорава сына Шаўчэнку, які дастаўся мне па спадчыне пасля нябожчыка бацькі майго Сапраўднага тайнага саветніка Васіля Васільевіча Энгельгардта, запісанага па рэвізіі Кіеўскай губерні, Звенігародскага павета ў сяле Кірылаўка, да якога чалавека мне, Энгельгардту, і нашчадкам маім наперад спраў няма і ні ў што не ўступацца, а вольны ён, Шаўчэнка, выбраць сабе род жыцця, які пажадае».

Хата, якая яму гэта сказала, і праўда была ласкавая, але яна таксама была не свая: то была хата Карла Брулова.

Аднак была ў яго і свая хата.

У сэрцы. У душы. Ва ўяўленні.

Намаляваная. Белая-белая. З разнасцежанымі вокнамі — і таму як крылатая.

Вокны, праўда, былі зачыненыя, але яна як бы ўзмахнула невідомым крыллем — каб іх адчыніць.

Мара!

Ага, усё жыццё ён марыў пра яе — пра сваю хату!

«Пастаўлю хату, свой пакойчык.

Садок-раёчак насаджу».

Яму балела свая хата, і ён крычаў пра яе.

Але жыццё — складанае: мёртвы часам хапае жывога, а жывы не можа абараніцца ад мёртвага.

Цар Мікалай Першы сачыў за ім і з магілы.

Мудрэц плакаў, а сяму-таму здавалася: смяецца.

Мудрэц стагнаў, а сяму-таму здавалася: прыкідваецца.

«Я толькі хатачку ў тым раі
Жадаў і ўсё яшчэ жадаю,
Каб хоць памерці на Дняпры,
Хоць на маленечкай гары».

І ўлетку 1859 года, у свой апошні прыезд на Украіну — наступнага лета ў яго ўжо не будзе,— ён шукае месца пад сваю вымраеную хату, пад сваю выпакутаваную сядзібу.

І знаходзіць гэтае месца — паміж Каневам і сялом Пекары — як ён сам кажа, «над самісенькім Дняпром».

І ўжо нават план гэтай хаты малюе і пасылае яго свайму брату Варфаламею — брату не па крыві, а па сэрцу.

Але хата, перш чым папасці ў рукі брата, папала ў Пецярбург — у Трэцяе аддзяленне.

Перш чым нарадзіцца, яна ўжо стала крамольнаю — трапіла ў палітычна ненадзейныя.

Хата, яшчэ не стаўшы хатаю, ужо стала вязнем.

Яе, яшчэ не народжаную, ужо арыштавалі.

Во як бывае — і сам яшчэ не нарадзіўся, а ўжо раб.

І хата, яшчэ не пастаўленая, а ўжо арыштаваная.

Шаўчэнка не ведаў, што наперад яго на Украіну спяшаўся цыркуляр — сачыць за ім і дакладваць кожны крок.

Вось так — ён ехаў, а перад ім бег цыркуляр Трэцяга аддзялення.

А цыркуляры ж бегаюць, вядома, хутчэй, чым коні: гэты дабег да Украіны раней паэта.

Цяжкі, пакутны клопат чакае таго, хто, гнаны, затраўлены, стаўраваны, уздумае паставіць сваю хату на сваёй роднай зямлі.

«У садзе, кветкамі абвітая,
На ўзгорачку сабе стаіць,
Нібыта дзеўчына, хаціна...»

Значыць, ён марыў пра хаціну, як марыць пра каханую!

Значыць, яму балела яшчэ і каханне.

І балелі вясельныя песні.

«Ой дзяўчына-горліца да казака горнецца...»

«Заграбай, мама, жар, жар...»

«Ісайя, радуйся!» — з надзеяй і хвалясваннем прамаўляў ён словы царкоўнай песні, якою пад час вяселля віншавалі маладых.

І цярпліва, настойліва чакаў свае Прачыстае — на Прачыстую, калі замаўкалі, прыбраныя, палі і лугі, на яго любай Украіне пачыналіся вяселлі...

А яго Прачыстая так і не настала — абмінула, абышла яго бокам.

Столькі дзяўчат і жанчын на Украіне — прыгожых і годных, ласкавых і добрых, шчырых і замілаваных, сардэчных і ўзычлівых, спагадлівых і цнатлівых.

А яму не знайшлося жонкі.

Нялёгка, мусіць, было любіць гэтага лабатага, наравістага, упартага («спатыкаюся,

але не каюся») чалавека, які, кажуць, і купаўся — мужык! — толькі ў адзенні.

Але ж колькі жанчын любяць нахабнікаў і прайдзісветаў, п'яніц і зладзеяў і лічаць сябе такімі шчаслівымі!

Я не наракаю на жанчын, яны не вінаватыя — проста размінуліся з ім у жыцці.

А колькі самотных жанчын і зараз цярпліва чакаюць свайго суджанага...

Столькі шаноўных жанчын было на яго любай Украіне, а ён быў такі адзінокі.

Столькі жанчын пасля вышывалі яго партрэты — па два гады жыцця аддавалі на гэта,— а тады яму не знайшлося каханай.

«А мусіць, трэба ажаніцца ну хоць бы з чортавай сястрой»,— роспачна ўсміхаецца ён.

Але не, такое ён гаворыць толькі на словах.

Варфаламей, названы брат, які служыў упраўляючым у памешчыка, хацеў, каб ён ажаніўся з гувернанткаю Наталкай Шулякіўнаю.

Але круталобы раззлаваўся: «Я не хачу сабачай крыві!»

І сам хацеў ажаніцца з наймічкаю Харытаю Даўгаполенка, якая слугавала князю Лопухаву, а пасля і самому Варфаламею.

Але тая адмовіла яму — відаць, збаялася складаць разам яго і сваю няволю, яго і сваё гора, яго і свае жабрацкія торбы.

А можа, спалохалася сваіх гадоў: ёй жа ўсяго толькі было васемнаццаць...

«Ой, ён такі стары і лысы. І вусы ў яго сівыя. За яго замуж?»

І праўда, ягонае шчасце — ажаніцца з маладой — мусіць, ужо мінула...

Шкадую, што не знайшлося дзяўчыны ці жанчыны, якая б палюбіла яго гады і пакуты, яго лысіну і сівыя вусы.

Сумую, што ва ўсёй Украіне не знайшлося жанчыны, якая б падзяліла з ім яго сум і адзіноту, яго нядолю і няволю.

А потым і думаю: а можа, гэта і добра?

Геніяльны чалавек, мусіць, не можа быць шчаслівы.

Яму, здаецца, наканавана быць няшчасным і адзінокім.

Геніяльнасць патрабуе адзіноты, бо адзінота — чорны хлеб геніяў.

І ўсё ж жанчына была заўсёды з ім.

Як і хата — у думках, ва ўяўленні, у сэрцы, у душы.

Як і Бог — наканаваная і непазбежная.

Спачатку гэта была маці Кацярына Якімаўна.

Як яна са старэйшаю сястрою, таксама Кацярынаю, умела размалёўваць белую-белую печ!

Была і малодшая сястра Ярына.

Якую яна сарочку палатняную вышыла Тарасу!

Потым была яна, Кацярына. Якую ён сам нарадзіў. І якую гэтак кахаў.

О як ён шкадаваў яе, пакрыўджаную лёсам і прыхаднем! Няшчасную. Гнаную бядою. Зняважаную, адрынутую людзьмі.

Людзі гналі, адпіхвалі яе ад сябе, а ён гарнуў да сэрца.

Хіба можна так любіць сваё дзіця?

Можна, бо ты, ствары́ўшы яго, найперш за яго і адказваеш.

Як любіў ён яе — намаляваную і жывую: яе твар, яе закрытыя вочы, пад павекамі якіх угадваюцца цёмна-вішнёвыя, як ягадкі, зрэнкі; яе пульхныя вусны, якія, здаецца, яшчэ не астылі, не амяглі ад пацалункаў; яе шыю, яе вінавата-цнатлівыя грудзі, якія двума сарамлівымі грудочкамі ўпрыгожваюць белую кофтачку; яе чырвоны, здаецца, ядвабны пярэднічак, які, хаваючы, адкрывае крыху пакруглелы жыватok, радасны ад няшчаснай надзеі, бо радзіць жа — заўсёды радасць; яе рукі, якія трымаюць пярэднічак, нібыта ўжо лашчаць таго, хто яшчэ мусіць, гаротны, нарадзіцца.

Ён быў закаханы ў сваю Кацярыну і высакародна абараняў яе.

Хіба мог абыякавы чалавек так адчуваць яе годнасць, яе жаль і слязу, яе цярплівасць?

І казашку Кацю ён любіць. Тую, што на яго малюнку беражліва закрывае рукою святло ад свечачкі, а яно, гэтае святло, адбіваючыся ад яе далонькі, нібы белая кроў, прылівае да прыгожага твару.

Кацярына — маці. Кацярына — сястра. Кацярына — гераіня. І нават казашка — Кацярына.

І ён іх любіць, як любіць усіх жанчын свету.

І толькі адну жанчыну, і толькі адну Кацярыну ён ненавідзіць, бо яна для яго і не Кацярына, і не жанчына, а такі ж вурдалак, як і Мікалай Першы,— яна для яго вораг, бо яна — Кацярына Другая.

Колькі жаночых партрэтаў ён напісаў!

Колькі жаночых вачэй назаўсёды пакінуў несмяротнымі!

Вунь яны і сёння глядзяць на нас з той далёкай і ўжо мёртвай далечыні.

А яны глядзяць — жывыя!

Вясёлыя і задумлівыя, сумныя і бесклапотныя, радасныя і цнатлівыя, захопленыя і спагадлівыя.

Ён любіць усе гэтыя вочы, бо яны для Мудраца толькі розны стан адной і той жа жанчыны, адной душы, якую ён мог бы любіць усё жыццё.

О колькі ў яго нерастрачанай радасці, ласкі і дабрыні да жанчыны! Як ён усіх іх любіць!

Бо хіба можна без любові так радавацца вуснам, вачам, рукам...

Бо хіба можна столькі святла і замілаванасці аддаць незнаёмаму, абыякаваму для цябе твару?

Жанчыны любай яго Украіны.

«Што за прыгажосць бездакорная! — захапляецца ён імі.— Не бачыў нічога падобнага да гэтай невыказнай прыгажосці... Чароўнаму Рафаэлю і ў сне не снілася такая

прыгажосць і гармонія ліній. А славуты Канова ўшчэнт разбіў бы сваю цукровую «Псіхею», калі б убачыў гэты цуд».

Сляпая з дачкою.

І яна — прыгожая, і яна — яго каханая.

Як ён спачувае яе вечнаночным вачам, як гладзіць яе чуйныя рукі, адчувае і сам, як натужна гудуць здарожаныя, трывожныя ногі — куды яны яе, цемравокую, павядуць?

І дзяўчынку-павадырку, што паклала галоўку на матчыны калені і заснула, таксама любіць — хіба не бачыце, як лашчыць ён яе бацькоўскай рукою, а тая, стомленая дарогаю, спіць і нічога не чуе?

Для ўсіх жанчын ён просіць толькі долі і шчасця.

І ўсіх шкадуе.

Каго любіць, таго і шкадуе.

А каго шкадуе, таго і любіць.

Шкадуе сіротку-наймічку Мар'яну, якую сустрэў калісьці ў сяле У'юнішчы, і якой падарыў грошы на хусцінку, і якую, ведаючы, як ёй будзе цяжка ў жыцці, адно толькі просіць:

«Не цвіці ж, мой цвеце новы,
Цвеце не развіты,
Завянь ціха, пакуль сэрца
Тваё не разбіта».

Ён шкадуе і княжну Рагнеду, бо Уладзімір, напаўшы на Полацк, забіўшы Рагвалода, «поя княжну, растлив ю».

Ён шкадуе і тую сунаміцянку, якую — голую і гарачую! — кладуць разам з іншымі дзяўчатамі-рабынямі ля старога і ўжо халоднага цара Давіда — каб сагравалі яго.

Шкадуе — значыць любіць і іх.

Ён любіць Яраслаўну, ён любіць Ладу — стараславянскую міфалагічную багіню кахання і вясны.

Любіць і яе, Лікер'ю Палусмакаву, на якую пасля Харыты абрынулася ўсё яго каханне, абваліліся ўсе яго мары і надзеі.

Ці можа вытрымаць такое звычайная жанчына?

Усіх іншых ён любіць здалёку, бо ўсё гэта для яго жанчыны-прывіды.

Недасяжныя ідэалы, да якіх няма звычайных дарог.

Лікер'я — жывы чалавек.

І да яе ёсць простая, звычайная дарога — па заснежаных або туманных вуліцах Пецярбурга да дома знаёмых Тараса Рыгоравіча, у якіх слугавала колішняя прыгонная, а на той час вольнанаёмная дзяўчына, якую, як і яго самога, прывезлі рабыняю ў сталіцу з любай Украіны.

Яна была падобная на яго Кацярыну.

Жывая — на выдуманую.

Можа, таму ён і закахаўся ў Лікер'ю, бо бачыў у ёй Кацярыну?

Нават пасля, калі маляваў партрэт каханай, ён шукаў у ёй Кацярыну.

Нават кофтачку тую ж, як і на Кацярыне, намаляваў ёй, нават завязаў яе гэтак жа, нават каснічок здаецца, той жа самы зрабіў.

«Калі я ўпершыню ўбачыла яго,— успамінала пасля Палусмакава,— падумала, які ж гэта да нас дзядзька зайшоў: стары, непрыгожы...»

А ён кахаў яе і прамаўляў да яе:

«Мая ты любая! Ўсміхніся.

І вольную душу святую,

І вольную руку, мой дружа,

Падай мне...»

Ён кахаў і таму не бачыў тых дваццаці шасці год, што гарою выраслі між імі: яму — сорак шэсць, ёй — дваццаць.

Але пры чым тут гады, калі кахаеш?!

Ён рыхтаваўся да свае Прачыстае.

Купіў два залатыя шлюбныя пярсцёнкі.

Слыннаму кралевацкаму ткачу Дзяміду Кашуку, працаю якога захапляўся, заказаў вясельныя ручнікі з пеўнямі: на Украіне ручнік — сімвал жыцця і смерці, яго даюць чалавеку ў апошнюю дарогу, яго сцелюць пад ногі маладым — каб слалася іх сямейнае жыццё.

І яму трэба былі ручнікі, каб ласкаю слалася іх сумесная жыццёвая дарога.

І хату над Дняпром ён збіраўся ставіць не так для сябе, як для Лікер'і.

Нават маладога настаўніка наняў для сваёй неўзабаўнай жонкі — хацеў, каб яна навучылася чытаць і пісаць...

Але...

Вучацца звычайна за сталом, а ён заспеў іх аднойчы ў іншым месцы...

Так і засталіся пярсцёнкі беспрытульныя — хоць і разам, а паасобку.

Нават у вопісе, зробленым пасля смерці паэта, да сёння шчыміць:

«Пярсцёнкі (два) залатыя, шлюбныя».

І прыгажуны-ручнікі з пеўнямі, што выткаў Дзямід Кашук да вяселля Шаўчэнкі, давялося пакласці на Тарасову труну, калі яна майскім днём даплыла да Кралеўца.

Таму і хата, яшчэ не нарадзіўшыся, ужо развалілася.

Здарылася так, як і прадракаў ён:

«У мой раёк спадціху-ціха

Падкрадзешся, наробіш ліха,

Запаліш мой самотны рай».

Лікер'я выйшла потым замуж за цырульніка. А цырульнік, ведаеце, не паэт.

Ён піў і біў сваю жонку, развяліся.

І, можа, толькі пасля Лікер'я нешта зразумела.

Прыехала ў Канеў, зняла пакойчык непадалёку ад Чарнечай і кожны дзень прыходзіла на магілу Тараса Рыгоравіча.

Да самага канца стагоддзя прыязджала яна ў Канеў і, уся ў чорным, цэлымі днямі прастойвала ля святога ўзгорачка на Вялікай Гары.

Паны давалі ёй грошы — як удаве Шаўчэнкі.

А вартаўнік Іван Аляксеевіч Ядлоўскі, які аж пяцьдзесят год самаахвярна і бескарысліва даглядаў магілу, ганяў яе — не мог бачыць Лікер'ю і казаў, што яе чорны цень толькі абражае Чарнечую гару.

А ён, Вялікі Пакутнік, так і застаўся адзінокі.

Ён, самотны бесхацінец, у канцы жыцця толькі ў роспачы ўскрыкне:

«О каб з кім сесці, хлеба з'есці ці слова мовіць хоць адно...»

Які ж ён быў адзінокі!

Ва ўсіх людзей павінны быць сем'і і дзеці, а ў яго не было ні сям'і, ні дзяцей.

А як ён марыў менавіта пра сям'ю і дзяцей!

Як маляваў сваю мару — шмат дзе на малюнках святая тройца: ён, яна і яно!

Вось сялянская сям'я. Тая, якой у яго няма і ніколі не будзе.

Бацька, маці і дзіця. І дзед на прызбе.

І яшчэ хата, якой у яго таксама няма і якой ніколі не будзе.

О як ён любіць усё гэта і як прагне спакою і ціхамірнасці!

Такой ціхамірнасці, як, да прыкладу, на яго ж малюнку «На пасецы».

Дзеткі прынеслі бацьку полудзень. І ўсе шчаслівыя — і бацька, і дзеці.

Дрэвы шчаслівыя, пчолы шчаслівыя, вецер шчаслівы.

Вы думаеце, дзеці пасечніку прынеслі ежу?

Не, яны Шаўчэнку прынеслі полудзень! І ён таксама шчаслівы, таксама замілаваны, бо гэтыя дзеткі — яго дзеткі.

І казахскія хлапчукі, якіх ён маляваў у сваім выгнанні,— таксама яго дзеці.

І той вунь хлопчык, які распальвае грубку, і той, што ўжо дрэмле каля яе,— зноў жа яго дзеці, сыны акына Таразі, як яго называлі казахі.

Дзеці-байгушы, дзеці-жабракі, што працягваюць рučаняты і торбы — просяць міласціну: падайце, не мінайце! — таксама яго дзеці.

І тое малое, што гуляе з катком,— яго малое.

І іншыя дзеці, якія ўмеюць быць шчаслівымі ад самай-самай вобмалі,— таксама яго дзеці.

Ён іх бацька і ў той жа час раўня ім — па душы Тарас Рыгоравіч такі ж, як і яны.

Нібы вярнуўся ён у дзяцінства, калі, забыўшыся на валоў, якіх пасвіў у полі, ішоў у стэп, за курганы-магілы, пад якімі адпачываў, нецярпліва ўглядваючыся ў небасхіл,— ішоў шукаць, дзе канец свету.

Калі прагнуў дайсці да таго месца, дзе неба злучаецца з зямлёю — цікава, як там жанчыны ўжо не на зямлю, а на неба сцелюць бяліцца ручнікі...

Разам з дзецьмі ён радуецца дробязям: седзячы насупраць расчыненых дзвярэй, за якімі забаўляецца хлапчук з катом, ён і сам захапляецца гульнёю.

Разам з дзецьмі стаіць ён і пад вокнамі і засмучаецца, што дзяржаўны кулак, які высоўваецца з акна, не падае дзецям нічога, апрача самога сябе.

Жудасна, калі кулак сам па сабе і ёсць ужо міласціна!

Дзеці пра гэта не ведаюць, а ён, акын Таразі, ведае — дарослы па абліччы, дзіця па душы.

Здаецца, ён усё жыццё спачуваў сабе, малому, шкадаваў таго Тараску — казачка, пастушка, ваданоску — і хацеў хоць нечым памагчы яму зараз.

Але хіба можа дарослы чалавек памагчы сабе самому колішняму — малому?!

Хоць ён многае ведае і ўмее.

Скажам, ён умее на малюнку перадаць рух паветра.

Напісаць вецер, напісаць дождж.

Напісаць спёку і халодную ноч.

Напісаць пажар у стэпе — перадаць рух агню, рух гарачага паветра, ад якога, здаецца, задыхаешся і сёння.

Ці трагічна нізка апусціць лінію небасхілу на малюнку, калі здаецца: яшчэ кры-

ху — і ўвесь свет перакуліцца ў нейкае іншае вымярэнне.

Значыць, у яго не было сям'і, але было шмат дзяцей.

Аднак кожны чалавек, які хоча быць шчаслівым, акрамя жонкі, хаты, дзяцей, павінен мець яшчэ сяброў.

О, сяброў у яго было многа!

Сярод іх — і добры грэк Сакрат, і Алег, князь Драўлянскі, і Дыяген, абпраменены, нібы думкаю, святлом, якое з ім жыве ў бочцы, і гладыятар, які, задаволіўшы публіку, канае на арэне.

Кароль Лір яго сябра, блудны сын яго сябра, Багдан Хмяльніцкі яго сябра, Амяльян Пугачоў яго сябра — бачылі, колькі нянавісці, колькі гневу ў яго вачах — да здраднікаў, якія яшчэ нядаўна прыкідваліся аднадумцамі.

І вочы Кабзара падобны на вочы Пугачова на аўтапартрэце 1849 года — у іх таксама і здзіўленне, і нянавісць, і гнеў: за што ў салдаты?!

І дзяды з «Суднай рады» — мудрыя старыя, якія судзяць толькі справядліва,— яго сябры.

І тыя салдаты, якіх караюць шпіцрутэнамі, і тыя, каго караюць калодкаю,— яна нібы кляп у роце,— яго сябры.

І тыя вязні, што скаваны ланцугамі за ногі, і тыя, чые рукі і ногі ў драўляных калодках-скрыпніцах,— яго сябры.

Бо ён больш за ўсё цаніў і паважаў у чалавеку годнасць, спавядаўся маральнай чысціні, разумеў смутак і журбу, ведаў боль — той застаўся ў душы назаўсёды.

«Бо хто гаворыць: люблю Бога, а брата свайго ненавідзіць,— падман ёсць».

Таму кожны кабзар — яго сябра.

Ужо не кажучы пра сляпога кабзара Верасая — ён яму нават свой «Кабзар», той, які спачатку згубіўся ў моры кніг у халодным Пецярбурзе, каб пасля вырасці цэлым

вострававам, цэлым мацерыком,— паслаў і напісаў на ім: «Брату Астапу».

Кажуць, кніга гэтая яшчэ раз, па-новаму асляпіла сляпога Верасая — ён стаў бачыць.

Душою і сэрцам бачыць.

І Карл Брулоў і Васіль Жукоўскі, канечне ж, яго сябры — мастак напісаў партрэт паэта, яны прадалі яго на аўкцыёне за дзве з паловаю тысячы рублёў — менавіта столькі патрабаваў Энгельгардт за свайго раба Тараса.

Прыгонных звычайна мянялі на сабак — галава на галаву,— а гэты, ці бачылі вы, такую цану загнуў!

І негрыцянскі акцёр-трагік Айры Олдрыдж, партрэт якога напісаў Тарас,— зноў жа яго сябра.

Сыны рабоў, яны размаўлялі на розных мовах, але разумелі адзін аднаго — дапамагалі народныя песні: часта бачылі іх на вуліцах Пецярбурга разам — і іх, і іхнія песні.

І нават царскі сатрап, які дапытваў Шаўчэнку перад тым, як саслаць яго на Мангышлак, быў не вораг яму, а прыкідваўся дык і ўвогуле бацькам.

«Я б ганарыўся,— сказаў ён, убачыўшы, як годна трымаецца Шаўчэнка на допытах,— калі б вы былі маім сынам. Але адзінае, што я магу зрабіць для вас зараз,— не выпраўлю ў выгнанне пехатою: вас туды завязуць».

О гэтыя сатрапы! Часам яны, не ворагі, бываюць горш за ворагаў.

А ворагаў у яго было многа. І самы галоўны між імі — Мікалай Першы.

Тарас Шаўчэнка нарадзіўся 9 сакавіка.

А памёр 10 сакавіка.

Сёння нарадзіўся, а заўтра памёр.

Але паміж гэтымі «сёння-заўтра», «нарадзіўся-памёр» такое жыццё, столькі пакут, што ўжо ў самым канцы дарогі, азірнуўшыся назад, пакутнік у жаху выдыхнуў:

«Як добра, мама, што ты зарана,— у сорак гадоў Кацярына Якімаўна згасла,— спаць легла і не бачыла маіх пакут...»

«Я так яе, я так люблю, маю Украіну ўбогую».

Гэта ж трэба, так любіць сваю зямлю,— і не жыць на ёй: усё высылкі, выгнанні...

Так млець па роднай Украіне — і пабываць на ёй толькі тройчы.

Першы раз ён ступіў на родную зямлю пасля чатырнаццаці год выгнання.

Ступіў нагою не раба, а вольнага чалавека.

Ступіў і жахнуўся — такая прыгажосць і такія пакуты!

Цудоўная прырода і жахлівы здзек.

Якая неадпаведнасць: людзі, што тут павінны жыць радасна, не бачаць свету божага ад слёз!

«А на Сечы мудры немец картопельку садзіць».

І ўсё ж праз два гады ён вяртаецца на радзіму. Селіцца ў Кіеве. Але ненадоўга.

Уступае ў члены таемнай палітычнай антыпрыгонніцкай арганізацыі — Кірыла-Мяфодзіеўскага таварыства.

Пачынае задумвацца сам і змушае думаць іншых:

«Вось зірніце: адно зерне — цар, жменя — памешчыкі, прыгаршчы — мы. Цяпер змяшайце ўсё гэта. Знайдзіце, дзе хто? Хто знойдзе ў прыгаршчах цара?»

Хто ж даруе такое? Які цар якому рабу?!

І венцаносны вырашае, што лепей за ўсё бунтаўшчыку падыдзе салдацкая форма, хоць і ведае, што яна кепска ляжыць на паэтах і мастаках — яны не ўмеюць хадзіць строем.

Найяснейшаму ясна — паэт не павінен пісаць.

Найсвятлейшаму зразумела — мастак не павінен маляваць...

І трэці раз ён прыязджаў на бацькаўшчыну летам — пасля абразы казармаю, пасля Кос-Арала і іншых фортаў.

Прыязджаў выбіраць сабе мясціну пад хату.

У яго ў кішэнях зерне, гатовае да сяўбы — у паэта, як у рупнага хлебароба, зерне заўсёды было з сабою,— а ў душы — неспатольная мара пра сваю зямлю.

Але зямлі яму не прадаюць: «Трэба спытаць у генерал-губернатара...»

О гэтыя злавесныя словы! Яны, здаецца, гналіся за ім з нараджэння да смерці і нахабна паўставалі перад кожнай ягонаю мараю.

І нібы прадчуваючы, што ў яго ніколі не будзе сваёй нівы, малы Тараска вельмі любіў у дзяцінстве есці зямлю — толькі адвернешся, успаміналі родныя, а яму ўжо жываток забалеў: зноў зямлі наеўся.

Трагічнаю была і гэтая паездка: за ім сочаць, браты — прыгонныя, сёстры — рабыні.

Але ж — радзіма тут.

«Няма на свеце іншай Украіны,
Няма на свеце іншага Дняпра...»

І на гэты раз яго арыштоўваюць — за падбухторванне сялян. І зноў сілаю разлучаюць з роднай зямлёю.

На радзіму душа спяшаецца і цела таксама.

А з радзімы цела едзе, а душа астаецца: яе не арыштуеш, не змусіш ехаць.

І яшчэ адзін раз ехаў ён на любую Украіну.

Чацвёрты і апошні — у труне.

Труна плыла між родных хат і палёў, між майскай травы і кветак, між свайго вясновага сонца, якое было такое шчодрае, а ён ніяк не мог у ім адагрэцца пасля настылага Пецярбурга, пасля Смаленскага цвінтара ў сталіцы, дзе яго пахавалі.

Па запавету Мудраца перавезлі на Украіну.

Нарэшце падаравалі яму родны край!

Нарэшце ён назаўсёды з'яднаўся са спрадвечнай сваёю зямлёю — на Чарнечай гары, непадалёку ад тых мясцін, дзе нарадзіўся і вырас...

Па ўсёй Украіне шукаю я жанчыну, яго каханую,— і не знаходжу.

Бо любіў ён усю Украіну — нібыта яна і была ягонай жанчынаю, ягонай каханаю.

Па ўсёй Украіне шукаю я, каму пакланяўся Паэт, хто быў яго насалодаю і захапленнем.

Шукаю і не знаходжу.

Бо слову ён пакланяўся і каленкаваў, бо творчасць, здаецца, была яго жанчынаю.

Па ўсёй Украіне шукаю яго хату,— і таксама не знаходжу.

Бо ўся Украіна — яго хата.

І Чарнечая гара — яго хата.

Але і ў гэтай апошняй хаце не было спакою і суцяшэння — каля магілы крычалі, стагналі і плакалі людзі — усе тыя ж грэчкасеі і хлебажнеі: нялюдскія рэпрэсіі абрынуліся і на магілу, і на тых, хто да яе падыходзіў.

Баяліся, каб працалюбы і напраўду не паверылі, што на Чарнечай гары пахаваны Святы, які дапаможа, як гаварылі, усім здабыць волю.

Магілу руйнавалі, дэманстрацыі разганялі: конная паліцыя без шкадавання, злюцела біла нагайкамі па ядвабу і смушковых шапках, па плахце і шараварах, па чырвоных сцягах і па партрэтах Тараса Рыгоравіча — па твары, цалялі, нягоднікі, па твары...

А ля магілы штораз трагічна выраслі дзве постаці — Лікер'і Палусмакавай і Івана Ядлоўскага: адна — да руйнавання, другая — пасля руйнавання; адна — уся ў чорным, як прывід; другая — заклапочаная, з закасанымі рукавамі: магілу трэба было зноў камусьці жывіць.

Дзе яшчэ, скажыце, можнаісці вышэй верхавін дрэў?

А тут вось іду — пада мною, пад нагамі голыя, абледзянелыя, аж звіняць! — сукі і галіны: каб было лета, можна было б нават пагладзіць пышназялёныя чубы.

Дзе можна ісці вышэй Дняпра — такое, мусіць, па сіле толькі снам ды самалётам.

Але там не ідзеш, а ляціш.

А тут вось іду вышэй Дняпра і нават адчуваю, як ён, заледзянелы, натужваецца, напінаецца, высільваецца, каб неўзабаве разламаць на сабе ільды.

Дык вось ты якая, хата Тараса Рыгоравіча на вялікай Чарнечай гары Украіны!

Вокнаў няма, а святло ад яе ідзе.

Сама цёмная, а як светла ад яе навокал!

Дзякуй табе, хата, што ты прылашчыла і супакоіла нарэшце такога спакутаванага чалавека!

Дзякуй табе, добрая зямля, за тое, што ён пажадаў застацца ў табе назаўсёды!

Усё ж у доўгай і зацятай барацьбе Паэт перамог Цара.

Яшчэ жывы — перамог жывога.

Але ўсе зразумелі гэта, калі цар стаў мёртвы.

Родны, знямажаны, але моцны народ скінуў з п'едэстала ў Кіеве Мікалая Першага, а на яго месца паставіў свайго цара — Цара Тараса.

Свайго Бога.

І ўздыхнула з палёгкаю, і аж заплакала ад радасці яго верная і вечная каханая — Украіна:

— Цябе, Божа, хвалім мы!

Шчаслівы народ, у якога Бог ёсць!

## З чужымі Багамі

Тапчу тваю траву, Абхазія, а здаецца: сваю тапчу.

Тапчу тваю траўку-мураўку, Апсны,— такую ж самую, як у дзяцінстве каля свае хаты таптаў.

Тапчу рамонку пахучую — такую ж, як і каля свае сцежкі ведаў.

Тапчу мятлік — такі ж, як і на маім лузе заўсёды трымцеў.

Тапчу бамбучнік, тапчу вострае каменне, тапчу загарэлыя пяскі пляжаў і тады толькі пачынаю разумець, што гэта ўжо не маё — такога не помніць маё дзяцінства.

Сярод галаногага і галаспіннага натоўпу хаджу, і здаецца мне, што ўсюды, як і тут, няма большага клопату за клопат адпачынку.

Сярод галаголага статку блукаю, сярод бесклапотна-потных курортнікаў соўгаюся і, натыкаючыся ўсюды на іх задаволены смех, сам пачынаю думаць, што няма нідзе ў свеце ні слёз, ні гора, ні пакут.

Усе адпачываюць, і ўсім весела!

Усе ні пра што не думаюць, і ўсе смяюцца.

І таму адзіная цяжарная жанчына, сціпла апранутая і заклапочаная, што немаведама як і апынулася між гэтага голага рою-раю, здалася лішняю і недарэчнаю: чаму і навошта яна тут?

Хіба ў гэтай краіне вечнага свята ёсць яшчэ нехта, хто цяжарае і раджае дзяцей?!

Навошта дзеці, калі і без іх так хораша смяяцца і адпачываць?

І ўсё ж тут працуюць і раджаюць, як працавалі і раджалі спрадвеку.

Усе гэтыя голыя спіны і ногі — не тутэйшыя: яны прывезеныя.

Цягнікамі і легкавушкамі, аўтобусамі і самалётамі прывезеныя.

Сыдзе лета, захліпнецца ад вятроў і дажджоў позняя восень, схлынуць голыя спіны і ногі.

І тады абхазы астануцца самі сабе. Іхняя зямля ім самім астанецца.

Зямля, на якой трэба працаваць і трэба раджаць!

Спачатку чорныя сукенкі і чорныя хусты жанчын не разумееш — вельмі ж яны душныя і жалобныя сярод сонца, спёкі і галізны.

А потым радуешся адкрыццю: дык чорны ж колер — самы ўрачысты, самы чысты і самы светлы ў сонечнай Абхазіі.

Спачатку не разумееш нейкай староннасці мужчын, абыякавасці, а то і няўвагі да іншых — абхазы жывуць, працуюць, смяюцца між сабою, некуды спяшаюцца, аднекуль вяртаюцца, а цябе і не заўважаюць: быццам і няма нікога побач з імі.

А потым разбярэшся: яны жывуць сваім жыццём і, разгубленыя ад такога летняга нашэсця, не хочуць змяшацца з ім, хочуць застацца самі сабою.

Жывуць пасярод натоўпу, а здаецца, стаяць збоку ад яго.

Душою адсланіўшыся ад галаголых.

Сэрцам прысланіўшыся да свае зямлі.

«Апсны — краіна душы» — прачытаў недзе ў гарах.

І задумаўся: не кожны народ адважыцца на такую самахарактарыстыку — дужа ж многа яна патрабуе ад таго, хто сказаў так!

А ён адважыўся. І дзякуй яму за гэта!

Хто не замахваўся на яго душу, хто не хацеў прыручыць яе, зрабіць сваёю — пакорнаю і паслухмянаю.

А ён ведаў сваё: абразу не цярпець, знявагу ненавідзець, здзек не даравáць.

Мусульмане і хрысціяне змагаліся за яго душу, кожны хваліў сваю малітву, а ён заставаўся са сваімі Багамі.

З даўнявечнымі язычніцкімі Багамі заставаўся, бо душа яго была язычніцаю.

З Айтарам — Богам размнажэння, абнаўлення і жывёлагадоўлі заставаўся.

З Джаджаю — багіняю ўрадлівасці, заступніцаю палёў і раслін заставаўся.

З Богам Шашвы, які спачувае ўсім кавалям, заставаўся.

У кожнага ёсць свой Бог — у душы і ў целе.

Бог вечны — няма яму ні пачатку, ні канца: ён усюды і ва ўсім.

Бог усё ведае і ўсё бачыць, Бог блізка, і Бог далёка.

Бог — камень, і Бог — травіна.

Бог — болей цела і болей душы.

Але той жа час ён — кропля душы і кропля цела.

Яднанне гэтых кропель і ёсць жыццё.

Справа Бога — суцяшаць у бядзе, ратаваць ад злосці.

Злосць забівае чалавека: калі ты раззлаваўся, ты прайграў...

Мітушуся, а трэба разжыцца на спакой.

Непакоюся, а трэба засяродзіцца.

Бегаю, а трэба спыніцца і разгледзецца.

Памажыце мне, чужыя язычніцкія Багі, зразумець вашу краіну душы.

Вядзі мяне, Дзыдзлан, Бог вады, па горных дарогах, дзе так цкліва пахне геранню, праціскайся праз вузкія шчыліны ў гарах, узнімайся на тысячы метраў, каб паказаць свой скарб, сваю жамчужыну — блакітную кроплю ў далонях гор: возера Рыцу.

Гара і раўніна, якія б яны ні былі розныя,— усё роўна родныя сёстры.

Адна без адной жыць не могуць — дзе ёсць гара, там ёсць і раўніна.

Раўніна сушыць табаку — лапушыстыя лісты роўненька нанізаны на драты.

Даліна спеліць вінаград — гронкі ацяжарваюць, як не ламаюць вінаграднікі.

І тое, і другое — яд для чалавека.

Але абхазы жартуюць: «Дзякуючы менавіта гэтым ядам, дзякуючы таму, што ў нас яны спеляцца разам, мы жывём па сто гадоў: табака звужае сасуды, а віно расшырае іх...»

Хаты і магілы ў дварах. Жывыя — жывуць у хатах, мёртвыя — каля хат.

«Навошта так?» — пытаюся.

«Каб жывых адусюль цягнула да родных хат і магіл»,— адказваюць Багі.

У бамбука, звычайна, калі зацвіце хоць адно каліва,— гіне ўвесь гай: каранёвая сістэма адна!

Зацвіло — значыць, адбылося, здейснілася тое, дзеля чаго ўсе жылі.

У людзей тое ж самае? Людзі жывуць для таго ж? Няўжо клопаты ў чалавека і бамбука супадаюць?

У нізіне сонечна, а па гарах, па цяснінах паўзуць павольныя, марудлівыя, як дырыжаблі, воблакі.

Бзыбская цясніна — самая шырокая, Гегская — самая вузкая, Юпшарская — самая прыгожая.

А па іх плюскочуць тры ракі — як адна: мітусліваму воку нават цяжка ўгледзець, дзе Юпшара становіцца Гегаю, а Гега выліваецца ў Бзыб.

Там — толькі вусікі за каменьчыкамі, якія абцякае вада, тут — толькі нагнутая да самых пырскаў галінка, якую гайдае плынь, а далей — бурлівы паварот пад масток — і ўжо новая рака.

І ўсюды настойліва пахне геранню.

Сіні туман над вадою, смарагдавая трава па берагах — і хаткі, хаткі, хаткі.

Не для чалавека, для пчол хаткі.

О, Анана-Гунда, спагадніца пчолам і пчалярству!

Як ты рупішся, каб жылі ў згодзе людзі, рэкі, пчолы і горы!

Вось яны, горы, у блакітным прывідным засціле і самі як прывіды.

Не стае аўтобуснага акна, каб вокам дабрацца да іх вяршынь.

Але горы — гэта ўжо клопат іншых Багоў.

Ашха Інцваху — духаў гор — клопат.

«Зірніце направа — там замак д'ябла»,— пазяхае экскурсавод.

А мне здаецца, што бачу я замак багоў.

Ваш замак, Ашха Інцваху.

Раскажыце мне пра вашы горы, шаноўныя заступнікі.

Веліч іх бачу, прыгажосць бачу, але ж за гэтым бачу і нешта іншае.

Тое, што мяне злуе і абражае.

Пагарду і знявагу бачу, грэблівасць да нас, людзей, адчуваю спіною.

Голыя горы — без дрэў і кустоў — халодныя і самаўпэўненыя.

Так, горы — гэта тое, што было да людзей і будзе пасля людзей.

Людзі жадаюць іх зразумець, прагнуць зраўняцца з імі, а горы не хочуць гэтага.

Колькі смелых яны спіхнулі са сваіх вяршынь, колькі пахавалі ў цяснінах, паламалі леднікамі, змялі лавінамі...

Але ґордыя абхазы не могуць змірыцца з гэтым — яны зноў лезуць на вяршыні, каб ад таго месца, дзе загінуў родзіч, да самага дома працягнуць нітачку.

Яны ведаюць, што цела памірае, а душа жыве.

І нітачка трэба душы, каб яна лягчэй знайшла дарогу да свае хаты.

Але нітачка патрэбна не толькі для мёртвых, яна і для жывых абавязковая: каб даказаць гарам, што і чалавек не слабы.

Зірніце, колькі нітачак — залатых, як промні сонца, сярэбраных, як павучынкі,— цягнуцца з вяршынь і прадонняў, з выступаў і пячор у скалах.

Яны вядуць мёртвых і жывых у родныя хаты.

Традыцыя абхазскіх хат: раз у год збірацца раднёю, каб ведаць усё пра свой род: хто ажаніўся, хто паступіў у інстытут,

хто пабудаваў новую хату, у каго нарадзілася дзіця, хто трапіў у турму...

Сядзяць, гамоняць, радуюцца і засмучаюцца, падтрымліваюць і абураюцца.

Іх уважліва слухаюць і продкі — яны побач, хоць і не за сталом, а ў магілах.

Мітушуся па тваіх дарогах, Абхазія, гляджу на яшчэ зялёныя твае мандарыны, радую руку аксамітнаю пяшчотаю твайго чайнага куста, спяшаюся, хоць і адчуваю, што зразумець цябе можна толькі спакоем.

Дарэчы, а ці ёсць у пячор свае багі?

Ці, можа, і там гаспадараць яны, Ашха Інцваху?

Гэта ж усё ў камені — свае прадонні і свае цясніны пасярод гары.

А можа, ёсць менавіта Бог гор, толькі я не ведаю яго імя?

А можа, у пячорах, гэтых вялікіх палацах, збіраюцца ўсе багі?

І Дзыдзлан там бывае — у пячорах жа ёсць падземныя рэкі і падземныя азёры.

І нават свае вадаспады ёсць, якія сцякаюць застылаю лаваю,— хоць і без шуму, але так, як і ўсе вадаспады свету.

І Аірг, Бог жывёлагадоўлі, не абмінае, мусіць, пячор: там жа ёсць кузуркі і кажаны — адны ўнізе, другія ўверсе.

Дарэчы, і ў пячор тая ж самая пагарда і грэблівасць да чалавека — я магу ўсіх вас раздушыць, казяўкі.

І праўда, там, на самым дне пячор, побач з глыбамі каменю, што ўпалі і разбіліся, побач з глыбамі, якія вісяць над табою і таксама могуць упасці і разбіцца, адчуваеш сябе маленькім, нікчэмным і безабаронным.

Як і той хлапчук, які выпадкова адкрыў Новаафонскую пячору.

Які, звязаўшы рваныя вяроўкі, пераадольваючы страх, адчуваючы нагамі пустату, бясконцае прадонне, упершыню за

ўсё жыццё падзямелля спускаўся ў яго холад і цемру.

Канечне ж, ён адчуваў ваша дыханне, Ашха Інцваху, канечне ж, разумеў, што, калі сарвецца, ніхто і ніколі яго не ўратуе.

Гэта ж цяпер тут светла, святочна, прыгожа — ззяюць дзівосныя, як рубіны, сталагміты, вісяць, як ледзяшы, сталактыты, і нават прасторна — ад глыбы да глыбы — гучыць народная песня абхазаў пра параненую скалу.

Гэта ж цяпер тут камень радзіў зялёную траву — з'явілася святло, а вільгаці ў пячоры хапае, і ўжо зазелянела, як на лузе, мурава каля свяцільнікаў.

І папаўзлі на святло і зяляніну халодныя ад вечнага холаду, сляпыя ад вечнай цемры, галодныя ад вечнага голаду казяўкі: хоць яны і ядуць камень, хоць яго тут і многа, але ж каменем дужа не наясіся...

Кропля, што не ўтрымалася на столі і ўпала на дно пячоры, пачала сталагміт.

А тая, што збаялася і, ўчапіўшыся за скляпенне, засталася вісець угары, заснавала сталактыт.

Хто з іх выйграў, хто прайграў?

Тая, што адважылася, стала на камень цвёрда.

Тая, што збаялася, вісіць на камені і баіцца і зараз — непакоіцца, каб не ўпасці.

А ўвогуле яны абедзве ахвяры — часу і прасторы ахвяры.

Яны ўсё роўна імкнуцца адна да адной, растуць насустрач адна адной.

І некалі з'яднаюцца, стануць суцэльнаю калонаю, што злучыць неба і зямлю пячоры.

Колькі ж стагоддзяў трэба ім, каб сустрэцца?!

Але зноў жа: калі ёсць надзея, вякі не страшныя — сустрэнуцца!

І падзеляцца сваімі ўражаннямі: адна расскажа, як страшна падаць у чорную

прорву, другая — як жудасна вісець над невядомаю пустатою.

Няўжо ніколі не было Бога пячор?

Быў ён, быў, і толькі мы, людзі, чамусьці не помнім яго.

Хіба вось гэтыя прасторныя, як бездакорныя залы для музыкі, каменныя лёхі маглі калі-небудзь пуставаць?

У гэтай грандыёзнай і велічнай руіне — Новаафонскай пячоры — здаецца, сама сабою гучыць музыка.

Як гучала для мяне ў Піцундскім трохнефным храме дзесятага стагоддзя.

Арган на паўсотню галасоў, на чатыры тысячы труб.

Спявае некалькі чалавек, а здаецца, стараецца цэлы хор.

Нават сцены там вызвалілі ад штукатуркі — каб патушыць рэха, бо яно — вораг музыкі.

Тут нічога і ні ад чаго не трэба было вызваляць — пячора створана для рэха, і яно тут — сябра і памочнік музыкі.

У храме зразумеў: арган можа сумаваць у мажоры, а радавацца і ў мінoры.

Пад каменнымі скляпеннямі, паміж сталактытаў і сталагмітаў адчуў, што пячоры і храмы створаны для роздуму.

Там можна толькі думаць — весяліцца і смяяцца там немагчыма.

У храме ці ў пячоры можна памерці для звычайнага грэшнага жыцця і нарадзіцца для жыцця святога, духоўнага...

Тым не менш, вернемся зноў на дарогу.

Бачыце, вось і ён, каменны мяшок,— шчыліна ў гары на адзін толькі аўтобус.

Злева скала, як казяўку, хоча спіхнуць у прадонне наш аўтобус.

Але справа прадоння няма, там таксама скала.

І яна прагне раздушыць нашу кузурку цывілізацыі.

Спіхнуць няма як, а вось раздушыць — абедзве разам! — адчуваеш, могуць.

Таму няўтульна, нягледзячы на экзотыку, эмацыянальна-неспакойнай душы ў аўтобусе, які прадзіраецца праз шчыліну, як не тручыся вокнамі аб самыя скалы.

Здаецца, няма выйсця з гэтага каменнага мяшка — ні аўтобусу, ні думцы.

Здаецца, усё, што трапіла сюды,— трапіла назаўсёды.

Дрэвы абраслі з усіх чатырох бакоў мохам — значыць, тут з усіх чатырох бакоў поўнач?

Сонца, здаецца, тут не бывае, але і без яго горы велічныя: што можа дадаць да іх велічы сонца?!

Горы спераду і ззаду, горы з бакоў і над табою.

І надакучлівы голас экскурсавода: «А што прыгажэй гор? Горцы, горцы...»

Хіба могуць прыбавіць што-небудзь да самой велічы словы?!

Велічы слова не трэба — веліч вышэй слоў.

Цікава, а чаму няма тут Бога людзей?

Бог раслін ёсць, Бог кузурак ёсць, Бог пчол ёсць, а Бога чалавека няма...

А чалавеку ж таксама патрэбен свой Бог.

Які б абараняў яго ад гвалту і разбою, ад здзеку і несправядлівасці.

Ад войнаў каб абараняў.

А ці быў у абхазаў Бог абароны?

Канечне ж, быў, але абхазы, мусіць, знарок не памятаюць яго, бо ён кепска памагаў ім.

А можа, абарону людзей браў на сябе Афы — Бог грозных з'яў прыроды?

Бо гвалт і здзек — хіба гэта не грозныя з'явы прыроды? А вайна?

А колькі ад такіх злавесных з'яў напакуталася, набалелася Абхазія, асноўным таварам вывазу якой былі самшыт і рабы.

Першыя месцы сярод рабоў, што вывозіліся з Каўказа, разам з чэркесамі і грузінамі падзялялі абхазы.

На рабоў выменьвалі соль — самы дарагі на той час прадукт.

Бачыце, чалавек, а дзешавей солі.

«Туркі патрабуюць выключна нявольнікаў»,— плакалі бедныя.

І смяяліся багатыя — свае родныя феадалы памагалі туркам і разам з іхнімі купцамі палявалі на жывы тавар — на людзей.

Праўду кажуць: «Вялікія людзі пасварыліся, а іх сяляне перабілі адзін аднаго».

Сяляне ва ўсім вінаваты!

Хоць і сяляне былі розныя: анхаю-цкя, чыстыя сяляне, да прыкладу, трымалі самі рабоў.

А вось ахашвала — былі ўжо сапраўдныя рабы: яны не мелі ні сям'і, ні жытла, ні маёмасці.

Яны працавалі за жменю гомі ці абыста — звычайнага проса.

Менавіта іх лавілі і прадавалі ў рабства.

Але з іх выходзілі сапраўдныя сялянскія важакі.

Сказаў быў аднойчы вось такі селянін — Кублух Агумаа з сяла Джгерда — думку, што зямля павінна належаць таму, хто яе апрацоўвае, а яго за гэта ў Сібір саслалі.

Цяпер вунь гэтую прапанову народныя дэпутаты мусоляць, аднак нікога нікуды не ссылаюць.

Ды што селянін! Не спадабаўся некаму апошні валадар Абхазскага княства Міхаіл Чачба, пераразваны па-грузінску — Шэрванідзе, прызналі ўсёмагутнага ненадзейным і саслалі ў Варонеж.

Усё забралі ў яго, толькі тытул «святлейшага князя» пакінулі — так і памёр ён у Варонежы «святлейшым».

Абхазы, чакаючы нападу, звычайна спалі ў брані, з пікаю ў руцэ.

Шчыт клалі пад галаву, а асядланага каня прывязвалі да свайго ложа.

Чаму ж ты, Афы, не памагаў ім тады?

Чаму маўчаў у тыя трагічныя гады руска-турэцкай вайны, калі абхазаў сілаю перасялялі ў зненавідную Асманскую імперыю — туркі адступалі панічна, але не забываліся забіраць з сабою і рабоў.

А абхазы, як і мы, беларусы, дужа любяць сваю зямлю.

Калі пасяляюцца ўжо дзе, дык не пакідаюць гэтае месца да самай смерці.

Як калісьці даўно і мы — яшчэ пры сваіх язычніцкіх багах.

Абхазы не хацелі на турэцкія караблі, яны ўцякалі ў свае лясы, а заваёўнікі спальвалі ў гэты час іхнія вёскі — каб не было куды вяртацца.

Хто супраціўляўся — знайшоў волю, але вечную: іх, непакорных, жорстка пакаралі і склалі штабялямі ў Сухумі — глядзіце, маўляў, і бойцеся.

У тым Сухумі, ці Цхумі, дзе кожнае лета любіла адпачываць грузінская царыца Тамар.

У тым Цхумі, які быў сталіцаю гандлю рабамі.

Зноў апусцелі квітнеючыя даліны, зноў нямымі сталі сёлы.

Толькі адзін з пяці махаджыраў-перасяленцаў застаўся жывы.

Але і ён жыў на чужыне адною мараю — вярнуцца на радзіму, да сваіх спаленых хат.

Там было кепска, але яны не ведалі, што і тут не лепей.

Іх ніхто на радзіме не чакаў.

Але ж надзея — гэта стан душы і цела.

Яна — нібы німб вакол чалавека.

Надзея — гэта тое, дзеля чаго мы жывём.

З надзеяй мы магутныя, без яе — слабыя.

Цяжка быць першаму, але яшчэ цяжэй апошняму.

Ніхто цябе не чакае, а ты ідзеш.

Цяжка прыйсці тады, калі ўсе пайшлі ўжо.

Што больш за ўсё трэба чалавеку?

Багацце? Золата? Слава? Узнагароды?

Не! Чалавеку перш за ўсё трэба радзіма.

Іх абражаюць — не даюць сяліцца ў цэнтральнай частцы края, выганяюць з прыморскай паласы і дазваляюць толькі арандаваць свае ж колішнія землі, а яны ўсё роўна рвуцца на радзіму.

З іх здзекуюцца, а яны, кінуўшы ўсё на чужыне, парожнe спяшаюцца дамоў.

Ачба і Чочуа, Хашба і Лолуа, Бебія і Акобія спяшаюцца.

Спадзеючыся, як сказаў сялянскі красамоўца Асман Шамба з сяла Эшэры, адпачыць і ўладкавацца пасля доўгіх няшчасцяў і нягод.

Душа спяшаецца дадому, а заадно цягне і цела.

Цела аселае, а душа, аказваецца, яшчэ болей аселая.

І дома, дараваўшы нягоднікам усе здзекі і пакуты, зноў пачыналі квітнець спустошаныя лугі, палі, нівы.

І тады прыходзіў Айтар — Бог размнажэння — і ў хатах, садах, на вуліцах пачыналі кугакаць малыя.

Крычанё да крычаня — ужо народ, ужо будучыня.

Ужо чысціня душы і чысціня цела.

Але ж і зараз абхазаў на сваёй зямлі меншасць — усяго толькі семнаццаць працэнтаў...

За што раззлаваўся ты на цэлы народ, Айтар?

І вось ужо аўтобус — не аўтобус, а птушка.

Нібыта няма пад яго коламі асфальту, нібыта адарваўся ён ад зямлі, як самалёт, і ляціць над гарамі, завісае над дарогаю, па якой мы толькі што праехалі.

Над цяснінамі ляціць, над прадоннямі ляціць, над самшытавымі гаямі лунае, якія тут ужо называюцца Рыцынскім запаведнікам.

Дарэчы, самшытавымі венікамі тут мятуць вуліцы — мусіць, з пратэсту, што сам-

шыт, як і людзі, вывозіўся калісьці ў рабства.

Мы молімся на самшыт, а тут ім мятуць смецце...

Як моцна пахне гераннюі

І малюнак — хоць адразу ў рамку.

Адсюль, з вышыні і даліні, яшчэ вузейшаю здаецца шчыліна ў каменным мяшку.

Здаецца, прамень ніяк не можа прабіцца ў яе, а той, які прабіўся, не можа знайсці выйсця — мітусіцца па скалах, усюды натыкаючыся на камень.

І зноў не верыцца, што мурашка — такі ж камфартабельны, як і наш, аўтобус, што набліжаецца да расколіны,— зможа працінуцца ў яе.

А пад намі, здаецца, уся Абхазія — шырыцца з краю ў край пад невідомымі крыламі аўтобуса.

Хачу зразумець тваё жыццё, твае абрады і веру, тваю душу і тваё цела, Апсны.

Цела спачывае, душа думае.

Цікава, а што робіць тады душа, калі думае цела?

Хачу пачуць, як спявае твой мудрэц над параненым воінам — ён верыць, што песня залечвае раны.

А калі верыш — абавязкова залечвае.

Хачу ўбачыць, якая шчаслівая — а як жа, яна выходзіць замуж! — стаіць абхазская дзяўчына ля высока засланага ложка з гарою падушак на ім — якраз як у нашай вясковай хаце.

Гэта ты памагаеш ім, дзяўчыне і хаце, Ерыгі — багіня ткацтва і іншай жаночай працы.

Хачу адчуць радасць пляча і радасць суседства, калі ў застоллі самы пашаноўны чалавек надзявае на сябе трохраговы ручнік, два другія рагі кладучы на калені тым, хто сядзіць побач.

Радасць дружбы таго, хто кладзе, і тых, каму кладуць.

Чысціня цела і чысціня душы.

Суседзі ўжо не могуць варагаваць ні з тым, хто паклаў ім ручнік, ні між сабою.

Дзякуй вам, язычніцкія багі Абхазіі, за шматраговы ручнік, пакладзены на мае калені.

Дзякуй за ўсё, што вы дазволілі паглядзець.

А вось і яно само — возера Рыца.

Нечакана блакітнае, надзіва спакойнае, да болю задумлівае.

Усё адлюстроўваецца ў вадзе — і горы, што навісаюць над возерам, і дрэвы, што моцна трымаюцца за каменне, і снягі, якія шарэюць вышэй дрэў.

Усё адбіваецца ў ім, і ўсё робіцца блакітным, а то і смарагдавым — і горы, і дрэвы, і снягі.

Нават Юпшара, адзіная рака, што выцякае з возера,— таксама смарагдавая.

І думка, якая хоча спасцігнуць гэтае дзіва,— зноў жа блакітна-зялёная.

Смарагд пасярод каменю.

Кропля ў далонях гор.

Замучоная і замучаная...

Не, я не памыліўся.

Вада ў возеры ліпкая, у яе панакідана ламачча, бляшанак ад кансерваў, бітых бутэлек.

А паўсюль аж прагінаецца, аж стогне камень ад упэўненага статка турыстаў.

Дзыдзлан, Бог вады! Ты стварыў такую прыгажосць — цаны няма твайму смарагду.

Дык чаму ж ты яго не ратуеш?

Дзе ты падзеўся, што не відно цябе?

Мусіць, і ты збег адсюль — не вытрымаў такога нашэсця цікаўных ног, рук, вачэй.

Дзе ты, Бог?

Недзе далёка ўнізе пачуўся трэск галля...

Гэта ты, Божа?

За дрэвамі і кустамі, мусіць, ішоў зубр — нашы зубры добра прыжыліся ў Рыцынскім запаведніку.

Але, кажуць, сярод самшытавых гаёў і паху герані яны ўсё яшчэ настойліва шукаюць зуброўку — траву, якую помняць па Белавежы...

## Экстаз

Святое месца каля Святых Гор нечакана паклікала да сябе, і ўсхваляваная душа з трымценнем і заміраннем азвалася на гэтыя запросіны...

Мы кажам: дзякуй табе, Міхайлаўскае, што ты знайшлося для Пушкіна — у генія павінна быць сваё Міхайлаўскае ці свая Ясная Паляна.

Але ж гэта была ссылка, было выгнанне — яго дом быў турмою, яго парк быў турмою, яго сцежкі былі турмою. Сораць — турма, возера Маленец — турма, хацінка Арыны Радзівонаўны — таксама турма.

Мы кажам: дзякуй табе, жанчына, дзякуй табе, каханне, якое, нібы міг бліскавіцы, успыхнула ў гэтай турме.

Але ж Ганна Пятроўна Керн была замужам і гэтае каханне да аднаго было здрадаю другому?

І ўсё ж, дзякуй табе, каханне, бо ты нават флірт можаш узвысіць да такой чысціні, якой усе мы марым пакланяцца.

Пушкінскае свята паэзіі. Пскоў з яго ракою Вялікаю. Святыя Пушкінскія Горы з дарагою магілаю, дзе вялікі сын прытуліўся да роднае маці.

І вось нарэшце Міхайлаўскае.

Хоць я і не быў тут ніколі, усё здаецца мне знаёмым — зусім жа блізка, вось там, за Апочкаю, за Невелем, мая Беларусь, мая паўночная зямля, дзе такія ж самыя ўзгоркі і кусты, палі і лугі, рэкі, лясы і сцежкі.

І ўсё ж хаджу, як заварожаны, гляджу, як заварожаны, стаю, як заварожаны.

Стаю каля хаты, на Сораць гляджу, за Сораць гляджу.

Дрэвы шумяць гэтак жа, як і пры ім шумелі.

Краявіды тыя ж самыя, якія і ён бачыў.

І вецер, здаецца, той жа, што варушыў яго крылатку.
У сённяшнім леце стаю, а здаецца, даўняе лета чую.
Удзень стаю, а здаецца, ноч бачу.

...Цудоўная летняя ноч, навошта ты такая прыгожая? Навошта так звабліва пахнуць твае травы? Навошта свеціць поўня? Навошта такая цішыня, ад якой закладае вушы і грудзі — няма як дыхаць? Гэта б'ецца мае сэрца ці, можа, яе? Няўжо яна ў маім садзе забылася сваё сэрца? Не, сэрца не забудзеш — яно заўсёды з целам. Я ненавіджу цябе, ноч, што ты такая панадная і ласкавая! Чуеш, ненавіджу! Нішто не павінна быць цудоўным без яе! Пах травы ненавіджу, поўню — ненавіджу! А яшчэ нядаўна ўсё гэта я так любіў! Змоўкніце, конікі! Вы раздражняеце мяне і не даяце зноў і зноў успамінаць яе вобраз. Што гэта — яе смех, яе голас? І чаму так пахне дарожным пылам? Ах, які ж я неразумны: то ж нядаўна паехала яна, і гэты пыл ад яе экіпажа. Не выдумляй! Дарожным пылам пахне заўсёды ўвечары, а паехала яна колькі дзён таму. І з ёю сеў гэты кузен. Я ненавіджу іх экіпаж! Я ненавіджу ўсё, што нядаўна любіў: ненавіджу купанне ў рацэ, ненавіджу сенакос. Ненавіджу дарогу ў Трыгорскае — і верхнюю, і ніжнюю,— якімі так цешыўся: месяц з правага боку — туды еду, месяц з левага боку — адтуль еду. А навошта месяц? Ён прыгожы толькі тады, калі асвятляе твой твар. К чорту і Трыгорскае — навошта яно, калі там няма цябе! Былі толькі лета і ты. А зараз — адно толькі ле-

та. І тое хутка састарыцца ў восень... Кожную ноч я гуляю па сваім парку і паўтараю сам сабе: «Яна была тут, яна спатыкалася аб вось гэтае карэнне, а мне балела: я ўздрыгваў ад кожнага такога дотыку. Я б'ю карані нагамі і лашчу рукамі — яны кепскія, бо палохалі яе, і добрыя, бо помняць яе ножкі. Камень, аб які яна спатыкнулася, ляжыць на маім стале, а галінку геліятропу, якая была на яе грудзях і якую я выпрасіў у каханай, бачу і ў цемры...

Алея Керн. Тое ж самае карэнне — тоўстае, векавое, выслізганае да бляску: хоць і ведаем, што іх выслізгалі іншыя ногі, усё роўна боязна ступаць — яны помняць тую ноч.

Як і вось гэтыя дрэвы, што, разам з маладым выгнаннікам, таксама глядзелі тады з надзеяй у бок Трыгорскага, якое засланіла яму ўсё на свеце: і сваю крыўду, і чужую радасць.

Зараз радасць у яго была свая!

Але ж навошта тады тут, на возеры, яшчэ і гэты востраў адзіноты?

Радасці ж самота непатрэбна. Ды і само Міхайлаўскае на той час — востраў адзіноты.

Значыць, паэту нават на востраве патрэбен куточак адзіноты?

...Цябе няма, але ты са мною. Я цябе бачу! Вось твае журботныя вочы... Вось твае вусны — такія блізкія і такія жаданыя... І я ўжо ля тваіх ног. Абдымаю іх і люблю. Адчуваю твае калені... Дзе я? Што я? Гэта што — трызненне? І я шукаю поўдзень у дзве гадзіны дня? Хоць яно і смешнае, але шчырае. О, я ўсё аддаў бы, каб гэтае трызненне стала явaю! Я кахаю цябе болей, чым табе здаецца. Навошта мне хаваць свае

пачуцці і саромецца іх? Бо калі я жывы, а любові не маю,— я мёртвы. Калі я ўмею ўсё, ведаю ўсе таямніцы, а любові не маю,— я ніхто і нішто. Веды — драбніца, розум — глупства, прароцтвы — лухта. Усё гэта знікне, а каханне застанецца. Важней за жанчыну няма нічога на свеце. Высакародней за каханне — таксама нічога няма. Што зрабіць мне, каб убачыць цябе вось зараз? Пакінуць радзіму? Засіліцца? Ажаніцца? Ні тое, ні другое, ні трэцяе: тады я не ўбачу цябе ніколі. Можна захацець убачыць цябе аднойчы, а можна хацець гэтага заўсёды. Я хачу бачыць цябе заўсёды! Я хачу ехаць да цябе кожны дзень. Ніхто не ведае, як я пакутую без цябе ў сваім выгнанні. І ведаць не будзе. Пакутаваць трэба аднаму, бо пакуты на людзях — блюзнерства. Яна невыносная, гэтая цёплая летняя ноч! І яе цішыня, яе насалода... Задушы мяне, спакуслівая летняя ноч! Не шкадуй — задушы: я пазнаў шчасце раней, чым развітаюся з жыццём. Я зацалую твае рукі, якія адчую на сваёй шыі! Я не хачу думаць пра цябе, дрыяда, каб не звар'яцець, але не магу, думаю. Я злуюся, шалею і ўсё роўна, бачыш,— ля тваіх ног. Я паміраю ад смутку! Хачу думаць пра нешта іншае, а думаю толькі пра цябе. Што яднае людзей? Журба? Жаданне? А можа, падабенства душ? Ці наадварот — іх рознасць? О ты, дзіватворніца!Ствары цуд — з'явіся! Мілая, чароўная, прывабная... Ах, нягодніца! Даруй, чараўніца. Ты самая прыгожая і пяшчотная. Хто паслаў цябе — суцешыць мой боль і маю адзіноту? Хто ён, гэты заступнік? Не, я не варты твайго кахання! Мне зда-

ецца, ніколі ў жыцці ніхто не змусіць мяне перажыць такія хваляванні, якія я перажыў з табою... Што гэта са мною? Я — нібы чатырнаццацігадовы хлапчук, які не ведаў ніколі жанчыны...

«У дрэва ніжнія галінкі — для ўсіх: на іх можа ўзабрацца кожны, хто пажадае.
І толькі самыя верхнія, пяшчотныя і далікатныя,— для птушак і матылёў: чалавеку яны недасяжныя.
Дык вось у Міхайлаўскім, убачыць якое марыць кожны паэт свету, я адчуваю сябе такім шчаслівым, нібыта ўзабраўся на самую верхнюю галінку...»
Так расказваў пра сваё захапленне гэтым краем бельгійскі паэт Марыс Карэм.
А мне здавалася, што і я знаходжуся недзе каля той жа самай галінкі...

...О гэтыя графы і генералы, гэтыя Варанцовы і Насельродэ! Бачыце, што адзін піша другому: «Вызваліце мяне ад Пушкіна: гэта, можа быць, вельмі добры хлопец і неблагі паэт, але мне не хацелася б далей мець яго ні ў Адэсе, ні ў Кішынёве...» Таму і схавалі мяне тут... Слухайце, а і праўда, кіньце вы свайго генерала ў сваіх Лубнах, закладзіце коней на Востраў і прыязджайце! У Трыгорскае? Не — у Міхайлаўскае! Ведаеце, я пачастую вас нават печанаю бульбаю. Не любіце? Што вы — смачней за яе няма на свеце нічога! Матуля ведала гэта і заманьвала мяне ў дом печанаю бульбаю... Вар'ят, гавару адно, а думаю другое! Спазмы... Спазмы ад таго, што я зноў уявіў вас у сваім парку. А затым уявіў Лубны і Ермалая Фёдаравіча побач з вамі. К чорту ўсіх мужоў і ўсіх генералаў! Я ненавіджу

усіх генералаў! А ў чым вінаваты Ермалай Фёдаравіч? Разумны, паважны. І самая вялікая яго віна ў тым, што ён ваш муж. Не магу ўявіць, як можна быць вашым мужам! Бачыце, аж за чатырыста вёрст вы абудзілі ўва мне рэўнасць. Я ўяўляю, як вы кружыце ўсім там галовы — направа і налева. Усміхаецеся графам, ларніруеце генералаў. Какетнічаеце з living рознымі кузенамі... Я ж бачыў, як вы какетнічалі з гусарамі, з якімі я некалі піраваў у Магілёве і якія прыехалі да мяне ў Міхайлаўскае. Ах, як вы спявалі ім у Трыгорскім «Венецыянскую ноч»! З якім пачуццём і абяцаннем — нібы хацелі ўсіх закахаць у сябе. О, гэта ж не Трыгорскае, а вар'яцкі дом! Я ненавіджу сваіх гусараў і нават сляпога Ваню Казлова, на чые вершы вы спявалі з такім хваляваннем песню, раўную яго да вас... «Ёй не міла вабнасць ночы»... Ненавіджу і баркаролу! Я не люблю зараз слоў — яны могуць быць такія ж саладжавыя і ліпкія, як і пагляды... Вы какетнічаеце несур'ёзна? А мне баліць напраўду! Як добра, што ўсе кахаюць па-рознаму. Адны — пачціва, другія — нясмела, трэція — стрымана... О, каб яны кахалі вас па-іншаму, я звар'яцеў бы!.. І яшчэ — нехта Рокатаў. З яго пахвалою: «Чароўная жанчына. Я б яе пакараў ізаляцыяй. Такія жанчыны небяспечныя для грамадства». Ёлупень! О, якія ж яны дурныя, гэтыя дужа разумныя людзі! А сам ты — лепшы? Памятаеш, як практыкаваўся ў красамоўстве перад ёю ў Аленіных: «Вы хочаце ў рай, а я хачу ў пекла, таму што там будзе вельмі многа такіх харошанькіх, як вы, жанчын...» Цалую і пераца-

лоўваю вашы рукі — даруйце. А вы, як і абяцалі ў лістах, пацалуйце мяне ў вочы... Ці спяць вашы вусны? Ноч жа... О, непакорна-пяшчотная ноч, уціхамірся нарэшце! Мне здаецца, тваё паветра такое густое і трывожнае, як перад навальніцаю. А можа, гэта навальніца ўжо варочаецца, як гром, у душы? Распаласуй, навальніца, напятую цішыню, ад якой не знаходжу я месца ў сваёй журботнай вясковай глухмені! Раздзяры яе! Чорцік, стань анёлам! О, я помню, тое дзіўнае імгненне, калі ўпершыню ўбачыў цябе...

Была на паляне трава — няма на паляне травы.

Была паляна прасторная, стала паляна цеснаю.

Шумна і весела зрабілася на сцежках суму і адзіноты.

А дзе ж ён сам, Аляксандр Сяргеевіч? Ага, вунь на сцэне — як і павінна быць, разам з паэтамі.

Не, на сцэне яго толькі партрэт, а сам ён, канечне ж, сярод людзей.

Розныя мовы ўсхваляюць яго геній, розныя народы кланяюцца Міхайлаўскаму.

А навокал палі, якія ён бачыў, лугі, па якіх хадзіў.

Алея Керн побач, лаўка Анегіна недалёка над кручаю і нават да Святагорскага манастыра, пад скляпеннямі якога — дзякуй Казлоўскаму! — гучалі, сціскаючы сэрца, «Аве, Марыя» і «Я помню дзіўнае імгненне», блізка...

І ўвесь свет побач.

...А можа, я выдумаў яе? Можа, гэта мая фантазія нарадзіла яе? Але ж галінка геліятропу, што глядзіць на мяне... Але ж камень, аб які яна спатыкнулася... Яна для мяне — то

рэальная какетлівая маладая жанчына — зямная і вабная, якой — уся мая ўвага і страсць. То раптам яна аддаляецца, і бачу я ўжо яе, як прывід — яе вобраз светліць праз нейкі незямны засціл, і на яго глядзіш з хваляваннем і непакоем — як на сонца, зажмурыўшыся. Яна ўсміхаецца не толькі вуснамі і вачамі, яна ўсміхаецца ўсёю сабою: рукамі ўсміхаецца, плячамі ўсміхаецца. Душою ўсміхаецца... Каханне ўсёмагутнае, і якая асалода слугаваць яму! Мудрасць і каханне несумяшчальныя. А я хачу іх сумясціць — хачу і кахаць, і быць мудрым. Чароўнасць сышла на маю адзіноту. А зараз, калі яна паехала, маё выгнанне — яшчэ болей нясцерпнае. Я — д'ябал, а той, хто бачыць ўва мне д'ябла,— бог для мяне. О, чароўная даўкая ноч, ты д'ябал і бог адначасова!..

Раніца ў Міхайлаўскім. Шчаслівыя, што пераначавалі ў такім слынным месцы, весела ўмываемся — хто з чаго — каля школы-інтэрната, дзе ўсе спалі ў вялікай залі, перагароджанай просцінамі на пакоі.

Паліваю з нейкай конаўкі на рукі Рыгору Рыгоравічу Пушкіну, праўнуку паэта, звычайнаму маскоўскаму інжынеру — надзіва сціпламу, нават сарамліваму чалавеку,— і пытаюся: «Як вам спалася?»

«Цудоўна! — смяецца ён.— А як яшчэ можа спацца ў маім родным родавым маёнтку?»

...О, ноч, аціхні сама і супакой мяне! Я не магу болей! А што ты маўчыш, мой аргамак, мой слаўны вараны конь? Ты ж памятаеш, як сядлалі

цябе, як садзілася яна і вы скакалі між жытоў — аж развяваліся за вамі яе блакітныя стужкі. Паехалі! А куды? Абы-куды! Толькі б ехаць! Туды, дзе няма гэтай задушлівай і пажадлівай, гэтай праклятай ночы... Мілая! Каханая! Сама чароўнасць! У Аленіна ты так свяцілася, што я мог аслепнуць. Я здзіўляўся: хіба можна быць такою прыгожаю? Я хачу, каб толькі я адзін глядзеў на цябе, любаваўся табою! І калі нехта яшчэ зірне на цябе гэтак жа, як я,— памру! Не змушай мяне паміраць, мой жызнёнак! О, я помню дзіўнае імгненне, калі перада мной узнікла ты... Што, што? Кажаш, я не першы гавару табе такія словы? «А ведаеш, імператар Аляксандр Паўлавіч казаў мне тое ж самае: «Я ніколі не забуду першага імгнення, калі ўбачыў вас...» Зноў гэты Аляксандр! Відаць, такі мой лёс — хадзіць поплеч з ім і каля мае бяды, і каля мае радасці... Ён сказаў: «Не забуду»? І потым вы ларніравалі яго на парадах, аглядах і ў дывізіёнах? Строілі яму вочкі, танцавалі з ім? Ён запрашаў вас у Пецярбург, а вы наіўна адказвалі яму: «Прыязджайце лепей вы да нас у Лубны», на што ён, усміхнуўшыся, канечне ж, адказаў: «Прыеду, абавязкова прыеду»? Ты абагаўляла яго, пакланялася яму, глядзела на яго з захапленнем? Цар! Прыгажун-мужчына! А сэрца жанчыны заўсёды мужчынскай славы просіць... Ненавіджу імгненне, ненавіджу цябе, ненавіджу імператара! Усіх імператараў ненавіджу! Мала яму, што саслаў мяне сюды, у выгнанне — «калежскі сакратар А. Пушкін звольнены са службы і адпраўлены ў ссылку ў пскоўскі маёнтак бацькоў

пад нагляд грамадзянскіх і духоўных улад»... «Каб выправіць пяро і слова», па-салдафонску прызнаўся потым Бенкендорф...

«Імператар упэўніўся, што яму неабходна прыняць у адносінах да п. Пушкіна некаторыя новыя меры строгасці, і, ведаючы, што яго родныя валодаюць нерухомаю маёмасцю ў Пскоўскай губерні, яго вялікасць пастанавіў саслаць яго туды, даверыўшы яго вашым, пан маркіз, пільным клопатам і нагляду мясцовых улад».

...Мала яму гэтага, дык ён яшчэ і сам ходзіць па маіх сцежках ля Міхайлаўскага і Трыгорскага, сядзіць на маіх алеях, у маім парку. О Божа мой! Ты, канечне, памагаеш чалавеку, але навошта ж ты прагнеш, каб ён пакутаваў перад гэтым? Лічыш, што кожны чалавек павінен зазнаць пакуты, бо без пакут няма радасці...

А свята тым часам гуло і шырылася — усяго на ім, як і на кожным свяце, хапала.

Але аблітае кола аўтобуса не было хуліганствам.

І спалоханыя ўскрыкі бабулек, якіх знаны паэт хапаў за калені, не было хамствам.

І лятаючыя талеркі на ўрачыстай вячэры ў Пушкінскіх Гарах, што з ежаю ляталі над чынна прычасанымі галовамі і святочнымі касцюмамі,— таксама не былі здзекам.

Гэта Яраслаў Смелякоў, удзельнік таго даўняга свята паэзіі, былы «зэк» і «вораг народа», так пратэставаў супраць усіх несправядлівасцей, усіх ссылак, усіх гулагаў свету...

Успамінаем, як Яраслаў Васільевіч паказваў нам тады свой пашарпаны пашпарт, дзе было напісана, што ён беларус.

А пра тое, што больш як хто абураліся тады яго паводзінамі, маўчым.

І пра тое, як смяяліся хохмам жартаўнікоў-самавукаў,— таксама маўчым.

Такіх, да прыкладу: «Чым Смелякоў адрозніваецца ад Пушкіна?» — «Пушкіна сюды саслалі, а Смелякова адсюль выслалі».

Верылі пацешкам, якім было весела, што Смелякова за пракуды адвезлі назад у Пскоў.

Не, зусім не разумеем мы пратэстаў!

...І ўсё ж прыязджайце! Бо я не вынесу гэтай спакуслівай, чароўнай ночы. Я задушу яе, калі вы не прыедзеце! Чуеце,— задушу. Каб яна не напамінала мне пра вас. Прыязджайце хутчэй! І я абяцаю вам, што ў панядзелак буду вясёлы, у аўторак — захоплены, у сераду — пяшчотны, у чацвер — дураслівы, у пятніцу, суботу і нядзелю — буду ўсім, чым вы захочаце. Ды вы ж і самі ведаеце, што я бываю то шумна-вясёлы, то сумны, то нясмелы, то дзёрзкі, то ласкавы, то нясцерпна нудны, то нават дурнаваты — чалавеку ж нельга заўсёды быць разумным! Прыязджайце! — крычу. А сам разумею — не прыедзеце... І ўсё ж я чакаю..Надзея — прыгожая жанчына, але да мяне яна адносіцца непрыгожа. Мая прывідная фея! Я кахаю цябе і цябе ж ненавіджу! Цалую твае ручкі і ненавіджу іх. Асалоду жыцця пазнаўшы, гаркоту хацеў пакінуць іншым, а яна астаецца са мною. Душа, якая пакутуе, патрэбна жанчыне. Раз'юшанасць і шаленства наша патрэбна ёй! Бывайце, чароўная!

Я пакутую ад вар'яцтва і цалую вашы ножкі. Не прыязджайце! Я вас буду чакаць. І пісем — таксама. Памятаеце, я папрасіў у вас дазволу пісаць вам і вы літасціва дазволілі. І ўсё ж я хачу, каб мае пісьмы вы хавалі на грудзях. Разумею, што нашы пісьмы будуць перахопліваць, будуць смяяцца з іх, смакаваць іх, нават спальваць. А вы ўсё ж пішыце! Хаця, хіба можна каханне давяраць словам, а словы — пісьмам?..

У галечы і жабрацкай беднасці жыла ў сваёй старасці Ганна Пятроўна Керн.

А пісьмы Пушкіна берагла доўга і пяшчотна.

І ўсё ж прадала — дадзела ўсё ж гора. Па пяць рублёў за кожнае заплацілі...

Кажуць, бедная бабулька заплакала і пацалавала вясёлкавую паперку — ці то ад адчаю, што расстаецца з самым дарагім у сваім жыцці, ці то ад радасці, што на нейкі час прагоніць з хаты беднасць.

...Дакуль ты будзеш здзекавацца з мяне, ноч?! Дакуль будзеш свяціць, поўня,— я ненавіджу тваё святло! Дзе ты, дзень? Прыйдзі і накінь на маю стомленую і аголеную душу свой покрыў. На яе саднеючыя раны. Я крыўдзіў сваю душу! Я, ганебны і высакародны, нікчэмны і ўзвышаны, здзекаваўся з яе і абражаў яе... І ўсё ж, ноч, жахлівая ноч, ты спагадніца і памочніца мая. Душа адпакутавала ў табе і стала вольнаю. Зараз яна гатовая для слова. У пакутах паздаравела душа, засяродзіліся думкі. Знешняе і ўнутранае з'ядналася. Яўнае і патаемнае сустрэлася. І я зараз адчуваю, што духоўныя сілы мае дасягнулі поўнага развіцця,— я магу тварыць. І заўтра, выпакутаваўшы «Барыса Гаду-

нова», скончыўшы «Яўгенія Анегіна», выдыхнуўшы «Цыган», напісаўшы столькі міхайлаўскіх вершаў, я пляснў у далоні і крыкну: «Ай ды Пушкін, ай ды сучы сын!»

На магілу Ганны Пятроўны Керн адразу з загса прыходзяць маладажоны.

Каму і чаму яны прыходзяць пакланіцца? Здрадзе? Нявернасці? Заляцанню?

Яны прыходзяць пакланіцца каханню, вышэй якога няма нічога на свеце.

# ЗМЕСТ

*Любоў Ламека.* Неспатольная прага крыла — — — 5

*З кнігі*
**«СОНЕЧНЫ ДОЖДЖ»,**
1960 г.

«Адгукніся...» — — — — — — — — — — — 11
Ваўчыца ў звярынцы — — — — — — — — — 12
Неадасланы ліст да маці — — — — — — — — 12
Сонечны дождж — — — — — — — — — — 13
Хітрая восень — — — — — — — — — — — 14
Сонца села — — — — — — — — — — — — 14
«Вецер блукаў па садзе...» — — — — — — — — 16
Лебядзіная вернасць — — — — — — — — — 17
Начны дыялог — — — — — — — — — — — 17
Колішняя сварка — — — — — — — — — — 18
Салаўіная бяссонніца — — — — — — — — — 19
На бацькавых руках — — — — — — — — — 19
Слёзы маці — — — — — — — — — — — — 20
Далёкія сенажаці — — — — — — — — — — 20
Год — — — — — — — — — — — — — — 21
Размова — — — — — — — — — — — — — 23
Перад світаннем на будоўлі — — — — — — — 23
«Не баюся я цяжкай, далёкай хады...» — — — — 24

*З кнігі*
**«ЛІРЫЧНЫ ВЫРАЙ»,**
1965 г.

ЗА НЕБАКРАЙ

Пачатак палёту — — — — — — — — — — — — 25
«Ляжаць на далоні зерні...» — — — — — — — 25
Пра стол — — — — — — — — — — — — — 26
Начная змена — — — — — — — — — — — 26
Танец соснаў — — — — — — — — — — — 27
Спёка — — — — — — — — — — — — — — 28

«І цяпер яшчэ веру я...» — — — — — — — — — 29
Песні — — — — — — — — — — — — — — 29
Мова — — — — — — — — — — — — — — 30
«Пакліч...» — — — — — — — — — — — — 30
Пехатою ў вырай — — — — — — — — — — — 31
Лінія гарызонта — — — — — — — — — — — 32
«Зноў я сцежку шукаю...» — — — — — — — — 33
Сіняторыя — — — — — — — — — — — — — 33
Маналог мядзведзя, які пасля першай спячкі выйшаў з бярлогі — — — — — — — — — — — 34
«З разамлелых пупышак...» — — — — — — — — 35
Карэнне расы — — — — — — — — — — — — 35
Блакітная геаграфія — — — — — — — — — — 35
Брацкая магіла — — — — — — — — — — — — 37
«Спяць у снарадах...» — — — — — — — — — — 38
«Сэрца — то спрасаваны стагоддзямі порах...» — — 38
Пейзаж з чалавекам — — — — — — — — — — 38
«Заходзіць яблык...» — — — — — — — — — — 39

ВЯРТАННЕ

«Каб неба цябе не загушкала...» — — — — — — 40
«Думкі чалавека — вы працяг...» — — — — — 40
«Пасля расставанняў...» — — — — — — — — — 41
Коні на праспекце — — — — — — — — — — — 41
«Вось яна, піраміда...» — — — — — — — — — 42
Хвіліна сустрэчы — — — — — — — — — — — 43
Вітаюцца кавалі — — — — — — — — — — — 44
Споведзь — — — — — — — — — — — — — — 45
«Горад мой...» — — — — — — — — — — — — 47
Зялёнае воблака на рынку — — — — — — — — 47
Лірычны ўспамін — — — — — — — — — — — 48
Уваходзіны ў паэму — — — — — — — — — — 49
«Мы стаім у зялёным маі...» — — — — — — — 51
Успомненая дарога — — — — — — — — — — — 52
«Ужо аб вайне не могуць...» — — — — — — — 53
Заканчэнне палёту — — — — — — — — — — — 53

*З кнігі*

«ДЗЕНЬ»,

1968 г.

МЕЛОДЫЯ ПЕРШАГА ПРОМНЯ

Запрашэнне ў раніцу — — — — — — — — — — 54
Світальнае — — — — — — — — — — — — — 55
Пачатак — — — — — — — — — — — — — — 55
Малітва над калыскаю — — — — — — — — — 56
Патоп — — — — — — — — — — — — — — — 56
«Пушчу турбуе клопат адзіны...» — — — — — — 57
«Калі...» — — — — — — — — — — — — — — 58
Імпрэсія — — — — — — — — — — — — — — 59
«Мы цяжка ходзім па зямлі...» — — — — — — 59
«Трава — мядзведзь мядзведзем...» — — — — — 59

Птушаня — — — — — — — — — — — — — 60
«Нібы бліскавіцы белыя...» — — — — — — — — 61
Паядынак — — — — — — — — — — — — — 61
Настраёвы эцюд — — — — — — — — — — — 62
«Мая хата ўзімку...» — — — — — — — — — 62
Цнатлівы жарт — — — — — — — — — — — 63
Полюс цішыні — — — — — — — — — — — — 63
Санет кахання — — — — — — — — — — — 64
Пасля сваркі — — — — — — — — — — — — 64
«Еўропа грэецца Гальфстрымам...» — — — — — 65
Падарожжа вакол цябе — — — — — — — — — 65
Двое — — — — — — — — — — — — — — — — 66
Хрыстова нявеста — — — — — — — — — — — 67
«Паміж ручаямі і ліўнямі...» — — — — — — — 68
Яечня — — — — — — — — — — — — — — — 68
«Хоць продкі здаўна мае хрышчоныя...» — — — — 69
Гукі дарог — — — — — — — — — — — — — 69
Вечны пацалунак — — — — — — — — — — — 70
Галерэя вокнаў — — — — — — — — — — — — 71
Мір — — — — — — — — — — — — — — — — 71
«Які чалавек вуглаваты!..» — — — — — — — — 72

## ВЫШЫНЯ ПОЎНАГА СОНЦА

«Хаця ў аснежаных залужжах...» — — — — — — 73
«Ці бачылі вы, як камень...» — — — — — — — 73
«Рыбы хочуць лятаць, як птушкі...» — — — — — 74
На выстаўцы дзіцячых малюнкаў — — — — — 74
Знойдзенае завяшчанне багацея — — — — — — 75
Крыўда — — — — — — — — — — — — — — — 75
«Маўчанне ціхае маланак...» — — — — — — — 76
Вязень — — — — — — — — — — — — — — — 77
Праліў сноў — — — — — — — — — — — — — — 78
Перасяленцы — — — — — — — — — — — — — 79
Пажар у старажытным Полацку — — — — — — 80
Вечаровая песня лесаўчыка — — — — — — — — 81
Пятля Кастуся Каліноўскага — — — — — — — 82
Тураўская элегія — — — — — — — — — — — 83
Вяртанне ў лес — — — — — — — — — — — — 84
«Лягчэй вы паміралі, нашы прашчуры...» — — 86
«Я люблю вельмі край свой зялёны...» — — — — 87
Нарвежская балада — — — — — — — — — — 88
Чорны храм — — — — — — — — — — — — — 89
Пакаранне мёртвай — — — — — — — — — — 90
«Маці!..» — — — — — — — — — — — — — — 91
Правады — — — — — — — — — — — — — — — 92
«Калі ўпершыню...» — — — — — — — — — — 93
Гарады, якіх няма — — — — — — — — — — — 93
Зялёны ліст — — — — — — — — — — — — — — 94
Нюрнберг. Пасля прысуду — — — — — — — — 97
«У садзе...» — — — — — — — — — — — — — — 98
Па вайне — — — — — — — — — — — — — — — 98
«Успаміны не ўсе зааранны...» — — — — — — — 99
«Я дні рассуну...» — — — — — — — — — — — 99
«Самадзержац» — — — — — — — — — — — — — 100

«Я згодзен зерню вечна пакланяцца...» — — — — 101
«У такое надвор'е...» — — — — — — — — — — 101
«Там, недзе за гарой сваіх гадоў...» — — — — — 101

ВЕЧАРОВАЯ МУДРАСЦЬ ДРЭЎ

Ціхая мелодыя — — — — — — — — — — — 102
«Ламаюцца ў снежных сумётах вятры...» — — — 102
«Я выплываю з адзіноты...» — — — — — — — — 103
Гекзаметры рыбака — — — — — — — — — — 103
«Бяда чалавека гнала...» — — — — — — — — — 105
Адзінец — — — — — — — — — — — — — — 106
«Радня крылатых птушак — самалёты...» — — — 107
Марскі музей — — — — — — — — — — — — 107
Працяг — — — — — — — — — — — — — — 108
Лістапад — — — — — — — — — — — — — 109
Скарга прыручанага ваўка — — — — — — — — 109
«Я ўночы прачнуўся...» — — — — — — — — — 110
«Без вёслаў лодка сніцца мне...» — — — — — — 111
«Дрэвы восеннюю...» — — — — — — — — — — 111
«Не ведаю, што робіцца са мной...» — — — — — 111
«Успамін...» — — — — — — — — — — — — — 112
«Наш самы строгі кат — сумленне...» — — — — 112
«О, колькі званняў...» — — — — — — — — — — 112
Абдымкі — — — — — — — — — — — — — — 113
«Гэтулькі славы!..» — — — — — — — — — — — 113
«Па вузенькай сцяжынцы спрэчкі...» — — — — — 113
Бяскрылыя гусі — — — — — — — — — — — — 114
Слова ў спрэчках — — — — — — — — — — — 115
Дуэль — — — — — — — — — — — — — — — 115
Узнаўленне — — — — — — — — — — — — — 116
«Вы кажаце...» — — — — — — — — — — — — 117
«Вада па муку пабегла...» — — — — — — — — 117
Наручнікі — — — — — — — — — — — — — 118
«Усё менш інвалідных калясак...» — — — — — 119
«Я вельмі хачу ў мінулае...» — — — — — — — 120
«Хоць і мінула столькі год...» — — — — — — — 120
Трыялет гадоў — — — — — — — — — — — — 121
«Гады твае ў снег паўмярзалі...» — — — — — — 121
«Апошні год свой дрэвы адчуваюць...» — — — — 121
«Ужо даўно на тым баку планеты...» — — — — — 122
«Вітанне, раніца...» — — — — — — — — — — — 122

*З кнігі*

**«У ПОЎДЗЕНЬ, ДА ВАДЫ»,**

1976 г.

СТРОГАСЦЬ

«Чысцінёй святліцца слова...» — — — — — — — 123
«Здараецца, наплыне дабрыня...» — — — — — — 124
«Як жа хараша ўваліцца...» — — — — — — — — 125
«Раніца. Сонца. Ралля...» — — — — — — — — 126
«Чаго дамогся — не цікава...» — — — — — — — 126

«Адзін аднога крыўдзім порадзь...» — — — — — 127
«Мой агонь пастарэў на год...» — — — — — — 128
«А часам, як дрэву, хочацца...» — — — — — — 129
«У траве пажухлай і счарнелай...» — — — — — 129
«Сядзім, смяёмся за сталом...» — — — — — — 130
«Калі цябе пакрыўдзяць незаслужана...» — — — 131
«Я выходжу з раба пакрысе...» — — — — — — 131
«Калі ты працаваў адзін за трох...» — — — — — 132
Пазім'е — — — — — — — — — — — — — — 133
«Спатыкнешся аб чэрвень, бывае...» — — — — — 133
Настрой — — — — — — — — — — — — — — 134
«Дзе нам баліць, там і душа...» — — — — — — 134
«Ах, мілы конь, ах, мілы косю...» — — — — — — 134
«І прыйдзе смутак нечакана...» — — — — — — 135
«Кожны дзень прачынаешся з прагаю цуду...» — — 136
«Пасівела душа, пасівела...» — — — — — — — 136
«Абнаўлення, хлопцы, абнаўлення...» — — — — 137
«Зноў мяне прыручаюць дарогі...» — — — — — 138
«У няпростым гэтым свеце...» — — — — — — 139
Там, у дзяцінстве — — — — — — — — — — 140
«Калі з выраю птушка...» — — — — — — — — 140
Вяртанне з хваробы — — — — — — — — — 140
Пералёт дажджу — — — — — — — — — — 141
«Не вернуцца годы — мая радня...» — — — — — 142
«Іду звычайнаю сцяжынай...» — — — — — — — 142
Уваходзячы ў мора — — — — — — — — — — 143
«Прадвесне. Птушыныя гнёзды...» — — — — — 143
«Ах, як весяліцца гай пад сугрэвам...» — — — — 144
«Ты хіба яго не стрэціў?..» — — — — — — — — 144
«Такою ранішняй часінай...» — — — — — — — 145
«Тры прыгаршчы вады ў крыніцы...» — — — — — 145
Вада — — — — — — — — — — — — — — — 145
Малітва прашчура — — — — — — — — — — 146
Лета. Акварэль — — — — — — — — — — — 147
Сенаванне — — — — — — — — — — — — 147
Эскіз — — — — — — — — — — — — — — — 148
«Бы схаваную ў кветкі мелодыю...» — — — — — 148
Ручай — — — — — — — — — — — — — — 148
Мелодыя на званах — — — — — — — — — 149
«Добры дзень табе, вечар...» — — — — — — — 150
«І ўсё ж не марна...» — — — — — — — — — 150
Вясновае — — — — — — — — — — — — 150
«А мы з табой, бы ў рай, у гэткі...» — — — — — 151
«Калі ў вачах — вачам аж цесна...» — — — — — 151
Чаканне цябе — — — — — — — — — — — 152
Начная размова — — — — — — — — — — 153
Твае рукі — — — — — — — — — — — — 153
Музыка для закаханых — — — — — — — — 154
Рыфма пра каханне — — — — — — — — — 155
«Было тады...» — — — — — — — — — — — 155
«Сумую я па лыжным следзе...» — — — — — — 156
Амаль буколіка — — — — — — — — — — 157
Чыстае слова — — — — — — — — — — — 157
«Я хачу вярнуцца да цябе...» — — — — — — — 158
Жанчына спявае — — — — — — — — — — 158

«Калі, ад шчасця захмялелы...» — — — — — — 159
«А збудзённіць паланенне...» — — — — — — — 160
Белыя вароны — — — — — — — — — — — — 161
У гасцях — — — — — — — — — — — — — 162
Да біяграфіі майго народа. I — — — — — — — 162
Паранены партызан — — — — — — — — — — 163
Перамога — — — — — — — — — — — — — 164
Пытанне — — — — — — — — — — — — — 165
«Я люблю цябе да скону...» — — — — — — — 165
«Гэта дрэва шукае свайго бусла...» — — — — — 166
«У мяне шмат радзім не было...» — — — — — — 166
Роднае слова — — — — — — — — — — — — 167
«Зразумець, што ты — народ...» — — — — — — 167

## РАСКАЛЬЦАВАНЫЯ ПТУШКІ

Да біяграфіі майго народа. II — — — — — — — 169
Адказ на анкету — — — — — — — — — — — 169
Да біяграфіі майго народа. III — — — — — — — 170
З успамінаў — — — — — — — — — — — — — 171
Закатаваны — — — — — — — — — — — — — 171
«Ты кінуў слова ў мяне...» — — — — — — — — 172
«Чаму я ў юнацтве...» — — — — — — — — — 172
«Вы кажаце, гэта дзед?..» — — — — — — — — 173
Ау! — — — — — — — — — — — — — — — 174
«А зямля...» — — — — — — — — — — — — — 174
«Давайце адзначаць дні нараджэння дрэвам!..» — — 175
«Радзіма, дай мне аднойчы...» — — — — — — 176
«Недзе ў далёкім краі...» — — — — — — — — 176
Да пытання аб руках — — — — — — — — — 177
«Некалі...» — — — — — — — — — — — — — 177
«Чаму мяне ў снах...» — — — — — — — — — 177
«Слухаю песню конікаў...» — — — — — — — 178
Малюнак — — — — — — — — — — — — — 178
«Як прабабка мая казала...» — — — — — — — 179
Падарожнік — — — — — — — — — — — — — 180

## ВЯНОК САНЕТАЎ

Жанчына — — — — — — — — — — — — — 181

*З кнігі*

## «УСМІХНІСЯ МНЕ», 1984 г.

Усміхніся мне — — — — — — — — — — — — 189
Жыццё — — — — — — — — — — — — — — 190
«Варта ў крылы паверыць свае...» — — — — — — 190
«Як радасна, мой дружа, разумець...» — — — — 191
«З роду я хлебасееў...» — — — — — — — — — 191
Элегія — — — — — — — — — — — — — — 192
«Шануйце зямлю нашу ўвесну...» — — — — — — 194
«Ты ласкі прагнеш, нібыта дзіця...» — — — — — 194

«І не абтросшы з ног дарожны пыл...» — — — — 195
«Конь, сівы ад гадоў...» — — — — — — — — 196
«Дружа мой!..» — — — — — — — — — — — 197
З ранішнім ветрам — — — — — — — — — — 198
«У самы знак задыякальны Дзевы...» — — — — — 199
Бабуля — — — — — — — — — — — — — — 200
Сялянскія рукі — — — — — — — — — — — 201
Вайдэлоткі — — — — — — — — — — — — — 201
Сябры — — — — — — — — — — — — — — 202
Мінула ўжо вясна, наперадзе зіма — — — — — 203
Дымок у збажыне — — — — — — — — — — — 204
«Адкуль я помню гэтакі малюнак?..» — — — — — 206
Настальгія арабінкі — — — — — — — — — — 207
«Ахвярай стаў, а ўсё-ткі перамог!..» — — — — 208
Прамова ў Ляўках — — — — — — — — — — — 209
Ялта, Максім, кіпарысы — — — — — — — — 210
Дождж ля вёскі Шастакі — — — — — — — — 210
Вечар паэзіі — — — — — — — — — — — — 211
«Кайсын Куліеў, мудры горац...» — — — — — — 212
«Калі вось так лунаеш апантана...» — — — — — 213
«Мятлушка-шматкалёрніца...» — — — — — — 213
Дзівак — — — — — — — — — — — — — — 214
Думка — — — — — — — — — — — — — — 214
«Дзе нас чакаюць сцежкі і бары...» — — — — — 215
«Лятаюць рыбы у вадзе, бы ў небе...» — — — — — 215
«А як жа, ці чуеце, дрэвам...» — — — — — — — 216
«Жыла ў мяне радасць...» — — — — — — — — 216
«Быццам саксаул з ранетам...» — — — — — — 217
«Асвечвае спакусна змрок начэй...» — — — — — 217
«Аж прагінаецца бетон...» — — — — — — — — 217
Сусветнае — — — — — — — — — — — — — 218
Паляванне, сумныя трафеі — — — — — — — 219
Сон, быццам ява — — — — — — — — — — — 219
«Лятай, лятай, маленькі каралёк...» — — — — — 220
Кветка — — — — — — — — — — — — — — 221
«Як мы, калісьці стрэўшыся, з табой...» — — — — 222
«Быў час лагоды і спакою...» — — — — — — — 223
«Калі снегапад раптоўна...» — — — — — — — 223
«Стаю абдожджаны...» — — — — — — — — — 224
Каханне — — — — — — — — — — — — — 225
«Я люблю цябе...» — — — — — — — — — — 225
«Не, на каханне ланцугоў няма...» — — — — — 226
«Нібы па струнах нехта гучна...» — — — — — — 227
Песня — — — — — — — — — — — — — — 228
«Не стане і мяне...» — — — — — — — — — 228
«О радасць абнаўлення плачам...» — — — — — 229
Асенняе раўнадзенства — — — — — — — — 229
«Трывогі свету нам не заглушыць...» — — — — 230
«Стамілася сэрца...» — — — — — — — — — 230
«Дываны выбіваюць...» — — — — — — — — — 231
«Ты ўсё сцябаеш пугаю каня...» — — — — — — 232
Тлумачэнні камп'ютэру — — — — — — — — 233
«Нас кожная раніца старыць...» — — — — — 236
«Шчаслівая такая ж, як і ты...» — — — — — — 237
«Ачаг сямейны — звыклы тэлевізар...» — — — — 237

Цішыня ў свеце — — — — — — — — — — — — 238
«Што з табой, свеце мой любы...» — — — — — 238
«Ва ўсёй жывой і нежывой прыродзе...» — — — — 239
«Даўно ўжо тое мінула...» — — — — — — — — — 239
«Маці было сорак гадоў...» — — — — — — — — 240
«Яна ў руцэ шчаслівая ляжала...» — — — — — — 241
Неба вайны — — — — — — — — — — — — — 241
«А спачатку...» — — — — — — — — — — — — 242
Жывы са спаленай вёскі — — — — — — — — 242
Спачуванне — — — — — — — — — — — — — 243
«Сам на сябе палюе чалавек...» — — — — — — 244
«На трэцяй ад сонца планеце...» — — — — — — 245
Калыханка — — — — — — — — — — — — — 245
«А сатана — людзей і Бога вораг...» — — — — — 247
Трывожная радасць — — — — — — — — — — 247
З мінулага — — — — — — — — — — — — — 248
«Ты паплач, каханая, адкрыта...» — — — — — — 248
«І нарадзіў кагосьці хтосьці...» — — — — — — 249
«Якое дзіва!..» — — — — — — — — — — — — 249
«Для радасці ўрачыстай на зямлі...» — — — — 251
«Вядзі мяне, зялёная радзіма...» — — — — — — 251
Дойлід — — — — — — — — — — — — — — 252
«Травой траву ніколі не стрымаеш...» — — — — 253
Жыццяпісы — — — — — — — — — — — — — 254
«Дзе сцежкі ведаюць цябе адну...» — — — — — 256
Пасля журбы — — — — — — — — — — — — 257
«Ненавідзець — гэта ўсё ж любіць...» — — — — 257
«Ёсць жа людзі: пагляд — нібы ў кобры...» — — — 258
«Я пайду ў гарод...» — — — — — — — — — 258
«Калі мая закончыцца сцяжына...» — — — — — 259
Матчына сэрца... — — — — — — — — — — — 259
«Учора — не маё...» — — — — — — — — — — 260
«Ляціць Зямля — наш карабель касмічны...» — — 260
На завяршэнне кнігі — — — — — — — — — — 261

*З кнігі*

**«ВЕЧА СЛАВЯНСКІХ БАЛАД»,**

1988 г.

Сяўба — — — — — — — — — — — — — — 262
Мячык — — — — — — — — — — — — — — 265
Урок — — — — — — — — — — — — — — — 267
Еш! — — — — — — — — — — — — — — — 269
Пытанне — — — — — — — — — — — — — — 270
Кветкі — — — — — — — — — — — — — — 272
Зброя — — — — — — — — — — — — — — 274
Пустэльнік — — — — — — — — — — — — — 275
Валы — — — — — — — — — — — — — — — 278
Шыбеніца — — — — — — — — — — — — — 279
Арыштант — — — — — — — — — — — — — 282
Ёлка — — — — — — — — — — — — — — — 285
Крылы — — — — — — — — — — — — — — 287
Лазня — — — — — — — — — — — — — — 289
Кукіш — — — — — — — — — — — — — — 291

Кузня — — — — — — — — — — — — — 293
Званні — — — — — — — — — — — — — 295
Чубы — — — — — — — — — — — — — 297
Пагоня — — — — — — — — — — — — — 298
Ростань — — — — — — — — — — — — — 301
Будоўля — — — — — — — — — — — — 302
Саранча — — — — — — — — — — — — — 303
Конь — — — — — — — — — — — — — — 305
Вадзянік — — — — — — — — — — — — 307
Каханне — — — — — — — — — — — — — 309
Кароль — — — — — — — — — — — — — 310
Падатак — — — — — — — — — — — — — 312
Кантрабанда — — — — — — — — — — — 313
Вяселле — — — — — — — — — — — — — 315
Касцёр — — — — — — — — — — — — — 316
Грунвальд — — — — — — — — — — — — 319
Званы — — — — — — — — — — — — — 321
Разня — — — — — — — — — — — — — 322
Чараўніца — — — — — — — — — — — — 323
Адчай — — — — — — — — — — — — — 325
Пыл — — — — — — — — — — — — — — 325
Развітанне — — — — — — — — — — — — 327

*З кнігі*

**«АХВЯРНЫ ДВОР»,**

1991 г.

Варзоб — — — — — — — — — — — — — 328
Ахвярны двор — — — — — — — — — — — 343
Одзіум — — — — — — — — — — — — — 355
Хата — — — — — — — — — — — — — — 376
З чужымі Багамі — — — — — — — — — — 396
Экстаз — — — — — — — — — — — — — 410

Сіпакоў Я.

С39 Выбраныя творы. У 2 т. Т. 1. Паэзія/Прадм. Л. Ламекі.— Мн.: Маст. літ., 1995.— 431 с., [1 л. партр.].

ISBN 5-340-01334-8 (т. 1).

Першы том выбраных твораў вядомага беларускага пісьменніка складуць вершы з кніг «Сонечны дождж», «Лірычны вырай», «Дзень», «У поўдзень, да вады», «Усміхніся мне» і балады з кнігі «Веча славянскіх балад», а таксама паэмы ў прозе «Варзоб», «Ахвярны двор», «Одзіум», «Хата», «З чужымі Багамі», «Экстаз».

С $\frac{8820600000—006}{М 302(03)—95}$ 93—94

ББК 84(4Беи)6

Літаратурна-мастацкае выданне

СІПАКОЎ
ІВАН ДАНІЛАВІЧ

*ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ*
*У ДВУХ ТАМАХ*

*Том 1*

Паэзія

Рэдактар Г. В. Роліч. Мастак Н. У. Сустава. Мастацкі рэдактар А. І. Дрозд. Тэхнічны рэдактар М. Ц. Папкова. Карэктар Л. М. Маслоўская.

Здадзена ў набор 06.09.93. Падп. да руку 14.11.94. Фармат 84×108[1]/32. Папера друк. № 1. Гарнітура тып Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 22,68+0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 22,79. Ул.-выд. арк. 20,41. Тыраж 2200 экз. Зак. 482.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.